Уладзіслаў Рубанаў

# ЦЁПЛЫ ПУХ АДУ·ВАН·ЧЫ·КАЎ



Уладзіслаў Рубанаў

# ЦЁПЛЫ ПУХ АДУВАНЧЫКАЎ

*

Аповесці
і апавяданні

*

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1987

ББК 84 Бел7
Р 82

Рэцэнзент
ФЕДАР ЯФІМАЎ

Р $\frac{4702120200 - 125}{M302(03)-87}$ 27—87

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1987.

# АПОВЕСЦІ

*



## РАЗАМ ПА ЖЫЦЦІ

> Агульная колькасць інвалідаў за другую сусветную вайну склала 95 мільёнаў чалавек.
>
> *З газет*

Раённыя гарады на Беларусі маюць агульную адмету, каларыт. Самы свежы мазок у панараме гарадоў — новыя шасціпавярховыя дамы, якія велічна-нязвыкла, надта шыкоўна глядзяцца паўзверх нізкіх цагляных, а часцей — драўляных будынкаў, агароджаных ад вуліцы старым невысокім шчыкетнікам, паўз які расце непрыгожая, запыленая трава, кусты парэчак і стаяць у рахманай асуджанасці даступныя ўсім вішні.

Калодзежаў у горадзе не капаюць, ваду звычайна бяруць з жалезных насатых калонак; каля іх заўсёды, нават у спёку, блішчыць гразь, над якою пырхаюць белыя капусніцы з чорнаю абводкаю на крылах і бзыкаюць натрывожаныя руплівіцы пчолы.

Пры весніцах туляцца шырокія са спінкамі лавачкі, пакрамсаныя хлапчукоўскім складанчыкам. Седзячы на іх, дастаеш нагамі да тратуара, ён спрэс у трэшчынах, з якіх надта любяць прарастаць раздвоеныя вушкі клёнікаў. На старых вуліцах шмат і звычайных пясчаных сцежак — ад машын і матацыклаў іх аберагаюць укапанымі тоўстымі слупкамі.

У кожным райцэнтры ёсць некалькі сапраўдных гарадскіх вуліц, найперш цэнтральная, абавязкова з гучнаю назваю. На ёй, як правіла, вы знойдзеце будынкі партыйных і савецкіх органаў, рад магазінаў, аптэку, пошту, Дом культуры... Яна патанае ў зеляніне, асабліва шмат таполяў — у чэрвені, калі з іх злятае пух, зямля засцілаецца вохкаю беллю, на мокрых мясцінах шчытнаю, бы палатно. Гэта ўжо трэцяя на гаду белая замець: першая была ўзімку, самая ўладная — снежная, потым, калі адцвіталі сады, і вось — таполевая, яна ўсюдыісная: пушынкі прыліпаюць да адзення, валасоў, пранікаюць у аўтобусы, залятаюць у адчыненыя фортачкі, іх ловяць рукамі дзеці — так, як матылькоў.

У райцэнтры заўсёды (і часта!) сустрэнеш вясковых

людзей — прыязджаюць на базар, у магазін, у розныя канторы і бальніцу. Іх зразу пазнаеш: дзядзька, факт, будзе ў кірзавых ботах, халявы якіх знарок сплюшчаны гармонікам, у цёмных картовых штанах і ў нязменным картузе на макаўцы, пад якім, калі дзядзька спыніцца прыгрэбці спацелыя валасы, блішчыць белая, незагарэлая лысіна. І ніводная вясковая цётка не паедзе ў горад з голай галавою ці ў старым адзенні. На такі выпадак беражэцца квяцістая хустка, доўгая цёмная спадніца, нярэдка ахарошаная ўнізе ружоваю ці белаю стужкаю, тоўстай вязі кофта і просценькія, без усялякіх шпілек-набоек, туфлі. У такім убранні цётка гатова хоць міністру паказацца.

Ляск, стукат, гудкі... А вясною і ўвосень ранішнюю свежую цішыню вуліц, прыглушаную лёгкім туманком і дымам, абуджае віскатня парасят — іх прывезлі яшчэ цёмначы на калёсах у доўгіх, няшчытна збітых скрынях, а з базару ўжо разносяць у душных цёмных мяшках; хапае парасятам пакуты — да іх доўга і пільна прыглядаюцца-прыцэньваюцца, цягаюць маленькіх і ружовых за ногі, мераюць пальцамі шырыню між лапатак, ці тоўсты ў камлі хвост.

У суботу ці ў нядзелю на аўтастанцыі можна ўбачыць такую сцэнку — маленькі дарожны спектакль, на які не патрэбен ні білет, ні рэклама.

Купка вясковых людзей: жанчыны і два дзядзькі. Адзін пажылы, амаль дзед, з белымі пушыстымі вусамі. Другі — маладжавы, у яго вялікія цёмныя рукі, на правай блішчыць шлюбны пярсцёнак — уражанне, быццам фалангі безыменнага пальца не стыкаюцца, між імі паветра. Гэты, маладжавы, трымае за хахол мокры ў ражку мех, у якім вішчыць-тузаецца парася. «Глядзі, — смяецца маленькая, худая, загарэлая жанчынка, прыкрываючы далонню шчарбаты рот, — каб ён у аўтобусе не...» — і так глянула на ўсіх, акурат прыдумала нешта неймаверна дасціпнае.

Самавіты мужчына, у чорным касцюме, пад гальштукам — чырвоным, як і туфлі на нагах, — трымаючы за руку хлопчыка гадоў сямі, спыніўся проці людзей. Маленькая жанчынка, мабыць, няўседлівая, дападкая па натуры, тут жа сказала, звяртаючыся да хлопчыка: «Во хай і табе папка купя парасёначка... Карміць тады будзеш, а то во есці хоча, бачыш, плача...» — паказала на мокрую пляму ў ражку меха. «Дык дзе ж яго, баб-

ка, трымаць? — усміхнуўся дабрадушна мужчына. — Хіба што на балконе».

Размова, якая цікава завязвалася, нечакана абарвалася, бы нітка, якую рэзка тузанулі, — з цьмянага меднага рупара аб'явілі: «На стаянку пададзены аўтобус Рэпкавічы — Маліпаўка!» Жанчыны замітусіліся, як спуджаныя мухі, пачалі хапаць на плечы свае вісклівыя клункі, а мужчыны, дзіўна, не зварухнуліся, спакойна курылі, прыпяўшыся спінамі да сцяны аўтастанцыі.

Канец спектакля.

І калі да ўсіх гэтых зрокавых эцюдаў і гукаў дабавіць яшчэ стары парк са згубленаю ў ім цэркаўкаю, на якой тады-сяды квола, журботна дзілінькалі два званы, то акурат вымалююцца Рэпкавічы — раённы гарадок, дзе мне давялося жыць тыя першыя гады сталай працы.

Не ведаю, ці па спецыфіцы журналісцкай работы, ці па якой іншай прычыне (можа, тут ёсць пэўная заканамернасць для ўсіх?), але ў Рэпкавічах я найперш уведаў начальства. Ну, рэдактар — само сабою. Павёў ён мяне, зразу ж па прыездзе, на гутарку ў райком партыі, да сакратара па ідэалогіі Алёсіна. «Добры дзень!» — «Добры дзень!» Алёсін паклікаў па тэлефоне загадчыка аддзела прапаганды: «Знаёмцеся, калі ласка...»

Камсамольцы загадзя ведалі, што ў рэдакцыю прыязджае новы супрацоўнік, які ўжо адным тым, што малады, міжвольна станавіўся мішэнню кадравых стрэл. Калі я браўся на ўлік, загадчык аргаддзела Васіль Арэхаў звадзіў мяне, лічы, у кожны кабінет. Аказалася, што мы з ім трохі знаёмыя: я ад'язджаў на канікулы, а ён, завочнік гістфака, засяляўся ў наш пакой.

Нават пра самага радавога чалавека не станеш пісаць, не параіўшыся з кіраўніком ці парторгам. Так я, прыйшоўшы ў пээмка з першым рэдакцыйным заданнем напісаць замалёўку пра цесляра, пазнаёміўся з начальнікам — самаўпэўненым, важным маладым чалавекам у скуранай лётчыцкай куртцы. У яго быў дробненькі, худы тварык і надзіва гучны голас.

Чарга расла — старшыні калгасаў, дырэктары саўгасаў і, канечне, іх намеснікі, а перад усімі, мабыць, бліжэй стаялі работнікі райсельгасупраўлення.

Гэта, калі браць па логіцы, аб'ектыўна, але з людзьмі я не вельмі ўмею сыходзіцца і, магчыма, некага не-

дзе прапусціў ці абмінуў наўмысна, але жыццё, як кажуць, усё паставіла на сваё месца, запоўніла ўсе прабелы, як вада запаўняе без разбору мелкія і глыбокія ямкі.

Людзі простыя, але нечым адметныя, з «лысінкаю», інвалід ці п'яніца, маладая прыгажуня ці элегантны фарсун, пачынаюць западаць у вока пазней, калі першая разгубленасць, скаванасць перад новым табе светам схлынуць і ты можаш спакойна, без насцярожлівага павароту галавы агледзецца па баках.

Першы раз я ўбачыў *яе* ва універмагу, у секцыі мужчынскага адзення: глянуў на твар — і адшаснуўся так, як, бывае, ад сцяны, калі натыкаешся на яе ў цемнаце. Людзі — індывідуальнасці, але знешняе падабенства размывае іх. Твар *гэты* быў незвычайны, як і галава, вялікі, з буйнымі, няправільнымі рысамі і з тою насцярожанасцю ў вачах, якая бывае найчасцей у людзей, што пакутуюць ад нейкай сваёй непаўнацэннасці.

Жанчына выбірала мужчынскія штаны, але не з прасцячковаю аляпаватасцю, як гэта робяць зазвычай вясковыя цёткі; у рухах не было мітусні, а спаважнасць і нават прыдзірлівасць.

Універмаг пабудавалі нядаўна, і ў салонах яшчэ пахла фарбаю, ад яе лёгка кружылася галава. Я востра гэта адчуў тады, калі сутыкнуўся нос у нос з жанчынаю: знямеў збянтэжаны і, канечне, здзіўлены, а праз колькі хвілін ужо з болем засмучаўся, што ёсць на свеце і такія жанчыны, якіх проста нельга не пашкадаваць.

Потым я ўбачыў яе зноў. А можа, мне толькі здалося, можа, уражаны ва універмагу, сасніў жанчыну, а падумаў, што ўбачыў другі раз? Сон — штука загадкавая. Ён можа выцягнуць з цёмных закуткаў памяці такі аддалены і мімалётны штрых, што будзеш адно здзіўляцца яму і тлумачыць якім-небудзь містычным паходжаннем, хаця яго праекцыя на жыццёвую з'яву часам можа многае сказаць.

У снах, як і ў сустрэчах, ёсць свая логіка, схаваная, бы тайна, і спрасаваная шматслойна ў падсвядомасці, таму і непадуладная ні нашай волі, ні нашым жаданням.

* * *

Высокае сонца сыпала на зямлю чыстае, празрыстае, як фільтраванае ўсё роўна, святло; і жнівеньскае

неба таксама было нейкае непарушна-чыстае, у роўнай густой сіні, якая, здаецца, зусім нізка над галавою: падымі руку і дастанеш.

— Ну, прыемнага апетыту! — памахаў я рукою «несямейнікам» — так у нас у рэдакцыі называюць тых, хто ходзіць абедаць у рэстаран.

— А табе ўдала правесці перагаворы наконт кватэры, — павярнуўся Пшонік, адказны сакратар, і я ўбачыў на яго твары пустую, бяскрыўдную, але непрыемную ўсмешку.

Рыпнулі пад маімі нагамі маснічыны рэдакцыйнага ганка. І ганак, і сам будынак, у якім месцілася рэдакцыя, былі драўляныя, старыя. Праўда, будынак з год назад ашалявалі і пафарбавалі ў светла-руды колер, а чарапічны дах замянілі бляхаю. З яе, калі ішоў дождж, лёгенька сцякала вада і палівала клумбы. У дождж, стоячы каля акна, я любіў назіраць, як ад празрыстых халаднаватых струменьчыкаў падрыгваюць кветкі, асыпаюць ужо аджылыя, зморшчаныя пялёсткі; вада змывае іх, і яны плаваюць потым у забруднелых лужынах, як маленькія зморaныя качаняткі.

Дажджу ўжо даўно не было, дарога пыльная, і за кожным крокам падымаецца воблачка, плыве понізу, а на станцыі, дзе чмыхаюць паравозы, узлятаюць густыя, шызыя клубы дыму і таксама плывуць на невялікай вышыні, паралельна зямлі.

Кватэру гэту напытаў не я, а літсупрацоўніца аддзела пісьмаў Ніна Альбуціна. І напытала не для сябе і, тым болей не для мяне, а для Пшоніка, у якога была «закахана без памяці», хаця сама наўмысна пускала чуткі, што яны проста сябруюць. Пшонік жыў на кватэры ў ваенным гарадку, туды набіралася кіламетраў пяць, а Ніна — у саміх Рэпкавічах; і сустракацца ім, праводзіць адно аднаго было нязручна, але — гэта домысел, бо самі закаханыя (назавём іх усё ж так) ніякіх прычын не выстаўлялі, людзі асцярожныя і скрытныя, яны ахуталі свае адносіны непранікальным змрокам няпэўнасці, у якім вольна лунaлі хіба што людскія плёткі, намёкі ды кпіны.

У мяне якраз таксама наспела нявыкрутка з кватэраю. Мой гаспадар, дзядзька Кузьма, быў маўчун, ужо за гэта я лічыў яго разумным чалавекам, хаця многія абзывалі дзіваком. У дзядзькі, і праўда, была слабінка: ён разводзіў птушак. Не ў няволі, як многія

«недзівакі», не ў клетках, а на гарышчы хаты і хлява, у садзе. Рабіў скрыначкі, буданчыкі, над акном наўмысна няшчытна прыбіў разьбяную ліштву, і за ёю гнездаваліся вераб'і цэлаю плоймаю, раніцаю будзілі мяне сваім цвырканнем. Зімою дзядзька вешаў пры ганку, каля фортачак, на яблынях і кустах бэзу кармушкі, якія сам называў «рэстаранамі ў пер'ях». Птушкі дзень і ноч кружылі над хатаю, свісталі і цыргыкалі, ценькалі і квірчэлі; не баяліся, садзіліся і мне на плечы, галаву, драпалі кіпцюрыкамі па шчоках.

Дзядзька птушкалюбам стаў з той пары, як памерла зусім маладою жонка; пакінула яму сына і дачку. Ён гадаваў разам дзяцей і птушак. Сын ажаніўся даўнавата, яшчэ да арміі, і жыў у сваёй кватэры. Цяпер збіралася замуж дачка, бледная, высокая, з блакітнымі касаватымі вачыма дзяўчына. І нават апошні асталоп датумкаў бы, што ўсім у адной не дужа вялікай хаце будзе цесна. Дзядзька Кузьма нічога мне пакуль не гаварыў, але я сам пачаў шукаць сабе новае прытулішча. І тады Альбуціна паказала, што яшчэ не зусім у ёй заснула велікадушнасць: «Я ведаю кватэру, асобны пакойчык, акно ў сад...» Але яна і словам не абмовілася, што гаспадары Пшоніку адмовілі, пра гэта я даведаўся пазней.

Дом — прыватны — быў недалёка ад рэдакцыі, адразу за пуцямі, у вузенькім завулку, які здаваўся яшчэ болей цесным ад таго, што на яго з двух бакоў хіліліся з гародаў вішні і слівы. На весніцах у двор зашчапкі не было, закрываліся яны тугою спружынаю. Да сянец вяла шырокая цэментавая дарожка. Я пастукаў у дзверы. Чакаў доўга. Дзверы адчыніліся зняцяйкі, і я разгубіўся: перада мною стаяла, выціраючы фартухом вялікія чырвоныя рукі, тая жанчына, што некалі ўразіла мяне ва універмагу.

— Калі ласка, праходзьце, — запрасіла яна густаватым голасам. — Сядайце во, — паказала на табурэты каля шырокага, засланага цёмным абрусам стала, і сама першая села.

Я сказаў, чаго прыйшоў.

— Ага, патрэбен нам кватарант.

Сказала іменна так — «патрэбен», і мне перш здалося, што за словам гэтым хаваецца не зусім прыстойны сэнс — спажывецкі разлік. Але далей жанчына і блізка не пыталася, якая ў мяне зарплата і колькі я магу

плаціць, ці буду вадзіць сябровак і ці п'ю гарэлку. Яна і не жалілася на свой лёс, яна шчыра, без хітрасці ўсякай сказала мне, чаму ім, у іх сям'ю патрэбен «лішні чалавек».

— Жыў бы каторы з сыноў пры нас, было б усё прасцей, а так... Адзін у Крычаве, другі ў Маскве, трэці, сярэдні, забраўся ажно ў Карэлію... Служыў там, там і прыжаніўся.

Галіна Андрэеўна (такназвалася яна) глядзела на мяне з мяккай насцярожанасцю. У яе былі вочы дзіўнага колеру, не то сіняга, не то зялёнага, здаецца, такога колеру было лісце на нейкай невядомай мне экзатычнай расліне, якую бачыў у Батанічным садзе ў Мінску. Я слухаў, і ў душы маёй мацнела супярэчлівае пачуццё: здавалася б, я павінен Галіне Андрэеўне спачуваць, а мне хацелася ёю захапляцца. Перад маім зрокам яна стаяла ў німбе нейкага высокага, чыстага святла. Яна была з тых людзей, пра якіх ніколі не мяняеш думкі, бо іх *адчуваеш;* з імі можна нават не размаўляць, адно моўчкі сядзець побач і час ад часу бачыць рукі, вочы, чуць дыханне, якое ў нейкі момант затойваецца, і заўсёды хочацца думаць — ад перажывання. У мяне ўжо даўно спее задума напісаць апавяданне з крыху парадаксальнаю назваю «Размова моўчкі».

Гадзіна праляцела вобміг, а я не мог сказаць, што мне пара ісці. Галіна Андрэеўна, убачыўшы, як я зіркнуў на гадзіннік, што папіскваў вялікім жоўтым маятнікам на сцяне насупраць, сказала з віною ў голасе:

— Прабачце, вам, мабыць, на працу?

У мяне ўжо быў кватаранцкі вопыт, і я добра ведаў, як гэта важна, калі цябе разумеюць гаспадары.

...Раніца была цёплая. У шырокай нізовіне за пуцямі ляжаў густы, як студзень, блакітны туман; з яго тырчаў белы, бліскучы бетонны слуп, бы чаранок лыжкі. На клёне каля шпакоўні сядзеў шпак і тоненька, бы ў струк акацыі, свістаў. Па адным, як згаварыўшыся, цяжкае ад расы, падала з яблынь рудое, бы скарынкі хлеба, лісце.

Лета перайшло ў восень, а я перайшоў на новую кватэру.

Пакойчык, на радасць мне, быў невялікі: можа, і на

дзіва каму, але мне лепей пішацца заўсёды ва ўтульных закутках, дзе ўсё да мяне бліжэй — сцены, вокны, кнігі, дзверы, — абціскае з усіх бакоў і быццам памагае скучваць думкі, не дае разбягацца ім, круціць у адным клубку, як у віры. Па левую руку, на шырыню сцяны, стаяў стары жалезны высокі ложак, ён упіраўся краем бліскучага біла ў цёмны патрэсканы вушак акна. У куце справа туліўся невялікі, вузкі, як школьная парта, столік, а над ім вісела самаробная кніжная паліца.

Пад акном у садзе расла яблыня, так блізка, што хоць адчыняй фортачку і зрывай з галіны тры, мабыць, забытыя гаспадарамі яблыкі: у пакойчыку стаяў духмяна-густаваты пах, які лёгенька кружыў галаву, а на душы чамусьці сеяў самоту — па вёсцы, ці што.

Чамадан свой і «архіў» — кардонную каробку з-пад пішучай машынкі — засунуў пад ложак; туды ж, не распакоўваючы, згрудзіў стопкі кніг, звязаныя шпагатам, а на паліцу паставіў адно тое, што трэба пад рукою на кожны дзень.

Увечары, калі я сеў пісаць дахаты пісьмо з новым адрасам, святло настольнай лямпы высвечвала за акном яблыню; у поўнач я добра бачыў матавыя кропелькі расы на тых трох яблыках, а на цёмных бліскучых шыбах пяшчотныя, як сняжынкі, крыльцы начных матылькоў.

Чатыры дні на тыдні ў Галіны Андрэеўны былі першыя ўрокі. І я таксама ішоў на працу к дзевяці. Галіна Андрэеўна разумела, што мне, маладому хлопцу, няёмка таптацца разам з ёй на кухні; яна ўставала раней, у сем гадзін; снедала ды ішла ў залу за стол, гартала планы, падручнікі. Я чуў яе тупое астматычнае пакэрхванне.

Тады ўжо я ішоў на кухню. У халадзільніку ў мяне ляжалі яйкі, кавалак каўбасы, масла, на якое ў Рэпкавічах ніколі не бывае нястачы, стаяла бутэлька малака ці кефіру. Нават пры самай беднай кухарскай фантазіі з гэтых прадуктаў можна скулінарыць сытнае снеданне. А хутка я ўпэўніўся, што такое самаручнае гатаванне, як і казала Галіна Андрэеўна, ашчаджае не толькі час, але і грошы, якіх у халасцякоў заўсёды не хапае ад палучкі да палучкі.

Пшонік, вітаючыся раніцаю са мною за руку, у натужнай глыбакадумнасці жмурыў вочы і кожны раз пытаўся: «Ну, як на новай кватэры?» Я бачыў, што ён

хоча, каб я абураўся, а мне было добра на новай кватэры, і я хваліўся, разумеючы, што і на макулінку не хлушу. Пшонік хмыкаў і глядзеў, не мігаючы, на мяне так, быццам нешта патаемнае ведаў і хацеў пранюхаць, ці вядома яно мне.

Літаратурны штотыднёвік надрукаваў маё апавяданне — па раённых мерках (радкі, радкі, як яны ўядаюцца ў мазгі журналістаў-раёншчыкаў!) — вялікае, амаль на цэлы высокі падвал, з партрэтам, біяграфічнай даведкаю і клішыраваным загалоўкам. Я купіў у кіёску штотыднёвік. Ішоў па вуліцы. І радасць, і захапленне, і дзіўная ўзрушанасць — усё разам напаўняла маю душу, і яна мне ў гэты момант уяўлялася такой вялікай, ёмістай, бы зямны шар. Свяціла сонца. Паветра было халоднае, празрыстае, а неба аж белае, з цёмнымі, як вугаль, воблачкамі, ад кудзельнай гушчыні якіх сыходзіла на зямлю нейкая гарэзлівая засяроджанасць. Вецер зацята гарнуў па асфальце жоўтае, яшчэ свежае лісце і прыпячатваў да маіх штаноў, быццам маскіраваў мяне пад восеньскае ўбранне, зліваў у гэту мінуту з наваколлем, суладдзе якога мы ў радасці не прымячаем.

У парку на лаўцы сядзелі Пшонік і Ніна Альбуціна. Пшонік трымаў перад сабою разгорнуты свежы ружовафарбны штотыднёвік, а Ніна забаўлялася з букецікам жоўтага лісця, гладзіла яго асцярожна па самых кончыках, вострых, бы іголкі, падносіла да твару і зажмурвала вочы; хіталася, акурат спявала песню: яна любіла спяваць — сведчанне таго, што душа ў яе не драмала.

— Добры дзень! — павітаўся я.

Ніна падскочыла, пачырванела, ад чаго яе настылыя на холадзе шчокі ўзяліся дымчата-барвовымі плямамі, павіншавала мяне з дэбютам, здаецца, шчыра, без прыкрага салодзенькага фальшу, якім людзі часта прыкрываюць сваю зайздрасць. Пшонік яшчэ не паспеў, мабыць, нашаптаць ёй пра маё апавяданне, інакш яна, змагаючыся з сабою, змаўчала б, хоць таксама пісала нешта «для сябе», нават пасылала аднаму вядомаму пісьменніку свае спробы, якія той арыгінальна ацаніў — школьнымі баламі: 2, 3, 4, 5. Пра гэта мне расказала карэктар, сціплая добрая дзяўчына з вялікімі цёмнымі вачыма, пастаянны сум у якіх ці не гаварыў пра глыбокую меланхалічнасць яе натуры.

Пшонік адно глянуў на мяне паўзверх газеты, нахмурыў бровы, між якімі сядзела ладная, з кнопку, барадаўка, і зноў уталопіўся ў газету. Смехата! Чалавек жывасілам выціскае з сябе раўнадушша і да мяне, і да майго апавядання, каб я, крый бог, не падумаў, што ён зайздросціць. Дзівак, канечне. Быццам ніхто не ведае, што ён зайздроснік першай маркі; і ўсё ад сваёй журналісцкай пасрэднасці, якая, аднак, заўсёды ва ўсіх намерваецца на боскае прызнанне.

Скрозь ствалы таполяў і голыя зараснікі язміну я бачыў, як бліскалі на вуліцы аўтобусы і легкавікі. І ствалы таполяў блішчалі, як слюда, і бляск іх адбіваўся ў Пшонікавых вачах, як ні стараўся ён засланяцца газетаю.

Мы сядзелі, як чужыя; гаварылі з Нінаю пра цяжкі дзень панядзелак, калі трэба выпусціць газету за дзень, а не за два, як астатнія нумары. Яшчэ было б паўбяды, калі б у друкарні былі добрыя лінатыпісткі. Вопытная, трыццацігадовая прыгажуня Рыта Лагацкая пайшла ў дэкрэтны адпачынак (нарадзіла дачушку, і мы ўсе радаваліся, хадзілі віншаваць), а тыя дзве маладзенькія дзяўчынкі, што прыслала нам Мінскае вучылішча паліграфістаў, пакуль што больш і ахвотней усміхаліся адна адной і люстэркам, якія пастаянна насілі ў глыбокіх кішэнях халатаў, чымся дбалі пра набор. Радкі ў іх адліваліся марудна, клаліся ў латок наперакасяк; старонкі спярэшчваліся карэктарскім алоўкам нават і пасля першай праўкі.

І адно тады, як гаварыць не было пра што, Пшонік зняцяйкі сакануў мяне вачыма і едкім пытаннем:

— Навошта лухтой займаешся?

Усур'ёз браць да галавы Пшонікава пытанне я не мог, бо паказаў бы, што ў ім ёсць праўда і што яно мяне закранула, а па-другое, таптаў бы і сам тое кволае, што так ці іначай вырастала з маёй душы; і таму я засмяяўся, мабыць, так, як смяецца дарослы з дзіцячае наіўнасці, якая, аднак, прыносіць асалоду і ў адказ на сябе патрабуе сур'ёзнасці.

— Для каго лухта, а для каго, можа, і сэнс нейкі мае, — сказаў я скрозь смех, у напышлівай танальнасці слоў наўмысна пакідаючы месца для іроніі з сябе.

— Ды кінь ты!.. — Пшонік пляснуў газету побач на лаўку. — Каму гэта трэба? Пра ўсё ўжо даўно напіса-

на і перапісана. Класіку чытаць трэба, таварыш пісьменнік.

Калі б я ўлавіў у ягоным голасе хоць крышку сумнення, то яшчэ б паспрачаўся: пра самабытнасць чалавека, яго непаўторнае светабачанне, душу. Але Пшонік, адчулася зразу, сваю зацятасць безаглядна перанёс і на такую далікатную ды тонкую рэч, як літаратура, і я зразумеў, што думкі нашы разбягуцца ў процілеглыя тупікі.

Потым, праз некалькі гадоў, Пшонік, прачытаўшы ў тым жа штотыднёвіку крытычныя заўвагі па маёй аповесці, будзе сутаргава, як паралітык, бегаць па кабінетах і крычаць: «Га, што я гаварыў? Лухтою чалавек займаецца! Во глядзіце!..»

* * *

У канцы лістапада з рэдакцыі штотыднёвіка мне прыйшло пісьмо: прасілі прыехаць «для бліжэйшага знаёмства». Я доўга не думаў, ехаць або не; трэба ехаць. І я сказаў рэдактару пра свой намер, нават і блізка не падазраючы, што яму не проста будзе адпусціць мяне на адзін дзень — я адпрошваўся на пятніцу; і замінка была не ў тым, вядома, што мой «прагул» неяк пашкодзіць газеце, а ў тым, што рэдактара насцярожылі сталічныя запросіны, і ў іх яму бачылася ледзь не маё «дэзерцірства».

— Глядзі ж у мяне! — Рэдактар на развітанне шматзначна паківаў пальцам сваёй пухленькай ліласкурай далоні, поціск якой быў слабы, як у жанчыны ці ў чалавека, які па нейкай прычыне не хоча з табою вітацца і падае руку адно дзеля прыстойнасці.

Я ішоў па вуліцы і нічога не прымячаў вакол сябе: думкамі быў ужо ў Мінску.

Галіна Андрэеўна сядзела за сталом каля акна і вязала дзіцячыя шкарпэткі. Яна паглядзела на мяне, позірк у яе быў задуменны і як быццам трывожны.

— Еду ў Мінск, — сказаў я: ведаў, Галіна Андрэеўна не застанецца абыякавая да маёй паездкі. Яна і праўда затурбавалася, але ніяк не магла падступіцца да мяне з просьбаю: мусіць, яе стрымлівала думка, што мне і са сваімі клопатамі хопіць мітусні, дык навошта яшчэ і чужыя.

— Можа, вам што-небудзь прывезці? — спытаў я,

ідучы Галіне Андрэеўне на выручку, калі яна зноў — ужо каторы раз! — спынілася каля мяне. У яе вачах скакалі неспакойныя, нервовыя іскрынкі.

— А ці будзе ў вас час?

Мне не падабалася, з самага пачатку, што Галіна Андрэеўна, малодшы сын якой старэйшы за мяне на два гады, называла мяне на «вы»: мусіць, не толькі таму, што працаваў у рэдакцыі, да якой у людзей заўсёды бачыў шчырую павагу, але яшчэ і таму, што ад прыроды была інтэлігентная і далікатная, чаго не прышчэпіш чалавеку самым вытанчаным выхаваннем. Я бянтэжыўся, чырванеў, і гаворка не ладзілася, крышылася, бы сырая, непрапаленая цагліна.

— Будзе ў мяне час, не турбуйцеся, калі ласка...

Яна схадзіла ў спальню і прынесла папяровы пакунак, накрыж перавязаны белай капронавай ніткаю. Ён быў надзіва лёгкі, як ёлачная цацка, і ў ім нешта пераліўна, тоненька задзілінькала.

— Гэта дэфіцытнае лякарства. Перадайце, прашу вас, майму мужу, — сказала яна і падала мне паперку, — вось па гэтым адрасу.

Не ад цікавасці, а найперш з-за таго, каб паказаць, што адгукаюся на просьбу са шчырай ахвотаю, нераўнадушна, я разгарнуў паперку: «Бараўляны. Шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, палата № 8. Рубчэню Пятру Максімавічу». А каб яшчэ болей падмацаваць у Галіны Андрэеўны думку, што паездка ў Бараўляны не стане мне вялікім клопатам, сказаў:

— Ведаю, дзе Бараўляны. Пад Мінскам, у бок Лагойска...

Мабыць, я і праўда з такою жаданай хапатлівасцю лавіў кожнае слова Галіны Андрэеўны, што назаўтра яна, праводзячы мяне за весніцы, папрасіла яшчэ, каб я — зноў-такі, «як будзе час», — купіў ёй сітнага хлеба, «таго, што з кменам».

На вакзале ў Мінску было многа людзей — заклапочаныя; мітуслівыя; надзіва спакойныя твары. Стаяў густы, высокі гул. З паўгадзіны назад шчодра, па-восеньску ўладна прашумеў дождж, і прывакзальная плошча была мокрая, у спадзінах валавяна блішчэлі лужыны, веерам, імгненна, разляталіся, калі па іх жыгалі таксі, і гэтак жа хутка зноў збіраліся ў люстэркі шэрага, халоднага колеру — над горадам віселі нізкія збэрсаныя хмары.

— Перад будынкам чыгуначнага вакзала акуратна выстраіліся «Ікарусы», новенькія, чысценькія, аж зіхацяць, яны падобны нечым на фанабэрыстых галагуцкіх пеўняў; мабыць, чакаюць нейкую дэлегацыю ці экскурсію, бо за шклом на кожным аўтобусе нема крычыць надпіс: ХАТЫНЬ.

Па самой плошчы, на тратуарах, каля машын снуюць галубы; узлятаюць на дахі дамоў, а то хаваюцца ў душніках, якія нагадваюць суфлёрскія будачкі. Шкада, што з-за хмар не прабіваецца сонца, мне падабаецца, як пасля дажджу яно мядзяна палымнее ў вокнах шматпавярховых гмахаў, якіх у Рэпкавічах, на жаль, яшчэ не пабудавалі, калі не лічыць шасціпавярховых «карлікаў».

Яшчэ дарогаю спланаваў, што перш адвязу лякарства, а тады зайду ў рэдакцыю. Аўтобусы на Бараўляны, ведаў, адпраўляюцца з той пляцоўкі, што каля кас папярэдняга продажу білетаў. Пайшоў туды. Каля закратаваных акенцаў прысадзістага драўлянага будынка з белым шыферным дахам стаялі, як зазвычай, даўгія чэргі. Паўз нізкі металічны бар'ерчык тырчаць слупы з белымі чатырохкутнікамі — на іх чорнаю фарбаю напісаны маршруты. Адшукаў, прачытаў: на Бараўляны — 155. У чарзе на пасадку ўдакладніў нумар аўтобуса яшчэ раз. Чамусьці мяне заўсёды цягне некалькі разоў уверыцца ў тым, што, здаецца, і так ужо не сее ніякіх сумненняў. Але ўсё роўна здараюцца прыгоды. Ад такіх дробных, як, напрыклад, у сталоўцы: выберу сабе ў меню страву, а як дойдзе чарга да раздачы, якраз апошнюю порцыю перад самым носам забяруць. Дык вось, ад такіх дробных смехатворных прыгод і да самых абуральных: раз нехта са знаёмых трапіў п'яны ў міліцыю, а назваў маё прозвішча, і мне доўга давялося выблытвацца з гісторыі, пакуль нарэшце мяне «рэабілітавалі».

Зайшоў у аўтобус; каля самых дзвярэй было вольнае сядзенне — аднамеснае, атуленае ў белы чахол. Мне б скеміць, на што гэты чахол, не, пракампасціраваў талон і гупнуўся на сядзенне; палажыў на калені «дыпламат». Задумаўся, як зазвычай у дарозе, і раптам чую: «Асвабадзіця, гражданін, служэбнае месца!» Каля мяне стаіць чырванашчокая кабета з маленькаю, як дзіцячаю, сумачкаю праз плячо і круціць на драцяным абручыку ружовыя рулончыкі білетаў. Кандуктар!

І як я зразу не здагадаўся, што гэта «начальніцкае» сядзенне? Дзіўная псіхалогія ў чалавека: дай маленькую ўладу, тут жа робіць усё, каб не ўроўніваць сябе з астатнімі, хоць крэслам, але выдзеліцца.

Купіў білет — талоны, аказваецца, на гэтым маршруце не маюць сілы — і перабраўся на задняе сядзенне, дзе якраз каля акна было яшчэ вольнае месца.

На прыпынку «Камароўка» людзей падбавілася, і дзядзька з двума лазовымі кошыкамі, убіўшыся на сядзенне, прыціснуў мяне так, што я не мог паварушыць рукою. Дзядзька быў тоўсты, няголены, у ватоўцы і замасленых штанах, а кошыкі, якія ён трымаў аберуч за дужку, пахлі яблыкамі і, спрэс утыканыя саломінкамі, былі падобны на кацінае мурло.

Класічны гандляр, падумалася пра дзядзьку. Але ж стаяць за гандлярскім сталом і не такія, а інтэлігентныя з выгляду мужчыны — прасветленыя твары, негрубыя рукі, правільныя словы, чыстая кашуля, гальштук. Я не столькі гэтым людзям здзіўляўся, колькі імі абураўся: што прымушае іх прыніжацца (іначай не скажаш), стаяць, лісліва заглядваць у вочы, махаць рукамі, зазываючы на свой тавар пакупнікоў; і самае горшае тут—што не з-за ласкі яны ідуць на такое, а з-за хцівасці сваёй, якая, можа, як ні што іншае забівае ў чалавеку дабрачыннасць.

Адвярнуўся да акна, за якім імчалася з хуткасцю аўтобуса (толькі ў адваротным напрамку) восень: сухая, жорсткая трава, стаптаная капытамі кароў, адналькава зжаўцелыя дубкі і бярозы ўскрай узаранага чорнага поля, што злучалася ўдалечы з палоскаю сіняга, дзіўна празрыстага небасхілу. Іншы раз мне, растрывожанаму ўяўленнем, хацелася паляцець на крылах туды, за празрысты, сіні далягляд, каб убачыць на свае вочы, што малюе фантазія і ці ёсць якая-небудзь у яе мяжа?

Мой позірк зняцяйкі абарваў аўтобус — адзін, другі, трэці... Тыя, што стаялі на прывакзальнай плошчы, з надпісам: ХАТЫНЬ. У вокны відаць: замежныя турысты. Дзіву даешся, калі чытаеш і чуеш, што там, за кардонам, зусім мала ведаюць пра нас, савецкіх людзей. Няўжо тыя, што прыязджаюць (во як гэтыя), не могуць разнесці па ўсім свеце праўду аб нашай краіне, яе міралюбнасці, аб яе жаданні сябраваць з усімі сумленнымі людзьмі планеты? Што ім не дае, чужы

светапогляд ці раўнадушша, урэшце боязь? А можа, проста іх, відавочцаў, так мала, што іх праўдзівае слова, як тое воблачка пылу, бясследна растае над мільёнамі задурманеных прапагандысцкай хлуснёю галоў?

...Аўтобус спыніўся на заасфальтаваным пляцы, перад вышыннымі белымі, як папера, дамамі.

— Ці не падкажаце, дзе шпіталь інвалідаў вайны? — спытаў я ў жанчыны-кандуктара і акурат напомніў ёй пра абавязкі. Яна спешна, ужо ў спіны людзям, што цясніліся, выходзячы, каля дзвярэй, аб'явіла:

— Каму ў абласную бальніцу і гошпіталь — злазце!

У тых вышынных белых, як папера, дамах — падказвала шэрая пліта-шыльда з літарамі серабрыстага бляску — была абласная бальніца.

— Шпіталь, — падказаў мне дзядзька ў скураным чорным паліто і брылі, — трохі далей, ву-у-унь за ляском.

Я пакіраваў туды па шырокай пясчанай дарожцы, паўз якую цесна, бы на парадзе, стаялі сінія, белыя, чырвоныя, жоўтыя легкавушкі, і ні ў адной з іх не было людзей. Лясок аказаўся ельнікам, густым, высокім, але надзіва чыстым, як падмеценым: ні табе галінкі, ні табе сучка. Зямля ўсыпана жоўтай сухой бліскучай іглі-цаю, на якой ляжаць чорныя шышкі — маленькія натапыраныя вожыкі. Столькі шышак я ніколі ў жыцці не бачыў, хоць і вырас у лесе, хадзіў па ельніках, нават па ялугах, як называюць у нас густую, непралазную чмурэчу. На дне акопаў, што захаваліся ад вайны, шышак было аж чорна, акурат выпнуў калматую спіну буры мядзведзь. Адна шышка сарвалася з яліны, стукнулася ў горбік зямлі і скацілася ў акоп, быццам гільза да гільз, той і розніцы, што — без дыму і ціха, не звякнула.

Ад усіх гэтых колераў і гукаў міжволі трывожна станавілася на сэрцы, у галаву ўпарта лезлі думкі аб мінулай вайне і яе ахвярах; пра тое, што наш неспакойны ядзерны век таксама азмрочаны халодным дыханнем злых сіл за акіянам.

Мяне заўсёды трасе ад слоў «бойка», «бой», «забіваюць». Наіўна, канечне, але мне іншы раз здаецца, што чалавека няможна забіць. Чалавек можа памерці, калі аслабнуць лёгкія, печань, сэрца, ныркі, але забіць яго няможна. Я не ўяўляю, як можна жывасілам спыніць сэрца. Хіба яно не будзе працаваць нават тады, калі

чалавек увесь зранены? Яно ж заўсёды і ва ўсіх выпадках выручае чалавека. Можа, і ў наіўнасці ёсць доля сэнсу?

Я, мужчына, чалавечае дзіця, чые далёкія продкі хадзілі на мамантаў, бізонаў, ільвоў з дзідаю і каменем, за сваё жыццё яшчэ нікога не ўдарыў, не крануў пальцам, хоць не скажу, што прырода пашкадавала мне сілы: у дзяцінстве, калі была завядзёнка барацца (на выгане, у двары, проста на пяску на вуліцы), я лажыў на лапаткі старэйшых ад сябе хлопцаў. А вось біцца...

Ужо быў жаніхом, на танцы ў суседнюю Дабранку пайшлі, дык мясцовыя блазнюкі здуру намыслілі напалохаць нас, малінаўцаў, і перастрэлі з друччам у руках. Як я ляцеў, не дарогаю, праз балота, дахаты. Абадраўся, абрасяніўся, валасы растрэпаныя. Маці, убачыўшы мяне, аж крыкнула. Я расказаў ёй, не скупячыся на самыя жахлівыя словы, што здарылася. Маці глядзела на мяне з жалем і спачуваннем, а мне хацелася, каб яна яшчэ і прытуліла да сябе, як маленькага.

Я не ведаю, хто я такі, але і хлюпікам сябе назваць не магу, мабыць, мая істота не хоча прымаць бессэнсоўныя бойкі і рызыку.

Неяк было на «ваенцы»... Кідалі мы гранаты на палігоне, сапраўдныя, баявыя, РГД-5. Першае аддзяленне выйшла на агнявы рубеж, астатнія заселі ў траншэях. Скажу праўду, жудасна чуць нават сам выбух: як ад перуна заканапачвае вушы, а пыл, а дым... Нам не па сабе, нервуемся — баявая граната. Хлопцы па адным, з гранатаю ў руцэ і аўтаматам на грудзях, ідуць наперад — наступаюць. Па камандзе афіцэра-выкладчыка кідаюць гранату ў «варожы» акоп (з яго чучала тырчыць) і не лажацца на зямлю, а з крыкам «ура» бягуць у атаку; прыкрываюць прыкладам ніз жывата, згінаюцца — на галаве каска.

І раптам адтуль, з пярэдняга краю чуем: «Параніла!!!» Твары ў хлопцаў імгненна сталі белыя, у вачах застыў жах. Сумяція. Воханні. У мяне таксама халадок па спіне слізгануў. Але і тады, калі прыбег пасыльны і сказаў, што «нікога не параніла, а толькі прасекла асколкам бот», ніхто не асмеліўся выходзіць на агнявы рубеж: хто ў зямлю глядзеў, хто ў неба, адзін, моднік факультэцкі, люстэрка дастаў і ўнурыўся ў яго. Я дык — дзіва! — на зялёнага чарвячка загледзеўся: з

жоўценькай галоўкаю і рудымі макулінкамі вачэй, ён грыз травінку, адмыслова выразаў сківічкамі ўзоры на ёй. Дыхнуў вецер — чарвячок упаў у траву, і тут аднекуль рашучасць у мяне з'явілася, ускочыў я на бруствер.

Афіцэр-выкладчык паглядзеў на мяне з павагаю і даў гранату. Я вырваў у ёй кальцо і, прыціскаючы сутаргавымі пальцамі вузенькі белы рычажок, пайшоў у «атаку». Назад варочаюся, бачу, хлопцы галовы паднялі з траншэй. Першы, ён усягды рызыкуе болей, чымся тыя, хто следам ідзе, хаця фартуна іншы раз усё блытае.

Гэту яловую і пачуццёвую змрочнасць вобміг рассеяла пранізліва-белая яснасць, што ўдарыла шквалам у вочы, як толькі я выбраўся з лагчыны і ўзышоў на пагорак: сонца вырвалася з-за хмар і асвяціла ствалы ялін, скрозь якія віднеліся пабудовы і голае, нейкае фіялетавае (пясок такі, ці што?) поле. На правую руку ад мяне гарэў агонь, каля яго стаялі-хадзілі мужчыны ў сініх халатах, смяяліся; кідалі ў агонь ламачча, і тады ўверх шугалі салюты чырвоных іскраў. Ад гэтае людское бесклапотнасці, ад гэтых чырвоных іскраў зразу пацяплела і мне.

Па краі, на ўзлеску стаяла шмат альтанак з круглымі, як грыбы, сталамі і доўгімі лаўкамі, пафарбаванымі ў тонкі, блакітнаваты колер, акурат нешта несур'ёзнае, дзіцячае.

Сам будынак шпіталя быў змрачнаваты на выгляд, цагляна-руды, і толькі апошні, шосты паверх і аднаскатны дах — нясцерпна белыя, і, можа, таму на антэне і на краі страхі, падшытай латочынаю для сцёку вады, я ўбачыў галубоў: іх было шмат, як і на вакзале, але сядзелі яны ціхамірна, паклаўшы на шыфер раздзьмутыя ліловыя валлякі, акурат адчувалі, разумелі, што тут іх ніхто не настрашыць і што яны ў поўнай бяспецы.

Прасценкі двух ніжніх паверхаў густою калматаю коўдраю акрываў хмель. Лісце яго, цяпер калінава-барвянае, мала рознілася ад колеру сцен. Праз вокны, з расхінутымі на бакі белымі фіранкамі, відаць былі ў палатах людзі.

Невысокую мураваную абгароду ўвенчвалі тугія

пірамідкі ядлоўцу. Ён быў зялёны, з блакітнымі бусінкамі ягад. Я спусціўся па сходцах, умошчаных гладкім бліскучым каменем.

У двары стаяў нізенькі, абліцаваны блакітнаю кафляю, зрубчык. У ім была вада, з яе тырчала гіганцкая, мусіць, болей метра, самаробная ракавіна, пазней я выпадкова даведаўся, што яе вылепіў інвалід, настаўнік з Магілёўшчыны. Я спыніўся каля зрубчыка. Ракавіна, здалося, шумела, як мора. Потым зразумеў, яна і праўда адзываецца на вецер. Вада ў зрубчыку была светлая, як сляза, на дне вырысоўваўся кожны каменьчык, бледна-зялёныя лісцікі, што ссыпаліся з кустоў ніцае вярбы і былі падобныя на печкуроў, якія вельмі любяць чыстую ваду і камяністае ці пясчанае дно.

Дзверы ў шпіталь былі шкляныя, і яшчэ з ганка я ўбачыў у фае бледна-ружовыя кубачкі цюльпанаў, што раслі на квадратнай клумбе, абкладзенай з усіх бакоў буйным палакіраваным сіняватым гранітам. Пах стаяў у фае не бальнічны, а чысты, свежы, і гэта мяне здзівіла не меней, чымся трохі пазнейшае: што да сцен у калідоры былі прымацаваны ёмкія дубовыя парэнчы, на якія чамусьці карцела абаперціся рукою.

Звычайна чуццё не падводзіла, а тут падвяло, як назнарок: шукаючы палату, я павярнуў не ў той бок калідора, доўгага і прамога, бы тунель. Маім цывілізаваным, спешчаным прыгажосцю і гармоніяй вачам адкрылася ўражлівае відовішча. Скрозь па калідоры сядзелі, ляжалі, хадзілі, стаялі, поўзалі людзі. Без рук, ног, вачэй, носа, вушэй; сагнутыя ў крук ці пахіленыя ўбок з такім заломам, што рука даставала падлогу; некаторых везлі на калясках, а то неслі на насілках як нежывых.

Міжволі я параўнаў іх, калек, з лесам, у якім доўга круціла, шалела бура. Спіна ў мяне зашэрхла ад халодных колікаў. Сцяты, я асцярожна, бы ў спляценні электрычных правадоў, ступаў па калідоры. Мне было няёмка і сорамна за тое, што я, малады, здаровы, апынуўся тут, сярод нямоглых, скалечаных людзей, інвалідаў: «белая варона», я, канечне ж, кідаўся ім у вочы, і ад таго іх доля, здавалася мне, станавілася яшчэ пакутлівей і бязрадасней.

Раптам нехта няўпэўнена крануўся мае рукі, нечым халодным, як ледзяшом. Я павярнуўся і перш ўбачыў чужую руку, белую, худую, з сінімі крывымі венамі,

потым — самога чалавека. Не містычнага, не ўяўнага, а рэальнага чалавека. Глядзі, глядзі!.. Не адварочвайся. Перамажы сябе! Нейкі цвёрды нутраны голас дыктаваў мне сваю волю, і я адчуваў, што падпарадкоўваюся яму.

Чэрап у чалавека быў нейкі плоскі, жоўты, сухі, як струк. Замест вачэй зеўралі ружовыя глыбокія ямкі з вузялкамі-папурышкамі, падобнымі на сухія, зморшчаныя гарошыны; носа няма, а толькі дзве прадаўгаватыя дзіркі.

— Хадзі, чалавек, сядзем, раз ужо трапіўся пад руку, пагаворым, — голас быў адрывісты, нежывы, акурат вымаўляў яго не чалавечы артыкуляцыйны апарат, а халоднае нутро металічнага камп'ютэра. — Дзе тут на што сесці? Я не дачакаўся нянечкі, каб вывела... Мне знадаела ўжо быць у цёмнай магіле, ні святла, ні сонца, ні кветак, ні людзей... Нічога няма. Я хачу да людзей, я расказваю ўсім, як здзекаваліся з мяне фашысты... Мне часта даюць укол, і я доўга сплю. А я не хачу спаць, я прачынаюся і зноў за сваё... Я напісаў пра гэта ў газету.

Ногі ў мяне адзеравянелі і не гнуліся, калі я садзіўся на шырокую, мяккую, нізкую канапу побач з чалавекам.

— У баі пад Смаленскам мяне цяжка параніла, — праз сілу шаптаў мне чалавек, і холад яго рукі ўжо студзіў мне локаць. — Ляжаў беспрытомны... Наш узвод адышоў на новы рубеж. Мяне схапілі звяры-людаеды і кінулі ў хлеў... А тады ўкінулі яшчэ аднаго зраненага чырвонаармейца. Мы абодва падплывалі крывёю... Нас білі прыкладамі па руках, калі мы хацелі перавязаць адзін аднаго шматамі сваіх кашуль... Смага мучыла нас, але нам не давалі піць. На нашых вуснах тушылі недакуркі... Дзяржалі цэлыя суткі, потым прынеслі памыі і выпілі ў свіное карыта. Упусцілі вепрука... Ён стаў хламкаць. І нас падцягнулі да карыта, утапілі галовы ў памыі... Памыі былі халодныя, і мне стала лягчэй. Потым вепрука выгналі, а хлеў падпалілі... Я задыхнуўся ў дыме і больш нічога не помню... — Чалавек гаварыў, і ніводная мышца не варушылася на ягоным твары, адно каля вуснаў дробненька моршчылася знявечаная, абпаленая скура. — Але я выжыў, мяне выратавалі мясцовыя людзі... Я выжыў, каб расказаць

табе, а ты запомні гэта, ты... — цвёрдыя, кашчавыя пальцы сцялі мой локаць.

Мне? Пры чым тут я? Мне здавалася, што са мною размаўляе сама смерць: вылезла з глыбокай сырой магілы ці спусцілася з таямнічай вышыні і размаўляе. Што? Што за крык? Адкуль крык? Па калідоры бегла маладжавая тоўстая нянечка, каб — было відаць — напусціцца на мяне.

— Я ні пры чым. Я толькі сеў, — сказаў ёй наперад.

Яна глянула на мяне, як на дзівака, узяла на рукі чалавека і панесла, бы хлапчука.

Скалечаных людзей я бачыў і раней. На вуліцы, у аўтобусе, на вакзале, у ліфце, нават у лазні. Дый бацька мой, удзельнік Сталінградскай бітвы, таксама інвалід. Тут, сабраныя разам, яны ўражвалі не тым, чым звычайна — што ў некага не было рукі ці нагі, а нечым іншым. Тое, што за ім стаяла, выклікала ў мяне пашану, гордасць за іх, гэтых мужчын, самаахвярных людзей-франтавікоў.

Я забыўся, што трэба выглядаць на дзвярах нумары, і адно як натыкнуўся ў канцы калідора на словы Сямашкі, напісаныя мала не метровымі чырвонымі літарамі: «Тот, кто курит, вредит не только себе, но и окружающим!» — схамянуўся; павярнуў назад.

Насустрач ішла жанчына ў белым і вяла за руку маленькую дзяўчынку з блакітнавокаю лялькаю ў руках. Я заглядзеўся чамусьці на дзяўчынку і на ляльку, хоць падумаў, што трэба спытаць у жанчыны, дзе палата № 8. У дзяўчынкі былі вялікія блакітныя, як і ў лялькі, вочы, пухнатыя, гладзенькія шчочкі аж падрыгвалі пры кожным кроку; расчасаныя «пад дарослую» даўгія мякка-льняныя валасы спадалі ёй на грудзі двума ручаямі. Дзяўчынка была вельмі сур'ёзная і засяроджаная. Па тым, з якім раўнадушшам ішла побач з ёю жанчына, я зразумеў, што яна — не маці, хутчэй знаёмая ці сваячка; а ідуць яны, мусіць, да дзеда гэтай дзяўчынкі. Пакуль я думаў-гадаў, жанчына з дзяўчынкаю апынуліся ў мяне за спінаю. Крычаць услед ці даганяць я не стаў, пайшоў далей, ужо з большаю пільнасцю прыглядаючыся да нумароў на дзвярах.

На сценах віселі плакаты, дошкі афіцыйных аб'яў; каля міжгародніх тэлефонаў-аўтаматаў стаяла чарга.

Не ведаю, ці званіла яму Галіна Андрэеўна, што я прыеду, ці апісвала мяне, але ён зразу здагадаўся, што

я шукаю яго. Ён стаяў на калідоры каля дзвярэй, прыхінуўшыся спінаю да сцяны, і мяне спынілі яго вочы, яны глядзелі ва ўпор, з нейкаю зычліваю ўсмешлівасцю. І не пра тое, што чалавек бязрукі, перш падумаў я; у вока кінулася, што чалавек быў зусім лысы, як і той, якога толькі што слухаў на канапе, — жоўтая круглая галава адлюстроўвалася ў драўлянай панелі, якімі абліцаваны тут, у гэтым крыле, сцены.

— Добры дзень! Вы — Пятро Максімавіч Рубчэня? — спытаў я, усё яшчэ дзівячыся з таго, што і па сённяшні дзень застаецца для мяне загадкаю: няўжо прырода пайшла насустрач чалавеку, аблысіўшы яму нашчэнт галаву і шчокі? Твар у чалавека таксама быў чысты, голы, ані шчацінкі, як і галава, здаваўся вылепленым з бела-мучнога, бліскучага цеста. Сам чалавек не змог бы ні прычэсвацца, ні галіцца, а прасіць некага нават адзін раз у дзень, мабыць, было б не так проста.

— Я, я! — выгукнуў чалавек, акурат баючыся, што праміну яго; кіўком галавы запрасіў мяне ў палату; наказаў падбародкам, каб садзіўся на ложак, а сам сеў на крэсла і адно тады выставіў мне абрубак правай рукі, схаваны ў шырокім рукаве халата, і я здагадаўся яго паціснуць, адчуў пальцамі тонкую, бы кій, халодную косць.

Пятро Максімавіч увесь час усміхаўся, а можа, ён проста быў усмешлівы ад бляску скуры на шчоках, ілбе, маладых пранізліва-сініх вочак. Іменна «вочак», хоць і не кладзецца гэта дэталь у партрэт мужчыны, скалечанага вайною салдата, але ж і праўда: вочы ў Пятра Максімавіча зусім маленькія і сіненькія-сіненькія, быццам дзве зорачкі свежых, расяных з начы незабудак.

Я выняў з «дыпламата» пакунак і паклаў на засланую белай сурвэткаю тумбачку.

— Дзякуй! — Пятро Максімавіч дакрануўся да пакунка абрубкам рукі — пусты астатак рукава лёг на тумбачку.

Палата была прасторная, у ёй стаялі два ложкі. Кароткія белыя фіранкі на вокнах давалі сонцу волю, і яно гуляла з вадою ў графіне, з нікеляванымі шарыкамі на білах ложкаў, матавым плафонам, што аж іскрыўся, чыста вымыты, пад столлю, нарэшце з дзвярною пластыкаваю ручкаю ў форме экзатычнай кветкі.

У палаце мы былі адны, і гэта спрыяла нашай гаворцы, ва ўсякім выпадку ёй ніхто не замінаў. Тое, што

Пятро Максімавіч паводзіўся вольна, спакойна, хутка зняло з мяне здранцвеласць. Я першы адкрыў яму сваю душу. Але так і не зразумеў, ці то яму і праўда было цікава ведаць пра мяне, кватаранта, супрацоўніка рэдакцыі, ці яго ўніклівасць падпадала пад звычайную логіку — ахвотна размаўляць з тым, каго аніяк не хочацца крыўдзіць і адзінаю ўдзячнасцю да якога пакуль можа стаць прыязнасць да яго.

Паспрабую перадаць словамі тое, што пачуў ад Пятра Максімавіча.

* * *

...Трава паўз дарогу была запыленая і выядала вочы сухою шэрасцю, на якой там-сям бяleліся акуратныя гурбачкі пяску. Сіне свяціла сонца, і над свежымі, адно белаватымі па краях варонкамі дрыжала паветра. Як макароніны, тырчалі з зямлі аголеныя карані. Каля чорнай, з жоўтым лісцем на вярхушцы бярозы ляжала дагары пакарабачаная кабіна паўтаратонкі з пустымі фарамі.

Гэта была дарога вайны, па якой нашы войскі пагналі назад, на захад, фашысцкіх недабіткаў і па якой ішоў цяпер адзінокі салдат з лёгкім рэчмяшком за плячыма.

Салдата звалі Пятро. Пот сцякаў па яго скронях і пакідаў на скуры на шчоках дзве цёмныя няроўныя ніткі, якія злучаліся ў адну каля самага падбародка. Вочы, у трэшчынках маршчын, хавалі ў сваім пранізлівым блакіце тугу і боль.

Дарога была пустэльная, адно праляцела нязграбна, неяк бокам, брудная бясхвостая сарока. Калі далячынь стамляла вочы, салдат абыякава глядзеў на збітыя мысы сваіх ботаў.

Схамянуўшыся, ён убачыў сябе сярод чэзлых, невысокіх, шэрых алешын і зразу адчуў тварам свежасць, ад якой па нагах мляўка разлілася слабасць.

Пятро спыніўся, параўняўшыся са сцежкаю, што роўна адбягала ў кусты. На лбе востра прасекліся глыбокія складкі. Пятро аблізнуў запечаныя губы, збочыў на сцежку. Вочы ўважліва счытвалі з няроўнасцей мяккага чарназёму даўнішнія сляды, утаптаную сухую траву і круглыя глыбокія адбіткі конскіх капытоў, тамсям зацягнутых белаю, бы марля, павуцінаю, разлезлыя недакуркі...

«Эх, закурыць бы зараз!..» — уздыхнуў Пятро і з жалем падумаў пра пачак махоркі, які ўсунуў яму ў рэчмяшок — на развітанне — сусед па шпітальным ложку, жвавы чарнавокі грузін Зурык.

Пятро паскорыў крок, адганяючы ад сябе назойлівую думку пра курэнне. Жывым глыбокім шклом бліснуў спераду лапік вады ў абтаптанай з усіх бакоў спадзінцы. Пятро бег да яе, прагна каўтаючы вязкую сліну і моршчачыся.

На сагнутым, як лук, ствале вінтоўкі вісела сржавелая бляшанка з адагнутым верхам, і салдат на нейкі момант зачапіўся за яе непрытомным позіркам. Ён апусціўся перад крыніцаю на калені і, не здымаючы рэчмяшка, цяжка ўпаў на грудзі. Піў, схаваўшы твар у вадзе. З гімнасцёркі адвіслі медалі і пазвоньвалі ў такт глыткам. Прыпадняў галаву, каб аддыхацца, і з падбародка спачатку цурчэла, а потым капала ў крыніцу вада. Вільготна было каленям і грудзям. Салдат бачыў на дне чыстыя махры карэньчыкаў і мяккі пульсачык у рудаватым спакойным глеі. Зноў пахіліў галаву ўніз, стараючыся кранацца вады аднымі губамі, — напіналіся на шыі жылы. Зняможана адкінуўся на бок, падцягваючы да жывата калені. Выгнуўся і стаў на ногі, яго хіснула, у вачах паплылі зялёныя кругі. Ён зрабіў некалькі няўпэўненых крокаў і сеў на траву, нечакана мяккую, як вата, тут, у забалаці.

Яснеў позірк і выплывалі, выразна праяўляючыся, абрысы вольхі, сіратліва згубленай сярод іх бярозкі, густога купчастага ядлоўцу, порсткай зялёнай асакі.

Блізка ад сябе Пятро ўбачыў жоўтую чыстую кветку лотаці. Кашлатае лісце глянцава льснілася. Пяшчота зварухнула Пятрову душу, і яму стала цёпла, як ад сонца, усяму — галаве, грудзям, спіне, нагам... Ён падышоў да кветкі, доўга ўглядаўся ў яе, у кожны пялёстак, сіняватыя рысачкі на ім, у кожную цнатліва стоеную з тупым кончыкам тычынку. Потым прысеў, чуючы біццё сэрца, і дакрануўся тварам да лотаці — халаднаватыя пялёсткі мякка пагладзілі яго, як ласкавая рука. Пятро доўга нёс на агрубелай скуры гэты лёгкі, як пух, дотык. І тады, калі зноў ішоў дарогаю і яму нясцерпна хацелася курыць.

Вячэрні змрок узрадаваў салдата далёкімі рэдкімі агеньчыкамі. «Нарэшце!..» — выдыхнуў ён, думаючы, што агеньчыкі — гэта і ёсць той раўцэнтр, дзе спыня-

юцца паязды. Хацелася пабегчы, ды хутчэй, чым ішоў, не ішлося: ногі валакліся, як чужыя.

Дарога вывела чамусьці на ўскраіну горада, на аблогу. Пятро спярша пачуў цёплы смярдзючы пах шпал, потым наткнуўся на рэйкі, папраставаў збоч іх, мяркуючы выйсці зразу да станцыі. У падэшвы няроўна ўпіраўся і хрупаў пад імі, як сухія ракавінкі, каменны друз.

Будынак станцыі, пляскаты, даўгі, прыпадаў да зямлі, як паранены ў ногі звер. Па пероне хадзіў чалавек з мятлою і падбіраў у тачку для перавозу багажу кавалкі цэглы. Каля ўвахода вісеў ліхтар і слаба асвятляў разбіты круглы гадзіннік.

У пачакальні было каля дзесятка людзей. На клунках сядзелі дзеці. Адно акенца касы свяцілася, ды каля яго нікога не было, і Пятро зразумеў, што сесці на цягнік тут мала надзеі. Але ўсё-ткі падумаў, што не лішне будзе спытаць у касіркі (ужо змеціў: пажылая сівагаловая жанчына), як дабрацца яму да Масквы. Касірка, не падымаючы галавы ад журнала, у якім поркалася кароткім хімічным алоўкам, адказала абыякавым голасам:

— Калі і будзе ваш поезд, дык толькі праз тры дні.

Пятро, хоць і наладзіўся на такі адказ, уздрыгнуў і ўнурыўся ў акно — знадворку яго шчытна засланіла цемра.

— Вы, салдат, мабыць, са шпіталя? — зноў пачуў Пятро голас касіркі.

— Так точна! — ён надзіва жвава павярнуўся.

— Ёсць распараджэнне такіх, як вы, накіроўваць у райком камсамола: вуліца Інтэрнацыянальная, 29.

Адно аддаліўшыся ад станцыі, Пятро спахапіўся, што не распытаў, як знайсці Інтэрнацыянальную вуліцу, і што не закурыў там, у пачакальні. Пайшоў наўздагад, спадзеючыся каго-небудзь тутэйшага сустрэць. Стары згорблены чалавек у чорным да калень пінжаку прашмыгнуў міма, не адказаўшы на прывітанне. Не ведала адраса і жанчына, якая несла ад калодзежа ваду і сама спынілася перад салдатам, сказала:

— Повезет вам — с полными ведрами!..

Перасекшы яшчэ дзве вуліцы, Пятро натрапіў на маладую пару, што, гарэзуючы, наравіла даўжэй пабыць у густой цемры пад клёнам.

— Праскочыў, таварыш франтавік, — ахрыплым го-

ласам сказаў хлопец, не зводзячы вачэй з Пятра і туля-чы да сябе дзяўчыну. — Гані квартал назад і каля разбуранага дома зварочвай направа — і прама. Насупраць таполевага парку — райком.

Будынак райкома Пятро ўбачыў раней, чымся парк: свяціліся тры акны на першым паверсе, і з расчыненых напята дзвярэй коса падала на тратуар святло. Воддаль — напроці — бязважкаю глыбаю чарнела сцяна таполяў, засланяючы ўсеянае скупымі зоркамі неба.

Ён зайшоў у кабінет, піхнуўшы ад сябе дзверы, і здзівіўся, убачыўшы за сталом дзяўчыну. Ёй было гадоў дваццаць пяць, а можа, меней: шырокі твар, вузкі высокі лоб, хвалістыя густыя валасы, якія, хоць і кароткія, нізка цямнеліся на скронях.

Пятро павітаўся, пачуўшы ў адказ густаватае рускае «здравствуйте».

— Мяне паслалі да вас з чыгуначнай станцыі.

Дзяўчына пільна паглядзела на яго, і ён убачыў чырванаватыя бялкі яе дзіўных зялёна-сініх вачэй.

— Сядайце, калі ласка, расказвайце.

— Я вяртаюся са шпіталя... дамоў, ды няма во поезда... Ад правадніка я адмовіўся...

— Зразумела. Патрэбен начлег і харч... Двое-трое сутак? — Дзяўчына, не адрываючы вачэй ад яго, Пятра, нахілілася да сейфа, адчыніла маленькія квадратныя дзверцы з Т-падобнаю ручкаю і выняла стосік паперак, сціснутых насярэдзіне гумкаю. Пятро разгублена кіўнуў галавою і сеў на крэсла, абцягнутае выцертай да нітак матэрыяй. На сцяне віселі партрэты Леніна і Сталіна, палітычная карта свету і схема чыгуначных шляхоў; на падаконніку стаяў вазон альясу з адстрыжанымі цвёрдымі лістамі, утыканымі жоўтымі калючкамі.

— Вось вазьміце дакумент на харч, а з начлегам... хвілінку. — Яна зняла трубку тэлефона, набрала нумар.

— Сцяпанаўна? Гэта Дамарадава. Прыбыў чарговы, — мякка ўсміхнулася, — гаротнічак... Як бы яго там утачыць куды-небудзь. Нават калідоры, кажаш, забіты? Ага, колькі той гасцініцы... Правае крыло яшчэ не адрамантавалі?

Пятро сядзеў нерухома, як мёртвы.

— Так-с!.. — Дзяўчына паклала трубку, забарабаніла па стале пальцамі, гледзячы ў цёмнае акно. Павекі, нават прыплюшчаныя, не хавалі чырванаватых бял-

коў. Пятро сцепануў плячыма, адчуўшы тугія лямкі рэчмяшка, — тонка дзынкнулі медалі.

— Вы не хвалюйцеся, — сказаў Пятро нясмела, — я пераначую на станцыі... Там свабодна, людзей няшмнога. І ведаю, як знайсці.

— Вы, мабыць, даўно не елі? — спытала дзяўчына, бачачы ў цёмнай шыбе Пятроў адбітак. Пятро чамусьці густа пачырванеў, ды ў шыбу гэтага не было відаць.

— Са шпіталя я выбраўся ўчора... Мне далі паёк, ён у рэчмяшку, але... Дарогаю піў ваду, праўда...

Дзяўчына рэзка павярнула да яго твар, і ў яе расшыраных зялёна-сініх вачах ён убачыў спачуванне. Сцяўся, аж здалося: ножкі крэсла ўплішчыліся ў падлогу.

— Ужо другія суткі толькі вадою і жывіцеся, выходзіць? — сказала як не шэптам, ад якога ў Пятра пацяплелі вочы. — Вам трэба папраўляцца, а не худзець... пасля ранення, — працягвала ціха дзяўчына, перавёўшы позірк з шыбы на яго, Пятра.

— Я прывык ужо галадаць, — сказаў ён, злуючы на сябе, што ў голасе здрадліва прарываецца чуллівасць.

— Цяпер вы на маёй адказнасці, і я павінна думаць, куды вас уладзіць, каб вам было добра і зручна. — У голасе дзяўчыны паявілася цвёрдасць. Пятро адчуў яе, і яна яго закранула.

— Я не прывык на фронце да пяшчот, — сказаў ён, нервова сціснуўшы зубы.

— Калі ласка, не хвалюйцеся, — голас у дзяўчыны зноў памякчэў, — я разумею вас... разумею, што вы шмат перажылі. Вам цяжка...

Пятро ўздыхнуў і апусціў галаву.

Дзяўчына ўстала з-за стала. Яна была высокая, з крутымі плячыма. Скрыжавала рукі, і на грудзях напялася бэжавая кофта з прышпіленым да кішэні камсамольскім значком.

— У гасцініцы месц няма. Сталовая ўжо зачынена... — Дзяўчына стаяла тварам да Пятра і ледзь пахітвалася ў бакі, відаць, несвядома, ад задуменнасці. — Ёсць адно выйсце... — У голасе чулася няўпэўненасць.— І вам нічога не застаецца рабіць, як згадзіцца з маёй прапановаю. А заўтра будзе відаць...

— Што вы збіраецеся мне прапанаваць? — спытаў Пятро так, быццам яго змушалі на непрыстойны ўчынак.

— Вы пераначуеце ў маёй гаспадыні, — сказала яна адрывіста і цвёрда. — Месца знойдзецца. Наперадзе ноч, і вам няма, фактычна, куды ісці. Вы даўно без яды...

Пятро падхапіўся, бунтуючы ўсёй сваёю постаццю, ды яна асадзіла яго мяккім упартым позіркам, і ён зняможана гупнуўся на крэсла. Зноў, ужо каторы раз за дзень, падумаў пра пачак махоркі ў рэчмяшку.

— Я зараз, — яна рашуча ступіла да тэлефона, і яму было чуваць, як журчыць нумарная катушка. — Валечка! Галя турбуе цябе. Змяні мяне, калі ласка, раней... ага, трэба. Цяпер-цяпер. Ну чакаю!

...Яны ішлі ў цемнаце наводдалі. Пятро глядзеў увесь час перад сабою, акурат нешта замінала павярнуць галаву ў левы бок, з якога падладжвалася пад яго шырокія крокі Галя. Яны адчувалі сябе няёмка абое, ды скупая размова, што няўмела вязалася між імі, паслабляла гэтую няёмкасць.

— Дык вам у Беларусь... З Беларусі, значыць?

— Ага, з Беларусі!.. — узрадавана адказаў Пятро.

— А я з Тамбова, інстытут канчала там, потым настаўнічала ў вясковай школе. Цяпер вось тут...

— Ад самай вайны? — спытаў ён, упершыню з цікавасцю, і Галя адчула на душы незразумелы трывожны халадок, які прабег пужліва, як цень ад сонца, што хаваецца за рэдкім воблакам.

— З сорак трэцяга... А вы — на вайне? — І спахапілася, што, мабыць, недарэчна спытала. Змоўкла.

— З пачатку... Ды толькі год паваяваў... — глухім голасам сказаў салдат і задумаўся.

Да самай хаты ніхто з іх не асмеліўся парушыць маўчанне, бо кожны адчуваў у ім тую шматзначнасць, разгадванне якой дае ўяўленню самы шырокі прастор і смеласць. Хата была невялікая, драўляная, з чорным толевым дахам, стаяла ў густым вішанніку, як замаскіраваная, і нечым напомніла Пятру панылую восеньскую сцірту саломы. Ветрык цяпла і нейкага салодкага, трапятлівага хвалявання раптам прасачыўся яму ў душу — успомнілася вёска, бацька, маці, браты і сястра... Ён развітаўся з імі ў 41-м, пайшоў на вайну... Так дружна жылі, працавалі. Асабліва Пятро любіў жніво, яму падабалася ўкладваць на воз снапы, вазіць іх у гумно і потым куляцца ў залацістых пругкіх хвалях саломы — зашыешся з галавою, вылезеш, валасы ўсе ў асцюках і за каўняром колюцца. Але вочы гараць

радасцю, і ва ўсім целе такая прыткасць, што, здаецца, заскочыў бы на неба...

Усё забрала, адкінула, счарніла выбухамі, пажарамі праклятая вайна!..

Гаспадыня, пажылога веку, сухарлявая, спакойна зіркнула на іх і шумна сербанула нешта гарачае з шэрай конаўкі, якую ашчапервала дзвюма рукамі, быццам апроч шыі, абматанай белаю хусткаю, ёй трэба грэць было яшчэ і далоні.

— Вось тут ляжаш, — паказала Галя на нізкую кушэтку зразу, як толькі ступілі на чыстую палавіну хаты. — А мы... — кіўнула на выцвілую шырму, што звісала да самае падлогі і засланяла, мабыць, спальню. — Сядай на табурэт. Давай рэчмяшок, пілотку, павешу... — Яна падышла да Пятра зусім блізка. Ён вылузнуў плечы з лямак, і яна ўзяла рэчмяшок, зняла з галавы пілотку — на лбе засталася чырвоная глыбокая палоска. — Пачакай хвілінку, я згатую вячэру. Во свежая «Правда», — яна разгарнула на стале, каля якога ён сядзеў, газету і пайшла на кухню.

Пятро чуў, як яна прыглушана перамаўлялася з гаспадыняю. Потым заказытаў у носе пах газы і курадыму, і па целе прабеглі нервовыя дрыжыкі, ды сцягнулася на твары скура.

— Калі ласка, на вячэру! — паклікала яго Галя, і голас яе быў нечаканы, як стрэл, і ён глядзеў з хвіліну няўцямліва і адлучана. Гаспадыня, што пратупала ў спальню, здалася ценем за мутным шклом.

Пятро падняўся і пайшоў следам за Галяю на кухню. Ад водару тушанай у гарнушку бульбы і салёных гуркоў у яго закружылася галава, ён кінуў кароткі позірк на стол і паспеў убачыць на патэльні акуратныя жоўтыя кружкі яечні-цалкавухі. Стаяў, чакаючы ад Галі слоў.

— Ну што, будзем вячэраць, Пятро, — сказала яна проста, з тою непасрэднасцю, з якою дзіця размаўляе з лялькаю.

Пятро не скрануўся з месца, адно вінавата плюскаў вачыма.

— Во тут сядай, — Галя паляпала далонню па табурэтцы, што стаяла побач з ёю.

Пятро сеў, і яны разгублена глянулі адно аднаму ў вочы. У Пятра не было рук...

Пакінем Пятра сам-насам з яго думкамі, у няпэўнасці, а можа, нават у адчаі, і павядзём далей расказ ад імя Галі.

...Яна ляжала за шырмаю, недалёка ад Пятра і чула, як ён дыхаў, няроўна, трывожна: то заціхаючы зусім, і тады яе працінала недарэчная думка: «Можа, памёр?», то з шумам выпускаючы з сябе паветра, і тады яна шкадавала Пятра, што ён перажывае і яму ўсё яшчэ баляць раны. Хоць Пятро і не скардзіўся ні на што, яна сама ведала па іншых параненых, якіх сустракала раней і некаторыя з якіх проста стагналі ад болю і прасілі ці спірту, ці морфію, ці якога іншага паратунку; Пятро адно скрыпнуў зубамі, калі яна, кормячы яго, незнарок тыцнулася локцем яму ў руку. «Ён мужны, гэты маладзенькі блакітнавокі салдацік», — падумала яна.

Калістратаўна, гаспадыня, ужо даўно з прыхліпам пасапвала побач на ложку, а яна, Галя, не магла заснуць. Стомленая, напаўгалодная, знерваваная, з запалёнымі ад хранічнага недасыпання вачыма, яна ляжала ўзбуджаная і чуйная да цвёрдае, застылае ў сваёй нерухомасці цішыні. Некалі маці гаварыла ёй, што сну памагае шклянка цёплага малака. Але дзе яе цяпер возьмеш? Можа, яго замяніць проста белы колер — белыя калматыя воблакі, лебедзі ці нават сланы... І яна пачала ўяўляць перад сабою іх, але ўжо праз імгненне думкі яе зварочваліся да салдата, і белыя воблакі спярша станавіліся блакітнымі, а затым на іх месцы ўсплывалі Пятровы вочы... Ці ёсць у яго хто-небудзь з родных і блізкіх? Мусіць, недзе ў беларускай вёсачцы, на Магілёўшчыне ці Віцебшчыне, жыве маці, гаруе і думае пра сына. Бацька, пэўна, ваюе, на фронце або ў партызанах. Браты і сёстры таксама не сядзяць: на вайне не адседзішся.

Бяссонніца і ўзбуджанасць хвалявалі фантазію больш і больш, і яна малявала самыя мройныя, самыя неверагодныя сцэны, чужых людзей з надзіва знаёмымі тварамі, і Галя зняцяйкі аж сцялася. Смешная, канечне, яна, бы дзяўчына тая, што кахае хлопца і потайкі, да плачу раўнуе яго. Ну і што, калі Пятро жанаты, мае жонку? Гэта ж добра, што яму ёсць да каго прытуліц-

ца, ёсць з кім прыгалубіцца, душу адагрэць. Яму так патрэбна цяпер ласка, увага, клопат...

Сатрасаючы хату, стагналі ў небе самалёты — ляцелі, цяжкія, бы шэршні, на захад, — за шпалераю выпадала са шпароў тынкоўка і шархацела, а можа, зноў усхадзіліся мышы, якім заўчора яна паклала атруты, і яны былі сціхлі. У спальні акна не было: што там на дварэ? Дождж, што пачаў крапаць звечара, мабыць, ушчук, бо за сцяною глухая, сцярожкая цішыня.

Ужо спіць, здаецца, Пятро: змогся, бедны. Галя ўстала і, асцярожна ступаючы, прашмыгнула на кухню — піць ваду. Не асмелілася глянуць на кушэтку, дзе спаў салдат, але чула: ён не варушыцца.

Ад вады пасвяжэла ў галаве, і думкі цяпер былі ясныя і ўкладваліся адна за адною цвёрда, бы каменьчыкі ў асфальт, па якім яна бегае штодня ў райком. Схлынуў вярэдлівы, напаўсонна-тугі тлум. Галя не помніць, што перш убілася ёй у галаву: ці то рашучасць распытаць у Пятра аб ім, уверыцца, што ён нежанаты; ці думка, да неверагоднасці смелая: пакінуць Пятра ў сябе і падлячыць яго, даць акрэпнуць яму.

Гэтак жа цяжка было праясніць пачуццё, што ахапіла яе крыху спагадзя: няйнакш, сорам межаваўся з нейкаю глыбокаю радасцю, што зарадзілася яшчэ дарогаю, калі ішлі з Пятром моўчкі. Яе злякнула адчуванне, якому яна не мела жадання што-небудзь проціпаставіць, быццам наперадзе яе чакае калі не круты пераломом, то абавязкова нешта важнае. Адчуванне было мімалётнае, кволае, яно хутка растала, а цяпер во зноў вярнулася з ледзяным хрусткім звонам, завалодала ёю з большаю сілаю, і з яго палону нельга было выбавіцца нават у сне. Астатак ночы прамінуў у блытаніне кашмараў і яўнасці, яна прахоплівалася праз кожныя паўгадзіны, мацала на будзільніку стрэлкі — ці спазнілася на працу.

...Ён сядзеў у паўзмроку за сталом, схіліўшыся над учарашняю «Правдой», і яна, адхінуўшы рукою шырму, перш усміхнулася яму з сарамлівай стрыманасцю.

— Добрай раніцы!

Ён падняў галаву не зразу, мусіць, думаючы, што яна ў начным адзенні; і толькі адчуўшы, што яна не імкне размінуцца, павітаўся ў адказ.

— Як ты спаў? — спытала.

— Ведаеце, вельмі добра.

Пятро і праўда быў свяжэйшы, чымся ўчора, і гэта яна ўбачыла з першага позірку.

Яна ўскіпяціла на прымусе чаю, і калі яны пілі яго, не адчувалі між сабою нацятасці і скаванасці, акурат былі ўжо даўно знаёмыя, прывыклі адно да аднаго і змірыліся з сваёю доляю. Яна студзіла чай, падносіла кубак да Пятровых губ, і ён шумна сёрбаў, стараючыся ямчэй прыладзіцца да кубка; у яго, бачыла, востры падбародак у мяккім, маладым пушку, тонкія цвёрдыя губы, ад куточкаў якіх пралеглі ўверх упартыя разоркі.

Чай хутка разморыў, расслабіў галаву, не хацелася ні аб чым думаць, хаця — востра пульсавала ў скроні — ведала: трэба пагаварыць з Пятром, нават ужо таму, каб ён не адчуваў сябе тут занядбаным і чужым. Пятро, наўпярок, яшчэ болей узбадзёрыўся ад чаю і, здаецца, быў ахвочы да слоў. З яго вачэй знікла ранейшая ліхаманкавая пранізлівасць, і цяпер у іх плаваў лёгкі нейкі прытуплены спакой. Галя бачыла гэта, і ёй не трэба было намагацца, ламаць галаву, як падступіцца да Пятра, і яна проста, без усякай замінкі спытала:

— З сям'і хто ў цябе?

Ён таксама адказаў зразу, не задумваючыся, быццам даўно чакаў ад яе такога пытання:

— Бацька, маці, сястра і два браты. Павінны быць...

У нейкае імгненне Галя ўлавіла, што ў Пятра звузіліся вочы і зморшчыўся лоб. Яна глядзела на Пятра са спачуваннем, а ён гэтым часам думаў пра жахлівае: «Што будзе, калі з родных ужо нікога няма?..» Калі іх позіркі сустрэліся, Галю не так здзівілі, як уразілі Пятровы вочы, яны сталі аддалена-чужыя, як бы перасаджаныя з другога чалавека. Яна пагладзіла яго па шчацэ, ён зварухнуўся, тузануў абрубкам правай рукі: можа, пярэчыў, а можа, хацеў прыціснуць яе далонь да шчакі і патрымаць, але спахапіўся, што не зможа, няма чым, і адно прыкусіў зубамі ніжнюю губу. Сэрца яе разрываў жаль, і ёй самой не верылася, што яна трывае, не плача. А потым, калі Пятро стаў расказваць, з яе вачэй усё-такі выкаціліся слязіны. Ён ляжаў з вінтоўкаю ў руках за грудаю цэглы ў напаўразбураным доме, калі разарваўся снарад. Шматпудовая бетонная глыба, востра адкалоўшыся ад пярочнае апоры-бэлькі, лёгка, бы гільяцінаю, адсекла яму абедзве рукі вышэй запясця. Яны так і засталіся ляжаць: адна пад ложаю вінтоўкі, другая з пальцам на спускавым кручку...

Выцершы слёзы і прычасаўшыся перад люстэркам, якое адшукала ўчора на дне чамадана, яна пабегла ў райком. Ёй там не цярпелася, і яна зноў папрасіла Валю, сяброўку, каб тая змяніла яе раней.

Пятро сядзеў у двары на калодцы і нешта чарціў на зямлі змыленым абцасам бота. Убачыўшы яе, ён абрадаваўся і ўстаў. Выйшла з сенцаў Калістратаўна, бліснула на іх вачыма.

Пакуль не было яе, Галі, Пятро, мабыць, перажываў, што замінае чужым людзям, што звязаў ім рукі: глядзі яго, кармі, дагаджай, і цяпер, калі ўбачыў яе, яму — было знаць — адлягло ад сэрца, і пэўна ж, ён думае, што, каб мог, нацягаў бы з калодзежа вады, падладзіў бы частакол, які пазелянеў і пахіліўся, прыбіў бы на дзверы ў сенцах дошку, тады, глядзі, і гаспадыня не так касілася б на сваю кватаранку, якая мала што сама жыве, дык яшчэ некага прывалакла.

— Галя, скруці мне цыгарку, — папрасіў ён зразу. Вочы ў яго былі нейкія вялыя і, здаецца, пацямнелі...

Яна выняла з сумкі газету, адарвала ражок, але няроўна, паўкругам. Кінула яго на зямлю, ён спланіраваў, бы матылёк. Палажыла газету на калодку, узяла трэску, прыціснула яе да газеты і адарвала роўненькую картачку. Пятро з цікавасцю наглядаў за ёю. Пачак з махоркаю ляжаў у Пятра ў кішэні гімнасцёркі. З нейкім незразумелым страхам, бы крала, яна дастала яго адтуль. Выгнула картачку жалабком і толькі сыпнула махоркі, як ён пстрыкнуў з пальцаў, і махорка высыпалася на зямлю. У шчокі Галі ўдарыла чырвань.

Яна перацiснула картачку насярэдзіне, зрабіла канцік і ўжо спакойна насыпала з пачка махоркі. Пальцы ў яе па-жаночы ўвішныя і спрытныя, але круціць цыгарку няўмела: адзін канец атрымліваецца тонкі, а другі тоўсты. Рог, дый толькі! Так-сяк яна саслініла яму самакрутку. Ён падзякаваў, узяў губамі і з такою прагаю зацягнуўся, што затрашчалі, згараючы, махорынкі.

Калі яны ішлі побачкі ў хату, свяціла сонца, і цені ад іх накладваліся адзін на адзін.

Яна з лыжкі карміла Пятра тоўчанаю бульбаю ўжо спакайней, смялей, чымся ўчора ўвечары, і ў галаве ў яе зноў пачалі карагодзіць тыя думкі, што і ўночы, яны як бы выстройваліся ў шчытны рад і першая была, бадай, самая цвёрдая і пэўная: Пятра нельга адпускаць, ён малады, але бяспомачны, яму трэба жыць, ла-

дзіць сям'ю, а ён будзе абмінаць дзяўчат, ведаючы, што бязрукі, нікому не патрэбны. Чым больш яна разжальвалася, тым ясней адчувала, што ў яе не толькі шкадаванне да Пятра; яна баялася прызнацца, але ёй увесь час здавалася, быццам сам бог паслаў ёй гэтага скалечанага блакітнавокага хлопца; яна мела мужную натуру, яна разумела (і бачыла), што прырода паскупілася ёй красы, агрубіла ёй твар, голас. Тое, што ў ёй жыла цнатлівая, пяшчотная жаночая душа, хлопцаў, канечне, не вабіла, яны абміналі яе, і за ўсё жыццё ёй ніхто не прызначаў спаткання.

Было крыўдна і балюча. Але вайна заглушыла гэтую крыўду і гэты боль, і вось цяпер яны ўскалыхнуліся з новаю ярасцю. Разумела яна: вайна бязлітасна прарэдзіла мужчын, старых і маладых, яе раўеснікаў, і яна ўжо змірылася, што застанецца адзіночкаю, будзе аддаваць сябе рабоце. Толькі брала сумненне, не адступалася, мучыла, ці можа жанчына жыць адною работаю, няхай сабе і любімаю да зацятасці? Нейкае нутранае, як у лісы, чуццё падказвала ёй: не, не можа; шчасце, сапраўднае, поўнае, салодкае, жанчына без сям'і, дзяцей, як бы ні старалася, не знойдзе. Гэта не была халодная разважлівасць дзяўчыны, якая страціла ўсякую надзею выйсці замуж і якой напляваць на ўсё, абы дабіцца мэты. Проста яна *дачакалася* свайго: каханне заўсёды прыходзіць неспадзявана, яго нельга запланаваць ці заказаць, як страву ў рэстаране, і пасмакаваць загадзя.

Што пакахала, яна амаль ужо не сумнявалася, інакш якая б яшчэ сіла прымусіла яе ісці на вечную сувязь з чалавекам, ад якога не будзе ёй, жанчыне, аніякае апоры і палёгкі. І ён, Пятро, вельмі хутка да яе прыгарнуўся — бачыла яна, і гэта нараджала, а расхваляваная фантазія пясціла ў ёй думку, што імкненне ў іх да згоды ўзаемнае. Вось толькі адно пакуль трывожыла і сумненнем клалася на душу: ці зможа? Ці зможа, ці хопіць сэрца і духу ўсё жыццё быць яму нянькаю, хадзіць каля яго, шанаваць, берагаць, бы тое немаўля, ні разу не папракнуць? Адказаць цяпер яна не магла, але старалася ўявіць усё *тое,* што выпадзе ёй на долю, ляжа на яе жаночыя плечы, адганяла сорам і страх, калі думала пра самае патаемнае ў жыцці мужа і жонкі. Як ёсць непазбежнасць у птушыным лёце, так у цнатлівым кодэксе жаночых законаў, ведала,

ёсць пункт, які рана ці позна павінен быць парушаны. Нягледзячы ні на што.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

...Яна доўга ляжала нерухома, набіраючыся смеласці, і ёй увесь час здавалася, што спіць і бачыць сон — з тых прыемных і салодка-трапяткіх, што часта прыходзілі да яе перад вайною, калі яна выспявала, круглела на дзяўчыну, і ў яе паглядах на хлопцаў звычайная блазенская гарэзлівасць змянілася сарамліваю і даўкаю ўзрушанасцю. Бо ўвесь гэты час, як яна думала, Пятро не ляжаў спакойна, гарачліва дыхаў ёй у шыю недзе каля вуха, цалаваў і шаптаў, шаптаў: «Ты стала маёй жонкаю... адзіная мая... ты самая добрая ў свеце...» О, пакута боская! Якая магія ў гэтых слоў, якая сіла: на цябе абвальваецца цёплы імглісты морак, разнявольвае ўсё цела, бы той гіпноз, якім некалі ў школе чараваў барадаты, з дзяркатымі, нейкімі пустымі ў глыбіні вачыма дзядзька, і здаецца, ты не можаш напружыцца ніводнаю мышцаю, працістаяць нават рагатаму чорту, які гатовы рынуцца на цябе і бязлітасна растаптаць.

Яна прамовіла: «Пеця...» — і не магла болей анічога сказаць, але нават у адным гэтым слове, у прыдыху, з якім яно вышапталася, Пятро адчуў і маленне, і загад, і прызыў, і, урэшце, рашучасць — усё разам цяжка было імгненна ўсвядоміць і, баючыся неасцярожным, няўмелым рухам пакрыўдзіць жонку, Пятро адкінуў у знямозе галаву на падушку.

Яна павярнулася да яго ў нейкай прытомнай гарачцы... Далей пачатак і канец таго, што здзеялася, замкнуліся ў тым, што спачатку цёплымі мяккімі рукамі яна сарамліва лашчыла яму грудзі, твар, а потым, ужо гарачыя, пруткія, ён адчуў іх на сваёй шыі.

* * *

Рэдакцыя штотыднёвіка была ў старым жоўтым высокім будынку — я прачытаў гэта на шыльдзе, прыбітай на фасадзе. Аддзел прозы быў зачынены, і я пастукаў да адказнага сакратара — у масіўныя дзверы з маленькаю ручкаю. За сталом, на якім ляжаў высокі стос папер, сядзеў лысаваты чалавек, і адно я павітаўся, ён падняў на мяне вочы. Ён быў у акулярах, з рыжай барадою і вусамі а ля «Песняры». Ён глядзеў на

мяне, спрабуючы адгадаць, хто я і чаго зайшоў. Я назваў сябе, і ён абрадавана, можа, нават залішне мітусліва падаў мне руку, пасадзіў на крэсла каля стала. Як пішуць журналісты, ён адразу ўзяў быка за рогі: стаў хваліць мае апавяданні, «шчыра, непасрэдна напісаны...».

— Паверце мне, — сакатаў адказны сакратар, — пакладзіцеся на мой вопыт, бо я сам таксама пішу, і ў часопісе працаваў... Чытаю амаль усё, што выходзіць на беларускай мове. Так што магу параўноўваць. Некаторыя пішуць фальшыва, хлусяць самім сабе, бо ў іх ёсць жаданне пісаць, але няма, як пісаў Талстой, «потребности внутренней, задушевной высказаться».

Я не разумею, як пра сэрца, пачуцці можна схлусіць. Няпраўду можна сказаць пра падзеі, пра факт, пра палучку, пра тое, што ў магазіне ёсць, а чаго няма, ахвотна я іду на футбол ці дзеля кампаніі, але пра сэрца... Як пра яго можна схлусіць? Яно — адно, і з ім, як гавораць, усё ясна. І таму мне не здавалася гэта «адсекава» пахвальба нечым нязвыклым ці нячыстым, я прымаў яе як заслужаную ўзнагароду за ўменне пісаць; і толькі многа пазней я зразумеў, што і пахвальба тая была завышанаю, мабыць, з педагагічных меркаванняў — падтрымаць хлопца з «раёна», і ўменне маё пісаць «шчыра, непасрэдна» было не чым іншым, як толькі першаю кволаю спробаю пяра, пасля якой ставала ўсяго: і ваганняў, і адчаю, і сумненняў, хапала і крытыкі, часам з'едлівай, незычлівай. Гэта ўжо на старасці, хоць ты і не стаў лепей пісаць, не чапаюць, не крытыкуюць, і калі не абыходзяць маўчаннем, то адно хваляць. Мабыць, узрост шануюць, а яшчэ ўсім стала ясна, чаго пісьменнік дасягнуў і што прыступка, на якую ён узабраўся, ніжэй за тую, што асядлалі славалюбы і пыхліўцы, каб яе раўніва аберагаць.

Адказны сакратар, гэты мітуслівы і, мусіць, добры чалавек, завёў мяне да галоўнага рэдактара, і тут я хачу сцвердзіць адну ісціну, якую, бывае, той-сёй і аспрэчвае: мне здаецца, што людзі, якія зрабілі табе дабро, помняцца лепей і даўжэй, чымся злыя.

Галоўны, статны, высокі мужчына з разумным позіркам шэрых вачэй на бледным, хваравітым твары, сустрэў мяне як даўняга знаёмага, і толькі яго звыклыя пытанні — хто, што, дзе і як? — сведчылі, што мы бачымся ўпершыню. Гэта, аднак, не бянтэжыла галоў-

нага, і ён вёў са мною размову ў такой вольнай непасрэднасці, якую можна растлумачыць хіба што высокай і чуйнай унутранай культураю, якой, мусіць, болей, чымся астатнія, усё-такі надзелены людзі творчыя.

Адно цяпер, здалёк, бачу, што яго практычныя парады — сабраць «што ёсць» ды аддаць у выдавецтва на рэцэнзію, бо чарга на выданне першых кніжак надта вялікая, — былі карысныя, слушныя, пра што на той час не хацелася нават думаць. Яно заўсёды ў жыцці так і будзе: які б чалавек разумны ні быў, якія і ад каго парады ні слухаў бы, ён абавязкова павінен перажыць усё сам, набыць *свой* вопыт, які, можа, і на жаль, іншаму перадаць нельга, ім не засцеражэш ад неладоў і пакут іншага, нават пры самых добрых ды шчырых намерах.

Я выйшаў з рэдакцыі акрылены. Паветра пагусцела і было сіняе, бы чарніла. Імглістаю ўтульнаю ружовасцю свяціліся ў дамах вокны. У тралейбусах і легкавушках калінавымі плямкамі «крывавелі» стопсігналы. Ад праспекта далятаў цвёрды, тупы ляск — гупаў шматпудовы пнеўматычны молат. Пахла дымам і карбідам.

Тралейбус завёз мяне на вакзал. Я падступіўся да акенца касы. Белавалосая дзяўчына ў акулярах з вялікімі круглымі, як накрыўкі слоіка, шкельцамі, міла ўсміхнуўшыся, сказала, што на Рэпкавічы ўжо ўсе білеты прададзены. Дзіва што: на суботу і нядзелю многа людзей едзе дахаты. Клянчыць-прасіцца ў шафёра, каб узяў на «лішні білецік», я не ўмею, мае просьбы заўсёды такія нясмелыя, адкрытыя, што шафёру прасцей простага адказаць «не». Ведаючы сябе, я ўжо даўно не прашуся ў аўтобусы, на якія няма білетаў.

Што рабіць? Я дастаў са сподняе кішэні пінжака блакнот-алфавітку, куды запісваю адрасы і тэлефоны. Глянуў на гадзіннік: во-во стрэлкі выструняцца зверху ўніз у адну лінію. Трэба хутчэй званіць, пакуль у людзей не скончыўся рабочы дзень. Некалькі маіх аднакурснікаў размеркаваліся ў Мінск: сын дэкана, рэдактара адной з рэспубліканскіх газет, начальніка міліцыі. Хаця яны хлопцы і добрыя, неганарлівыя, надзейныя, ім, бадай, званіць не буду: навошта трывожыць?

Пару чалавек, такіх жа вясковых, як я, таксама засталіся ў сталіцы. Гэтыя, як у народзе кажуць, «узялі сваім гарбом» — здольныя, працавітыя, самаадданыя

журналісты і, можа, крышачку нахабныя, ці што, можа, проста смелыя.

«Пазваню Коктышу...»

З Коктышам мы паўтара года жылі на адной кватэры. Высокі чорнагаловы, шчыры і непасрэдны, як дзіця, ён быў любімец курса, надта ўвіхаліся каля яго дзяўчаты. Яго залішнюю эмацыянальнасць і нервовасць многія подленька тлумачылі тым, што ў яго бацька алкаголік. Так гэта ці не, але я ведаю іншага хлопца, які не падабаецца мне якраз сваім закамянелым, «таўстаскурым» раўнадушшам і ўнутранай глухатою, хаця бацька яго таксама п'е.

Жы-ры-ры, жы-ры-ры... — журчыць тэлефон.

— Алё! Сельгасаддзел? Добры дзень! Можна Коктыша?

— Кто спрашивает?

— Сябар.

— Ушел уже и больше сегодня не будет.

Коктыш нядаўна атрымаў у Курасоўшчыне кватэру, але адраса я не ведаў. Ды калі б і ведаў, то наўрад ці паехаў бы: не папярэдзіўшы, заходзіць да людзей? Мала што ў іх можа быць, а тут яшчэ я са сваімі клопатамі.

На абласным радыё працаваў Санюковіч. Ён зрэдку званіў мне ў Рэпкавічы, заўсёды па нейкай патрэбе, а не проста так, каб спытаць, як жыву-маюся; часцей за ўсё ён заказваў мне нарыс пра даярку ці пастуха — «з глыбінкі».

Пазваніў яму. Трубку падняў акурат Санюковіч. У яго добра пастаўлены голас, гаварылі, ён хараша спявае, але сам я ніколі не чуў. Знешне ён занадта хамавата-грубы, але па натуры справядлівы, шчыры, дзейны, таму і веру, што ён можа спяваць.

Санюковіч мне абрадаваўся, усклікнуў: «О!» і доўга смяяўся сваёй захліпістаю ўсмешкаю, якая многім здавалася яхіднаю і адпуджвала, а мне яна такою не здавалася. Я, мабыць, нейкі «не от мира сего», бачу іншы раз у чалавеку зусім не тое, што бачаць іншыя, з-за гэтага часта пакутую і мяне лічаць некамунікабельным; я магу раструшчыць, бы арэх, усякія каноны пра чалавека, іменна каб сказаць яму нешта прыемнае, хаця тут усё адносна, бо мы ацэньваем сябе па добрых учынках, а людзі нас — па благіх.

Санюковіч пытаўся, я адказваў і як бы між іншым

намякаў, што мне няма дзе начаваць. Санюковіч прапускаў мае намёкі міма вушэй, нёс лухту, называючы мяне «класікам» (зразумела, з іроніяй), і не забываў раз-пораз устаўляць, што ён яшчэ ў студэнцтве надрукаваў у насценгазеце эпіграму на маё апавяданне.

Санюковічава балбатня мне ўскорасці надакучыла, і я маўчаў, пыхцеў, як паравоз, у трубку, пакуль нарэшце Санюковіч не адчуў, што перабірае меру. Перадыхнуўшы, ён сказаў:

— Трэба нам было б сустрэцца ды пагаварыць не з наскоку, але, бачыш, еду з жонкаю і сынам да цешчы. Білеты ўжо ў кішэні. Кабанчыка намеціліі калоць. Лафа, скажу табе, выгаднае дзельца... Сумку свежаніны прыпру ў Мінск. Гэта не тое, што ў гастраноме...

Санюковіч быў чалавек дужа хваткі, практычны, але і я ў душы згадзіўся з ім, бо таксама езджу «на кабана» да бацькоў у вёску; праўда, халасцяку, мне сумка не трэба, хіба што «гасцінца», як кажа маці, вазьму: трохі мяса, трохі пячонкі-лягчонкі.

Я пажадаў Санюковічу шчаслівай дарогі і палажыў трубку. З будкі не выходзіў. Цямнела хутка. З прасветлін між дамамі ўжо глядзелі на мяне зоркі, яны былі бледныя, ледзь хліпалі ў павалоцы дыму, пары і туману, якія заўсёды падымаюцца над вячэрнім горадам. Да шкляных дзвярэй тэлефоннай будкі вецер прыклеіў жоўты кляновы ліст з рудымі жыламі-баразёнкамі — быццам звонку падпірала дзверы нечая далонь, не давала мне адчыніць.

А што, калі?.. Я думаў, ці варта званіць дзяўчыне, з якою некалі сябраваў і якой нават зрабіў, як цяпер разумею, немалую паслугу. Яе звалі Света. Вучылася яна курсам ніжэй, а пазнаёміў нас мой зямляк-аднакурснік, які хадзіў да дзяўчыны, што жыла са Светаю. Аднаго дня, здаецца, на свята моладзі, ён запрасіў мяне з сабою. Света была дзяўчына вясёлая, раскаваная, і мы пацалаваліся з ёю ў першы вечар — у паўзмроку за шырмаю, куды адышліся пад чуллівую музыку танга. Мне было сорамна, а Света гаварыла, што ў пацалунках няма нічога кепскага, яны не пранікаюць пад скуру, як татуіроўка, і жанчына, памыўшыся, кожны раз новая і свежая.

Света была не толькі вясёлая і раскаваная дзяўчына, але і рацыяналістычная. Выпадкова, у затлумленай мройным чадам гутарцы я сказаў, што ў Мінску жыве

сябар майго бацькі, палкоўнік міліцыі, яны разам ваявалі ў Сталінградзе. Света тут жа ўссела на мяне: «Паможы прыпісацца ў Мінску». (Дзіва, але тады, ужо студэнт-трэцякурснік, я і блізка не думаў, што пастаянная прыпіска ў Мінску многа значыць.) За гэтую паслугу Света ледзь не ахвяравала мне самую сябе: «Прыпіска — і я ўся твая», але мяне гэта яе цынічнасць раззлавала. Па-першае, мая доля ў прыпісцы не здавалася мне нечым «звыш», а толькі звычайнаю студэнцкаю выручкаю; па-другое, і гэта галоўнае, мне даволі было радасці ад самой магчымасці аказаць дзяўчыне ласку.

У адну з паездак дахаты я абрысаваў бацьку сітуацыю, шматзначна, хаця і не без іроніі, назваўшы Свету «сяброўкаю жыцця»; ён даў мне адрас і асабістае пасланне сябру-палкоўніку. Потым, пазнаёміўшыся з палкоўнікам, бяздзетным мужчынам, я звёў з ім і Свету. А далей яна ўвіхалася ўжо сама, дзівячы мяне ўменнем ладзіць з людзьмі і ўсё болей выклікаючы да сябе недавер.

Я счакаў, пакуль параўнела дыханне, і пазваніў Свеце: у першамайскай паштоўцы яна пахвалілася, што «выбіла тэлефон». Я хваляваўся, і голас мой зноў задрыжаў, як у студэнта, які адказвае па шпаргалцы, а выкладчык яго хваліць.

— О, Колька!.. Прывітанне! Ты ў Мінску? — Мілы, пяшчотны галасок быў повен радасці, як спелая ягада соку, і мне міжволі стала прыемна ад гэтае радасці. — Хвіліначку... — Яна, мабыць, некуды схадзіла; потым зноў узяла трубку, здаецца, я чуў, як ад хвалявання стукае ў яе сэрца. — Ну, расказвай, як ты там, у сваіх Рэпкавічах... Не жаніўся яшчэ?

Што было рабіць: я паўтарыў амаль усё тое, што гаварыў Санюковічу, і гэтак жа сама чакаў запросін. Света — знаць было — адчувала гэты мой неспакой, але апраўдвала сябе, мусіць, тым, што непрыстойна ўсё ж ёй, адзінокай дзяўчыне, зазываць да сябе хлопца. Я набраўся смеласці, бо цярпенне ў мяне лопнула, а выйсця не было:

— Слухай, Светка, можа б, я пад'ехаў да цябе? — У маіх вушах звінела кроў. Света не чакала ад мяне такога нахабства, думаючы, што ў мяне адна мэта. Голас яе прыкметна пацішэў, яна сказала вінавата:

— Колечка, даражэнькі, толькі не сёння... Сёння не магу. Я падрыхтавала хну, буду фарбаваць валасы.

Давай сустрэнемся заўтра, а?..— Жаданне ўбачыць мяне, здаецца, было ў яе шчырым, але, адчуваў, яна хлусіць, што сабралася фарбаваць валасы. А чаму? Ну чаму мы не гаворым з чалавекам адкрыта, прама, шчыра, а мудруем-інтрыгуем, як быццам і з высакароднаю мэтаю не ўскладняць адносіны, але ўсё атрымліваецца наўпярок. І толькі ў злосці, у гневе мы пачынаем гаварыць праўду, але ўжо, на жаль, нядобразычліва і рэзка.

— Ну, добра,— сказаў я,— можа, заўтра пазваню... — А сам сабе падумаў: «Наўрад ці пазваню...»

— Толькі не крыўдуй, калі ласка,— Света ледзь не маліла.— Я радая, што ты... Я табе многім абавязана.

А я, прызнацца, і не крыўдаваў. Кажуць, гэта страшны чалавек, які не ўмее абурацца, злаваць на іншых, акрамя, канечне, сваякоў, між якімі адносіны ўсёдаравальныя і памяркоўныя. Няўжо страшны? Калі шчыра, дык у мяне няма такіх сяброў, якім бы я мог даверыць як сабе, безаглядна адкрыць усе свае тайны, не баючыся, што яны будуць пляткарыць.

Жарты жартамі, але шанцаў пераначаваць у каго-небудзь са знаёмых у мяне ўжо не было. Дый, урэшце, што я пястун які ці Мінска не ведаю? Я з сілаю піхнуў дзверцы будкі, яны лёгка адмахнуліся і стукнулі па сцяне дома. На прыпынку стаялі два тралейбусы. Я сеў у першы і паехаў у «Паляўнічы бар», мне падабаліся ў ім умлелыя ў грыль-апараце сялянскія каўбаскі з кіслаю капустаю; у бары прадавалі яшчэ піва, але яно ў дзяцінстве мне збрыдзела. Мы тады паехалі з маці ў горад, і нам дужа захацелася піць; мы знайшлі ў шкляны адпацелы ўсярэдзіне павільёнчык, а там толькі піва, і маці купіла цэлы куфаль. Піва было горкае, нясмачнае, але сасмяглы, я выпіў ледзь не ўвесь куфаль; пасля мне было дрэнна, я доўга кволіўся.

Раней у бары завіхалася худзенькая, шустрая, як сініца, жанчына з прыветлівым тварам і нямымі вачыма, а цяпер стаяў бармен. Я ледзь не павярнуў на выхад, убачыўшы яго: перапрашаю за крутасць, але мне заўсёды не па сабе, калі за афіцыянта бачу мужчыну, здаровага, выпешчанага. Не мужчынскі гэта занятак — хоць забі! Апетытны пах каўбасак, іх тлусты бляск за гарачым шклом грыль-апарата ўсё ж утрымалі мяне ў бары, і я стаў у чаргу.

На сцяне была распята вялізная сівая шкура ваўка

з пафарбаванымі жоўтымі кіпцямі; вакол яе віселі вазончыкі дробных белых кветак, якія ў народзе называюць «бабскія плёткі». Прылавак быў мокры ад піва, і меню, якое я ўзяў у рукі, таксама было мокрае.

На выгляд бармен меў гадоў трыццаць, быў апрануты ў чорны касцюм, на белай кашулі крыкліва вылучаўся чырвоны гальштук; быццам шматкі з гэтага гальштука бармен прыклеіў сабе на вусны, яны былі поўныя, чырвоныя, як у жанчыны; і ўвогуле ў далікатным, бледным твары, мяккіх, плаўных руках было шмат жаночага.

— Каўбаскі і бутэльку мінеральнай вады.

— Усё?.. — спытаў бармен, быццам я папрасіў у яго нешта зусім-зусім не тое, дзеля чаго ідуць сюды людзі, а скажам, газету ці рыбалоўных кручкоў.

— Усё, — сказаў я і высыпаў у глыбокую жоўтую талерку дробязь. Бармен уважліва паглядзеў на мяне, і гэты ягоны позірк чамусьці прымусіў мяне сцяцца: ён быў нейкі прытарна-ліслівы і нахабна-працяглы.

Недалёка ад прылаўка быў вольны столік, і я сеў за яго. Мае любімыя каўбаскі з кіслаю капустаю не лезлі ў рот, хоць і былі сакаўныя, прыемна казыталі пярцоваю гаркавінкаю кончык языка: увесь час я адчуваў на сабе позірк бармена.

Ён што, ведае мяне, гэты бармен? Ці палічыў за рэвізора? А можа, я так яго ўразіў тым, што не ўзяў піва? Цяжкае, гнятлівае пачуццё, што пачынала ўсё мацней абрыньвацца на душу, будзіла ў галаве непрыемныя думкі, і яны скакалі ў бязладным, тлумным танцы.

Ачуўшыся, я зноў паехаў на вакзал. Ён сустрэў мяне агнямі, маленькімі і вялікімі, зялёнымі і чырвонымі, блакітнымі і жоўтымі, таямнічым моракам нізкага неба. У розных накірунках ішлі людзі. Раптам адна жанчына з мяккімі чорненькімі, бы пушок рагозу, вусікамі дакранулася да майго локця: «Давай, красавец, пагадаю... Усю праўдачку раскажу. У цябе непрыятнасці, але цябе чакае харошая радасць. Хочаш, красавец, раскажу...»

Нюх яны маюць, гэтыя гадалкі, ці што? Так і ловяць тых, у каго засмучаны твар, ці дзяўчат з разбітымі сэрцамі: ведаюць нябось, што ў горы чалавек больш даверлівы. Але ў мяне здаўна жыве непрыязнасць да ўсякіх гадалак. З тым земляком, што са Светаю пазнаёміў, было раз. Прыходзіць з кіно сумны, знерва-

ваны... Расказвае: каля паштамта прыліплі гадалкі і не то выманілі, не то ўкралі «пяцьдзесятку» — усю павышаную стыпендыю. Думаў, чаравікі за яе купіць, бярог...

«Хочаш, я табе пагадаю?» — чапляецца цяпер і да мяне маладзіца. Я сцяў пашчэнкі, нахмурыў бровы, каб паказаць сваю строгасць ды непрыступнасць, і тая адкаснулася. Я завярнуў у хлебны магазін і купіў Галіне Андрэеўне дзве буханкі сітнага хлеба; папрасіў прадаўшчыцу загарнуць іх у паперу.

На вуліцы ў кіёску купіў «Вячэрні Мінск», каб, седзячы на вакзале, пачытаць. Падняўся на другі паверх у пачакальню, сеў у куце на лаву і прабег вачыма па газеце — загалоўках, аб'явах, тэлепраграме... Адчуванне, што пад павекамі цвёрдыя каменьчыкі — хіліла на сон: стаміўся, дзень на нагах. На мяне падазрона паглядваў дзяжурны міліцыянер. Ужо скрозь дрымоту пачуў мужчынскі голас: «Каму трэба ў напрамку Рэпкавіч?» Я скеміў імгненна, падбег да мужчыны.

— Адзін? — спытаў ён.

— Адзін.

Ідучы па прыступках уніз следам за мужчынам, я бачыў, што ў яго старанна адпрасавана калашынне і да бляску начышчаныя новыя, на высокім літым абцасе чорныя туфлі. Мы падышлі да сініх «Жыгулёў». Там сядзела жанчына, а можа, дзяўчына, бо строгае, цёмнае паліто з норкавым каўнерыкам-абдямоўкаю і фетравы капялюшык з кветкаю збоку прыбаўлялі ёй гадоў.

Мужчына ўсю дарогу жартаваў з маладою жанчынаю, шырока ўсміхаўся, бліскаючы прыгожымі белымі зубамі з залатою фіксаю ў ніжнім радзе, і па ўсім было відаць, што ў жыцці ягоным усё гладка, прыстойна, нішто не азмрочвае думак і сэрца, можа, каму і на зайздрасць, мяшчан хапае. Чамусьці стала шкада мужчыну, у якога, можа, уся і мэта ў жыцці — гэтыя «Жыгулі» ды маладая жанчына ў іх.

У Рэпкавічы прыехалі позна. На вуліцах гарэлі рэдкія сонныя ліхтары, пад якімі на тратуары цьмяна адсвечвала лісце. Па вокнах легкавушкі страката бліскала святло: я фізічна адчуваў, як то шырэюць, то вузеюць у маіх вачах зрэнкі; усмешка ў мужчыны проста сляпіла, і жанчына жмурылася.

На танцпляцоўцы ў парку грымела музыка, здаецца, заглушала ўвесь свет, як рык стальнога, бяздумнага дыназаўра. Я ўжо прымеціў: у каго няма музычнага слыху і густу, той кампенсуе іх моцным гукам; таксама і ў кнігах: дзе менш думак, душы чалавека, там больш надакучлівай апісальнасці, ілюстрацыйнасці.

Галіна Андрэеўна яшчэ не спала; сустрэла мяне каля парога; яна была ў новай зялёнай сукенцы з белым каўнерыкам. Я здымаў плашч, а яна стаяла каля мяне, як маці, і чакала. Пасля сталічнай мітусні мне зразу стала лёгка, быццам з рэальнасці я трапіў у сон, адзін з тых, што помняцца з маленства. Я зусім іншымі вачыма глядзеў на Галіну Андрэеўну, і той німб высокага, чыстага святла вакол яе ззяў яшчэ ярчэй і шырэй. Яна запрасіла мяне ў залу піць чай.

Стол быў вынесены насярэдзіну, засланы жоўтым абрусам, на фоне якога добра вылучаліся маленькія блакітныя, бы сон-трава, фарфоравыя кубачкі; на талерцы ляжалі тонкія лустачкі батона. З халадзільніка Галіна Андрэеўна прынесла каўбасу і масла.

Я расказваў; Галіна Андрэеўна моўчкі ўважліва слухала мяне, галава яе была схілена, і я добра бачыў твар, болей, чымся раней, адутлаваты, ацёклы, з зеленавата-жоўтымі пухлінамі пад вачыма, якія сведчылі калі не пра хваробу нырак, то пра тое, што яна блага спала; шырокія бровы, прыпаднятыя каля пераносіцы, прыдавалі выраз незразумелага мне смутку.

— Пятро Максімавіч ужо добра сябе пачувае, можа, праз тыдзень вернецца, — сказаў я і ўбачыў, як вочы ў Галіны Андрэеўны ажывіліся, але ўсё роўна іх нельга было назваць раданымі; і я зразумеў, што Галіну Андрэеўну нешта ўсур'ёз трывожыць.

Недзе праз тыдзень Галіна Андрэеўна расказала мне пра сваё гора. Старэйшы сын, Сцяпан, прыслаў з з Карэліі пісьмо — разводзіцца з жонкаю. Яшчэ раней я чуў, што ён жанаты на дачцэ нейкага начальніка. У водпуск прыязджаў да бацькоў рэдка, затое заўсёды з вялікімі, абцятымі жоўтаю ляйчынаю чамаданамі гасцінцаў: вэнджаныя асятры, якія аж плавіліся ад тлушчу; вяленая гарбуша, тоўстая і з сярэдзіны чырвоная, бы морква; тугія маршчыністыя палкі сервелату ў прадаўгаватых кардонных каробках, падобных на цукерачныя не толькі формаю, але і размалёўкаю.

У сямейных неладах, і я згаджаўся, была вінавата

Сцяпанава жонка, Таццяна. Яна, спешчаная дачка, часта папракала Сцяпана, што ён нібыта прыйшоў, «як пан», на гатовае, абзывала яго «правінцыял», утрыманцам, маўляў, яе бацькі зрабілі яму ўсё, і кватэру, і мэблю, і нават кар'еру. А напраўду, дык нічога б гэтага не было, калі б Сцяпан не стараўся сам, не лічыўся на станкабудаўнічым заводзе таленавітым інжынерам-даследчыкам. Вядома, нейкая грашовая помач ад Таццяніных бацькоў была, асабліва напачатку, але ж не настолькі квола стаяў на нагах і Сцяпан, каб шукаць апору ў іншых і радавацца. А што да «правінцыі», то гэтым словам Таццяна хацела абразіць ды прынізіць мужа, каб хоць неяк надаць сабе вартасці — таннай, затое ўцешнай для хваравіта-абвостранага самалюбства. Сцяпан усе дзесяць гадоў, якія жыў з Таццянаю, нічога бацькам не гаварыў і не скардзіўся; пакутаваў, цярпеў у адзіночку; нават па ягоных званках ды пісьмах ні аб чым нельга было здагадацца, аж пакуль на стол суда не легла заява на скасаванне шлюбу. Факт гэты ніяк нельга было абысці або ўтаіць, і Сцяпан напісаў бацькам пісьмо-споведзь. Самая балючая ў ім была думка пра лёс дачкі. Што яна застанецца без бацькі ці без маці: Сцяпан наважыў не ўступаць на судзе дачку жонцы, маўляў, жанчына «нізкай маральнасці не мае права выхоўваць дзіця».

Пятро Максімавіч пра пісьмо яшчэ не ведаў; калі Галіна Андрэеўна званіла яму, то не сказала: «няхай чалавек спакойна далечваецца».

Дасюль кожная сям'я ўяўлялася мне гэтакім хутарком з лагодным, бязвоблачным небам над ім, і нават тыя спрэчкі маці з бацькам, якія даводзілася некалі ў дзяцінстве чуць, здаваліся мне звычайнаю гутаркаю дарослых людзей на павышаных танах, але ж як цяпер разумею, за імі стаяла, мабыць, нешта сур'ёзнае, канфліктнае, што ўрэшце магло расхістаць сямейны падмурак. Я збіраўся жаніцца, і мне было над чым падумаць. І я думаў, для сваіх дваццаці трох, мабыць, залішне абачліва і цвяроза: гэта яна, мая Люба, добрая і ласкавая да мяне, пакуль не пажаніліся, а ў сям'і можа стаць зусім іншаю, сварліваю і злою. Чуў некалі ад мудрага малінаўскага дзеда Мацвея: жанчына, выйшаўшы замуж, мяняецца, і, на жаль, не ў лепшы бок; а калі народзіць дзіця, нахабнасць яе ўзрастае: болей дзяцей — болей нахабнасці.

Такія думкі прыходзілі да мяне рэдка, пад кепскі настрой, і я хутка на іх забываўся, бо ў Любу верыў — безаглядна, шчыра, як, мабыць, верацъ усе закаханыя. Мы пазнаёміліся з ёй мінулай зімою. Я зазвычай позна, нярэдка да глыбокай ночы, заседжваўся ў рэдакцыі: пісаў матэрыялы. Трэба сказаць, што напачатку, пакуль быў запас ураджанняў, назіранняў, слоў, мне пісалася лёгка; і ў форме падачы матэрыялаў, і ў поглядзе на рэчы была нейкая свежасць, гэта адзначалі ўсе на «лятучках». Але раённая газета — малацілка адмысловая, і матэрыялы праз яе праходзяць як праз трубу, без затрымак, толькі паспявай падаваць. І з цягам часу ў кожнага раённага журналіста выпрацоўваецца стэрэатып, штамп, шаблон. Маючы пару лічбаў і глянуўшы задуменным позіркам у акно, ён праз паўгадзіны выдае рэпартаж, замалёўку ці нават (былі выпадкі) рэйд. Зразумела, пра творчасць тут і гаворкі не можа быць. Чым болей ты да яе схільны, тым цяжэй. Паспрабуй знайдзі, як напісаць за месяц, скажам, пяць замалёвак пра даярку: тыя ж кароўнікі, апараты ці вёдры, сцежкі ад хаты да фермы. Адну замалёўку, дзве, тры напісаў... А далей? Кладзі перад сабою першую — і пагнаў, мяняючы прозвішчы, лічбы?

Я сядзеў позна і мучыўся: не хацелася паўтарацца. Аднойчы са мной пажартавалі. Гэта было пад Новы год. Стаяў мароз, і я чуў, як нехта шкрэбаўся на ганку, шаптаўся; потым — уводдалі — галёкаў і свістаў. Я — без увагі: ці мала хто? Сабраўся дахаты; і, выключыўшы ў калідоры святло, штурхануў ад сябе парадныя дзверы, яны не падаліся: былі запёрты звонку. Тады я дужэй налёг на іх — і мяне аглушыў выбух. Запахла дымам, у вачах доўга стаяў бляск, што вузенька, як мячом, с秒ануў зверху ўніз праз шчыліну двухстворчатых дзвярэй. Мяне білі дрыжыкі, я абураўся: яўна, пазбродавала мясцовая «жанішота». І толькі праз многія гады Люба прызнаецца, што гэта была яе ідэя — падперці мяне, «чэрствага халасцяка», а пасля ўжо хлопцы падлажылі выбуховы пакет; у такую форму вылілася яе першая цікавасць да мяне.

А далей было так. Зноў-такі позна зазваніў тэлефон. Я падняў трубку і пачуў гучны голас... Алы Пугачовай; яе ў той час толькі-толькі «выводзіў» на арэну «Арлекіна». Нехта зноў жартаваў са мною: голас спявачкі то аддаляўся, глушэў, і тады ў трубцы нехта стрымана

дыхаў, то набліжаўся — трубку падносілі да магнітафона ці прайгравальніка. Я дапытваўся, хто мяне забаўляе, не дае працаваць, але дарэмна; толькі па ціхім пахіхікванні здагадаўся — дзяўчына.

Званкі паўтараліся некалькі вечароў запар. Нарэшце тайна раскрылася: званіла мне Люба Арцюшкевіч, маладая касірка з ашчадкасы. Яна стаяла на ўліку ў нашай камсамольскай арганізацыі, і на нядаўнім «агеньчыку», які праводзіла рэдакцыя, мы сядзелі за адным столікам; і між намі нават не праслізнула зацікаўленага позірку, адно смяяліся разам з усімі. І вось цяпер — гэтыя званкі. Слова за словам, і мы дамовіліся схадзіць у кіно.

Люба была высокая, статная і побач са мною, ростам не вельмі ўдалага, глядзелася мажна, задужа «салідна»: роўны ўвышкі з жанчынаю мужчына заўсёды прайгравае. Гэта, круці ні круці, мяне бянтэжыла, і я ўвесь час міжволі цягнуўся ўгору і ледзь не на дыбачках ступаў: не ведаю, адкуль і чаму бралася ва мне гэта юнацкая непасрэднасць.

Мы сядзелі ў трэцім радзе з краю. Рукі ў Любы былі надзіва пяшчотныя і мяккія, хаця, калі верыць ёй, гультайкаю не была: умела вязаць «шапачкі-рукавічкі» і смажыць «качку, начыненую яблыкамі». Бацька Любін, афіцэр у адстаўцы, працаваў начальнікам вузла сувязі; ездзіў на ўласнай «Победе», не вельмі зграбнай з выгляду, затое, казалі, з новым «волгаўскім» маторам.

Фільм называўся «Твар анёла», і расказваў ён пра дзіцячы канцэнтрацыйны лагер у чэхаславацкім горадзе Лідзіцэ. У пажылога тоўстага дзядзькі, што сядзеў праваруч ад мяне, цяклі з вачэй слёзы, і ён раз-пораз выціраў іх кулаком. Я таксама, як і гэты дзядзька, не мог раўнадушна глядзець на змораных голадам і катаваннем дзяцей, пад тонкаю скураю якіх выразна была відаць кожная костачка...

І потым мне ўжо было не да чуллівых размоў з Любаю. А ёй, здаецца, нічога не замінала, яна ганарліва трымала сваю маленькую прыгожую, як у антылопы, галоўку ў белай вязанай шапачцы і не саромелася браць мяне пад ручку пры людзях. У яе была дзіўная, чароўная ўсмешка, якая можа быць ці то ў зусім легкадумных дзяўчат, ці то ў свавольных, па-дзіцячы адкрытых дзяўчатак. Мы ішлі ўпобачкі на ўскраіну горада,

дзе жыла Люба. Бадзёра і крохка парыпваў пад нагамі снег. У небе зеленавата бліпічалі-пераліваліся чыстыя густыя зоркі. За круглы і белы, як дыск, месяц зачапілася вузкая, як палоска, цёмная хмарка, і ён быў падобны на дзіцячую бразготку.

Люба жыла ў вялікім белацагляным доме-асабняку, агароджаным ад вуліцы шчытным плотам. У садзе стаялі пад снегам яблыні, кусты парэчак, падобныя на клубкі воўны. Цені на снезе былі сінія, а на сцяне веранды і на плоце — чорныя, як сажа.

Мы пастаялі з Любаю каля весніц; калі я адыходзіў, яна падала мне руку ў чырвонай вязанай рукавічцы, і я панёс з сабою цнатлівую, цёплую радасць у грудзях: і ад сустрэчы, і ад гэтай чырвонай рукавічкі.

Дарогу мне перабег чорны кот з зялёнымі, як святлафоры, вачыма, але мяне гэта ніколечкі не засмуціла, бо ў прымхі не веру. Чамусьці я быў упэўнены, што Люба — тая дзяўчына, з якою ажанюся: з ёй, думалася мне, будзе проста, цікава, прыемна, бо няма ў яе характары ні змрочнай падазронасці, ні зацятай няўступчывасці.

Неўзабаве Люба запрасіла мяне ў госці. Дзень быў ціхі. Падаў лёгкі, тонкі, як павуцінка, сняжок. Чырвонае, з зеленаватасцю па краях стаяла ў смузе сонца, і веяла ад яго не цяплом, а спакоем.

Люба пазваніла ў дзверы і тут жа адчыніла іх. Насустрач нам з бакавога пакоя выйшлі Любіна маці і старэнькая, сівая бабуля з добрымі вадзяніста-блакітнымі вачыма і тонкім, вострым падбародкам.

У Любы быў асобны пакой, які ўмяшчаў не толькі шырокі ложак, дзябёлы старамодны стол, але і цёмнае цяжкое піяніна, кніжную шафу, дзве тумбачкі, трумо, розныя пуфікі-табурэцікі і крэсла-качалку. На падлозе ляжаў зялёны варсісты палас; ярка-чырвоны, стракаты дыван засланяў усю сцяну, пры якой стаяў ложак, на астатніх вісела безліч усякіх пано, інкрустацый, чаканак, вымпелаў са значкамі. Люба прызналася, што любіць сувеніры, і тыя, хто ведае гэту яе слабінку, дораць іх ёй, асабліва шчыруюць браты; іх у яе два, яны старэйшыя, адзін урач, другі дырэктар сярэдняй школы, даўно жывуць сваімі сем'ямі.

Мы пілі каву за цёмна-вішнёвым нізкім столікам з разьбянымі тоўстымі, як таўкачы, ножкамі; лыжачкі і падстаўкі для шклянак ядрана блішчалі пазалотаю; на

падносе ў кітайскіх талерках ляжалі бутэрброды з каўбасою і буйнавата-зялёнаю, бы каноплі, ікрою. На свой смак, мы дабаўлялі ў каву каньяк, і нам было хораша, утульна і проста, можа, адно Любіна маці, звалі яе Ксенія Пятроўна, залішне мітусілася і зашмат аддавала мне ўвагі, якая, калі быць прыдзірлівым, межавалася з настойлівым жаданнем дагадзіць мне як будучаму зяцю.

Але, чымся болей мы сядзелі, тым болей змрачнела Люба: цэлы месяц мы не будзем бачыцца. Днямі я іду на вайсковыя зборы. З рэдакцыі прызвалі яшчэ Пшоніка: як-ніяк, свае людзі, і на новым месцы нам будзе весялей. У арміі я не служыў: зразу пасля школы паступіў ва універсітэт, і там на ваеннай кафедры мне прысвоілі званне лейтэнанта.

Люба правяла мяне да ганка; на расстанне мы пацалаваліся, і Люба, уткнуўшыся мне ў плячо, заплакала, што я не мог не ўспамінаць потым з цеплынёй і дабрадушнаю ўсмешкаю, бо ўсё ж у яе чуллівасці, здалося мне, было трошкі ад кіно і паказухі, чаго я не прымаў нават у рамантычных дзяўчат.

* * *

Круталобы жоўты «пазік» завёс нас, «партызан» (так кадравыя ваенныя лагодна называюць тых, каго прызываюць на зборы) у ціхае мястэчка; дамкі невялікія, акуратныя, і здаецца, у іх жывуць толькі сціплыя, добразычлівыя людзі. Рэдка дзе ўбачыш гараж; няшмат магазінаў. Пахла вастраватым сялянскім дымком. У адным двары скубла з капы сена чорная каза з фіялетавымі доўгімі рагамі, самыя кончыкі якіх былі жоўтыя, як свечкі.

Вайсковая часць была абнесена бетоннаю загародаю. Дрэвы стаялі аснежаныя, на ніжніх вузлаватых галінах сядзелі задуменныя, фарсістыя галкі, сонна лыпалі белымі вачыма. Мы ішлі па шырокай чыстай дарожцы да казармы, цёмна-рудой, быццам адлітай з медзі. На першым паверсе нас пераадзелі ў ваенную форму; ложкі былі на другім, мы з Пшонікам выбралі суседнія.

З раніцы нам чыталі лекцыі; пасля абеду вывозілі на палігон на тактычныя заняткі. Лекцыі былі нудныя, нецікавыя, пра вядомае па вучобе на кафедры; а

стрэльбы ўсіх весялілі яшчэ і таму, што на прасторы, у вольнай непасрэднасці людзі заўсёды адчуваюць сябе лепш. Было і непрыемнае. Аднаго старшыню калгаса акурат у страі хапіў эпілептычны прыпадак. Ён немачна закрычаў і паваліўся на снег; твар у яго стаў сіні, з рота паперла пена. Усе разгубіліся, не ведалі, што рабіць. Пшонік першы спахапіўся, кінуўся на назіральны пункт і прынёс у сваёй шапцы вады. І хаця яна была тут не патрэбна, усё роўна Пшонік заслужыў пахвалу.

У першую выхадную нядзелю я забраўся ў бібліятэку: яна займала пры клубе часці два пакоі на другім паверсе. Там былі кнігі, болей ваенна-патрыятычныя, і я здзівіўся, калі ўбачыў серыю «ЖЗЛ» — цэлую даўжэзную паліцу сіваватых кніг з белымі факельчыкамі на спінках. Я выбраў жыццяпіс Бальзака, гэты пісьменнік імпанаваў мне яшчэ са студэнцтва, калі ўпершыню прачытаў яго «Озорные рассказы».

Цяпер на вольны час я меў занятак — чытаць; Пшонік адшукаў у мястэчку нейкага нібыта сваяка і кожны вечар прападае ў яго. Хлопцы расказваюць дасціпныя гісторыі, смяюцца, гарэзнічаюць. Нехта напіхаў Пшоніку ў саквояж пустых бутэлек. Пшонік вярнуўся позна, падняў крык: «З мяне здзекаваюцца!» — і высыпаў бутэлькі на ложак суседа — інжынера з пээмка, якога ўсе дражнілі «Па рублю». Той, доўга не думаючы, хапіў бутэльку і агрэў Пшоніка па карку: быў не вінаваты. Пшонік заляпіў аплявуху ў адказ; вочы ў яго былі разгубленыя: рушыўся пясчаны замак ягонага аўтарытэту, за які ўвесь час дрыжаў бы асінавы ліст, і які з такою натугаю пнуўся будаваць высокім. Колькі цяпер Пшоніку перажыванняў! Як таму футбалісту, які не забіў мяч з пенальці ў важным матчы.

Зрэшты, перажыванняў хапала і мне. Радасна і той жа час страшна было думаць, што закахаўся. Праўду пісаў Купрын: слабае каханне разлука тушыць, моцнае распальвае з большаю сілаю. Я, каб пераканацца, ці па-сапраўднаму кахаю, прымушаў сябе знайсці ў Любе нешта такое, што сапсавала б мне настрой, засмуціла, але, як ні дзіўна, чымся болей я прыпісваў ёй заган, тым болей мацнелі пачуцці да яе. Я не спаў уночы; у шырокія вокны свяціў месяц, і ў яго блакітным святле я запісваў у блакнот думкі, якія бушавалі ў галаве яшчэ і ад таго, што ў кнізе Цвейга пра Бальзака было

напісана шмат пра каханне і жанчын. Дзіўны, канечне, быў Бальзак да жанчын: яму заўсёды падабаліся тыя жанчыны, якія пераўзыходзілі яго вопытнасцю і ўзростам і дазвалялі яму глядзець на іх знізу ўверх. Адсюль выраз «бальзакаўскае каханне» — калі *ён* многа маладзейшы за *яе*. У мяне, на жаль ці на шчасце, каханне было звычайнае, яно жыло і трапятала ў душы ўпартым, рашучым, гарачым матыльком. Я баяўся, што гэты матылёк вырвецца і абпаліць крыльцы ў полымі якой-небудзь жыццёвай нягоды.

* * *

Пятро Максімавіч прыехаў у суботу надвечар. За вокнамі сіпеў вецер. Пад дахам за сенцамі стукала каса, а можа, яшчэ там нешта звінючае вісела. Галіна Андрэеўна не магла схаваць радаснай усмешкі, выйшла насустрач мужу.

— Як даехаў?

— Хо, такая маладайка праводзіла на аўтобус! — сказаў вясёлым голасам Пятро Максімавіч. — Ружоващчокая, з яснымі вачыма пампушачка... Аж нянечкай нязвыкла яе называць.

Потым яны доўга, да позняй ночы, сядзелі ў зале на канапе і ўголас гадалі, што будзе з сынам, Сцяпанам. Святла не ўключалі: ім, як і мне ў пакоі, свяціў месяц. Яго мяккае, малочнае святло веяла спакоем, але на душы ў мяне было неспакойна, не давалі заснуць словы, якія Пятро Максімавіч сказаў жонцы: «Слязамі не паможаш. Слёзы — вада, калі галаве бяда. Лепей думаць, як жыць».

Уранні я зайшоў на кухню. Гаспадары сядзелі за сталом. Снедалі. У нос мне шыбанулі густыя змешаныя пахі: мабыць, Галіна Андрэеўна ўстала зусім рана, а можа, і зусім не лажылася спаць, нагатавала яды і цяпер карміла мужа. Твары ў абаіх былі невясёлыя, зрэзаныя вострымі маршчынамі. Я адчуў сябе ніякавата.

— Частуйцеся, Коля, апельсінамі, — сказала Галіна Андрэеўна.

На стале ў вялікай зялёнай паліванай місе горкаю блішчалі буйныя аранжавыя апельсіны, акурат маленькія тугія сонцы; на кожным прыклеены чорны ромбік, на якім лацінкаю напісана: МАРОКА. Апельсіны былі з далёкай Афрыкі, да якой змалку чамусьці адчуваў

прыязнасць і цікавасць. Пра што ў жыцці мы толькі не марым. Дзівакі!

Пятро Максімавіч і Галіна Андрэеўна не хаваліся і нічога не ўтойвалі ад мяне. Званіў заўчора Сцяпан: з жонкаю развёўся і дачку (самае дзіва) прысудзілі яму, і было б яшчэ большае дзіва, калі б пакінулі яе пры маці-істэрычцы, якая здзекавалася не толькі з мужа, але і з малой, «за тое, што яна ад Сцяпана»: біла яе, нават выганяла на балкон; суседзі гэта пасведчылі. Як і многае іншае ў сямейным жыцці, я не разумеў, адкуль у жанчыны такая жорсткасць. Можна злаваць, крычаць, ірваць на сабе валасы, дамагаючыся ісціны, справядлівасці, але пры чым і навошта тут жорсткасць; можна апраўдваць адну жорсткасць, гэта — жорсткасць у праўдзе.

Дзяўчынка, дарэчы, Люба, сёлета пайшла ў першы клас: за ёй патрэбна вока, яе трэба сустракаць са школы, карміць, мыць фартушкі, вучыць з ёй урокі. Сцяпану аднаму, які з рання да вечара на заводзе, вядома, не выкруціцца. Хацелі спярша Любу прывезці сюды, да дзеда і бабулі; але нядобра будзе, падумалі, збіваць з тропу дзяўчынку, у якой толькі-толькі школьная сцяжынка пачалася. Пагадзіліся так: Галіна Андрэеўна пасля першай чвэрці падасць заяву на звальненне і паедзе на нейкі час гадаваць унучку. Лёгка сказаць — паедзе.

У акно я бачыў, як у небе пад воблакамі кружылі маленькія, бы ластаўкі, вароны, а яшчэ вышэй чарціў прамую, бы дрот, лінію белы самалёцік — яна, здавалася, злучала зямлю з нечым такім недасяжна-высокім і чыстым, што можа быць адно там, дзе няма людзей. А дзе іх няма? Існуюць гіпотэзы, што ў Сусвеце мы не адны, і ўсім трэба мірыцца, бо ўсім нам свеціць адно сонца. Хто б ні засціў яго — загінуць усе.

— Можа б, вы, Коля, паглядзелі пакуль за Пятром Максімавічам? — спытала нарэшце Галіна Андрэеўна, а мне стала сорамна: не мог сам наперад здагадацца. Дурань, вечна гэта стрыманасць падводзіць!

— Пра што гаворка! — сказаў я, злуючы на сябе. — Не хвалюйцеся...

Я не крывіў душою, мне і праўда не было страшна заставацца з Пятром Максімавічам: не такі ўжо ён бяспомачны.

...У першую нядзелю зімы Галіна Андрэеўна выбралася ў далёкую дарогу. Яна была ў рудым, з пясцовым каўняром, паліто, на галаве пуховая хустка, на якую мякка садзіліся лёгкія сняжынкі, гарэлі ў промнях ранішняга сонца ружовымі іскрынкамі. Мы з Пятром Максімавічам праводзілі яе да чыгуначнай станцыі; я нёс напакаваную сумку. Чакалі поезда нядоўга, ён прыйшоў як гарачы ўздыблены конь: і праўда, на такую далёкую дарогу патрэбна сілішча не абы-якая. Я пакінуў іх адных. Галіна Андрэеўна глянула на мяне з нейкай даверлівай самотаю.

Вярнуўшыся, я хацеў ісці ў рэдакцыю, мяне чакаў недапісаны нарыс, але ўтрымала дзіўнае пачуццё, якога раней не ведаў: нібыта я ўцякаю ад нейкай святой справы ці, прынамсі, адлучаю сябе ад таго, з чым абы-якава размінуцца ніяк нельга.

За перагародкаю тупаў па хаце Пятро Максімавіч: людзі без рук моцна тупаюць нагамі; уздыхаў і кашляў... хай даруе! — неяк вымушана, каб толькі паказаць мне, што ён заклапочаны. Я адчыніў фортачку: у твар патыхнула мятнай, цвярозлівай свежасцю, якую прынеслі пылінкі інею, што зрываў вецер з галін яблыні. Пастукаў, неяк нясмела зайшоў у пакой Пятро Максімавіч.

— Ну, абжыўся ў нас? — спытаў ён з усмешкаю на вуснах і ў вачах.

— Такіх ціхіх кватэр мала дзе знойдзеш! — сказаў я, і ён заўсміхаўся шырэй, вальней, з дзіцячаю непасрэднасцю гледзячы мне ў вочы і як бы спрабуючы нанова разгадаць мяне: мабыць, напаследак яны з Галінаю Андрэеўнаю абменьваліся ўражаннямі, думкамі, ці можна на мяне спадзявацца.

— Можа, вам што памагчы, дык — калі ласка? — спытаў я і ўбачыў, як з твару і вачэй Пятра Максімавіча імгненна знікла хваравіта застылая нерашучасць. Ён сеў за стол, глянуў у акно ў сад, прыжмурыўся.

— Без тваёй помачы я не чалавек, а палена дроў, — сказаў ён жорсткую ісціну, а засмяяўся звыкла і будзённа, бы ў адказ на які-небудзь пусценькі жарт. І толькі мне было не да смешачак, у мяне валасы дыбком сталі, заварушыліся. Вострае спачуванне абудзілася ў маёй душы, і я замяўся, думаючы, што адказаць, але так і не знайшоў слова: у такіх выпадках звычайна выручае жарт; але каб жартаваць нават з сябрам, край

важна ведаць мяжу нахабства, якое можна дазволіць з ім, а тут... Я маўчаў, хаця мімікаю твару, вачыма, якіх не хаваў, рукамі паказваў, што гатовы на любую помач. — І ўсё гэта вайна, праклятая вайна!.. Што яна зрабіла са мною і з тысячамі такіх, як я... Быў жа ў шпіталі, бачыў...

— Ды ў мяне бацька без нагі... Сталінградзец!

— А, ага... Ну во! Што табе гаварыць, сам бачыў усё. У першыя гады пасля вайны я не мог адкараскацца ад сноў, яны душылі мяне за горла, за грудзі, я выў, стагнаў... так, як выюць, калі ляцяць, снарады... Думаў, што Галіна мая мяне кіне... дурны, падумае. Аж не. Устане, сядзе каля мяне і суцяшае... Цяпер жонкі так мужыкоў не глядзяць. У іх, кажуць, асабістае жыццё. Якое ліха асабістае, калі ты замуж ішла? Я вот часта думаю, цяперашняя жанчына не няньчылася б са мною і дня, кінула б. Яй-богу, кінула б. Яны цяпер харошых, здаровых мужчын кідаюць, не ладзяць з імі. Бачыце, характарамі не сышліся. Дзіва што — не сышліся: аднакавых жа людзей няма, хоць трэсні. І суды патураюць ім... А тут трэба строга, і з іх, гэтых легкадумных жанчын, пытаць: «Вы чаму рушыце сям'ю? Хто вам даў права? Яна — не толькі ваша воля». Пень вунь як паточаны чарвякамі ды жукамі, а стаіць... А то чуць што, якая трэшчынка — на развод. Безадказнасць! Канечне, цяпер лёгка жыць, дзяцей гадаваць, дзяржава клапоціцца... Паспрабавала б каторая пасля вайны мужыка адкінуць... Жыццё — як тая луста хлеба, намазаная з двух бакоў: з аднаго мёд, з другога гарчыца, так і жуеш горкае і салодкае разам, а то лізнеш з аднаго боку, тады з другога... І мы не святыя, і ў нас з Галінаю ўсякага было. Ну, але ж пасварымся, папсіхуем і тут жа памірымся... Заўсёды яна першая адтайвала... І было ёй чым і магла б сгразіць мне, але падыдзе пасля сваркі, абніме, пацалуе мне во сюды ў лысую макушку: «Што табе, Пеця, падаць?» Уткнуся ёй у рукі, слязамі іх памыю і далей жыць...

Я ўбачыў, як у Пятра Максімавіча вільготна заблішчалі вочы, ён адвёў іх да акна, ад чаго бляск у іх яшчэ болей пагусцеў. Я не ведаў, што мне рабіць у гэтую мінуту, напэўна, трэба даць Пятру Максімавічу супакоіцца, а потым я буду лавіць яго кожнае жаданне, сачыць за кожным крокам, каб ён нідзе ні ў чым не высільваўся...

* * *

Яго быў розум, а мае — рукі: ён гаварыў мне, што яму трэба, дзе што ляжыць, і я рабіў. Я ўпершыню адкрываў сабе, што ўсё ў гэтым доме, так ці іначай, прыстасавана «на руку» Пятру Максімавічу. Выключальнікі на сценах — не проста кнопкі ці невялікія дзюбікі, а шырокія пластмасавыя планкі, якіх адно краніся, і яны шчоўкаюць; у рэпрадуктары «Сож» замест колца ўманціравана крыжавінка — як прапелер, здаецца, яна зрушыцца ад камара.

Каб і далей было зразумела, што ды як, і чаму я раблю іменна так, а не гэтак, мусіць, трэба ўсё-ткі апісаць *рукі* Пятра Максімавіча: я іх добра разгледзеў калі зашпільваў яму сарочку. Гузікі на сарочцы былі дробненькія, бы лубін, яны выслізвалі з пальцаў; Пятро Максімавіч як мага кручэй задзіраў уверх падбародак, асцерагаючыся, каб я не дакрануўся да яго скуры. Мабыць, дотык чужых мужчынскіх рук ужо сам па сабе непрывычны, а ўдабавак Пятро Максімавіч не хацеў здацца панам, які сядзіць, бы мумія, і не варухне пальцам. А можа, і яшчэ нешта бянтэжыла Пятра Максімавіча, толькі ўчора, калі сарочку зашпільвала яму жонка, ён быў зусім абыякавы да яе рук і размаўляў без натугі.

Ад плеч рукі былі тонкія, бы чапялішнік, з тоўстымі вузламі ў локцях; левая, ніжэй локця, заканчвалася каструбаватаю, няроўнаю зросцвінаю; правая была даўжэйшая — дактары, набраўшы з нагі мышачных валокнаў, «нарасцілі» на ёй як бы два пальцы, іх можна было крыху развесці: яна вельмі нагадвала рачыную клюшню, той і розніцы, што большая ды мяккая — адзін палец цалкам з мякаці, а ў другім прамянёвая косць.

Гэтымі куцкамі Пятро Максімавіч тое-сёе мог рабіць і без чыёй-небудзь помачы. Мы селі за стол. Пятро Максімавіч папрасіў, каб я выставіў з судніка бутэльку віна, ён прывёз яе з Мінска нібыта ў аддзяку за мае старанні. Сала, каўбасу, гуркі і хлеб я парэзаў тонюсенькімі, аж свіцяцца, скрылькамі, расклаў не на талерках, а на драўляным самаробным кружку (ці, як у нас кажуць, на крышцы — ад слова «крышыць») — вельмі тоўстым, але не выпадкова, а для зручнасці. Скрылькі ляжалі роўненькім веерам, канцамі навісалі з кружка.

Сабе я наліў у высокі зеленаваты фужэр, а Пятру Максімавічу — у алюмініевую конаўку, салдацкую, прынесеную з вайны. Ён зацісную конаўку куцкамі і стаў піць.

Пятро Максімавіч падчапіў скрылёк, узяў яго ў зубы і, задраўшы галаву, каўтнуў, як бусел. Можа, гэта было б і смешным, калі б бачыў у казцы, а тут нават адна думка пра смех палохала ды прыгнятала з такою адчайнасцю, як быццам вычвараў нешта непамыснае і зусім бязглуздае.

Шчокі ў Пятра Максімавіча зразу паружавелі; ён ахвотна ладзіў гаворку, і я здзівіўся не меней, чымся тады ў шпіталі, яго ўменню гаварыць натуральна і проста. Як вада, разліваючыся, затапляе ўсё большую прастору, так гаворка падагрэтых шчырасцю людзей пашырае кола тэм, часам да неверагоднасці далёкіх, не звязаных ні логікаю фактаў, ні вопытам субяседнікаў. Мабыць, чалавечая памяць дзейнічае па прынцыпу більярдных шароў: адзін шар, ударыўшыся ў кучу, разбівае яе, усе астатнія, бязладна стукаючыся, раскочваюцца ў самых розных напрамках.

Пятро Максімавіч прызнаўся мне (і тут я ўспомніў Альбуціну, зразумеў яе завіханне), што яны з Галінаю Андрэеўнаю не ўзялі на кватэру Пшоніка; ён, Пшонік, праўда, не вельмі настойліва прасіўся, затое Альбуціна ледзь не маліла, сціскаючы кулачкі і трасучы імі ў парыве расчуленасці. Пятро Максімавіч, канечне, рызыкаваў, адкрываючыся мне, бо не ведаў нашых з Пшонікам адносін. А раптам мы сябры-прыяцелі, у добрым ладзе між сабою? Дык вось, можа б, іншы і паасцерагаўся, але Пятро Максімавіч цвёрда заявіў: «Ён не спадабаўся мне». Звычайна такая прамалінейнасць бывае ці то ў людзей сумленных і ўпэўненых, ці то, наўпярок, легкадумных і самалюбівых, якія нічым не могуць надаць сабе вартасці, акрамя як жорсткім безаглядным ганьбаваннем іншага, нярэдка многа лепшага за сябе чалавека.

Пятро Максімавіч ведаў Пшоніка не толькі па «раёнцы», але і ў твар. Яны пазнаёміліся з паўгода назад. Пшонік прыходзіў у пэмка меліярацыі; браў матэрыял аб спаборніцтве дрэнажных брыгад. Начальнік, той самы важны, самаўпэўнены малады чалавек у лётчыцкай куртцы, з якім я пазнаёміўся, калі пісаў свой першы рэдакцыйны матэрыял і які здзівіў мяне гучным

голасам, прыставіў да Пшоніка Пятра Максімавіча, свайго намесніка. Яны пасядзелі з Пшонікам у кабінеце, пераварушылі горы папер, папак — дзіва што: Пшонік уедлівы і скрупулёзны ў адборы фактаў, а ў іх падачы заўсёды сухавата-аднастайны. Потым паехалі на «ўазіку» да Велькага Балота: там укладвалі трубку дзве перадавыя брыгады. Было сонечна, і ганчарная трубка тоўстаю чырвонаю гадзюкаю ляжала ў зялёнай траве.

Пшонік гутарыў з прарабам, пажылым сівым чалавекам, рабочымі; запісваў у блакнот лічбы, факты, прозвішчы; твар у яго быў сур'ёзны, заклапочаны, белыя вейкі не міргалі — усё разам гаварыла: чалавек салідны, мае адказнае заданне, а ў сутнасці ўся яго натужная напышлівасць бралася ад жадання пакрасавацца, паважнічаць.

З рабочым людам у бірулькі гуляць заўсёды небяспечна, на месца паставяць як бачыш. Адна сярэдніх гадоў жанчына, высокая, дужая ў плячах, з моцным загарэлым тварам, рэзнула Пшоніку ў вочы, калі ён прычапіўся, што яна паклала ў канаўку вышчарбленую трубку: «Навучы сваю матку ў бутэльку...!»

Пятро Максімавіч расказваў і пасміхаўся нейкай невыразнай усмешкаю, а потым схмурыў бровы.

— Мы праездзілі з ім, лічы, цэлы дзень. Вярнуліся ў кантору. Я і кажу яму: «Трэба паабедаць, Віктар Якаўлевіч...» Проста так прапанаваў, ведаю ж, чалавек галодны... можа, і ўранні перахапіў толькі. І што б ты думаў, Коля? — Пятро Максімавіч глянуў на мяне, ці пільна слухаю; потым зняў з кружка скрылёк каўбасы, злавіў яго губамі. — І што б ты думаў? — паўтарыў ён, мабыць, сумняваючыся, расказваць мне або змаўчаць усё-такі, і спрабуючы ўгадаць, ці ведаю я што-небудзь. — Гэты Пшонік заяўляе мне: «Ні ў якім разе! Я буду пісаць крытычны артыкул — у вас у спаборніцтве шмат фармалізму, пустой траскатні, папер усякіх... І мала што вы потым нагаворыце на мяне ў райком». «Дзіцятка ты маё, — падумаў я тады, ледзь стрымліваючы ў сабе злосць, — за каго ты мяне прымаеш? Ды сто гадоў ты не патрэбен мне, смаркач, са сваёю абачлівасцю!» Падумаў, але Пшоніку нічога не сказаў, развітаўся і пайшоў. Я, калека, стары, бяспомачны чалавек, франтавік, буду на яго пляткарыць... — Пятро Максімавіч, мабыць, ужо захмялеў, круціў нізка апуш-

чапаю галавою, і мне балюча было глядзець на ягоную патыліцу з сіняватаю ямачкаю і гузаком.

Гэта Пшонікава закарэлая «правільнасць» мяне заўсёды раздражняла, і калі б я ўспрымаў яе ўсур'ёз, то ў мяне ўжо даўно лопнуў бы ад абурэння той чуйны, шматпакутны і надзіва трывушчы орган, які мы называем *сэрцам*.

Непрыязнасць да Пшоніка з гэтага дня засела ў маім сэрцы ўчэпіста; я насіў яе, адчуваючы, што яна муляе мне, як бы качаецца цвёрдым комам ад рэбраў да рэбраў; гэта фізічнае адчуванне было невыноснае, і ком нарэшце разарваўся, бы тая граната, і я заехаў Пшоніку аплявуху. Падагрэла тое, што Пшонік пасадзіў мяне напроці і стаў правіць мой нарыс аб трактарысце, выкідваць цэлыя абзацы, сказы. Хацеў паказаць не столькі сваё ўмельства, колькі ўладу нада мною. І калі ён тлустаю рыскаю закрэсліў мой загаловак «Блакітныя ўсходы», а надпісаў свой — «Поле, як стол» — я не ўтрываў.

Мы былі ўдвух у кабінеце. Пшонік, як уджалены зняцяйкі, падхапіўся — адляцела да сцяны крэсла, — але я асадзіў яго цвёрдым і рашучым узмахам кулака.

— Толькі сунься!

Ён ігненна абмяк, пабялеў, адно левая шчака, як бінт крывёю, усё яшчэ налівалася бураковаю чырванню.

— Добра, добранька, — працадзіў ён, намякаючы на нейкую сілу, што стаіць у яго за плячыма і якую возьме ў саюзнікі, — разбярэмся...

Назаўтра рэдактар сабраў экстранную «лятучку»: «пабілі» адказнага сакратара. І хаця Пшонікава абвінавачанне заглушыў дружны рогат, не смяялася толькі Альбуціна, мне заляпілі вымову, бо я наадрэз адмовіўся вініцца перад Пшонікам. Ён сядзеў зацяты, натапыраны, і я бачыў, што гэтым яго помста не скончыцца. Дзіўна, але я не адчуваў прыгнечанасці, да якой іншым разам лёгка магла б давесці мяне вымова, я нават радаваўся нейкай тупой зларадна́й радасцю.

Жыццё тым часам не стаяла на месцы; кожны дзень уранні я наразаў тоненькімі скрылькамі сала і хлеб, калі варылі булён — мяса, лажыў на кружок; ставіў побач алюмініевую конаўку вады; вядро на табурэтцы заўсёды пакідаў паўнюткім — Пятро Максімавіч часта піў набгом.

Снедалі і вячэралі мы зазвычай разам. Пятро Максімавіч сам умеў сёрбаць з конаўкі булён, аднак толькі поліўку, а гушча злягалася на дне, і тады я карміў яго з лыжкі. Пятро Максімавіч чырванеў, калі абліваўся, але памалу асвойваўся; і я смела паіў яго чаем: халодную каноўку ён мог трымаць, а трохі цёплая ўжо апякала яму скуру — на куцках яна была вельмі далікатная і адчувала нават слабы дотык. Пятро Максімавіч у гэтым спярша не прызнаваўся, але я бачыў, як ён моршчыцца, калі п'е, здавалася б, астылы булён.

— Што, баліць? — спытаў я.

Ён збянтэжыўся, вочы яго нерухома глядзелі ў адну кропку, а мышцы твару нервова патузваліся.

— Пячэ, — сказаў ён з непасрэднасцю, на якую быў здольны, і я зразумеў, што мы — свае, што душы нашы ўжо не далікацяцца і не баяцца тонкага ляза ўзаемных прызнанняў. Я не ў сэнсе сваяцкага ахвяравання, а ў сэнсе радасці, якую прыносіць чалавеку шчырая прыязнасць іншага. Чаго толькі не бывае на вяку, як кажуць, і па спіне і па баку, і тады адно толькі спадзяванне на людскую чуласць дае сілу.

Я помню, як хлапчуком параніў нагу; быў адзін дома, лазіў па ліпах на гародзе, стрэхах, па частакол-лі — святло дзіцячай душы заўсёды імкне ўвысь, тады як дарослай нярэдка тухне ў нізкім брудзе распусты. І вось гоцнуў з паляніцы дроў на старую табурэтку. Табурэтка крых! — і я выцяўся каленам аб востры край сасновай чуркі. Спярша болю не адчуў; лапнуў рукою за калена і праз штаны замацаў цёплую ямку. Сашмаргнуў калашыну і ўскрыкнуў: на калене ў рассечыне ўбачыў голую сінюю косць. Крыві чамусьці не было; я ледзь не самлеў; сядзеў на зямлі і плакаў.

Той парою ў нашу Малінаўку якраз праводзілі электрыку; па вуліцы гурчалі трактары, з каўшамі і без каўшоў; хадзілі, бразгаючы цяжкімі ланцугамі, электрамантажнікі, і аднаго, мабыць, спыніў каля хаты мой плач. Мог бы, канечне, мог бы не пачуць, прайсці міма, падумаўшы, мала чаго крычыць дзіця, можа, маці матузоў дала. Але, бачу, заходзіць на двор чужы дзядзька, як зараз помню: высокі, рыжы, з вялікім носам і светлымі, блакітнымі вачыма, якія пытаюць: «Што, герой, плачаш?» А я ўжо сабраўся паміраць і думаў, што ў мяне голасу няма. Маўчу. Ён нешта гаворыць, а мне вушы заклала, як ватаю, не чую. Усё-такі

здагадаўся паказаць рану. Ён хуценька згроб мяне ў ахапку ды ў трактар; завезлі на Ходраў у бальніцу (цяпер яе называюць ФАП). Доктарку, цётку Аню, я ведаў: прыходзіла рабіць прышчэпкі ад адзёру. Круглатварая, з пухлымі чырвонымі вуснамі, трошкі гугнявым голасам і белымі, як бінт, валасамі; мы нават склалі пра яе прыпеўку:

На гары стаіць бальніца,
А над ёю зорачка —
Выйшла Анька із бальніцы —
Развязалась борачка...

«Борачка» — гэта ў нас тое, што і шнурок.

Цётка Аня сашчапіла маю рану маленькімі бліскучымі дужкамі, падобнымі на падкоўкі; зусім не балюча было, хоць і цяклі па назе тоненькія, бы нітка, стру- меньчыкі крыві; забінтавала; мяне павёз дахаты той жа «Беларус». Маці, убачыўшы мяне на руках у чужога чалавека, загаласіла...

Я часта думаю: чалавек не павінен гнаць ад сябе, з душы сваёй чуласць, а наўпярок, песціць яе, як мой былы гаспадар дзядзька Кузьма песціць птушак, і яны ляцяць да яго з усіх краёў, пазнаюць і не баяцца...

* * *

Тыдні праз два, як паехала з двара Галіна Андрэеўна, я ўжо ледзь не шкадаваў, што застаўся з Пятром Максімавічам, што звязаны, заўсёды вельмі трывалаю для мяне, вяроўкаю абяцання.

Мае апавяданні (штотыднёвік надрукаваў яшчэ адно) заўважыў той-сёй з сектара друку абкома, хаця, хто яго ведае, можа, нешта іншае, аб чым я і блізка не здагадваюся, сказала сваё апошняе слова. Але голас у трубцы, які запрашаў прыехаць у сектар друку, упамянуў іменна апавяданні ў штотыднёвіку.

Была раніца. На зямлі ляжаў снег, а на дрэвах — іней. Востра пахлі мазутам шпалы; як адуванчыкі, бялеліся на стыках рэек намарожаныя балты. Тоненька папіскваў ручкаю «дыпламат». Я думаў: няўжо павышэнне? Гэта запаветная мара, бадай, кожнага журналіста-раёншчыка — трапіць у вышэйшую рангам газету: там і часу болей, каб пасядзець над матэрыялам, і прэстыж, і, нарэшце, ганарары большыя, дый кватэру можна часам хутчэй атрымаць.

Загадчык сектара Тарасюк, маладжавы мужчына, з чорнымі, густымі, зачэсанымі назад валасамі, шырокім тварам, які ажыўлялі вялікія, па-мангольску раскосыя вочы, павітаўся са мною за руку; пачакаў, пакуль я супакоюся.

— Вы, мабыць, здагадаліся, што мы хочам прапанаваць вам павышэнне. Вызвалілася пасада карэспандэнта аддзела культуры ў абласной газеце.

— Трэба падумаць, — сказаў я, хоць шмат перадумаў дарогаю. У загадчыка сектара закраталіся ад здзіўлення чорныя бровы: мусіць, яму было непрывычна, што чалавек, якому прапанавалі павышэнне, не абрадаваўся, не падаў хапатліва ўдзячную руку і, відаць, не з-за разгубленасці або мінутнай слабасці, а свядома.

— Падумайце, — сказаў ён, кораценька бліснуўшы на мяне сваімі раскосымі вачыма; і гэты яго кароткі зычлівы пагляд — прымета сарамлівага і стрыманага чалавека, як часта думаў я, — пранік дакорам і спачуваннем у маю душу. За каго ён, мабыць, таксама вясковы хлопец, які выбіўся ў людзі, мяне палічыў?

Я хадзіў па скверы і думаў. Снег лёг пасля марозаў на цвёрдую зямлю і не раставаў: рыпаў пад нагамі, на лісці, па якім слізгала, бы па шкле, падэшва чаравікаў. На дарожках шукалі спажыву галкі, пухнатыя, шызыя, як дым; калі я набліжаўся да іх, яны ўзляталі і садзіліся на таполі, з галін сыпаўся дробненькі сінявакты пылок.

Мне было холадна: мароз ледзяною ніткаю сучыўся за каўнер паліто, калоў у пальцы левай рукі, на якую, падчас хвалявання, я не надзяваю пальчатку, трымаю ў правай руцэ.

Ці будзе яшчэ калі такая ласка? Можа, гэта, як кажуць, прабіў мой зорны час? Прапусці яго — і ты сярод тых людзей, якія лічаць сябе няўдачнікамі, а па сутнасці, людзі кволыя, бязвольныя і ў нечым нават абмежаваныя. Думаць, што ўсё жыццё фартуна будзе абмінаць цябе, неймаверна цяжка і горка. Апускаюцца рукі, душу разрывае адчай, не-не дый мільгане думка пра смерць. З-за дробязі? Не. Пісаў Случэўскі: «И капля волн полна трагедий и неизбежности полна».

Глупства! Трагедыя ў тых людзей, у якіх жыццё так ці інакш азмрочана, збеднена бязлітаснаю непазбежнасцю, і няма сілы, а часам і сэнсу яго паправіць, на-

ват намаганняў усяго Сусвету мала, хаця ў магію Сусвету, яго тайн, што яшчэ не праясніліся да апошняй, нельга не верыць.

Ад промняў сонца снег здаваўся зіхатліва-белым, як дробненька пацёрты цукар, цені — сінімі, а лісце бурштынава-жоўтым; усе гэтыя колеры мяняліся ў маіх вачах, як і думкі ў галаве, як і сляды на дарожцы...

Я баяўся думаць пра Любу. Яна з такою надзеяй і пакорлівай дзіцячаю безагляднасцю кінулася ў загадкавае сіло мужчынскай прыязнасці, а яно ж так часта аказваецца нетрывалым і бяздушна-рацыяналістычным. Надзея, якая не спраўджаецца, падобна птушцы, што гіне ад холаду і голаду ў мароз; абедзве маглі б жыць і радаваць людзей: першая — чаканнем светлай азоранасці, другая — песнямі.

Пасля доўгага пакутлівага роздуму я зноў пастукаў у дзверы загадчыка сектара. Тарасюк стаяў каля акна, сашчапіўшы на грудзях рукі. У яго вялікіх раскосых вачах не было ранейшай дапытлівасці, у іх плавала пасляабедзенная млявасць, і шырокі твар яшчэ болей свяціўся дабрадушнасцю. Мне вельмі не хацелася засмучаць чалавека, але я сказаў:

— Прабачце, што прынёс вам столькі турбот... Я застаюся ў Рэпкавічах.

Ён чамусьці не спытаў, што мяне трымае ў тых далёкіх Рэпкавічах на ўскраіне Магілёўшчыны. Сеў за стол, хацеў падняць руку, але апусціў яе ў безнадзейнай вяласці.

— Глядзі, Бібічык, на адным месцы і валун мохам абрастае.

Я вярнуўся ў Рэпкавічы з няпэўнасцю і пустатою на душы. У акне ў зале гарэла святло. Пятро Максімавіч сядзеў на канапе, перад ім ляжала разгорнутая «раёнка»; без акуляраў, ён далёка адхіляў галаву; глянуў на мяне, але я ўпершыню не абазваўся да яго словам, адно падышоў і моўчкі начапіў яму на нос акуляры. Змрок бязвольнасці скаваў мяне ўсяго.

Шумеў за шыбамі снег, акурат нехта чвахаў сухім венікам. За перагародкаю, у глыбіні хаты, цікалі ходзікі — як водгалас нечага няздзейсненага, затуманенага часам і выкрасленага назаўсёды з душы.

А разабрацца, чаму яны зачапіліся за мяне? Няхай

вунь Пшоніка бяруць, дзякуй скажа. Я засынаў недзе ўнутры, а тое, што заглушае свядомасць, было надзіва ясным, і думкі прыходзілі выразныя. Мабыць, у такой пачуццёвай раздвоенасці я і пратлуміўся ўсю ноч, бо ўранні не мог прысіліць сябе ўстаць з ложка: у целе і ў галаве не было бадзёрасці. Але чалавеку на тое і даецца воля, каб перамагаць слабасці, якімі ён абрастае, здаецца, шчодра і за якімі стаіць адмета ягонай жывой натуры.

У канцы тыдня ў горад нечакана зноў вярнулася восень — цяпло і сонца. Растаў снег. Над раскіслаю зямлёю паплылі густыя слаістыя туманы, якія цяпер часта нейкім чынам выпускаюць на сцэну, калі на ёй спявае ансамбль ці які спявак. З цяплом і сонцам да чалавека прыходзіць радасць, і я пакрысе забываў сваю паездку ў абком.

Але восеньская пагода ненадзейная, як ласка жаночага сэрца. І зноў усхапіліся шорсткія паўночныя вятры, вылізалі паветра да празрыстай, ледзяной яснасці. З неба падалі дробныя белыя крупкі, падскаквалі над зямлёю.

Дзівосаў у чалавеку колькі заўгодна; мне дзіўна было, што я, ходзячы ў лазню, ніколі і блізка не падумаў, каб запрасіць з сабою Пятра Максімавіча. І раптам мяне пранізала: «А Пятро Максімавіч?..» І я ўспомніў той жа міг і зразумеў, чаму з безнадзейным сумам глядзелі мне ўслед вочы Пятра Максімавіча, калі я з венікам пад пахаю выходзіў з двара; ён жа, Пятро Максімавіч, таксама неяк мыецца ў лазні і, як кожны мужчына, мабыць, любіць дух.

Пятро Максімавіч сядзеў перад тэлевізарам. На экране ў блакітнай мітуслівай смузе стаялі цыбатыя белыя птушкі з дзіўнаю назваю — фламінга.

— Я іду ў лазню, дык хачу і вас запрасіць, — сказаў я, палюбаваўшыся колькі хвілін на птушак. Пятро Максімавіч спавольна падняўся з крэсла, а потым нечакана замітусіўся, як хлапчук. Голас у яго быў дрыготкі і разгублены, калі ён гаварыў мне:

— Сетка вунь на цвіку вісіць, каля акна... Махровы ручнік у шафе, там і бялізна на змену. Вяхотка і мыла ў сенцах на паліцы...

Па Рэпкавічах унутрыгарадскія аўтобусы не хадзілі: горад невялікі, з канца ў канец яго певень пераляціць. І ў лазню мы пайшлі пехатою. Вецер гнаў па небе

валавяную, густую каламуць, кратаў лысыя чубы тапо- ляў, закручваўся і свістаў у падстрэшшы. Людзі на вуліцах атульвалі высокімі каўнярамі патыліцы; стоячы на месцы, не вымалі з кішэняў рукі і прытупвалі нагамі. Падцяўшы хвост, бег сярэдзінаю дарогі худы, высокі клышаногі сабака, а насустрач яму ніца ляцелі вароны; у руху і сабакі, і варон было жаданне як хутчэй убіцца куды-небудзь у зáціш.

Лазня займала нізкі і даўгі мураваны будынак, пафарбаваны ў брудна-сіні колер, па якім унізе каля вокнаў, каля вентылятара і трубы-аддушыны пачварна распаўзліся рыжыя плямы, фарба лушчылася і адпадала. Вераб'і, што сядзелі на кустах бэзу, час ад часу зрываліся, хапалі яе на ляту, уяўляючы, а можа, і думаючы, што гэта матылькі.

У касу, па білеты, чаргі не было; затое ў самую лазню мы прастаялі з гадзіну, памалу пасоўваючыся да дзвярэй, з якіх адзін за адным выходзілі мужчыны — ружовыя і свежыя ў твары; на хаду дамаўляліся — што лепей: выпіць піва ці, можа, скінуцца па рублю.

Прымыльнік быў цеснаваты, вузкі, як тунель. Каля сцен стаялі высокія блакітна-зялёныя тумбачкі з пранумараванымі тазамі наверсе. Моцна пахла распараным бярозавым лісцем і мылам. На кафельнай падлозе блішчэла вада, па ёй шлёпалі босыя ногі.

У душавой на нізкіх шырокіх мармуровых лавах ляжалі і сядзелі мужчыны, з іх курэла пара, яны церліся вяхоткамі, плюхаліся, бы гусі, у вадзе. Мы з Пятром Максімавічам абдаліся пад душам; пайшлі ў парылку. Сухі гарачы дух пекануў за плечы і вушы, бы калючкаю. Бледнае худое цела Пятра Максімавіча вобміг пакрылася жоўценькімі, як проса, папурышкамі.

— Не, я ў такой гарачыні не магу, — сказаў ён; мы выйшлі з парылкі. — Рукі смыляць... — Паглядзеў на мяне як бы вінавата. — Калі не цяжка, абкруці мне іх майкаю і ручніком.

Я абматаў Пятру Максімавічу рукі.

— Во! Цяпер і я магу пацёпацца!.. — Пятро Максімавіч патузаў вузкімі, як у падлетка, неразвітымі плячамі.

Венік у тазіку з гарачаю вадою разбрыняў, і лісце сочна духмяніла бярозавым гаем, травою з узлеску. Успомнілася дзяцінства і ты распластаны ў траве на баравіне, стомлены пасля ягад ці грыбоў; угары шу

мяць сосны і відаць, як з галіны на галіну пералятаюць маленькія, бы мухі, птушачкі.

Пятро Максімавіч улёгся на сярэднюю лаўку, і я лёгенька патрос над яго спінаю венікам; рукі ён падкурчыў пад сябе, бы чалавек, які збіраецца паспаць на зямлі. Скура спярша схапілася рэдкаю чырванню, а потым густа пабарвавела. Пятро Максімавіч круціўся-варочаўся, як уюн. З мяне сыпаўся градам пот.

— Можа, падмяніць? — раптам пачуў я за спінаю. Каля мяне стаяў Пшонік і лыбіўся, скакала між бровамі барадаўка.

— Хопіць, Коля... Дзякуй!.. — сказаў Пятро Максімавіч і скаціўся з лаўкі. На хаду павітаўся з Пшонікам.

— Дык што не хвалішся, таварыш Бібічык? — У Пшонікавых вачах зноў было тое цынічнае чаканне, што і тады, калі пытаўся ў мяне пра новую кватэру.

— Было б чым, — сказаў я спакойна і, бадай, падсвядома, бо гэты час, як гаварыў, у галаве шукала выйсця думка: «Ужо пранюхаў! Не іначай жа, маю паездку ў абком мае на ўвазе». Я, канечне, здзівіўся не таму, што Пшонік ведае, куды і чаго мяне выклікалі, а таму, з якою фальшываю дабрадзейнасцю звярнуўся ён да мяне.

— Ну як жа, як жа... — Пшонік гулка барабаніў пальцамі па днішчы пустога таза. — Думаеш, не ведаю, чаму табою абком цікавіўся?

— А тут няма ніякае тайны.

— Калі б і хацеў утаіць, то не атрымалася б! — Пшонік пакараскаўся на лаўку. — Тарасюк, загадчык сектара, сябра мой. Разам некалі пачыналі селькорамі...

«Ну і добрая ж ты цаца, калі нават уплывовы сябар не можа выцягнуць цябе», — падумаў я, уразіўшыся тым, што Пшонік ні з таго ні з сяго перайшоў на шчырасць.

— Гэта я неяк намякнуў Тарасюку пра цябе, — Пшонік правёў венікам па крывых кароткіх і тоўстых, як слупы, нагах, да самых пятак аброслых валасамі.

— Ну, дзякуй табе! — сказаў я, усміхнуўшыся: не сумняваўся, што Пшонік ніколі мне не паспрыяе, хутчэй — нашкодзіць, а па-другое, ведаў я, што ён, можа, як ніхто іншы, даўно цэліўся шмыгануць з Рэпкавіч і, здаецца, наблізіўся да мэты, афармляў дакументы на нейкую вучобу.

Пшонік адчуў маю іронію, але не хацеў яе прымаць,

бо, мабыць, ўсё-такі не вынюхаў галоўнага — што я адмовіўся ад павышэння, — і хацеў, каб я прыпісваў і яму заслугу. Як ён паслужыў мне, я ведаю. Той званок з прыёмнай сакратара райкома Алёсіна быў незвычайны. Я падаў заяву на ўступленне ў партыю, і натуральна, са мною хацелі пагаварыць. Алёсін быў чалавек пажылы, з блакітнымі вачыма, высокаю сівою прычоскаю кучаравых валасоў і абаяльнай, даверлівай усмешкаю. Некалькі разоў ён званіў мне па тэлефоне, каб «пракаменціраваць» мой матэрыял, і я ведаў ягоны голас — мяккі, лірычны тэнар. Мне было прыемна і лёгка з ім размаўляць, я не адчуваў скаванасці, словы не блыталіся, самі прасіліся з языка. І тады я зайшоў у кабінет з дзіўным спакоем. Кабінет быў вялікі і светлы, усё ў ім ведала сваё месца, не кідалася надта ў вочы, была тая сціплая ўтульнасць, што ствараецца прыроджаным густам акуратыста і гаспадара.

— Як вам калектыў? — спытаў Алёсін, калі мы пагаварылі з ім пра жыццё-быццё, пра палітыку, пра тое, як у Хельсінкі праходзіць заключны этап Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Я бачыў, сакратар з цікавасцю слухаў мяне. — Чалавек вы новы.

— Працуем! І журналісты ўсе неблагія.

— А якая ў вас думка наконт Пшоніка? — нечакана спытаў сакратар.

Што я мог сказаць? Маўчаў.

— Няўжо ў вас не склалася яшчэ думка?

— Склалася. І даволі хутка.

— Усё зразумела.

Я ведаў, калі гаворыш пра чалавека кепскае, то пра цябе таксама не падумаеш добра. Гэта — ісціна. Ты гаворыш праўду, перад сабою і сумленнем чысты, а ўсё адно атрымліваецца, што ябеднічаеш, тым болей на чалавека, які вышэй цябе пасадаю. Тут можна прыпісаць табе што заўгодна — і кар'ерызм, і подласць. Нават калі сябры ў мяне пытаюць пра майго нядобразычліўца, я ніколі не «качу на яго бочкі». Не магу. Ніколі не трэба мераць чалавека па чужых, пачутых думках і меркаваннях, тут заўсёды будзе месца плёткам, трэба рабіць толькі свае вывады, даражыць толькі сваімі ўражаннямі пра чалавека. Можа, у падобных выпадках нехта робіць іначай, і якраз ён будзе лічыць іншага несумленным, бо не ўяўляе, як гэта, будучы ў ладзе з начальнікам, не плявузгаць на астатніх?

І радасна мне было, што Алёсін зразумеў мяне, хаця, можа, спярша і палічыў, што яму трэба ва ўсім давярацца, у размове з ім няма забароненага, таму і спытаў пра Пшоніка.

— Вы малайчына, а ён, між іншым, столькі нагаварыў на вас...

— Што я хуліган, бабнік, п'яніца?

Алёсін — разумны чалавек! — усміхнуўся.

— Максімум шчырасці і ноль фальшы, нават у дробязі — вось, мне здаецца, дэвіз для кожнага, хто бярэ ў рукі пяро, — сказаў Алёсін і паляпаў мяне па плячы.

Мы шчыра развіталіся. Праз тыдзень мяне зацвярджалі на бюро кандыдатам у члены КПСС. Я вельмі хваляваўся, але толькі да таго моманту, пакуль зайшоў у кабінет. Алёсін першы спытаў у мяне — не пра міжнароднае становішча, не пра статутныя патрабаванні, як я чакаў, а пра майго бацьку, якога не ведаў, але з анкетных дадзеных было відаць, што ён інвалід вайны.

— Як здароўе бацькі, дарма?

Я спачатку не зразумеў сэнс гэтага «дарма», а калі зразумеў, што сакратар ужываў яго ў сэнсе — як, нічога? — здранцвеласць зразу адкацілася; і болей не вярталася.

— Старая гвардыя не здае пазіцый! — напаўсур'ёзна, напаўжартам сказаў я, і многія з членаў бюро ўсміхнуліся.

Гэта быў самы шчаслівы дзень у маім жыцці, пра які Пшоніку я не сказаў ні слова.

...Пшонік, бліскучы ад поту, задаволена пакрэхтваў.

— Дзякуй! — паўтарыў я ўжо не ўсмешліва, а са злосцю.

— Дзякаваць будзеш потым, у рэстаране, — Пшонік, падобна, і праўда прымаў мяне за прасцячка, і гэта міжволі высмыквала з маёй душы нервовую нітачку, для якой толькі іголкі не было, каб укалоць. І я залез вышэй Пшоніка на лаўку і стаў з сілаю хвастаць сябе венікам, акурат за нешта дакараючы. За што, і сам не ведаў. «Во як табе! А во так табе! З перчыкам, з гарачанькім!..» — Я асатанела махаўся венікам. Мяне штурхануў локцем тоўсты дзядзька, у якога жывот сплыў на калені, як белы мяшок мукі.

— Не давядзецца, на жаль, мне весці цябе ў рэстаран, — сказаў я Пшоніку, стоячы ў душавой пад «дожджыкам» і падстаўляючы тугім халодным струменям твар, спіну, грудзі.

— Зажаўся?

— Не пайду я ў абласную газету.

— Чаму? — Пшонік закруціў кран і лыпаў мокрымі белымі вейкамі.

— А навошта... з тваёй помаччу?

— ?!

Пшонік нахіліў да пляча, набок, галаву, як курыца, калі глядзіць у неба.

«Ну і няхай думае, што я паверыў».

Пятро Максімавіч сядзеў у прымыльніку на лаўцы — шыза-ружовы, як сунічнае мыла; вузлаватыя локці яго стаялі на каленях, але ён не мог падперціся ў шчокі; на абрубках ужо не было ні майкі, ні ручніка — сашмаргнуў сам. Пятро Максімавіч у такой зажуранай позе быў нейкі мізэрны, убогі і няшчасны. Я спачуваў яму ўсёй душою, і калі б мая воля, то побач з воінам-пераможцам, волатам, я наставіў бы помнікаў калекам — ахвярам вайны, якіх праз нейкі час зусім не стане, і каб людзі пастаянна бачылі, што з чалавекам робіць вайна. Страх уявіць сябе калекам, бяспомачным, нямоглым, мабыць, мацнейшы за страх перад сілаю, якую, згуртаваўшыся, можна і пабароць, тады як у калецтве варыянтаў няма: мой бацька без нагі, я ведаю, колькі пакут выпала на яго долю.

І дарогаю Пятро Максімавіч быў маркотны.

— Давай па піву ўдарым! — нечакана бадзёра выгукнуў ён, калі параўняліся са шкляным павільёнам, на расчыненых дзвярах якога быў намаляваны жоўтаю фарбаю вялізны пеністы куфаль.

Піва было халоднае як лёд, аж трашчалі зубы, і я не дапіў яго, прапанаваў Пятру Максімавічу, і ён, здаецца, са смакам выпіў майго паўкуфеля.

— Можа, чаго крапчэйшага хочаш? — спытаў ён.

— Не, — сказаў я нейкім безжыццёвым голасам.

Мы пайшлі дахаты. Пятро Максімавіч быў ужо надзіва вясёлы, гаманкі. Такім я, здаецца, яшчэ яго не бачыў. Забягаючы наперад, скажу, што, мабыць, арганізм яго перад наступам хваробы выставіў на барацьбу з ёю ўсе свае «штыкі».

— Ты думаеш, толькі вы, журналісты, пішаце... Я

таксама, як маладзейшы быў ды галава лепш варыла, тое-сёе запісваў... У чалавека, які пакутуе, роіцца шмат думак, усякіх, а найболей сумных. Во хадзі сюды, — пазваў ён мяне за сабою ў залу. Падышоў да бліскучай цёмнай шафы. — Адчыняй ніжнюю скрынку.

Я адчыніў. У скрынцы была ўсякая драбяза: каробачкі, маткі рознакаляровага дроту, алоўкі, шкляныя патрончыкі ад валідолу, жоўтыя салдацкія гузікі, старыя аблігацыі, зашмальцаваныя паперкі...

— Бяры вунь той сіні блакноцік.

Блакноцік быў абшарпаны, адрэзаная палова школьнага сшытка; на ім стаяла дата, напісаная простым алоўкам, а пасля абведзеная шарыкаваю ручкаю: 1954—1956.

— Як не будзе чаго рабіць, чытані...

Я ўжо даўно прымеціў гэтую асаблівасць людзей, якія пішуць, — абавязкова паказваць сваё пісанне камунебудзь, хто б мог ацаніць, пахваліць (зусім добра!), а то і надрукаваць (выдатна!). Я з радасцю, з нейкім нутраным трымценнем узяў у рукі блакноцік.

Чытаў яго ў сваім цесным пакойчыку, дзе мне добра, як лічыў, думалася, але хутка я зразумеў, што думаў я слаба, неглыбока, а галоўнае — скавана.

Думкі Пятра Максімавіча мяне ўразілі, некаторыя я перапісаў сабе ў дзённік, які вяду са студэнцкіх гадоў і ў які запісваю іншы раз выказванні вядомых пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў.

«Калі прыходзіць думка пра смерць, становіцца шкада не сябе, а тых, з кім жыву, з кім звязаны роднаснымі сувязямі. Яны будуць перажываць, ім без мяне будзе цяжка».

«Няўжо і мяне чакае некалі бруднейшая асаблівасць некаторых людзей — радавацца чужому гору? Пакуль мяне яно да слёз, да спазмы ў горле засмучае».

«Калі ў чалавека няма вялікай, колькі-небудзь важнай мэты, ён робіць яе са звычайных, прымітыўных патрэб: яда, адзенне, пажаднасць, мускулатура...»

«Злых людзей я навучыўся абяззбройваць прызнаннем сваіх недахопаў. Нават у іх гэта выклікала спачуванне».

«У сям'і. Не каханне, толькі найвышэйшая маральнасць утрымлівае чалавека ад здрады».

«Нішто так не выяўляе мае адносіны да людзей, як фальш з іх боку».

«Навошта ён (начальнік мой) пляце лапці інтрыг? Каб нячутна ступаць у іх па душах людзей?»

«Божа мой, колькі жаданняў, таемных і адкрытых, застаецца нявыказаных з-за гэтага калецтва!»

«Для нас праблем не існуе, пакуль мы з імі не сутыкаемся. Колькі іх у мяне?»

«Як гэта цяжка не быць усёедным, адносіцца да кожнага так, як ён заслугоўвае, часам мяняючы толькі нейкі штрышок».

«Чалавек, які тонка адчувае, патрабуе і ад іншых тонкіх адносін да сябе».

«Трэба рабіць усё, каб памяць пра нас жыла і пасля нашай смерці».

«У барацьбе паміж сумленнем і абставінамі трэба выбіраць сумленне».

«Недахопамі іншага, у якім бачыць і свае, можа абурацца толькі няшчыры чалавек».

«Ведаеце, хто перамагае? Цярплівы».

...Надвечар Пятро Максімавіч сказаў, што яму закалола ў скроні, і па спіне пагнала халодныя мурашкі. Ён сумняваўся, а я чамусьці пэўна думаў, што Пятро Максімавіч застудзіўся пасля лазні: вецер на вуліцы ды яшчэ тое злашчаснае халоднае піва. Пятро Максімавіч пасмяяўся з гэтых маіх падазрэнняў, хоць і было яму цяжка варушыцца.

Я палажыў Пятру Максімавічу на лоб руку — у далонь ударыла цяпло. Я накінуў плашч і выскачыў з хаты. Было ўжо цёмна, і сек дробны рэдкі дождж, які невядома па чыёй ласцы называюць у нас капусьнічак. Вецер расхінаў крыссе майго плашча, захліствау за спіну, як крылы ў змучанай вароны, калі яна падае на зямлю. Пад ногі мне лучыла нешта жывое, ці то шчанё, ці то бадзяжны кот. «Бедненькі!» Я ледзь не заараў носам. Ускочыў у лужыну, набраў у чаравікі вады.

Тэлефонная будка стаяла на рагу вуліц, метраў за трыста, і неўзабаве я ўжо бачыў, як цьмяна блішчаць нея мокрыя шкляныя бакі, і ўся яна здалёк падобна нечым на мядзведзя са злымі, неразумнымі вачыма. Я недарэмна, аказалася, так нядобра падумаў пра будку, бо, калі падышоў, яшчэ і нагою стукнуў у яе: на апара-

це не было трубкі, адно вісела абарваная расцягнутая спружына.

«У садзіку павінен быць тэлефон...»

Вокны ў дзіцячым садзе на першым паверсе яшчэ свяціліся. Але дзверы былі замкнуты. Я патузаў іх, азіраючыся назад, у цемнату, у якой недзе блізка жаласна-асуджана мяўкаў кот.

Дзверы адчыніла маладжавая жанчына, у белым халаце, з яркімі вуснамі, можа, нават падмаляванымі. «Хто яна: прыбіральшчыца, выхавацелька, музыкантша, загадчыца?» — спалохана глядзела на мяне сваімі млявымі, як соннымі, вачыма.

— Добры вечар!.. Пазваніць трэба... — гаворачы, я адчуваў, як з маіх мокрых пальцаў выслізваецца дзвярная ручка. — «Хуткую» выклікаць. — Ужо з-за дзвярэй пачуў: «У нас службовы тэлефон, малады чалавек, а не для прыватнага карыстання».

Эх, бедная ножка мая, я з сілаю грукнуў «пырам» (успомніўся футбол) чаравіка ў дзверы, як не высадзіў у іх каляровае, сонечнае шкло, за якім, здаецца, ці не мільгануў яшчэ адзін цень.

Я бег па вуліцы ў цэнтр горада, да кінатэатра, дзе стаяла некалькі тэлефонных будак, калі ў спіну мне засвяцілі фары машыны, якая, мабыць, вынырнула з-за паварота, і чорны цень мой імкліва пабег наперад, абганяючы мяне, але не пакідаючы. Мне ўжо здавалася, што гэта адна са стрэл чалавечай чэрствасці, але... машына аказалася «хуткаю дапамогаю». Спынілася, калі я махнуў рукою. Людзі ў кабіне спакойна выслухалі мой блытаны расказ і яшчэ з большым спакоем сказалі, што адвязуць у бальніцу «сардэчніка», і тады калі не самі, то іншыя прыедуць.

Я прыбег увесь мокры; на падлозе і дыване, дзе я ішоў, заблішчала вада. Пятро Максімавіч ляжаў пад коўдраю на ложку з закрытымі вачыма і, здавалася, не дыхаў. У мяне стукала ў грудзях сэрца, як падвешаная на ланцужок гіра, і я баяўся, каб яно не разарвалася, як у таго чалавека, што павезла «хуткая дапамога». Пятро Максімавіч пачуў, што я прыйшоў, адплюшчыў вочы; папрасіў вады. Я прынёс з кухні чайнік кіпячонай вады, наліў у конаўку і папаіў Пятра Максімавіча.

Па вокнах разанула святло фар, аж сыпнулі з шыб зялёныя іскры кропель: «хуткая дапамога». У сенцах загрукалі нагамі людзі. Дактары — мужчына і маладая

высокая, танюткая, як былка, дзяўчына — былі незнаёмыя.

— Вострае рэспіраторнае з магчымай пнеўманіяй, — голас у доктара быў мяккі, але мне стала ворашна ад ягоных слоў і чамусьці «рэспіраторнае» хацелася паправіць на «рэспіратарнае».

Мужчына-доктар выпісаў два рэцэпты і палажыў іх на табурэтку.

— Пасцельны рэжым.

Яшчэ не абсохшы, я зноў рынуўся ў мокрую, непрыветлівую, брыдкую, бы ануча, цемнату. Гэты раз — у аптэку. Баяўся, каб не захварэць самому, бо тады невядома, як будзе. Я туліўся ў плашч, шкадуючы, што не апрануў якую-небудзь ватоўку з сянец; там яе, вопраткі, вісіць не адно бярэма.

У аптэцы я напхаў цэлую кішэню жоўценькіх і белых таблетак — у каробачках і на папяровых пласцінках пад цэлафанавымі каўпачкамі. Я бег назад дахаты, а думкі мае ўжо беглі ў заўтрашні дзень: «Схаджу на базар і куплю мёду, малака, няхай Пятро Максімавіч п'е, грэецца...»

Пятро Максімавіч блага спаў. Спярша нібыта засынаў, чулася яго роўнае неглыбокае натужнае дыханне, потым з грудзей вырываўся дрыготкі пісклявы стогн, які тут жа зрываўся ў сутаргавы кашаль; кашаль быў сухі, з самае глыбіні лёгкіх.

Я ўключыў святло, падышоў да Пятра Максімавіча.

— Можа, яшчэ аспірыну даць? — Паправіў на грудзях коўдру.

Ён хітнуў галавою, прашаптаў: «Вады...»

Я падагрэў на пліце ваду і даў Пятру Максімавічу таблетку. Пад вачыма ў яго прарэзаліся глыбокія сінія падковы, твар здаваўся незнаёмым, нейкім вострым і сухім, бы маска, якую ўвесь час карцела зняць. Так часам хочацца зняць маску з фальшывага чалавека. Фальш — таксама хвароба, душэўная толькі, не зафіксаваная ні ў адным з медыцынскіх даведнікаў.

Уранні я зварыў Пятру Максімавічу рэдзенькі булёнчык з курынага сцегнячка, які адшукаў у маразілцы ў халадзільніку. Булёнчык быў сіні, з жоўтымі, бы таблеткі, скалкамі. Конаўка пякла мне рукі, але я прымушаў Пятра Максімавіча піць. На лоб яму высыпалі вялікія кроплі поту.

Пасля неспакойнай ночы я і сам адчуваў сябе мля-

ва, зліпаліся вочы, але Пятру Максімавічу патрэбен быў мёд, і я пачаў збірацца на базар. Узяў з судніка паўлітровы слоік, капронавую сетку і выйшаў з хаты.

На дварэ стаяла цішыня. Было вільготна. За акном у палісадніку, куды я даўно не заглядваў, нерухома стаялі мёртвыя, зрудзелыя галоўкі вяргінь. Неба па краях адкрылася чыстай, белай шырокай палосаю, як бы смяялася на ўвесь свой гіганцкі мяккі рот. На станцыі бадзёра чмыхалі паравозы, ляскалі буферамі вагонаў. Мужчынскі голас хрыпла крычаў: «Левы пуць! Правы пуць!» — і рэха ляцела ў нікуды, на край зямлі — «уць-уць» — як бы маніла качанят.

І яшчэ адзін ранішні гук улавіла маё вуха, калі я выйшаў з хаты: за горадам, мусіць, у бярэзніку, што прымыкае адным краем да балота, дзе ўлетку аж чырвона ад маліны, а другім да засеянага азімінаю поля, такавалі цецерукі. Іх мармытанне, што час ад часу змянялася кароткім «чуфырканнем», было вялае, пустое, незаядлівае: пад зіму цецерукі такуюць рэдка, мала, як бы толькі напамінаючы адзін аднаму, што ў добрай сіле чакаюць вясну і на першых жа, яшчэ халодных, усыпаных мяккімі пераз імавалымі журавінамі пратал інах, у першых праблісках світання, атручаныя цнатлівым «каханнем» цяцерак, счэпяцца ў зацятым, салодкім баі.

Міжволі думкі мае, падхопленыя крыламі ўзбуджанай фантазіі, перанесліся да Любы: як бы ні гаварылі, але Яму і Ёй без сустрэч не абысціся, як зерню без зямлі. Было б усё проста, калі б не хварэў Пятро Максімавіч. Можа, да вечара яму палепшае: варыянты чалавечага жыцця зменлівыя, таму ніводзін з іх не выглядае прамою лініяй, гэта — ці то заломы, як у маланкі, ці плаўныя зігзагі. Яшчэ большыя заломы і зігзагі ў каханні. Яно не ідзе па адзіна-адным зададзеным кірунку, як поезд па рэйках, і я баяўся за наша з Любаю каханне, я хацеў яго захаваць чыстым, непарушным, нічым не азмрочаным.

Базар у Рэпкавічах быў невялікі: дзве нізкія стрэшкі з двума радамі доўгіх сталоў пад кожнаю. Крыху далей шырокі ўтравелы пляц, на ім у суботу і нядзелю прадаюць кароў і парасят.

Звычайна з нейкаю патаемнаю радасцю і ціхім, светлым сумам хадзіў я па базары, удыхаў знаёмыя вясковыя пахі, слухаў сакавітую гаворку дзядзькоў і цётак,

глядзеў, як цягаюць зялёненькае сена з калёс спакойныя, рахманыя, акрытыя гунькаю, коні і, падобна, не вераць яны, што іх нарэшце вызвалілі ад цяжкай, знясільваючай працы.

Сёння мне было не да розглядаў, я зразу пашыўся між сталоў, кідаючы налева і направа позіркі: дзе прадаюць мёд. Нарэшце ўбачыў бабульку ў жаўтлявай, выгаралай плюшавачцы, захутаную ў тоўстую рудую хусту; перад ёю стаяў вялізны алюмініевы бітон, з яго тырчаў белы чаранок драўлянай лыжкі.

— Мёд, бабуля?

— Мядок, унучак, мядок... Сёлетні.

— Добры ён у вас, мне ад прастуды?

— Справядловы ў мяне мёд, дзетка, ні грамачка якой лішніцы... На во пасмакуй! — І, пакуль я думаў, як мне смакаваць, яна падчапіла кончыкам нажа мёду з бітона, мазнула мне на руку. Я лізнуў языком — так рабілі ўсе, хто правяраў мёд, — мёд і праўда быў салодкі, густы, пах ліпавым цветам.

— Прадаю, бо нямашака есці каму... Дачка адна, у Ленінградзе яна, дык вядро ўлетку ўзяла.

— Добра, бабуля, начэрпайце мне слоік.

Па дарозе я купіў яшчэ дзве бутэлькі малака.

Было па-ранейшаму ціха, неба зусім ачысцілася ад хмар, ясная сінь калола вочы, і мне хацелася пабыць на вуліцы. Але хіба я мог аддацца на волю гэтага жадання, калі мяне чакаў Пятро Максімавіч.

Я спарыў малака, падмяшаў мёду і даў Пятру Максімавічу абматаную марляю конаўку.

Можа, праз якую гадзіну ён паклікаў мяне і сказаў, што яму стала лягчэй глытаць, не чуецца вострых, як цвікі, штуршкоў у патыліцу.

— Сумна, — сказаў ён. — Пасля хваробы заўсёды так...

— А ў мяне спатканне, ды я не ведаю, як...

— Ну што ты! — ледзь не падхапіўся з ложка Пятро Максімавіч. — На мяне не глядзі. Я ўжо ачуняў. Дзякуй табе! Ад любой хваробы душа чалавечая вылечвае лепш за ўсякія таблеткі... Улічы гэта, ты яшчэ малады во... Дык, можа, і жаніцца ўжо надумаў? — Пятро Максімавіч хітравата прыжмурыў вочы. — Справа патрэбная, але... Мае вунь хлопцы, два малодшыя, у тых нібыта трохі пакладлівей жонкі, а ў Сцяпана... Так ужо яго пякла, так пякла, чуць што: ты такі, ты сякі,

гультай, няўмека... Цярпеў! Ды другі на яго б месцы з ходу рукі развязаў бы. А Сцяпан наш прыкладу такога не меў... Нават сварак нашых з маткаю не чуў, ні папрокаў ніякіх. А што ёй, Галіне маёй, не было ў чым мяне папракаць? Ого-о-о!.. Зразу, як сышліся, мы ў вёсцы жылі, у бацькоў маіх. Я кароў калгасных пасвіў, пужку пад паху і за імі... З помаччу старых так-сяк перабіваліся, а памерлі яны... Застаўся я, як кажуць, нуль без палачкі. Які з мяне гаспадар? А трэба і сена, і дровы, і гарод...Пераехалі мы ў горад. Нялёгка нам было абжывацца, будавацца — выдзюжылі. — Вочы ў Пятра Максімавіча пасумнелі, мабыць, ён нанова перабіраў у памяці пражытыя гады.

— Мой бацька дык амаль усё можа рабіць, толькі за плугам не паспявае...

— З рукамі лягчэй, канечне... Як паедзеш, перадавай прывітанне бацьку. А наконт жаніцьбы, то мая табе парада: абавязкова паглядзі, які ў тваёй дзяўчыны род, што за бацькі, ці правільна жывуць... Ведаеш, усякія махляры бываюць.

— А вы, мабыць, павінны ведаць яе бацьку. Начальнік вузла сувязі...

— Арцюшкевіч? Ну, канечне! Мужчына талковы. І жонку яго ведаю, у банку працуе... Адно каб гультайкаю яна не была... Яны, гэтыя Арцюхі, у дастатку жывуць.

— Ды не як быццам, не гультайка...

— Ну, глядзі! — кіўнуў падбародкам Пятро Максімавіч. — Бяжы на сваё спатканне і не думай нават пра мяне.

Як лёгка ўсё-такі з людзьмі, якія цябе разумеюць з паўслова!

Мы з Любаю ўбачыліся, як і дамаўляліся, каля Дома культуры, з якога мінулаю зімою адпраўлялі мяне на вайсковыя зборы. Яна была ў блакітнай мяккай куртцы, перацятай у поясе вузкаю дзяжкаю; на нагах чорныя бліскучыя боты з высокімі халявамі, якія шчытна аблілалі ікры («лытка» рэжа вуха грубаватасцю). Вочы ў Любы іскрыліся, і па іх як найлепей чытаўся яе настрой, трохі, мабыць, залішне бравурны, прынамсі, мне, стомленаму, знерваванаму, так здавалася.

Цямнела хутка. Галіны таполяў хісталіся, і разам з імі хісталіся зоркі на чорным небе, таго і глядзі, упадуць. З высокага коміна над кацельняю падымаўся бе-

лы, шчытны, як вата, дым: на мароз. Заўтра ўранні на траву, плот, стрэхі, мабыць, зноў ляжа іней, і калі выблісне сонца, будзе раставаць, сплываць да нізовін празрыстаю, тонкаю смугою.

— Холадна. Хадзем у наш клуб, — сказаў я неяк суха і рацыянальна, і мне самому не спадабалася.

Клубам мы называлі бакавушку пры рэдакцыі, дзе захоўвалася папера, старыя падшыўкі газет, паламаныя крэслы, стол; іншы раз хлопцы забіраюцца туды, каб спакойна пасядзець, напісаць матэрыял. Усю дарогу мяне грызла віна, што, можа, пакрыўдзіў Любу.

З акна рэдактаравага кабінета святло падала на куст бэзу: галіны голыя і белыя, як абгрызеныя зайцам. Учора была сесія райсавета, і рэдактар, мабыць, піша з яе справаздачу: пленумы, сесіі, нарады — гэта яго «хлеб». А можа, проста гартае іншыя «раёнкі», што дасылаюцца ў рэдакцыю і якія па яго просьбе акуратна падшывае чамусьці не сакратар-машыністка, а карэктар — тая маўклівая дзяўчына з меланхалічным сумам на твары, якой Альбуціна прызналася, што пасылала свае творы вядомаму пісьменніку.

Я адчыніў дзверы ў кабінет рэдактара; Люба засталася на калідоры. Рэдактар — худы, высокі, з кароткімі светлымі валасамі, зачасанымі ўверх, — стаяў пасярод кабінета: мабыць, пачуўшы стук уваходных дзвярэй, хацеў праверыць, хто прыйшоў.

— Маладое дзела! — міргнуў ён, калі паслухаў мяне. — Можаце пагрэцца, такая халадзіна...

Ён паспрыяў мне не толькі ад спагады, як паказваў, а яшчэ і па разліку: маўляў, дазволю і тады буду мець жывенькі факт з тых правінак падначаленага, якія потым вымушаюць ліслівіць і закрываць вочы на промахі ды недахопы начальніка.

Мы зайшлі з Любаю ў вузкі прадаўгаваты пакой з дзвюма глухімі сценамі. Пад нагамі суха зарыпелі масніцы. Святла не ўключалі: на акне вісела старэнькая штора, і праз яе знадворку цадзіўся морак. Я добра бачыў Любу і нават тое, як блішчаць у яе вочы.

Было ціха, адно за сцяною час ад часу кашляў рэдактар. Мы селі за стол. Я дастаў з кішэні дзве шакаладкі; мы адломвалі па маленечкім кавалку і лажылі ў рот: я — Любе, яна — мне.

Калі мы цалаваліся, нашы вусны былі салодкія, і здавалася, мы не цалуемся, а п'ём-цягнем са шклянкі

вільготны тугі цеплы мёд. Я незнарок зачапіў на стале стары вазон, ён упаў, стукнуўся аб падлогу і, гліняны, разбіўся на дробныя чарапкі. На шчасце? На калідор, чуваць было, выйшаў рэдактар, потым зноў вярнуўся ў кабінет.

Наша каханне было чыстае, маладое, але ўжо спелае і салодкае, бы яблык; і цешыліся мы ім спаўна, радаваліся, хаця, у адрозненне ад яблыка, вяршыня кахання — блізкасць — і лічыцца забароненым да пары да часу плодам; хто ведае, а можа, каханне, сапраўднае, мае адзін-адзіны міг найвышэйшага шчасця, які не варта выпускаць і ў які закаханыя павінны спапяліць сябе на яго агні. Колькі загадак яшчэ ў чалавечай душы?

Маўчаннем вялікі цяжар кахання не вытрымаеш — не адбудзеш. Гэта я ведаў. І адчуваў, што Люба чакае ад мяне слоў. І я не здзівіўся, калі яна, апускаючы вейкі, спытала:

— Коля, ты мяне кахаеш?

— Канечне, кахаю... Але ці трэба пра гэта крычаць?

— Ты не крычы, а скажы шэптам, як ты мяне кахаеш?

— Вельмі моцна, на ўсё жыццё.

— Гэта агульныя словы. Якое яно, тваё каханне?

— Думаеш, я ведаю? Яно — гэта нешта невыразнае, тое, на што ніколі не губляецца надзея.

— Туманна...

— Каханне і ёсць туман, тайна, якія хаваюць ямы, перашкоды, а то і прорвы, і мы ідзём у гэтым тумане ачмурэлыя, але шчаслівыя...

Люба стрымана ўсміхнулася, нешта з маёй «філасофіі» ёй дайшло, пранікла радасцю ў сэрца, яна захвалявалася, дыханне ў яе было няроўнае, быццам туга завязаная хустка сціскала ёй горла, я адчуваў, што яна цяжэе ў маіх руках, як непрытомная; калі б мы былі дзе-небудзь у лузе на траве, сярод кветак, я апусціў бы, здаецца, яе і сам бездапаможна рухнуў бы побач, і нам цэлую вечнасць не хацелася б уставаць, абязволеным пачуццёвым дурманам, у якім бы ўсё чароўна перапляталося: і трава пад спінамі, і пах кветак, і мы самі, і неба з зямлёю...

У нейкае высокае імгненне мне нават здалося, што нас падхапіў вялізны шар і панёс у цёплае блакітнае марыва; гайдалася і кружылася ўнізе прыгожая, зялё-

ная зямля. Гэта быў ці то сон, ці то мара-фантазія. І вось я ўявіў ужо, што шар занёс нас на Месяц, а можа, на якую другую планету — халодную, цвёрдую, зусім голую, бы камень; мне стала не па сабе: няўжо такое пяшчотнае і тонкае пачуццё, як каханне, сатрэцца і згіне ў гэтай грубай і няўтульнай змрочнасці?

...Я не магу сказаць, што гэта — было прадчуванне, але гаворка ў нас, як мы выйшлі з нашага «клуба», не ладзілася. Бывае такое: няма аб чым гаварыць, і ты маўчыш, каб не фальшывіць. І як шкада, што часам з-за боязі, нежадання фальшывіць, мы прытупляем у сабе дабрату, ласку да чалавека, асабліва жанчыны. Думкі ў мяне блыталіся, як маладая высокая стаптаная нагамі трава. Я разумеў: тую пустату, што немінуча ўтвараецца ў душы, калі з яе пачынае выветрывацца любоўны чад, можна запоўніць другім пачуццём — хвалююча непаўторным, загадкава жаданым і той жа час нейкім гарэзліва-легкадумным, прымітыўным, неглыбокім (у параўнанні з першым), якое нараджаецца, калі думаеш несці заяву на шлюб; пачуццё гэтае ва мне жыло даўно, і я вывучыў яго да тонкасцей.

Вакол месяца імгліўся празрысты, блакітнаваты вяночак — прымета, што хутка выпадзе снег, трывалы, жорсткі, на цэлую зіму. Хто б мог падумаць, што і на сэрцы нашы аж да самага лета ляжа бязлітасны снег адчужанасці, самаўпэўненай, маладой безразважнасці і падазронасці?

Мы ішлі ціхаю вулачкаю, нязвычна голаю і мёртваю без машын, дрэў, без куч цэглы і пяску. Як быццам тут і не жылі людзі. І раптам з цёмнага двара, з-за высокіх дашчаных варот выпнулася кампанія (чалавек пяць) хлопцаў; ішлі насустрач моўчкі, і калі разміналіся, адзін з іх ударыў мне кулаком у твар. У мяне бліснула ў вачах...

...Люба стаяла нада мною, тузала за рукі і плакала. Вакол ні душы. Гады! За што ўдарылі? Выпадковасць, помста ці звычайнае, бяздумнае хуліганства? Адчай і абурэнне разрывалі мне галаву і сэрца: і не толькі таму, што не даў нахабнікам здачы, а іменна таму, што не ведаў, з-за чаго паплаціўся. Люба клялася-бажылася, што яна тут ні пры чым, што ў яе не было да мяне хлопца; праўда, заляцаўся адзін час работнік банка, Хенькін, стары халасцяк, тоўсты і нецікавы мужчына. Не будзе ж ён, салідны чалавек, займацца легкадумнымі

штучкамі. Дык што, можа, Пшонік падгаварыў якіх-небудзь забулдонаў: ён, каб звесці з арэны канкурэнта, можа пайсці і на такое? Толькі наўрад, на зборах ён паказаў, што і ў ім чуласць ёсць. А можа, усё-такі Люба нешта хавае ад мяне? Як жа прыкра — быць недаверлівым, хаця і прыпісваюць гэту ўласцівасць натурам глыбокім, уражлівым і назіральным, якія за знешняю прыстойнасцю могуць разгледзець тое заганнае, што людзі звычайна ўтойваюць.

Мне было сорамна, хоць, як кажуць, скрозь зямлю праваліся ці разнясі сябе пылам па ветры. Я не мог падняць спакойна вочы на Любу, ішоў побач моўчкі, і ў мяне звінела галава, акурат званы на цэркаўцы ў парку. Люба, мабыць, сур'ёзна пакрыўдзілася. Як, як я мог падумаць, што яна ў нечым вінавата? Я прасіў прабачэння, а яна маўчала, і ў гэты момант мне чамусьці стала ясна, што мы з Любаю надоўга разыдземся. Мабыць, гэта жахліва — пакутаваць невінаватаму.

* * *

Лета прыйшло з пахучаю зелянінаю, з духмяным, салодкім жытнёвым водарам-мёдам, які заплываў з поля аж сюды, у горад. У садах завязаліся маленькія апушаныя вузельчыкі яблык, а на клумбах усцяж цэнтральнай вуліцы свежаю крывяною чырванню зацвілі цюльпаны і «пчолкі». На таполях у парку і на званіцы цэркаўкі, якую вясной «падмаладзілі» белаю фарбаю, падавалі дзяркатае кэрханне грачаняты.

Жывому — жывое.

На завулку гулялі вяселле, акурат напроці нашага двара. Грымела музыка, заводзіліся песні, чуўся нястрымны смех. Людзі весяліліся. А ў мяне на душы было цяжка, я страшэнна сумаваў па Любе і шукаў прычыну, каб сустрэцца ці пазваніць ёй. Ведаючы, што пад шум ды гам я не змагу дома ні пісаць, ні чытаць, я пазней засядзеўся ў рэдакцыі, за што потым дакараў сябе і праклінаў закон подласці, якім нярэдка мы апраўдваем і сваё няўмельства ці някемлівасць і воляю якога абвяргаем заканамерную ў жыццёвай крутаверці з'яву.

Быў ясны вечар з чыстым, як маміна душа, высокім небам, густа пахла маладая сакавітая трава. Я адчыніў весніцы і скрозь рып спружын пачуў голас Пятра Максімавіча; але самога нідзе не было відаць. Можа,

здалося? Я наструніўся, бо вушы былі заканапачаны трэскам ударніка, звонам гітар і круглым буханнем барабана. Пятро Максімавіч яшчэ раз гукнуў мяне. З гарода. І я падумаў, што ён за сенцамі каля кустоў парэчак, вастраваты водар якіх, казаў, аблягчае яму дыханне.

На гарод, як і ў двор, весніцы былі на спружынах, высокія, і адчыняліся яны штуршком рукі ці пляча; услед самі зачыняліся, як тыя шкляныя дзверы ў шпіталі ў Бараўлянах.

Пятра Максімавіча не было ні за сенцамі, каля сцяны якіх ляжаў грудок пазелянелай цэглы, ні каля парэчак, што раслі паўз плот і з якіх цяжка звісалі гірлянды чырвоных ягад.

Што за дзіва? Я трымаў у руках «дыпламат», браў напераменку то ў правую, то ў левую руку. Ззаду ў мяне рыпнулі дзверы маленькай, бы шпакоўня, адрынкі, у якую складвалі брыкет.

— Я тут, — голас Пятра Максімавіча.

Здаецца, зразу, а можа, і не зразу — не помню, я здагадаўся, у якую бяду трапіў Пятро Максімавіч. Я прыладзіў у развілку яблыні «дыпламат». Дзверы ў адрынцы прачыніліся шырэй: Пятро Максімавіч сядзеў на дыбках, у яго былі голыя каленкі. Ён глянуў на мяне мелькам, потым увесь час зацята глядзеў у зямлю.

Пятро Максімавіч насіў штаны на гумцы; гумка лопнула, і ён колькі часу сядзеў у адрынцы і чакаў мяне. Пайсці не мог, бо праз частакол добра відаць з вуліцы, і хто-небудзь з вясельнікаў, убачыўшы яго, падумаў бы, што чалавек здурэў ці п'яны. Я адно цяпер згледзеў на зямлі тупыя канаўкі-сляды ад каленак.

Я зацягнуў гумку ў вушкі штаноў і звязаў канцы; апярэджваючы мяне, Пятро Максімавіч спрытна падсунуў куцкамі штаны знізу, раз, другі, запіхаў за паясніцу кашулю.

Мы пайшлі ў хату моўчкі. Я забыў на яблыні «дыпламат». Вярнуўся па яго надзіва павольнаю хадою. Я думаў, што Пятро Максімавіч пойдзе да сябе ў пакой і будзе там сядзець. Але ён чакаў мяне, яго вочы гарэлі ўзрушанасцю, ён глядзеў на мяне імі шчыра, адкрыта, моргаючы, як дзіця.

— Вось да якіх казусаў даходзіць!.. І так усё жыццё... Каб таму Гітлеру і на тым свеце спакою не было! — Я бачыў, з якою балючаю, надрыўнаю дзёрзкасцю вы-

маві́ў Пятро Максімавіч гэты праклён. — Вот судзілі іх, нацысцкіх верхаводаў, у Нюрнбергу, павесілі, і ўсё. А я вазіў бы іх па месцах, дзе яны лютавалі, і паказваў... Калі ў іх хоць нешта засталося ад людзей, яны не вытрымалі б... — Пятро Максімавіч доўга маўчаў, і калі б у яго былі кулакі, я ўявіў, як бы яны сціснуліся. — І з тымі, хто сёння рыхтуе вайну, я таксама так рабіў бы... Такое жыццё харошае, э-эх!.. — Я адчуў, што праз гэтае «э-эх!» выйшла з душы шкадаванне пра тыя няздзейсненыя жаданні, пра якія Пятро Максімавіч запісаў у блакноце. — Захавайце мір — гэта апошнія словы, якія скажам мы, ветэраны, вам, сыходзячы ў магілу... — Пятро Максімавіч падышоў да акна, нейкі неўтаймоўны парыў рашучасці быў у ягонай постаці. Я ніколі не думаў, што столькі ўнутранай сілы можа выліцца ў чалавеку праз вочы, твар, крокі.

Пятро Максімавіч лёг спаць рана, але доўга не засынаў: уздыхаў, крахтаў, шалясцеў папераю, мабыць, перачытваў пісьмы ад жонкі. Яна апошнім часам піша яму часта: унучка вучыцца старанна, на адны «пяцёркі». У гэтую ноч я ўпершыню пачуў, як Пятро Максімавіч стогне — дзіка, страшна, як выюць снарады: і-у-у-у, гак! Я, прахапіўшыся, пабег да яго, затармасіў... «А! Што?.. — ачнуўся ён. Пазнаў мяне. — Стагнаў? Прабач...» Гэтае «прабач» спёрла мне дыханне, ледзь дайшоў да ложка,זаваліўся на яго тварам у падушку...

Уранні, як амаль заўсёды, я прачнуўся ад тупату ног Пятра Максімавіча: чымся мацнейшы тупат, тым болей Пятро Максімавіч нечым устрывожаны.

— Можа, на рыбку адскочым, га?.. — сказаў ён мне, калі я выйшаў са свайго пакоя. Мабыць, ён хоча як хутчэй забыцца на ўчарашні казус, падумаў я, а можа, проста любіць возера, бераг, ваду...

Я таксама ўмеў і любіў лавіць рыбу; лічы, з той пары, як і помню сябе, як усвядоміў, што жыву на свеце, магу чуць і бачыць, адчуваць і разумець. Я вырас на Сажы; мой старэйшы брат быў заядлы рыбак, цяпер плавае на рыбалавецкім траўлеры ў Балтыйскім моры; ён часта браў мяне з сабою на Сож; я лавіў у траве цвыркуноў, на кветках — мух і ўсякіх мяккіх кузурак; у чэрвені ў паветра вылятаді чорнымі хмарамі касцюры, гэта па-нашаму, а па-навуковаму — аўсянік (эфетэраптэра), яны жывуць усяго некалькі гадзін,

адно каб спарыцца, а затым падаюць у ваду, і рыба хапае іх, аж кіпіць рака. З ручаёў я выграбаў шыцікаў — беленькіх маленькіх чарвячкоў у адмыслова склееных трубачках. Калі запас нажыўкі быў вялікі, брат даваў мне вудачку.

Праўда, ужо тады, як жыццёвая плынь адарвала і панесла мяне ад берагоў Сажа, жаданне рыбаліць прытупілася, а можа, і назусім адпала б, калі б не сны: часта і нават вельмі часта я сніў, як цягаю вудаю зубастых шыракалобых шчупакоў ды паласатых, як зебры, акунёў, заўсёды здаравенных, якіх, помніцца, у сапраўднасці ніколі не лавіў. Але як толькі выпадала апынуцца дзе-небудзь каля вады, у душы абзывалася тая даўняя, дзіцячая, хваравіта-салодкая прага да рыбнай лоўлі.

Дык вось, рыбу вудзіць я любіў і ўмеў, а таму абрадаваўся прапанове Пятра Максімавіча. Але першае, што падумалася — гэта: «А як ён будзе лавіць?» Не мог я ўявіць ніводную снасць, з якою мог бы ўправіцца чалавек без рук. Пятро Максімавіч убачыў гэту маю разгубленасць.

— Вудачкі ў мяне ёсць, пад страху падторкнуў. Жылка, кручкі, грузілы, паплаўкі запасныя і ўсё такое... у прыскрынку ў каробцы. — Голас у яго быў нейкі хапатліва-адрывісты, нервовы.

На гародзе за сенцамі, пад цэглаю, я накапаў чарвякоў; замясілі цеста, спырснулі яго алеем.

Возера было вялікае, над ім вісеў рэдкі туман; далёкі бераг ледзь угадваўся, цямнеў тонкаю рудою нітачкаю. Блізкі бераг быў пясчаны, называўся выспаю; сонечнымі днямі тут загаралі людзі, хаця дно ў возеры і глеістае, слізгае пад нагамі, як мыла, а патрывожаная вада зразу становіцца мутна-зеленаватаю, бы сыроватка. Але ўсё роўна Пшонік хадзіў сюды купацца — адно таму, што тут, на зялёненькай траўцы, каля вады, любіў загараць адзін высокі начальнік, і ў Пшоніка была магчымасць лішні раз паказацца таму на вочы, перакінуцца словам ці няўзнак паднесці запалку, стрэсці з адзення наліплыя пясчынкі... А вось, не пайдзі на грэх, прыдасца!

Пятро Максімавіч спыніўся перад белым валуном, што, як нарваны гуз, вытыркаўся з травы метраў за пяць ад вады.

Я ўзяўся наснуджваць вудкі, іх было дзве, а Пятро

Максімавіч сеў на валун. Адну вудку, з большым кручком, я закінуў на чарвяка, а другую нажывіў галушкаю з цеста.

— Паменей глыбіню, а то кручок дастае дно, — параіў Пятро Максімавіч.

Паплавок — гусінае пяро — і праўда спакойна ляжаў на вадзе. Я знізаў яго бліжэй да кручка. Чырвоны канец паплаўка цяпер стаяў тырчком, паказваў у неба, у якім плыў, распластаўшыся крыжам і выцягнуўшы тонкія, як цапкі, ногі, вяла пазыбваў крыламі бусел: мабыць, выглядаў жаб.

— Клюнула!.. — Я аж схамянуўся ад пошапку Пятра Максімавіча. Паплавок нахіліўся і дробненька падрыгваў, няйначай, рыба смакавала нажыўку; потым паплавок лёг на ваду і стаў апісваць круг. Па дыханні за спінаю я адчуваў, што Пятро Максімавіч хоча сказаць: «Цягні!» — але баіцца адпудзіць рыбу.

Я тузануў на сябе вудзільна, яно сагнулася: на кручку сядзела рыбіна, валтузілася, як нешта цяжкае, нязграбнае, на глыбіні. Вудзільна ў руках дрыжала, і з вады нарэшце вырвалася рыбіна; бліснуўшы кароценькай маланкаю над галавою, паляцела мне за спіну, напяўшы жылку, шлёпнулася ў траву каля ног Пятра Максімавіча.

Рыбіна была незвычайная, залаціста-жоўтая, з рэдкімі белымі лускавінкамі; спіна вузкая, а галава лабатая, з шырокім, як шклянка, ротам. Я ўпершыню бачыў такую рыбіну і дзівіўся на яе, не беручы ў рукі. Яна ляжала спакойна, як сонная, і адно паварушвала чорным шырокім хвастом, захіляючы яго на сябе, акурат хацела ім прыкрыцца.

— Помесь, — сказаў Пятро Максімавіч, і я зразу здагадаўся, што гэта і ёсць тая рыба-цуд, пра якую шмат гавораць у Рэпкавічах і якая нібыта паходзіць ад карпа і дзікага карася.

Удалы пачатак «завёў» мяне: я ўважліва пільнаваў паплавок. Клюнула на чарвяка — імгненне! — і ёмкі акунь бушаваў у вадзе ў вядры, аж пырскі ляцелі, зіхацелі на траве, як раса, як чые-небудзь слёзы.

Пятро Максімавіч то ўскакваў з валуна, то зноў садзіўся, то падбягаў да мяне, потым адступаў на некалькі крокаў назад, каб цень не клаўся на ваду. Вочы ў яго ашклянела гарэлі густым бляскам, які хаваў у сабе і сінь радужкі, і чорныя зрэнкі, і сам Пятро Максі-

мавіч быў падобны на нейкага казачнага чараўніка. Я, здаецца, ніколі ў жыцці не бачыў, каб чалавек нечым так захапляўся: у такія імгненні, мабыць, для яго нічога, акрамя аблюбаванага, не існуе, усё шматфарбнае і цікавае, прыгожае і брыдкае, што ёсць у свеце і што ў звычайных абставінах магло б уразіць, пралятае міма, як птушка-невідзімка, чалавек як бы выключае сябе з асяроддзя, існуе сам па сабе, як выразаная з кавуна долька.

Сонца паднялося на самую макаўку неба, ліло чыстае, яснае гарачае святло. Дробныя, бы луска, хвалькі бліскалі-калолі ў вочы. Рыба перастала клявацьг паплаўкі ціхамірна зыбаліся, як маленькія загадкавыя чоўнікі.

* * *

Гора крышыць усякія ўмоўнасці, што людзі прыдумалі, каб адчужаць сябе. У Любы нечакана памёр бацька. Наглядна я ведаў яго, а блізка пазнацца нам не выпала. Ён быў нязграбна-тоўсты, з ляніва адвіслым жыватом, цяжка дыхаў, аж сіпела ў грудзях, бы вада ў чайніку на пліце; хадзіў ён павольна, калышучы жыватом, і здавалася мне, што вочы яго глядзяць пагардліва: ці то ад раўнадушша, ці то ад пастаяннай засяроджанасці ў сабе.

Я і хвіліны не думаў пра тое, што першы саступаю. Наша каханне вытрымала праверку пакутлівай разлукаю, і цяпер яму ўжо нічога не перашкодзіць, і ніякія легкадумнасць не разаб'е яго. Я купіў чырвоных гваздзікоў і пайшоў да Любы дахаты. Мяне ўвесь час муштравала пачуццё, што гэта ненармальна — несці кветкі мёртваму. Кветкі ў мяне звычайна вяжуцца з радасцю і прыемным, гэта — сімвал шчасця, любові, поспеху, але не смерці.

Люба сядзела каля бацькавай труны ў чорным плацці і чорнай газавай касынцы з бліскучымі ніткамі; калі яна павярнула твар, я жахнууся: ён быў белы, нейкі блакітнаваты і зусім пусты без усмешкі; пад вачыма залеглі чорныя дугі. Я дакрануўся да яе пляча і палажыў на стол каля труны кветкі, чамусьці баючыся, каб яны не скінуліся на падлогу.

Нябожчыка я не помню, мне запомніўся толькі падняты над труною вялікі жывот, акрыты белаю працi-

наю. І яшчэ, здаецца, тады я падумаў, што ў свеце паменела на аднаго ветэрана, сумленнага чалавека, а ў Любы, пяшчотнай, чыстай, даверлівай, бы кацяня, дзяўчыны, не стала бацькі...

## ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

На стары, здратаваны, брудны снег уначы лёг пушыста-мяккі, чысты, цнатлівы. Я ішоў да Любы, беражліва трымаў у руках вялікі букет белых, як гэты малады з начы снег, ружаў. Я быў у цёмна-сінім касцюме (пад паліто) і белай кашулі, пры гальштуку. На нагах на ўсе Рэпкавічы рыпелі новыя лакіраваныя туфлі.

Перад Любіным домам я спыніўся: у садзе проста на снезе сядзелі два снегіры, згіналі дзюбкамі сухія былкі крапівы. Адзін быў яркі, чырвоны, а другі — бледна-фіялетавы, дымчаты. Ад іх саміх, іх мірнага спакою веяла на ўвесь свет цішынёю.

На ганак выбегла Люба і, разгубленая, спынілася.

З таго часу прайшоў не адзін год, многа болей, чымся я ведаў Пятра Максімавіча. Жыццё, як вядома, не толькі радасці. Калі мне бывае тужліва, чамусьці заўсёды ўспамінаю Пятра Максімавіча; ён прыходзіць да мяне, як сон, як праўда з небыцця, а я хачу, каб гэта было ў сапраўднасці, і тады, я ўпэўнены, размова з ім надала б мне душэўнай трываласці, а нейкая часцінка яго маральнага вопыту засталася б у маёй душы — так заўсёды было, калі я жыў у Рэпкавічах, што на роднай мне Магілёўшчыне.

Нядаўна ў прэсе, па радыё і тэлебачанні ішло многа матэрыялаў, якія расказвалі пра ахвяры амерыканскіх атамных бамбардзіровак Хірасімы і Нагасакі. Жахлівае відовішча! Тысячы знявечаных старых, жанчын і дзяцей... Бязрадасная асуджанасць тых, хто цудам выжыў...

Кашмар!

Уражаны ім, я колькі начэй сніў адзін і той жа сон: густы, чорны ядзерны грыб і перад ім чалавек з паднятымі ўгору абрубкамі рук, і я штосілы бягу на помач гэтаму чалавеку — гнала адчуванне, што калі ён упадзе, трэба стаць на яго месца. Ні крыку, ні ляманту, ні

выцця, толькі светлы нямы сілуэт на фоне чорнага ядзернага грыба.

Я прахапліваўся: у пакоі была цішыня, спала побач Люба, яе абдымала ручкаю наша дачка.

---

## ГРЫБАВАР

У кожнай пары́, як і ў чалавека, бываюць святы — дні прыгожыя, вясёлыя, радасныя ад колераў, пахаў і гукаў. У лета — гэта, мусіць, ліпеньскія дні. Ліпень — ліпа: у мяккую, чыстую зелень урываецца залацістымі воблакамі ліпавы цвет. Цвітуць ліпы... Тонкая духмянасць сочыцца ў паветры, што, здаецца, аж трымціць і звініць ад пчаліных крыльцаў.

У Грышкі Пруцікава на гародзе раслі дзве ліпы — мацёрыя, высокія, мабыць, пасаджаныя яшчэ дзедавым дзедам. Была і гісторыя ў гэтых ліп, і як сведчанне яе — дуплы ў ствалах, шурпатыя зросцвіны на кары, куцкі адсохлых галін, струхнелыя і новыя шпакоўні... Кожную вясну, зазвычай на пачатку мая, Грышка, садзячы бульбу, чуў, як хрускалі пад лемяшом плуга карэньчыкі, што павыжыльваліся мала не па ўсім гародзе, і ён, Грышка, тады аж уздрыгваў, быццам нешта надабнае і важнае лопалася ў ягоным целе. Шмат хто, надта суседзі, падбіваў Грышку — і гэта зноў з мінулага, — каб ён выкарчаваў ліпы; моў, яны ссушаюць зямлю, і таму не родзіць бульба. А нехта злы нават завіхнуўся быў уночы абкарыць ліпы ўкругавую, але засталіся не зачэпленыя тапаром шлеечкі кары, праз якія ліпы і жывіліся.

Прычэпістыя да зямлі аказаліся старадрэвіны, стаялі, нягледзячы ні на што. А вось садавіна — яблыні, грушы — чэзла, са ствалоў і галін адхлупала кара, гніло дрэва і прападала, даўшы напаследак спажыву жоўценькім мышыным грыбам — ненапраўдашным апенькам.

Грышка мучыўся ў роздуме, але не мог здаўмецца, чаму раптам сталі зводзіцца-вымiраць яблыні і грушы, якія раней, яшчэ пры бацьку, цвілі амаль кожны год

дружна, бучна — на заглядзенне. Казалі, нейкая пошасць напала на сады — хвароба, якую нібыта заводзіць грыбок — не той, канешне, грыб, што ў лесе, а — плесня, цвіль, ад якіх нават хімія спасу не дае. Калі і ўдавалася вылузнуцца яблычкам, дык усё роўна яны хутка асыпаліся, густа ўсцілалі зямлю — цьмяныя, зморшчаныя карлікі-заморкі. А яшчэ хадзілі чуткі, быццам карэнне хварэе, чаўрэе ў зямлі — чым лячыць яго, ніхто не ведае. Але гэта ўжо, здаецца, будні, якія выдаюць шэрымі, аднастаїнымі ў сваёй адвечнай зададзенасці нават тады, калі свеціць сонца.

А тут ужо другі тыдзень лілі дажджы — беспрасветныя, аблажныя — дзень і ноч. Як людзі спярша радаваліся ім, так праз некалькі дзён пачалі праклінаць і нецярпліва чакаць, пакуль яны скончацца. Зямлю прамачыла — і добра, няхай растуць травы, бульба, спеюць палі, але дождж нарабіў ужо шкоды — спляжыў жыта, авёс, ускалыхнуўшы малінаўцаў не на жарт.

Калі нарэшце дождж ушчук і выбліснула сонца, па якім усе паспелі ссумавацца, над зямлёю сталі расці густыя, як воўна, туманы; распаўзаліся па гародах, лугах, лясах, цёплаю сырасцю ахутвалі зямлю, пранікаючы ва ўсе яе сітавіны.

І тады Грышка першараз падумаў, што сёлета будзе *ранняе* грыбное лета. Хоць і кажуць, што д'ябал прыдумаў грыб для таго, каб парушыць у прыродзе створаны богам лад, але няпраўда гэта, бо акурат ён, грыб, — дзіця капрызнае і вельмі чуйнае да ўсякіх змен у паветры і на зямлі, яго проста не купіш. Радасці Грышку падбаўляла яшчэ і тое, што з дня на дзень ён чакаў з арміі сына — Мішу, які за два гады службы так ні разу і не заявіўся на пабыўку; бацьку, канешне, гэта нос аніяк не паднімала, а на сэрцы расла туга, крэпла, застываючы, як смала. Рэдкія лісты, у якіх Міша пісаў зазвычай адно і тое ж — «служыцца нармальна, усё ў парадку», — суцяшалі мала.

Але кажуць: зла не кліч — яно само прыйдзе; калі б Грышку нехта сказаў, што яму трэба нудзіцца па сыну яшчэ год, ён палічыў бы таго за вар'ята і нават не пасмяяўся б з яго слоў. Ды, на вялікае гора, так і прыключылася: жыццё—вялікі чараўнік у сваіх вымудрах...

Паштарка, малодшая з пяцярых Чубатчыных дачок, прынесла пісьмо, якое Грышку зразу насцярожыла: канверт быў не такі, як слаў Міша, а размаляваны, з

маркаю на ражку, і адрас выстуканы на машынцы. Грышка доўга не разрываў канверт, сціскаў у руцэ і доўга думаў — што ў ім можа быць? Хіба падзяка ім, Грышку і Лісаветцы, за сына? А што — канец службы, нагода якраз... Толькі чула, чула Грышкава сэрца, што ў канверце — іншае, зусім іншае, і яно не прынясе яму радасці. Такі ўжо Міша — усё жыццё ад яго Грышку адны бядоты, і тут, як ні мудруй, чорнае да белага не прышыеш.

З самага дзяцінства так павялося. Гады тры Мішу было, калі, пагнаўшыся за падлёткам, ледзь не ўтапіўся ў багне — добра, што блізка пастух пасвіў кароў ды пачуў крык... Лазячы па дрэвах, абшаснуўся з высокае асіны і аб востры сук распароў бок — вазілі ў бальніцу, сшывалі... Ужо як падрос, стаў церабіць чужыя сады і гароды (адзін і з хаўруснікамі) — аднаго разу Чубатчыха, каб правучыць, абкруцілася ў белую прасціну ды стаілася ў бульбоўніку; як толькі хлопцы, качаючыся па градах, сталі вышчупваць гуркі, яна ўсхапілася і з крыкам «Я — бабка-зялезка!» — кінулася на іх. Ад перапуду Міша на месяц анямеў — дзякуй богу, адпусціла.

Здавалася, пасталее Міша — набярэцца розуму, але не... Да дзевак намысліць у Дабранку, выкрадае з канюшні каня і панёсся на́вуж; уранні, узмыленага, галоднага, прыганяе каня назад. Грышку нават у праўленне зазывалі, штрафам гразілі, і ён, вядома, там не заступаўся за сына, даваў слова прыструніць, і праўда ўсыпаў Мішу прачуханкі — за папругу браўся, кулаком трос ля носа, ды яму хоць солі на хвост натрусі. Паставілі пры канюшні вартаўніка, веласіпед у каго з двара выкаціць — і паляцеў. А колькі яшчэ дробных правінак было, за якія патрапаў нерваў!..

У школе, хаця там і здзіўляліся ягонай чэпкай памяці ды кемлівасці, Міша вучыўся слаба — лічы, на адны тройкі, — блага паводзіўся: збягаў з урокаў у «партызаны» (у лес), дзе пёк бульбу, курыў; з настаўнікамі не грубіяніў, але равесніка мог абразіць... і тут жа заступіцца за яго, засланіць ад забіякі.

І Лісаветка калі-нікалі давала Мішу матузоў, але ёй увесь час здавалася, што на сына ўсе залішне нападаюць, проста зганяюць над ім злосць, а ён не такі і шалапутны, і ўрокі «выбівае як з-пад малатка»; яна

нават хадзіла сварыцца да Шапялёва, класнага, за што Грышка потым яе самую адлаяў.

...Грышка няўмелымі пальцамі хапатліва растрыбушыў канверт, і тое, што прачытаў у лісце, спярша засціла ад яго сонца — пацямнела ўваччу, — потым праняло ўсё цела халоднымі дрыжыкамі, якія дробнымі тугімі хвалькамі пабеглі ўніз, сцягваючы, як на агні, скуру, і ён адчуў, што млеюць, адпадаюць ногі... Тымі ж друкаванымі, кругленькімі, бы каноплі, літаркамі, якія Грышка ўжо бачыў на канверце, было напісана, што Міша «совершил преступление»...

Грышка зразу не пайшоў у хату, запіхнуў ліст разам з канвертам у споднюю кішэню пінжака і завярнуў на гарод, дзе ў зацішным кутку за лазняю па-мужчынску прыцята паплакаў, пасіпеў у кулак. Што там, якое злачынства? Выдаў ваенную тайну? Не паслухаўся загаду? А можа, горай, самае жахлівае — няўзнак застрэліў каго? Ад яго, паганца, можна чакаць што заўгодна... З паграбні, дзе дасюль, распластаўшыся на сугрэўку, драмаў, скаціўся сабака, Босы, падбег, вінавата завіляў хвастом.

Лісаветка сустрэла Грышку, бледнага, растрэпана-паніклага, спалоханым ускрыкам: «Сэрца?!.» Пляснула далонямі і, знямелая, прысланілася да печы. Грышка зразу не хацеў гаварыць жонцы праўду, думаў перш падрыхтаваць яе, настроіць, ды Лісаветка нечакана так хапіла яго, што ледзь не вытрасла ўсе пячонкі і тое ж сэрца, не кажучы ўжо пра словы, хай сабе і нялёгкія, балючыя словы...

Лісаветка рыдала ўголас: «А мой жа татка!..» — трэсла кулакамі і біла імі ў печ. Грышка трымаў яе за плечы, сіліўся пасадзіць на табурэтку, недарэчна думаючы, якая дужая ў яго жонка.

Гора напраўду вялікае, што і казаць; падобна, Міша правініўся крута, даскакаўся — не да смешачак, і каб жа толькі сам за ўсё расплачваўся, а то ж і бацькам — здзек, ды не абы-які. Такая вось ласка ад дзяцей: малых гадуй — мучся; не спадзявайся, што калі падрастуць — дык лягчэй стане, наўпярок, турбот прыхлыне. Вось Ленка іх, дачка... Здаецца ж, не ў прыклад Мішу, і ціхая была, вучыцца старалася, а пасля васьмі класаў — у вучылішча будаўнікоў паступіла. Думала-

ся, на свой хлеб пойдзе, кватэру дзяржаўную не зачакаецца, але... Падумаць толькі — на БАМ (ці блізкі свет!) завербавалася. Ну добра, калі б добра было, але пісьмо прысылае: цяжарная, замуж бяруць... Хто там бярэ — ані слова, а ліст — як з вады вылаўлены — увесь сшэрхлы, літаркі расплыліся — пэўна, вядро слёз над ім выліла, пакуль пісала. Адбілі тэлеграму: спешна прыязджай; у адказ чытаюць — «не хачу здраджваць сябрам і камсамолу». І хоць за бок яе грызні. БАМ, канешне, ёсць БАМ — чытаеш, чуеш: чыгунка там край патрэбна, і яе будаваць нехта мусіць, але ж дзе ёй, Ленцы, заставацца, калі ганьба несусветная; хай бы прыехала, ачулася трохі, а тады б і назад можна было вярнуцца.

...Жыццё не любіць слабых і не спачувае ім; пасядзелі, пагаравалі Грышка з Лісаветкаю, а тады, як першы прыступ горачы схлынуў, сталі думаць, калі і каму ехаць да Мішы. Сам Грышка далёкіх паездак не любіў. Лісаветку, як кажуць, хлебам не кармі, а пусці ў дарогу, і яна цяпер, ведаючы, які ў яе дамасед мужык, павОдзілася так, быццам ужо наперад было ясна, што ехаць ёй; ды яна не зважала якраз на тую сваю пахібку, якая Грышку больш за ўсё не падабалася і якая магла, на яго розум, кінуць на Мішу цень, — гэта — жончына «пустата» ці, інакш, неразважлівасць. Можа, яе, гэтай «пустаты», і не столькі ў Лісаветкі было, як здавалася Грышку, і не так бы яна чапляла, абурала, калі б Лісаветка была проста жанчына — ці то малінаўская, ці то з бліжэйшае акругі, як жонкі ў большасці мужчын. Але ўся ў тым і штука, што Лісаветка была не з тутэйшых, Грышка прывёз яе ажно з Гомеля, які на той час лічыўся ледзь не краем свету. Так і казалі ў Малінаўцы бабы: Грышка ўзяў сабе жонку з-за свету.

Ехаў ён тады з заробкаў, з шахтаў Данбаса, куды загнала яго, як і многіх іншых беларусаў, пасляваенная нішчымніца; вёз тры чамаданы дабра, поўныя кішэні грошай і на пяць тысяч аблігацый, новенькіх, крамяных, якія потым (так пісалася ў газетах) зноў заменяць грашыма. На станцыі ў Гомелі ён выйшаў пакурыць; стаяла духата; да яго падбег маленькі замурзаны хлапчук, падняў выгнутую лодачкай далонь. Вочы ў хлапчука былі вялікія, чорныя і глядзелі з такім смуткам і ней-

каю сабачаю ўтрапёнасцю, што ў Грышкі міжволі задрыжала размякчаная рэстаранным півам душа і абручом здавіла горла — ні дыхнуць, ні прадыхнуць; ён узяў хлапчука (пазнаў: цыганёнак) за плячо, і той надзіва мякка падаўся следам; ён прывёў яго да ларка, за шклянымі бакамі якога смачна, мядова адсвечвалі булачкі, і сказаў, каб той прасіў «колькі яму ўлезе». Цыганёнак глянуў на Грышку здзіўленымі вачыма, у якіх разам з хітрасцю: «Маніш?» — пырснула і глыбокая, нястрымная радасць дзіцяці: «Во пашэнціла!», выцягнуў са штаноў падол завэдзганай, спалавелай кашулькі, але ўбачыў у ёй ладную дзірку, праз якую магла праваліцца булачка; хуценька сашмаргнуў з плячэй кашульку — здаецца, нават трэснуў рукаў — і распасцёр яе з бессаромным нахабствам.

Грышка браў з прылаўка булачкі... Вочы ў прадаўшчыцы дасюль былі нейкія млявыя, санлівыя, ці што, а тут раптам ажылі і адно з іх заміргала. А Грышка кідаў і кідаў на распасцёртую кашульку булачкі. Цыганёнак спрытна, адным рухам увязаў іх, закінуў ношку за плечы і — «А раптам гэты «ачо мануш»[1] перадумае?» — шмыгнуў у натоўп, які тут жа праглынуў яго, бы мышку стог сена.

Ён дасюль не ведае, ці *яна* пільнавала ўвесь час, як ён саступіў з падножкі вагона, закурыў, потым павёў цыганёнка да ларка, ці няўзнак лучыла на яго і па цыганскім чуцці, што, можа, не так даецца ад прыроды, як вытончваецца частай споведдзю чужой душы, супыніла: хвацка выгнула перад ім руку, як фея, трохі падцяла ўніз галаву, каб вочы, выкаціўшыся бялкамі, здаліся большымі і ўражлівымі. Затоеная ўсмешка, у якой было менш хцівае саладжавасці і больш звыклай жаночай гуллівасці, выпырхнула ёй на вусны, між якіх ядрана, як соль, блішчалі зубы. *Яна* была ярка-пякучая, прыгожая сваёю маладосцю. Такіх цыганак Грышка яшчэ не бачыў. Прызнацца, сярод цыган, якіх багата асела і ў Данбасе, Грышку падабаліся болей мужчыны — строгаю, панураю прыгажосцю чорных густых кучараў, часам змоладу пасівелых, усягды злучаных на пераноссі броваў, вусоў і смуглай скуры. У жанчын чамусьці ён не знаходзіў палкага хараства — звычайна былі худыя, на тонкіх нагах, з буйнаватымі насамі і —

[1] Добры чалавек (*цыган.*).

самае галоўнае — адпужвалі яго прыметнымі валасамі на твары, падбародку і над верхняй губой асабліва.

*Гэта* была бледнатварая, русавалосая (яго здзівілі даўгія пасмы, заплеценыя ў касу), а вочы — вугальна-чорныя, як бы з сіняватаю смугою, падобныя на саспелую нечапаную сліву.

З-за *яе* ён спазніўся на свой цягнік, спахапіўся адно тады, калі пачуў свісток і чамусьці аглушальны стукат колаў па рэйках. «Багаж!..» Яна не выпусціла ягонай рукі, хоць і адчула, дакладней — убачыла, як злосць і адчай выплеснуліся з грудзей на вочы, а цёмныя, правугленыя пальцы згарнуліся ў ёмкі, жалезны кулак, які, канешне, не збіраўся біць, у ім чалавек сашчаміў у адзін міг нервовую ўзбуджанасць і, можа, нават страх, што міжволі атуляе ў холад кожнага, калі ён зняцяйкі апынецца на краі глыбокай прорвы ці перад кучкаю незнаёмых, нядобра настроеных людзей.

Ён разам увесь абмяк, ужо не думаючы пра багаж, але аддаючыся на спагаду той, што заблытала яго не выдумкамі сваімі, а жаночаю красою. Потым ён здзіўляўся, як мог зразу даверыцца незнаёмай жанчыне, ды яшчэ з роду такога, адвеку шалапутнага. *Яе* звалі Ліса, Лісавета, а пазней ці ўжо ў тую ноч, не помніць, яна стала для яго Лісаветкаю — імя, у якім яму чуўся родны, цёплы плеск Сажа, шолах ліп на гародзе, звон бліскучых сцяблін, што яшчэ не адубелі як след, а толькі выструніліся для таго, каб утрымаць пустую шчотачку коласа, які некаторага дня раскаранауецца поўненькімі, бы сэрца, зярняткамі.

Лісаветка, як расказала, была не чыстакроўная цыганка: бацька яе, бесарабскі цыган, ажаніўся з украінкай, з якою і прывандраваў у Гомель; асеў там і ўладзіўся мясніком на базары. Грышка, на тры дні запазніўшыся, прывёз Лісаветку з сабою ў Малінаўку і на нейкі час стаў, мабыць, самым «сукаватым» чалавекам на вёсцы — яго (зразумела, болей з-за жонкі) усе чаплялі — позіркам, языкамі. Так зазвычай сярод жывога было і будзе. Грышка не крыўдзіўся, нават жартаваў: «От! Вон у табун новую карову падпусці — зразу ўсе да яе рагамі. А тут — людзі...» Але спакваля малінаўцы абвыкліся, пакрысе падзея счахла, і напамінкам пра яе засталася адно мянушка — Цыганка: усе да аднаго звалі так Лісаветку зáчы, а пры стрэчы называлі па імені.

...Дый пустая ці не пустая яна, Лісаветка, — клопату таго, проста не бабскага розума «ета дзела» — суд: там жа не слязам ды праклёнам месца, а разабрацца ва ўсім трэба, цвярозаю галавою, па справядлівасці каб... Толку, што гвалт усчнеш. Бегала ж яна, Лісаветка, даказваць Шапялёву, і ўсё попусту, можа, яшчэ больш разбалавала Мішу.

Так ці інакш (не мінавалі і спрэчкі), але ў паездку стаў збірацца Грышка. Лісаветка хоць і моўчкі, хліпаючы носам, аднак памагала яму, здаецца, ахвотна, з жаночаю хваткасцю.

...Дызель з Крычава, куды Грышка дабраўся на спадарожнай, прывёз яго ў Оршу вячэрнім часам. Было яшчэ відна, але сонца паслабела, не так смаліла, як удзень, хоць паветра па-ранейшаму было густое ад цеплыні, пахла тут, на вакзале, мазутам, асфальтам і яшчэ нечым вострым, ад чаго ў Грышкі аж навярнуліся на вачах слёзы. Казалі яму, што цягнік на Маскву будзе позна ўночы, недзе каля дзвюх гадзін; як дачакацца таго часу — Грышка проста не дабіраў толку. Звычайна людзі, якія ўмеюць і любяць ездзіць-раскатвацца, ідуць пры такім выпадку ў рэстаран, а то і зусім у кіно, швэндаюцца па горадзе, запыняючыся каля магазінаў і кіёскаў, у якіх купляюць значкі ды розныя забаўкі, знаходзяць суцеху ў парку ці нават на танцульках. Грышка пра гэта ведаў, але сам не быў здатны на такое, ды яшчэ пабойваўся, што, зашыўшыся ў горад, заблудзіцца і, пакуль дападзе да месца — цягнік «туту»; хопіць — некалі ў Гомелі наперажываўся. Дык там жа хоць багаж пасеяў, затое «долю сваю знайшоў», як кажуць у іх Малінаўцы.

Грышка прайшоўся па пероне паўз даўгі і высокі будынак вакзала, глянуў уверх, прыцісну ўшы на макаўцы картуз. Не спяшаўся, выглядам паказваў, што чалавек ён тут свой, усё ведае і разумее — так было спакайней яму самому. Тым не меней позірк Грышкаў зачапіўся і за дзверы, праз якія заходзілі ў вакзал людзі, адшукаў буфет — прылавак з вялікім бліскучым самаварам і некалькі высокіх, мала не да плячэй, столікаў з круглым, як у бочцы, верхам, заваленым паперою ды аб'едкамі; наткнуўся і на тую літарку «м», што памагае, калі адчуеш у сабе лішняе... Словам, розум яго,

па-сялянску біты, прымушаў найперш разабрацца ў тым, куды трапіў, і быць смелым да любых нечаканасцей, што выпадаюць у дарозе. Так абагнуў Грышка будынак вакзала і сеў пад куст бэзу на лавачку. Па зямлі хадзілі галубы (ну акурат тыя, што вядуцца на маліпаўскай ферме!), тыцкаліся дзюбкамі ў пясок, грэбавалі шалупашкамі ад семак, мабыць, шукалі хлебныя крошкі. Грышка, гледзячы на іх, падумаў, што і яму было б не лішне кусануць чаго, бо што ўранні ўхапіў, аб тым і праднява. У сумцы, ведаў, ляжаць самаробныя кілбасы, сала, ёсць слоік смятаны, у цэлафане тварог, і хлеб, здаецца, Лісаветка клала. Але, па-адно, што не будзеш жа тут куёўдзіцца з сумкаю гэтай, распакоўваць ды раскладаць, а па-другое, чымся менш ён з'есць, тым больш завязе Мішу, бо там яму, канешне, манкі з неба ніхто не сыпле. Напамін пра Мішу на нейкі час адвёў Грышкавы думкі ад яды, і ён сядзеў, панураны ды размяклы, як хворая курыца, дапякаў і сябе, і Мішу — што яны па натуры нейкія няўломістыя, карузлікі, адным словам. Ну, пра Мішу і гаворкі няма — няйнакш, прымесак цыганскай крыві і буюе ў ім, дый малады яшчэ, вецер у галаве і нагах. А вот жа ён, Грышка, чаму ўсё жыццё як непрыкаяны? І тады на шахты ў Данбас адзін з акругі падрадзіўся ехаць. Памахаў кіркаю пад зямлёю — льготу на пенсію заслужыў. А вярнуўся ў калгас, стаў нейкім капрызным, бы дзіця тое, неабачліва рэзкім, якім раней сябе не помніў. Ну, бывала, на вечарынцы пад чаркай пагарачыцца з хлопцамі, пакрычыць, але каб у бойку лезці, з частаколінаю бегаць — ніколі. Зла і пагатоў з сабою не насіў, забываўся на яго хутка і не помсціў «варожым вачам» — вітаўся з імі, першы пры стрэчы загаворваў.

Няўжо, думаў ён, рабочай закваскі падчапіў у шахцёраў: тыя ж ледзь што — рэжуць «праўду-матку» проста ў вочы, нягледзячы на крэслы і званні; трэба — дык і кулакі пусцяць у ход.

Грышка прыпомніў усё гэта, седзячы пад бэзам на лавачцы, таму, што дзівіла яго тады-сяды, пры нагодзе, — як гэта іншыя нейк жывуць сабе ціха, спакойна і не шманаюць, быццам і цяжкасцей ніякіх у іх няма, усё ідзе як па маслу і, здаецца, дзяцей сам чорт калыша. А можа, ужо сумняваўся ён, кожны ўсё-такі мае за што перажываць? Не можа чалавек быць чорствым, як скарынка тая зваляная за суднікам. Проста адзін ха-

вае ўсё ў душы, церпіць, мучыцца, а другі — увесь нарасхрыст, голы... А калі ўжо голы, то што хавацца, усім і так відаць, голаму нават смерць не страшная. Край тут — каб правільна цябе разумелі... людзі, от.

Калі голад ушчыпнуў за жывот зноў, ды ўжо з большаю злосцю, Грышка падняўся і пасунуўся туды, дзе — запомніў — быў буфет: у правым крыле вакзала, між тарцовых выступаў. Чарга не сказаць каб вялікая, але даўжэйшая, чымся раней, і гэта яго не засмуціла, а, наўпярок, усцешыла: хутчэй мінецца час, як-ніяк, патрачаны не ўпустую, а быццам бы на дзела. Пакуль стаяў, прасачыў, што бралі людзі — найбольш кураціну, якая ляжала, парэзаная вялікімі кавалкамі, на падносе, каву і пляскатыя, як праснак, коржыкі. Намеціў, што і ён возьме гэта ж самае. Але, пакуль падсунулася чарга, на падносе застаўся адзін невялікі кавалак, які ніхто не браў. Разгледзеў: шыя ды яшчэ ў пяньках ад пер'я. Грышка папрасіў дзве катлеты — хаця і халодныя, бо ў вітрыне пад запацелым шклом, затое не трэба будзе скубці зубамі гэту, мабыць, старую і недаваранаю курыцу, як, бачыў, рабілі тыя, што ўжо кешкаліся каля столікаў.

Ён нехаця пажаваў халодныя катлеты, якія да таго ж і нечым нясмачным папахвалі, выпіў шклянку кавы; коржыка толькі адламаў, астатняе адсунуў ад сябе. І тут ён убачыў руку, якая вынырнула невядома адкуль і зграбла коржык. Спярша мільгнула ў галаве, што прыбіральшчыца, але перад ім стаяў мужчына — невысокі, у акулярах, з начыста голым і выпуклым, бы яйка, цемем, укруг якога спадалі да самых плячэй рэдкія, склычаныя валасы. Апрануты ён быў у шэры затрэпаны пінжак; штаны, забраныя ў халявы кірзавых ботаў, пузырыліся на каленях і блішчалі. Мужчына адною рукою трымаў за чуб мяшок, просты палатняны мех, у які насыпаюць па восені бульбу; другая рука — з коржыкам — шуснула ў мяшок. Здавалася, мужчына збянтэжыцца ад позірку Грышкі, завернецца і пойдзе, але — не, запыніўся; глянуў на Грышку прыдзірліва, неяк востра, акурат шыльцам пырнуў, а ўжо тады ўсмешка выбілася на яго таўстыя (сапраўды як грыбы) вусны.

— Бачу, — сказаў мужчына, — і ты, чалавеча, сабраўся ў нялёгкую дарогу. Наперадзе — цемната, не так? — Ён не адводзіў ад Грышкі сваіх вострых пад

шкельцамі вачэй, у якіх, аднак, зусім не было колкасці, а няйнакш — лагода і, мабыць, спачуванне, ці што.

Грышка, які ніколі не чапляўся да людзей і не ўмеў попусту балбатаць, не кіўнуў: так-так, як гэта трэ было чакаць, а паныкаў галавою — не столькі згаджаўся пра далёкую дарогу, колькі паказваў, што ў яго проста баліць душа. Ён, не нагінаючыся, прыткнуў нагу да сумкі і так стаяў: мала якія людзі блытаюцца тут. Чуў жа колькі разоў, што і чамаданы крадуць, і кашалькі з кішэняў выцягваюць, як зазяваешся. Гэты, хоць і падазроны, здаецца, чалавек прамы: наўрад каб злодзей ці жулік квапіўся на недаедак. А там — хто яго ведае: чалавечая ж душа без вокан — не заглянеш.

— Вот ты мне, чалавеча, скажы, — мужчына сашчапіў у пальцах рукі і ўспёрся локцямі на столік, не зважаючы, што на ім блішчала разлітая кава, — што цябе гоніць у свет? Мне нічога ад цябе не трэба, я пагаварыць люблю.

Грышка і сам бачыў, што мужчына, як кажуць, аматар пачасаць языком і нават пры жаданні паспавядацца перад некім, жаданні, якое ў дарозе ўсягды мацнее не толькі ад таго, што трэба забавіць час, а яшчэ і ад таго, што адзінота навявае думкі часцей за ўсё сумныя, якія просяцца з языка ўпорлівей, чымся радасныя, і на якія кожны адгукнецца з большаю ахвотаю і шчырасцю, дык вось, хочучы паспавядацца, Грышка адчуваў, што нешта ў душы ўпарціцца, пярэчыць. Чужы чалавек? Гэта акурат добра — разышліся, і канцы ў ваду. Туза ла ў грудзях іншае: ці варта яму, бацьку, бэсціць свайго сына — перад кім бы тое ні было? Нават жа курыца і тая на сваім яйку гразі не бачыць. Можа, гэта і ёсць самае святое для яго, бацькі, — перажываць сынавы няўдаласці ў сабе, бо каму яна трэба, скарга твая, і хто цябе зможа зразумець да канца? У кожнай сварцы можна знайсці праведніка і вінаватага і роўна гэтак жа павярнуць усё наўпярок — праведніка выставіць вінаватым; нават самага нікудышніка не трэба зразу на сметнік, а трэба прыглядзецца да яго — і нешта ў ім цябе сагрэе, ласкаю ляжа на душу. Так і тут: будзе ён, Грышка, знеслаўляць сына, дык і выйдзе, што той з адных пахібак, такі-сякі... А куды ты, бацька, глядзеў? Мышэй лавіў? Гонар, што аб'яўляецца ў кожным бацьку, калі чужы чалавек пачынае падпяваць (так-так, моў, непуцёвае дзіцятка!), здаецца, назусім адагнаў думку

расказваць незнаёмцу пра Мішу. І Грышка, каб усё ж не маўчаць і не маніць, сказаў, што едзе да сына, але сказаў такім прыцятым голасам, што нават зусім не-здагадліваму чалавеку ёкнула б: не трэба далей распытваць.

І незнаёмец, паправіўшы акуляры і працёршы двума пальцамі вочы, раптам пасыпаў, бы градам на галаву, словамі, што Грышка не ведаў — ці то слухаць, ці плюнуць, павярнуцца ды ісці без аглядкі прэч. Але, каб паказаць усё ж, што ў гэтым расказе Грышку абурыла і горка засмуціла, прывядзём яго з самага пачатку.

— Бачу, ты не хочаш са мной адкрывацца, — незнаёмец хітра прыжмурыўся і ямчэй аблёгся грудзінаю на столік, — тады паслухай, што я табе скажу. Можа, і нецікава будзе — тады прабач. Я сам з Расіі-матухны, пад Бранскам радзіўся, не так і далёка адсюль. Бацька і маці ў мяне — людзі відныя былі. Дактары, значыцца... Я і сам чалавек граматны — цехнікум скончыў, у магазіне стаў працаваць. Скажу табе, хлопцам я быў — зух, дай божа! Дзеўкі вакол мяне раіліся, як пчолы. А дзе баба — там грашыма павінна пахнуць. За грошы... хоць зараз! — давай табе любую каралеву пакладу ля ног. Ну а, сам знаеш, дзе тых грошай-вошай набярэшся, калі сёння паддача ў кабінеце, заўтра — рэстаран, паслязаўтра — пікнічок... ну, гэта... калі на прыродцы, пад кусцікамі цмок-цмок гарэлачку і жанчынку. А яшчэ ж і ў кватэру трэба лам'я рознага, апрануцца... так сказаць, шыкоўна, па модзе. Вось тады я і аступіўся, як пішуць пра такіх... Махінацыямі, тралі-валі, стаў займацца, хаўруснікаў завёў... Каўбаска два рублі, а цэннічак да яе плясь на два з капеечкамі — і ўвечары ты ўжо чалавек. Паважаны! Гэта — к прыкладу, а там усяго было за восем гадоў. Але, але... — Мужчына цмокнуў языком, і ў гэтым было не толькі і не столькі шкадаванне па мінулым, колькі, мабыць, запозненае разуменне, здавалася б, простай ісціны — што за несумленныя ўчынкі трэба расплачвацца. — Вот бачыш! — Мужчына расхінуў на грудзях кашулю — лёгка, бо ў ёй амаль не было гузікаў, — усё цела было сіняе ад роспісу; пасля Грышка ўбачыў татуіроўку і на руцэ: арол сядзіць на камені і нешта клюе пад нагамі. — Цяжка мне сказаць, — працягваў мужчына, ужо не спускаючы вачэй з Грышкі, які, здаецца, ці не пачаў хваляваціца, бо пераминаўся з нагі на нагу, — што мяне зламала — ці то

ранейшае, разгульнае, жыццё, ці пасля цюрмы страм было ў вочы знаёмым людзям глянуць, — але пайшоў я бадзяцца па белым свеце... Не-не, я не з бічоў (слова Грышку было незнаёмае, але ён не стаў дапытвацца), якія ў Сібір падаюцца, я — проста гультаіна, таму і аціраюся тут... па нашай старонцы. І... павер, нічуць не шкадую — цікава, што ні кажы. Дарога — як тая кніга, толькі, каб чытаць яе, літары знаць не абавязацельна. А свабода якая, у любы куточак ідзі — любуйся, мілуйся, цябе нішто не звязвае і нішто не трымае, і ты нікому не замінаеш. Перахапіў што — і далей...

Грышка пасля гэтых слоў так задумаўся, што нейкі час ужо не чуў незнаёмца, адно бачыў, як у таго расцвелена варушацца абтыканыя ўкруга белымі шчацінкамі вусны і гарацьнейкім вар'яцкім агнём вочы: не чуў Грышка, але разумеў, што мужчына хваліцца сваім жыццём, а вот як сябе паставіць на яго месца — Грышка толку не дабіраў. Няўжо і праўда з чалавекам можа такое прыключыцца, што яму ўсё роўна дзе жыць? Ён тады ў Данбас адлучыўся (дык на дзела ж!), і то не мог ночку паспаць спакойна — усё Малінаўку сніў, сваіх людзей, як рыбу ў Сажы ловіць... так ужо часта, але расказваць пра гэты сон саромеўся, бо чуў, што рыбу сніць той, хто мочыцца ў пасцель. А як ірваўся-ляцеў назад — аж сцяўся ўвесь, калі цягнік у Гомелі пакінуў яго. Не, нешта тут не тое. Нават жа птушка, от, скажам, шпак, варочаецца на месца, дзе вылупілася з яйка: ужо некалькі гадоў засаб Грышка прымячае, што ў шпакоўнях на ліпах гняздзяцца пары аднаго роду — у іх дзіўная блакітная акантовачка па беражку правага крыла...

— Вот чуеш нярэдка, — між тым раскручваў свае думкі мужчына ў акулярах, — што зямлю трэба берагчы, любіць, даглядаць... ледзь не цалавацца з ёй. А па мне, — мужчына раптам стаў запавольваць гаворку і глядзець, не міргаючы, на Грышку, — хоць трава не расці. Што будзе з ёй — мяне ані не турбуе, я — вольны казак!

І тут Грышку прарвала — стукнуў двума кулакамі, як кувалдаю, па стале, аж падскочыў і скінуўся долкі відэлец з надзяўбнутым на яго кавалачкам хлеба, і так схмурыў бровы, што мужчына спрытна, як заяц, адскочыў ад стала; вочы яго забегалі — відаць было, ён неш-

та адчайнае замышляе; так і ёсць, зняў акуляры і асцярожна, не гледзячы, паклаў іх на стол, узяў рукі ў бокі, набычыўся.

— Што?.. — спытаў з задзірыстасцю, але і Грышка ўпёрся ў яго цяжкім, свінцовым позіркам.

— Во! — гаркнуў Грышка, не зважаючы, што каля іх пачалі ўжо збірацца людзі, пакруціў каля скроні пальцам і сагнуўся па сумку, ды... убачыў каля ног відэлец з каваланкам хлеба; падняў яго і аднёс на прылавак, дзе стаялі чыстыя шклянкі; потым забраў сумку і, адыходзячы, усё чакаў ды гатовы быў, калі кінецца ўслед за ім незнаёмы мужчына. Грышка, вядома, яго не баяўся, але думаў: уліпне ў бойку — забярэ міліцыя, а там — дакажы, што ты ні пры чым; пакуль разбяруцца, дык ад цягніка і дух развеецца.

Брыдка, пякуча было на душы, хоць ваўком вый, — не мог Грышка так хутка атрасацца ад таго, што муціла яму кроў ці, яшчэ горш, раніла-крэмзала душу; яно прыгнятала яго некалькі дзён, не давала заснуць уночы, ён хадзіў тады раззлаваны і пануры. Іншы раз у такой засмучанасці карцела выпіць, але асаджваў сябе, бо ведаў з ранейшага, што пасля, як працверазіцца, будзе яшчэ моташней.

Навошта, скажыце людзі, ён стыкнуўся з гэтым прыблудам, навошта завяліся? І так сэрца разрываецца, хоць абручамі, як тую бочку, сашчэмлівай. Клопат, што дурату нёс яму незнаёмец, пэўна, нейкі памешаны, пераджыў бы, можа, і забыўся б, але расла-разрасталася ў грудзях трывога за сына: што і як будзе — цяпер і пасля, як на волю выйдзе. Грышка думаў-пеклаваўся над гэтым, чакаючы цягніка, не спаў і ўсю ноч, калі нудны перастук-дробат колаў і лёгкае пакалыхванне вагонаў так назойліва стамляюць галаву, цела, вочы... «Не... не... не... толькі не...» — шаптаў між думкамі Грышка, як малітву.

...З вакзала да часці, каб не кружыць лішне ў незнаёмым горадзе, Грышка паехаў на таксі, якое мінут праз дзесяць высадзіла яго каля шырокіх варот з вялікімі зоркамі на жалезных створках. На прахадной яго затрымаў салдат з чырвонаю павязкаю на рукаве і нажом пры боку — спытаўшы ў Грышкі, што трэба, і,

здзіўлена прамовіўшы: «А-а-а...» — пазваніў некуды «таварышу капітану», і неўзабаве прыбег пасыльны, які адвёў Грышку ў гасцініцу, на другі паверх — у асобны пакой; параіў Грышку «кімарнуць з дарогі», а калі спатрэбіцца — яго паклічуць, і яшчэ сказаў, чамусьці сарамліва пачырванеўшы, што ён таксама з Беларусі, зямляк.

Грышка паставіў у парозе сумку, сеў на крэсла каля стала і ўнурыўся ў акно — яно выходзіла на двор. Па пляцы, асветленым сонцам, маршыравалі салдаты, вучыліся хадзіць страявым навабранцы — яны яшчэ нехлямяжыя ў адзенні, затое акуратна, нагала пастрыжаныя і ў начышчаных да бляску ботах. На аграмадным, як сцяна, шчыце віселі вялізныя картачкі-рамкі — можа, герояў з вайны, ветэранаў часці, а можа, і сённяшніх салдат ды афіцэраў. «Хто заслужыў...» — падумаў Грышка, і яму стала крыўдна і горка, як, здаецца, ніколі дагэтуль. Ён прылёг на ложак і, стомлены дарогаю ды перажываннямі, нечакана заснуў як мёртвы.

Разбудзілі яго ўвечары — той самы пасыльны, зямляк, сказаў, што просіць нампаліт часці. Гэта, як спагадзя ўбачыў Грышка, быў падпалкоўнік, блізкі да яго веку, але з надзіва маладымі чорнымі вачыма, без ніводнай сівінкі ў валасах. І па тым, што ён перш распытаў у Грышкі, як даехаў, як здароўе, дзе валяваў, было відаць, што чалавек ён — «харошы і ўважыцельны». Грышка асабліва гэта адчуў тады, калі падпалкоўнік стаў расказваць, як пасля ўжо загаду міністра аб звальненні Міша і два салдаты з радасці напіліся ў рэстаране і пабілі чалавека, — у ягоным голасе не было і намёку, каб вінаваціць ва ўсім Грышку, дапякаць яго. Грышка, праўда, мог таксама напусціцца на нампаліта, моў, так і так, сапсавалі хлопца, давялі, але не стаў гэтага рабіць, наўпярок, думаючы, што, можа, і не трэба прызнавацца, не зацяўся ўсё ж і расказаў пра сына — які «неўдаль ён рос з самага дзецтва», а таму, як бацька, Грышка «шчытае», што закапёршчыкам у бойцы мог быць акурат Міша.

— Так ці не так, — сказаў, ківаючы галавой, нампаліт, — але факт збівання чалавека... невінаватага — гэта злачынства, і за яго трэба адказваць па ўсёй строгасці.

Грышка не стаў прасіць нампаліта даравацъ сыну, памілаваць яго ці зменшыць кару, хаця так балюча

сціскалася ўсярэдку ад сваёй бяспомачнасці, што ў любую мінуту ён гатовы быў разрыдацца, але дзяржалі, відаць, нейкія танюсенькія нітачкі ў нервах. Нампаліт быў сам бацькам двух сыноў і разумеў, як чалавеку цяжка перамагаць у сабе гэту сляпую, інстынктыўную амаль, бацькоўскую гатоўнасць кідацца на выручку свайму дзіцяці, якое трапіла ў бяду, калі ўласная смерць нават не палохае, і пакольні чалавека ўсё ж нешта супыняла (думаў нампаліт, націскаючы далонямі сабе на скроні), то была ў яго, няйнакш, моцная і справядлівая душа.

Нампаліт дазволіў ім сустрэцца, бацьку і сыну, якія не бачыліся ўжо два гады. Грышка стаяў з сумкаю, а Міша выйшаў з-за дзвярэй, якія адчыніў дзяжурны афіцэр з такою ж павязкаю на рукаве, як і ў салдата на прахадной, і каля якіх застаўся смірна стаяць паставы з аўтаматам. Пастрыжаны нагала, як тыя навабранцы, у расхрыстанай, без гузікаў, гімнасцёрцы і пакамечаных штанах, Міша не кінуўся на шыю бацьку, як трэба было чакаць, а стаў наводдалі акурат скамянелы, быццам не пазнаваў, быццам сумняваўся, што іменна бацька, яго бацька перад ім. Грышка таксама стаяў незварушна, не зводзячы з сына вачэй, з яго твару, які дужа змяніўся і мала быў падобны да таго, што помніўся Грышку з апошняе мінуты — як рассталіся каля ваенкамата. Міша падрос увышкі, можа, і твар ад таго падаўжэў — выцягнуўся падбародак, скура на шчоках падубела, і выпучыўся на шыі вялікі, з грушу, кадык; толькі сінія, як у Грышкі, вочы, здаецца, былі ранейшыя, адкрытыя, з затоенымі чорцікамі ў глыбіні, яны глядзелі на Грышку незмігутна, быццам хацелі прапячы наскрозь, выпытаць, што на душы і за душою.

У Грышкі было апраўданне, чаму ён так паводзіўся з сынам, якога не бачыў гэтулькі часу, — яму край важна было паказаць, што асуджае сына, што хоча ад яго раскаяння — хоць цяпер. Міша, мусіць, не чакаў ад бацькі такой зацятасці, хаця і навастрыўся да любога нервовага выбуху; няхай бы лепей суматошны крык, кулакі, злоснае тупанне нагамі, але не гэтае тупое маўчанне, якое быццам раздзірае грудзі і забівае ў сэрца распалены ржавы цвік, што з кожным ударам уваходзіць глыбей і глыбей. «Тата, ну што маўчыш?!» — крычала Мішава душа, напінаючыся, бы струна, якая во-во парвецца, але неймавернаю воляю Міша прыму-

шаў сябе стаяць, сцінацца і, што яму было нялёгка, Грышка бачыў — у сына спярша задрыжалі вусны і заплылі слязамі вочы, потым сасмыкнуўся ўніз, па шчацэ, тоненькі, як нітка, струменьчык, і ў нейкі міг Грышку здалося, што ён зараз выпусціць сумку і зрушыцца з месца, ашчаперыць сына моцна-моцна і яны будуць стаяць злітыя, як дрэвы, што растуць з аднога кораня, ды ногі былі як прыбітыя да падлогі і не паслухаліся яго.

Салдат каля дзвярэй з мяккім, птушыным пушком пад носам стаяў і не чуў, як спаўзаў з пляча рэмень аўтамата; дзяжурны афіцэр у гэты час размаўляў з некім па тэлефоне, што стаяў на невысокай тумбачцы з ключом у дзверцах.

За гэтыя мінуты Грышка потым не будзе сябе ганіць, бо ўсё-ткі на сваім паставіў, як кажуць, не змаладушнічаў, даказаў сабе перш за ўсё і сыну, што ёсць нешта вышэйшае, ці як тут сказаць, чымся бацькоўскае патуранне, і што на сваю, родную табе душу таксама трэба глядзець па справядлівасці, а не паддавацца бабскаму хлюмканню ды забываць пра ўсё на свеце. Ён разумеў, што Міша настроіў сябе на мяккасць, паблажлівасць, як і на тое, што бацька яму спачувае і падзяляе з ім бяду, у якую недарэчна, па дурноце сваёй трапіў, але — не, Грышка не даў сыну ніякага спуску, ні на каліўца, і Міша не змог пастугііцца сваім зацятым форсам і, думаючы, што ўпячэ бацьку, зробіць яму балюча, крутнуўся назад за дзверы і ўпаў там на цвёрды ложак тварам уніз.

Назаўтра ў зале суда, адгароджаны высокай дубовую стойкаю, блiскучаю і чорнаю, Міша сядзеў як бы хворы, бледны нейкі, не падымаў галавы. Бачыў Грышка, што сыну не ўдалося адыграцца на ім, бацьку, выпрасіць літасці, вось і перажывае ён цяпер... Не крыўдуе ўжо, не злуе на бацьку, а, пэўна, сябе чахвосціць, каецца, і гэта вярэдзіла Грышку, ціснула грудзі, але сцярпеўся, скруціў свае нервы ў жмут, каўткамі прагаў каляны ком, што, бы калючка, распіраў горла, і не заплакаў нават тады, як зачыталі прысуд — «год дысцыплінарнага батальёна»; і адно калі сына ўжо вялі ў машыну, а Грышка, бяспомачны і разгублены, трухаў услед, і ён, Міша, павярнуўся і, не спыняючыся, на хаду наўмысля зухавата крыкнуў: «Тата, чакай мяне!..» — вочы ў Грышкі засціліся слязамі.

...Валодзька Шапялёў прыехаў з Мінска ў Малінаўку на адпачынак і прывёз з сабою трохгадовую дачку — зрэшты, калі б не думаў пакідаць Васіліску ў дзеда і бабы да восені, то наўрад ці выбраўся б сюды, хутчэй за ўсё махануў бы з жонкаю на поўдзень; мора ён бачыў адзін толькі раз (падчас вясельнага падарожжа), яно яму спадабалася і тады-сяды нават выплёсквала з душы шчымліва-салодкую тугу па нечым недасяжна-летуценным і неразгаданым. Але дачка ўсю зіму хварэла, у яслі амаль не хадзіла і няхай бы за лета акрэпла; а дзе гэта лепей зробіш, як не ў вёсцы, на чыстым паветры ды роснай траве.

За гэтыя дні, якія Валодзька прабыў у бацькоў, ён паспеў ужо добра-такі засумаваць. Бацька яшчэ хадзіў у школу (там рабілі рамонт), а з маці — так ужо сталася з самага пачатку — ён рэдка знаходзіў паразуменне, і размовы іх не заходзілі далёка — так, пра тое-сёе, звычайнае, вясковае.

Вось так, Валодзька, які нарадзіўся і вырас у вёсцы, што здавалася самым дарагім, адным-адзіным месцам тады, як яшчэ не ведаў свету, цяпер сумаваў у ёй, не знаходзіў занятку рукам і проста дзівіўся, зусім шчыра, як тут можна жыць, у такім абмежаваным коле і пастаянстве. Не, гэта і блізка не значыць, што ён не любіў сваю вёску, што яна не была яму блізкая і ён гатовы быў выракчыся яе; наўпярок, чалавек адукаваны, так званы гуманітарый, а значыць, і не зусім глухі да лірыкі, ён з безагляднаю апантанасцю лічыў, што ў чалавеку на ўсё жыццё застаецца ўспамін аб кутку маленства — з адметнасцю яго лясоў, дарог, рэк, палёў і нават птушак ды звяроў. Проста змест ягонае душы, калі можна так сказаць, быў ужо на ўзроўні, калі, акрамя той сажалкі на пагоне, у якой ён мог прабоўтацца ўвесь дзень хлапчуком дый цяпер пакружыць вакол яе з вялікай асалодаю, пацікавацца за чорнымі галавасцікамі, што вяртлява ўсплываюць напаверх, а на дно апускаюцца нерухома, як мёртвыя, яму патрэбен быў нейкі важкі інтэлектуальны патэнцыял, які ўзбагачаў бы яго далей ці, прынамсі, чараваў невядомасцю і навізною, як тое Чорнае мора, куды цягнула яго, але з якім расстаўся першы раз (і — упэўнены! — расстанецца другі) без болю і шкадавання.

Сёння ён схадзіў у грыбы і варочаўся дахаты; набраў амаль поўную сумку, хоць і быў нядоўга, гадзіны якія

дзве, і цяпер з прыемнасцю адчуваў у руцэ цяжар. Ішоў праз усю вёску, бо ўрочышча Шахты, дзе ён збіраў грыбы, было на тым канцы. Даўно, ой, даўно ён не бачыў Маліна́ўку на ўсёй яе працяжнасці: раней калі прыязджаў, дык хіба да магазіна, які пасярод вёскі стаіць, прагульваўся — цыгарэт купіць або маці што-небудзь з хатняй драбязы. Во некалькі новых хат з'явілася — канешне, не ў датык да старых, а на месцы старых, — такія цагляныя махіны, з верандамі, ганкамі разьбянымі, гаражамі — яўна маладыя гаспадары пастараліся. Побач з гэтымі збудовамі старыя выглядалі яшчэ болей запакінутымі і занядбанымі, нейкімі нехлямяжа-прыземленымі, якімі тады, у дзяцінстве, ані блізка не здаваліся. А можа, і яны, хаты, пастарэлі разам з людзьмі, ім, Валодзькам?

Дзяцей, што бегалі па вуліцы і віталіся з ім, спыняючыся і доўга праводзячы яго вачыма, ён пазнаваў адно тых, што былі падобныя на бацькоў, а то і на дзядоў ужо. «Як хутка ўсё цячэ, мяняецца!..» — думаў Валодзька з нейкаю сполашнаю ўзнёсласцю ці, хутчэй, расчуленасцю, якая тым больш агортвала, чымся далей Валодзька ішоў, бо малюнак вёскі западаў у вочы нейкім панурым, выцвілым адбіткам, быццам яго знарок нехта квэцаў толькі змрочнымі фарбамі. З дарослых яму ніхто не сустракаўся — і не дзіўна: хто ў полі, хто на сене ці ў лесе, — і ён трохі сумеўся, калі ўбачыў на лавачцы Грышку Пруцікава: той сядзеў, унурыўшыся вачыма ў зямлю і як бы нейкі зажураны. Валодзька павітаўся і, можа б, не прысеў, калі б Грышка не пазваў яго.

— Хіба з грыбоў?.. — спытаў ён нейкім сутаргава-перацятым голасам, разглядаючы з несхаваным здзіўленнем Валодзьку, які быў увесь яркі, акурат паўлін: у жоўтай, размаляванай спераду майцы і сініх спартыўных штанах з шырокімі, як у генерала, белымі палосамі па баках; на нагах кеды, якія, недзе чуў Грышка, вельмі ж хораша называюцца — красоўкі.

Валодзька расхінуў сумку, і жаўцізною з яе асвятліла Грышкаў твар, які ён нахіліў блізка-блізка.

— На Шахты бегаў? — спытаў Грышка як бы з рэўнасцю, не чакаючы, аднак, што скажа Валодзька. Такую назву — Шахты — Грышка даў мясціне ў лесе сам (для прыметы) — тады, як вазіў адтуль карчы на смалакурню, — з таго часу, лічы, усе людзі і сталі назы-

ваць лес Шахтамі, гэтым самым як бы ўпісаўшы навек у бывалішняе вёскі і тое, што Грышка Пруцікаў некалі глытаў пыл на данбаскіх каменявугальных шахтах. — Во, глядзі-тка, лісічак напароў... — і як бы спахапіўся... — А я...

Дзядзька Грышка, здалося Валодзьку, пастарэў, прынамсі, з твару: вочы запалі, затачыўся нос і маршчакоў падбавілася, у голасе няма той сакавітасці, якая ўсягды здзіўляла Валодзьку. Звычайна, прыязджаючы, Валодзька за дарослымі змен не прымячаў, яны як бы застылі ў адной нерухомай масцы — загарэлыя, абветраныя, быццам знарок падсушаныя.

— Ты ж у Мінску ета? — спытаў Грышка, калі ўдосталь налюбаваўся грыбамі. Спытаў, каб распачаць гаворку, бо пра Валодзьку Шапялёва кожны ў Малінаўцы ведаў — з самага дзяцінства ён быў спакойны, старэйшых паважаў, не гойсаў па вуліцы, на пяцёркі вучыўся і першы з вёскі ў інстытут паступіў. Цяпер — рабіў ужо, ды не абы-дзе, а ў Мінску і — казалі — нейкім вялікім начальнікам па кіно. Якім там можна быць начальнікам, гэта мала каго займала, бо ўжо адно тое, што ў Валодзькі ёсць свой кабінет, тэлефон, падбівала вясковага чалавека (па даўняй звычцы) калі не на пакланенне, то на павагу абавязкова.

Валодзька не любіў фанабэрыі і пра сябе абмовіўся словам, праўда, тое, што мае двухпакаёвую кватэру, упамянуць не прамінуў, і не таму, каб абудзіць у Грышкі зайздрасць, проста гэта была падзея вельмі важная і для яго самога, рэха якой яшчэ жыло ў душы аж дасюль. І ўсё-ткі спахапіўся, успомніўшы, што чуў ад маці пра Мішу і Ленку, пашкадаваў: навошта была пахваляцца, во — зразумеў нарэшце — дзядзька Грышка і так не вельмі пачуваецца. Валодзька быў старэйшы ад Мішы на чатыры гады, і яны хлопцамі мала стыкаліся ў кампаніях, але ўсё роўна іх можна было лічыць равеснікамі і цяпер прыкладаць адзін да аднаго — хто, што і дзе. З Ленкаю іх рознілі пяць гадоў, але яна была ў свае шаснаццаць такая пекная смугляначка — невысокага росту ды поўненькая, тугая, бы гумка, з цёмнымі вачыма і бліскучымі валасамі мала не да пят, — што на яе заглядваліся не толькі малінаўскія жаніхі, але наязджалі і з суседніх вёсак. Нават Валодзькаў бацька, хоць і настаўнік, але неганарлівы па натуры, іншы раз на падпітку сватаў яе да сына, ды яна, какет-

лівая і ў ладзе з жартам, адказвала, што ён, Валодзька, «ні ў жысць» яе не возьме замуж, а яна — хоць зараз згодна. І Валодзька, каб не варушыць усяго гэтага, не выстаўляцца і не наводзіць Грышку на невясёлае думанне, спытаў:

— А вы, дзядзька Грышка, дзе? Па-ранейшаму?

— Ды вот, усё грыбы вару, — сказаў Грышка, і было відаць, што ён нечым дужа заклапочаны. — І шчэ ж, каторы во год дом рыбака сцерагу. Па сумясціцяльству, так сказаць... Цяпер ета ў пашане.

— Добра вам, — сказаў Валодзька з нейкаю дзіцячаю прастадушнасцю; ён хацеў сказаць толькі тое, што работа — на прыродзе, жывая дый не такая ўжо адказная, і гэта як жа добра.

— А вам кепска? — раптам ухмыльнуўся Грышка, і насмешлівая нотка, што дрыгнула ў ягоным голасе, крышку зачапіла Валодзьку, але не тым гукам, які прыдаваў ёй іронію: Грышка хацеў сказаць, што калі ім, такім, як Валодзька, блага ў горадзе, дык няхай не стогнуць, а прыязджаюць сюды і робяць, балазе прычэлле рукам і галаве знойдзецца, надта пры цяперашняй электрыцы і механізацыі; Валодзька ж падумаў, што Грышка папракае яго гарадскімі выгодамі і ўсякай там хатняю бестурботнасцю.

«Не, — думаў тым часам Грышка, — такіх ужо ў вёску не зацягнеш — аселі ў гарадах намёртва, прыкіпелі, во што...» — Ён ужо даўно прымеціў, што ніводнае з дзяцей, чые бацькі так-сяк навучыліся грамаце, не заставалася ў вёсцы, што б там ні было — некуды ехала вучыцца... Ды што тут — дзеці тых жа старшынь (колькі іх перавярнулася!), аграномаў, брыгадзіраў, якія іншых агітуюць у калгас, ідуць якраз не ў тую навуку, якая б варочала іх назад, да бацькоў. А што ўжо крывіцца на настаўнікаў, тых жа Шапялёвых?

Валодзька пачакаў, калі Грышка перадумае ўсё, а тады, як убачыў, што той паварушыўся і памякчэў тварам — пачынала сыходзіць строгасць, — сказаў:

— Яно, канешне, кожнаму сваё: без крылаў не паляціш. Я дык люблю зямлю... Як і помню сябе, у ёй корпаўся, кветачкі ўсякія садзіў ды мурашачак-мошачак разглядаў, а цяпер шкадую вельмі, па сённяшні дзень, што на ёй мазалюють іншыя... вот вы, а не я. Ды што зробіш — кіно пацягнула...

Грышку такая шчырая Валодзькава споведзь лягла

на душу — разабрацца, дык правільна: не ўсе ж маліпаўцы павінны быць толькі малінаўцамі. А можа, яны такія спраўныя і ўпраўныя, што недзе ім і замены няма. Вунь нядаўна — гэтак жа сама сядзеў Грышка на лавачцы — бачыць, ад грэблі пыліць легкавік. Мала які, можа, хто ў ягады едзе — не даў таму ўвагі. Праміпае яго легкавік гэты і ўжо наводдалі спыняецца. Вылазіць з яго чалавек, ідзе... Не прыглядаецца Грышка — яўна дарогу бяжыць пытаць. І раптам: «Ета ты, дзядзька Грышка? Здаецца, ты... Прывітанне!..» — Падае ёмкую, як даўбешку, руку... А каб ты спрах! Васіль Муранкоў, не разлі вада з Мішам былі. Іці твае пяткі!.. Здаравенны, адкормлены, у міліцэйскай форме, і на пагонах зорачкі. Лейтэнант! Падсеў, чынна гэтак, важна шмарганўў калашыны, каб не напіналіся на каленях. Пагаманілі, паківалі галовамі. Аж яно во што, Васіль зразу пасля арміі ў міліцыю падаўся — добрую супрацьвадзілаўку заслужыў; потым павучыўся ў Мінску колькі там, і вось... «Твой?» — кіўнуў Грышка на легкавік, ужо як памаўчалі, можа, нават не столькі з радасцю, колькі з павагаю да Васіля — моў, бачу-бачу: салідны чалавек. «Мая, — адказаў Васіль абы-як, прыжмурыўшы, як лены кот, вочы, акурат гаварыў аб нейкай зусім нягеглай дробязі. — Цешча пару тысяч аджалела...» — І зноў сказаў з такім гонарам, быццам яму, такому зяцю, хоць і дзесяць тысяч адвалі, дык усё роўна не загнеш казе хвост. Вось табе і маеш! А быў жа такі гультаіна, горшы за Мішу.

Але і Малінаўка не прападзе, будзе ў ёй каму жыць — як ні круці! Вось толькі б Мішу дачакацца, там яны памудруюць, што рабіць, адно шкада, час не падгоніш — не конь. Добра, як жа добра, што хаця гэты Валодзька падвярнуўся — з новым чалавекам усягды лягчэй душу адвесці, во колькі тае гаворкі было, а разварушыўся, у вачах пасвятлела... А то ўжо так занудзіўся быў, як прыехаў ад Мішы, хоць у пятлю лезь. Грэх сказаць, грыбы ледзь не прамаргаў, калі б не Валодзька. Малайцом, золата хлопец — першы пранюхаў. Цяпер самому трэба сцягацца, праверыць дый зачынаць сваю кухню. А клопату-клопату яшчэ... Нечакана ўсё, а думаў жа ён, як дажджы лілі, што рана сёлета грыбы вылезуць. Ёсць у Грышкі, мабыць, як і ў кожнага грыбніка, *свая* мясціна, дзе ўсягды самаперш пачынаюць расці грыбы, — гэта ў Панітоўшчыне.

...У грыбы Грышка стаў збірацца зранння — смех, якія тут зборы: уссунуў на ногі лягчэйшыя чаравікі, нож у кішэню ўткнуў, узяў з кладоўкі кошык — і хоць у строй станавіся. Сумак Грышка не любіў — церліся ў іх грыбы, трацілі свежасць і ядронасць сваю, — а кошык паветра прапускае, таму і не псуецца грыб, не «згарае» — якім паклаў, такім і дастанеш. Іх, гэтых кошыкаў, у Грышкі з добры дзесятак на гарышчы сохне — сам пляце, балазе лазовага пруцця на лузе хапае, а ён там з вясны, лічы, кожны дзень.

Грышка хацеў ісці ў Панітоўшчыну грэбляю, цяпер, як палажылі трубу ды засыпалі гравіем, тут нават увесну, у самую распуціцу, хоць бокам каціся, але падумаў, што кружна, а дарога і без таго немалая, і скіраваў да балотца. Сцежачка, схаваная ў ліловай гушчыні мятліцы, вывела яго на поле, на якім рос лубін — акурат цвіў — жоўтае мора. Нягледзячы на свае гады, Грышка хадзіў вельмі зграбна, зусім не нахіляючыся ўперад, — маладзён, дый толькі!

Панітоўшчына была за шашою, і назва гэтая, нераўня Шахтам, ішла са старых часоў — некалі край малінаўскі належаў багатай графіне Воранцовай, якая сама жыла аж у Кіеве і толькі зрэдку летам наязджала песціцца на беразе Сажа. Была яна, расказвалі, не вельмі злая да прыгонных, а з выгляду надта мажная — высачэнная і надзіва тоўстая, не абхапіць; адсюль і назва — Панітоўшчына.

Дарога туды Грышку, ох, як знаёмая, лічы, кожнае дрэва ведае. Вунь за тою лагчынкаю, вытканаю зялёнай муравою, здаўна растуць дзве сасны з дзіўнымі, падобнымі на мётлы, кучомкамі на галлі. Здаецца, ад бабкі сваёй ці, можа, ад якой іншай старой чуў Грышка, што гэтыя кучомкі вырастаюць на дрэвах, зачараваных ведзьмаю, — трэба ж ёй, ведзьме, на нечым лятаць, вось яна і вырошчвае мётлы. А на самай справе, калі па-сур'ёзнаму браць, дык гэта хворасць такая нападае на дрэва і шыгалле слаба расце, хутка адмірае.

А далей, акурат сярод прагалу, бяроза пахілая стаіць, тая бяроза, на якую каляднаю ноччу Грышку ўзагналі ваўкі, і ён праседзеў аж да віднаты, не сваёю ахвотаю стаўшы «госцем» ваўчынага вяселля.

І не толькі таму так добра вызнаў Грышка дарогу, што па ёй у грыбы хадзіў ды карчы на смалакурню вазіў. Дарогаю гэтаю можна выйсці на Рамідоўшчыну,

дзе жыве Любка Гранцішына... І Грышка выходзіў не раз. Які салодкі быў той малады чад, як п'яна кружыў галаву — адкуль і што, Грышка не ведаў, можа, гэта і зусім нельга ўлавіць, разгадаць, з чаго пачынаецца яно, жаданне да чужой жанчыны. І праўда, ён ніколі не думаў дрэнна пра сваю Лісаветку, хоць трохі і шухавейная яна ў яго — семкі на лавачцы лушчыць будзе ці перад тэлевізарам выскаляцца, а пыл на падаконніку не бачыць. Грышка тады-сяды бурчаў на яе, прывучаў да рупаты, дбайнасці, хацеў, каб Лісаветка яго была як усе жанчыны — трохі скупаватая і да яго стражэй, а ёй усё смешачкі. Здаецца, і сама яна ўся з усмешкі, як рамонак. Праўда, калі на шчырасць, Грышка нават радаваўся іншы раз, што яны з жонкаю характарам розняцца — лёгка яму з ёй: ён са сваёю сур'ёзнасцю гатовы крахтаць-мудраваць над любою макулінкаю, а яна на жарцік звядзе — глядзіш, і ўсё проста. І грошы ў Грышкі Лісаветка ніколі не выграбала, не пыталася, ці ўсе аддае. Каб якому забулдыгу такую жонку — у раі жыў бы, няйнакш. А можа, усягды так здаецца, што ў людзей лепей, чымся ў цябе, таму і падганяеш сябе пад іх, а каб быў які-небудзь цар ці бог, што па справядлівасці мог расцаніць, то сказаў бы наўпярок — на цябе трэба раўняцца іншым. Ну, а што да красы, то з Лісаветкаю наўрад ці паставіш каго побач, нават тую Любку Гранцішыну... І ўсё адно, гэта часта дзівіла Грышку, Лісаветка была незачэпа. Шмат хто з мужчын клаў на яе вока, на легкамыснасць змушаючы, а былі — што і рукам волю давалі, моў, баба сіле скараецца, ды дзе там: як агрэе поўху — дзесятаму закажаш. От пахіхікаць, зубы пасушыць — на гэта яна майстрыца. Грышку, канешне, усё гэта лесціла, цешыла яго мужчынскі гонар — на любую гулянку, надта ў маладосці, ішоў з задзёртым носам: глядзіце, як трымаецца зубамі і рукамі за мяне жонка. І не страх — відаць было — перад чужым краем ці ад таго, што Грышка кіне, калі яна пераспіць з кім чужым, супыняў Лісаветку, гэта — факт! А што тады? Няўжо яна разгледзела ў Грышку нешта такое схаванае, чаго нельга ганьбаваць, брудзіць? Не, лухта ўсё гэта, нічога такога ў ім няма — мужчына як мужчына. І хто ведае, можа, якраз во тут з Грышкавай душы, неўпрыцям яму самому, пачаў наклёўвацца той слізкі расточак эгаізму, сок якога і ёсць не што іншае, як вера ў сваю беспакаранасць; а эгаізм — ён усягды ў

хаўрусе з паслабкаю. Смех, Грышка так і блізка не думаў, гэта аўтар, каб яму памагчы, наважыўся ўнесці хоць якую яснасць у тое, пра што пойдзе далей расказ.

...Яны тады рабілі на смалакурні, якую ўжо даўно знеслі, бо не было з чаго гнаць шкіпінар. Грышка вазіў на кані смаляныя карчы, якія рвалі аманітам па ўсім лесе, часам вельмі далёкім, як той, названы Грышкам Шахтамі, а Любка дзяжурыла каля жалезных чанаў і пільнавала, каб шкіпінар і дзёгаць лішне не наліваліся ў бочкі. Да Рамідоўшчыны, дзе жыла Любка адна-аднюю, было кіламетры два, а то і больш. Зімою дзень — як зайцаў хвост, і часта ёй выпадала ісці дахаты ўжо цёмначы. Грышка тады-сяды набіваўся — то жартам, то ўсур'ёз — у праваднікі, ды яна адварочвалася. Але каторага дня, пасля замеці, на якія тады зімы былі шчодрыя, Грышка, шкадуючы Любку, усё-ткі ўгаварыў яе сесці ў сані. Ехалі, блізка прытуліўшыся, не гледзячы ў вочы, бо кожны, мабыць, думаў пра адно і тое. Пусціўшы каня самаходам, ён нечакана сарваў з рук вязёнкі і, расшпіліўшы кажух, акрыў Любку крысом; адной рукою стаў шукаць цяпло пад яе старэнькім там-сям прапаленым паліто; яна, удзячная Грышку, не працівілася. Шчытна седзячы, дыхалі адно на аднаго марозам; Грышка быў ужо і намацаў Любчын бок, адчуўшы, як гарачыня жаночага цела пабегла па пальцах у руку і ў самае сэрца, але зняцяйкі таргануліся моцна сані — конь зачапіўся аглобляю за крывулястую бярэзіну, — і на іх пасыпаўся зверху снег.

— Што ўжо тута, — раптам сказала яна, сарамліва апускаючы вочы і не хаваючы пакоры ў голасе. — Паехалі ка мне — пакармлю. — На вейках у яе трымцелі, растаючы ад дыхання, пылінкі снегу.

Адчыняючы тугія весніцы, Грышка пачуў, як яны зарыпелі, згортваючы набок снег. На двары ляжала гара парэзаных бярозавых дроў, каля якіх жаўцела перамешаная са снегам пырса. Нехта з мужчын рэзаў, падумаў ён, і яму зразу размарыла душу, цяпло пракацілася па спіне. Што за мужчына? Можа, хто ўжо ў «хазяіны» набіваецца? А што — баба ладная, маладая, клопату — што замужам была: з вайны ў многіх мужыкі не паварочаліся. І хата яшчэ што звон, хаця і нізкая,

але з тоўстых стрыжоністых бёрнаў, пабеленая мелам, акурат церам які, і крытая бляхаю. Доўга прастаіць.

Любка запаліла карасінавую лямпу; павесіла яго кажух на цвік каля парога. Ён абабіў аб калена шапку, пакамячыў яе ў руках і накінуў на той самы цвік, на якім вісеў кажух, — чорная шапка злілася з чорным каўняром. Хацеў быў зняць і галёшы з валёнак, ужо нацэліўся заднікам, ды яна мякка падпіхнула яго ў спіну:

— Ідзі, не трэба...

Ён сеў на лаву, утупіўшы вочы ў валёнкі — на кроплі, белыя ад таго, што ў іх адбівалася печ; потым у прасветліну між шырмамі ўбачыў ложак з дзвюма падушкамі, закрытымі вышыванымі накідкамі; над ложкам вісела рамка з картачкамі, якія зводдалі няможна было разгледзець. Каб уведаць, ці ёсць там картачка Любчынай «дзевачкі», дачкі, што не пеpажыла вайну, памерла ад тыфу, ці паспелі яе хоць разок зняць на картачку, — Грышка хацеў спытаць, але, падумаўшы, не стаў варушыць балючае і даўняе.

Любка ўжо прычасалася перад люстэркам, уробленым у печ побач з пячуркаю; патрымаўшы заколкі ў вуснах, зашчаміла імі скручаныя на патыліцы куклаю валасы. Бачыў Грышка, не саромеецца яна яго ў сваёй хаце, пачувае сябе так, быццам даўно яны жывуць удваіх і прызвычаіліся адно да аднаго; калі яна паднімала да патыліцы рукі, ён убачыў, як напялася ў яе на грудзях кофта і з-пад яе выткнулася ў поясе зборка белай споднян кашулі; ён адвярнуў галаву, прыцінаючы ў грудзях дрыготку, што замуціла яму вочы.

Гэтак жа няспешна, акурат наўмысна хацела адцаліць час, яна сабрала на стол — выняла з печы смажанай бульбы; парэзала сала, салёных гуркоў; паклала ў талерку сырых яек. Паставіўшы бутэльку і дзве чаркі, сказала, каб садзіўся бліжэй да стала. Ён чамусьці шумна ўздыхнуў і падышоў нехаця.

Яна наліла ў чаркі, кіўком запрасіла выпіць. Ён пацягнуўся да яе чокнуцца — трымаў чарку шчытна ўсімі пальцамі. Яна, гаспадыня, не прысела, узлокцілася леваю рукою на стол, а праваю брала закусваць, і Грышка міжволі чапляўся краем вока за адкрыты куточак цела ў нізкаватым вырaзе кофты.

Хоць і выпіў чарку, а затым і другую, п'янь не брала яго і яда не лезла ў рот — нешта падкацілася пад гру-

дзі, цвёрдае, даўкае, як недаспелы, аскомісты яблык-дзічак, было цяжка дыхаць, не тое што есці. А Любка наўпярок, пачувала сябе спакойна, а гэты бляск у вачах і чырвань на твары хутчэй ад выпітае гарэлкі, чымся ад нейкай нутраной узрушанасці. І Грышка падумаў, што ім, мабыць, цяжка будзе паразумецца між сабою. Калі чэсна, дык ён ні на што не намерваўся з самага пачатку, проста пашкадаваў жанчыну-ўдаву, што ёй, беднай, грэбціся адной па снезе, а потым ужо, у санях, раптам павярнулася ўсё інакай, і яму падумалася, што яны, пэўна, ужо даўно гарнуліся, каб пабыць вось так адзін на адзін; загадзя ведаючы, што няпроста ім будзе на пару, не на людзях, не маглі перабароць у сабе сілу, якая збліжала іх, прымушала хаця б у думках падступацца да таго, што назолаю лезла з кожным днём мацней і ўедлівей.

Грышка ўжо кінуў есці; кладучы відэлец, нейкі міг не адымаў ад яго рукі — каб Любка, зразумеўшы, што ён хоча пайсці, нешта паспела яму сказаць, бо маўчанне цяпер — звінела яму ў галаве — найгоршае, што можна было прыдумаць. Чуваць было, як за цёмнаю шыбінаю форскаў конь. На жэрдачцы каля печы мноствам гарачых вачэй блішчала пляцёнка цыбулі.

— Ужо наеўся? — здзівілася Любка проста, ані блізка да паказухі, на якую часам латвыя жанчыны, у якіх наўме свой, жаночы, намысел. — Ці, можа, мала выпіў?

— Хапіла ўсяго. Дзякуй табе, — сказаў ён, глянуўшы ёй у вочы з-за аддзякі, а не з панадлівым намерам нешта прачытаць у іх, і ўстаў — з калень ссыпаліся крошкі хлеба.

Яна тады заступіла яму дарогу, без настырнасці і без рук, проста стала перад ім, сумам і тугою з вачэй абліўшы яго ўсяго, як кіпетнем, што ён не ўтрываў, хапатліва, неяк нязручна абняў яе і цвёрда прыцяўся да вуснаў... Пасля яна не раз успаміпала яму той адзіны калючы пацалунак, ад якога доўга шчымелі шчокі.

На яго і праўда найшла нейкая ўтрапёнасць, ён — як ачмурэў, чуў у сабе лёгкасць і сілу. Спаць яна паслала яму на лаве, і ён моцна заснуў, акрыўшыся цёплым кажухом, які не раз выручаў і тады, калі начаваў на смалакурні — а ўзімку гэта надаралася часта. Уранні, яшчэ прыцемна, ён спытаў у Любкі тапор і завінуўся калоць дровы. Прыпякаў сухі марозік, у ружовай імглістасці ўставала сонца, а цені ад яго былі мяккія,

лёгенькія, як хто накідаў на снег блакітных стужак. У ленай нерухомасці драмаў пад павеццю конь з дранаю пасцілкаю на спіне — адно варушыліся на пысе заінелыя, тоўстыя, як галінкі, вусы.

Чурбакі, нечачоцістыя, прамёрзлыя, расколваліся лёгка, пругка, аж звінелі. Плашкі ад іх былі роўныя, жоўценькія, што масла. За нейкія паўгадзіны Грышка перамахаў усю кучу дроў, памог Любцы згрудзіць іх пад павець. З кажуха, які ён зняў і кінуў на сталюгу, кучаравілася пара — Любка ўзяла яго і неяк клапатліва, акуратна згарнула аўчынаю ўсярэдзіну.

З той пары, лічы, і цягнула яго на Рамідоўшчыну, як магнітам. Што пяшком ішоў, а часцей — на кані, і тады вёз Любцы ці смалянога карча, які потым шчапаў на дробныя трэскі, пахучыя, бы ліпавы мёд, і складваў іх за комінам; ці бярозавых чурбачкоў; а то і сена таўсцей падкладзе на сані, бо знаў ужо, што ў Любкі не дужа ёсць чым пасуліць карове; калі ездзіў у раён — так чаго, па хатняй надабе, ці з паперамі па рабоце, — то ўсягды прывозіў ёй пару буханак «гарадскога» хлеба, пакідаў яго ў сваёй скрыні, а ўвечар аддаваў Любцы. Яна адмахвалася, не брала, ды ён сілаю разводзіў ёй рукі, усоўваў буханкі, і яна ўжо тады не адкладвала іх... Наўзамен Грышка ад Любкі нічога не прасіў, бо пасля таго, першага, разу засеў у душы нейкі незразумелы, цяжкі дакор, ды такі назойліва-балючы, што Грышка нават хацеў назусім забыць Любку, закрыць на яе вочы, але той жа час падумаў, што нягожа так будзе, выходзіць, ён, Грышка, слімак нейкі, душыць у сабе тое, чым, разабрацца па шчырасці, ганарыцца трэба... Ну і што — што жанчына, што адзінокая і што падумаць усякае можна; галоўнае, каб перад сабою чысты быў, да яе па-чалавечы ставіўся... Добра яму і ёй — і няхай. Ён, калі трэба, і Лісаветцы ўсё раскажа, яна, факт, не асудзіць яго, адно пасмяецца: душа ў яе шырокая, незамкнутая. Гэта такія, як Любка, перажываюць з-за ўсякай макулінкі, і ён жа, Грышка, такі самы — можа, таму і зблізіліся яны.

І аднаго дня ўсё-ткі не ўтрываў — каб палёгкаю заручыцца, сказаў Лісаветцы, што памагае адной «удовушцы». Спярша яна засмуцілася, бы цень лёг ёй на вочы, але, відаць, да таго моманту, пакуль раздумвала, а потым заламала над галавою рукі і доўга білася ў вольным, сутаргавым смеху: «Воечкі!.. Напужаў! Ха-

ха!.. Што ж тута благога, мужычок мой любы?..» Шчокі ў яе былі ад натугі чырвоныя, як бакі яблыкаў, у кожнай мясцінцы, здавалася, скакаў гарэзлівы, мяккі праменьчык, якім Грышку аж закарцела пагрэць і сваю шчаку. Ён прытуліўся да Лісаветкі, вінаваты, як дзіця, а яна стала гладзіць яго па валасах, казытаць каля вуха — словам, не паверыла баба; у Грышкі не павярнуўся больш язык што-небудзь гаварыць, і трывогу ён зноў паклаў на душу цвёрдым, чорствым каменем.

...Грышка звярнуў з дарогі на лінію — шырокую, некалі разворaную паласу, а цяпер утравелую, — па якой ездзілі машыны ў лес — на пяску былі выціснуты ромбікі пратэктараў; лінія выводзіла на поле, на якім звычайна раслі жыта ці авёс. От што не трэба шукаць, дык гэта паганкі, зразу сталі лучаць на вочы — вылткнуліся, не хаваючыся, на самай лініі, як парасоны, шэраю стракатасцю сваёю на соў падобныя. Грышка нават падфутболіў адну, і яна, вырваўшыся з булдоўкаю-каранём, шлёпнулася каля бярозы. І мухамораў чырвоных ужо процьма, а знаць — і барвікі павінны быць, бо хаця і ніякія не сябры гэтыя грыбы, але пачынаюць расці ў адзін час.

Скрозь пад бярозамі — бачыў Грышка — стаялі і ляжалі вялікія паржавелыя бляшанкі — з-пад павідла, няйнакш, вясною ў іх збіралі бярозавік, а цяпер у тых, каторыя стаялі, дождж наліў вады, і ў ёй плавалі разбрынялыя чорныя жукі. Дзіркі, праточаныя ў камлях бяроз, заброснелі ды так і засталіся, падобныя на вялікія бяльмастыя вочы. Грышка ўспомніў, што некалі ў калгасе быў конь Белазоры, дык у яго былі акурат такія вочы, — добры конік быў, цягучы, але...

«А можа, і ў ласёў тож такія вочы?» — раптам падумаў Грышка, ведаючы, што тут пратаптана ласіная сцежка, па якой ласі з Вялікага Балота, дзе днююць у змрочнай, вільготнай зацішы на мяккім імху і дзе пладзяцца, хаваючыся ў глыбокіх, ад бомб, ямах, зарослых тонкім бледным асіннікам, прыбягаюць на поле, на якім пасвяцца, скубуць яшчэ несаспелы, салодкі авёс, храбусткую, мяккую лебяду. І цяпер Грышка бачыў на лініі іх начныя сляды — то акуратныя, са шчытна зведзенымі вілкамі капытоў адбіткі (гэта калі лось ішоў спакойна), то проста ўзрыхленую зямлю, быццам падзяўбанаю жалезнай скабою.

Неяк па восені Грышка бачыў тут ласіную сутычку. Ён тады насек жардзя і браўся напрасткі дахаты. Раптам глянуў, бы хто штурхнуў, уперад і здрыгануўся: убачыў ласёў. Два грамілы стаялі блізенька адзін да аднаго, трэці — крыху воддаль, насцярожана і пудка кратаў даўгімі вушамі — пазней Грышка зразумеў, што гэта была самка.

Грышка заступіў за таўстую асіну і стаіўся, гэтак жа сцішана стаялі і ласі. Потым нечакана, як хто пуднуў іх, рэзка рвануліся насустрач — і па сасняку панёсся гулкі стук касцяных рагоў. Тузанулася і нервова пераступіла нагамі вушастая самка.

Грышка прытуліўся да асіны, адчуўшы шчакою яе каструбаватую кару.

Ласі, не падымаючы ад зямлі рагоў, разышліся — і зноў шалёная сіла кінула іх адзін на аднаго; сцегнякі напружыліся, як не лопнуць, ноздры расшырыліся, а бялкі вачэй сталі чырвоныя. Ласі доўга пераважваліся то ў адзін бок, то ў другі, і было відаць, як заднія капыты мякка патанаюць у зямлі.

Калі яны зноў адступілі, лось, што стаяў направа, грабянуў пярэдняю нагою па ігліцы, і на спіну яму ўпала некалькі камякоў зямлі, ён злосна раўнуў і скочыў на свайго саперніка. Той удала вывіхнуўся, і лось пераццяў капытом маладую, таўшчынёю з руку, бярозку; прамашка, мусіць, яшчэ болей раз'ятрыла, і ён, развярнуўшыся, зноў рушыў на саперніка, але той нечакана тыркнуўся яму наперад і лучыў рагамі ў храпу.

Здрыганулася, быццам ад укусу авадня, самка.

Падранены лось матлянуў галавою, каб выбавіцца, але пераможца дужа напіраў на яго, і ён, выгнуўшыся лукам, адскочыў убок, яшчэ ніжэй угнуў галаву ў калені і сам пайшоў у наступ, ударыў рагамі свайго саперніка ў цвёрдую лабаціну так, што той рухнуў на зямлю... Адчуваючы новы ўдар, зароў дзіка і бяспомачна, як просячы літасці, адно вочы, налітыя крывёю, як агнём, гарэлі шалёным адчаем і рашучасцю.

Грышка зажмурыўся і чакаў... доўга, думаючы: вось зараз звалены лось, так і не падняўшыся, недарэчна і пакутліва прыме сваю смерць, — але калі адплюшчыў вочы, то ўбачыў, што ён стаіць, ужо адбегшыся, а вушастая самка, зразу рахманая, супакоеная, ліжа пераможцу дрыготкі ўскалмачаны бок, пакідаючы на поў-

сці цёмныя мясціны, якія так былі падобныя на лапікі, прышытыя да выцвілай адзежыны.

...Грышка хадзіў паўз лінію, абапал якой густа раслі маладзенькія бярозкі, прыглядаўся да верасу, што яшчэ не цвіў, але ўжо выкінуў ліловыя кутасікі, шнарыў у асацэ-дуброўцы, што чубчыкамі тырчала на гладкіх мурожна-зялёных падушках імху; наткнуўся на леташні лоўж з сасновых галін,ігліца з якіх паасыпалася, і праз іх, як праз косці, свіціліся шырокія, тонкія шапкі лісічак, ці лепш такія назваць лісіцамі. Болей, канешне, лісічак было на прагалінах, з усіх бакоў даступных сонцу, часам і залішне, бо некаторыя шапачкі патрэскаліся, узяліся белымі глыбокімі праменьчыкамі. Грышка аббегаў усе куткі за лініяй, затым перабраўся на другі бок, дзе раслі таўстыя бярозы ды асіны, сярод якіх пракідалася і сасна; там на заценenай лісцем дрэў і строгім папаратнікам зямлі зазвычай любілі расці абабачкі. Маленькія, цвёрдзенькія, як драўляныя таўкачыкі, і такія ж белыя, вылазілі пад бярозамі барвікі — рэдка па адным, часцей сямейкаю, тры ці чатыры; у іх гладкі высокі корань, і яго добра спілоўваць, не трэба тачыцца нажом у зямлю, як бывае, калі падымаеш дуброўнічак — цёмны і смуглы, што цыганскае семя.

Першым яму трапіўся абабачак — з пахіленаю шапачкаю і на даўгой, як у бусла, ножцы. Затым — во радасць! — два барвічкі; ён тут жа счыкрыжыў іх — у аднаго карэньчык белы і тугі, як сыр, а ў другога, выедзены чарвямі, — мяккі і пусты, як порхаўка. Звычайна па карэнні першых барвікоў Грышка намячаў, будзе лета грыбное ці не, а тут: адзін добры, другі чарвівы — ні тое ні сёе. Затым Грышка надыбаў яшчэ некалькі барвікоў, ужо крэпенькіх, — зашыліся ў сівец ды яшчэ майнікам зверху прыкрыліся, вось і паспрабуй знайдзі іх, хітруноў. Добра, што Грышка ведае, дзе іх шукаць. Заюшыўшыся, ён кружыў каля бяроз ды асін, падымаючы то абабачак, то лісічкі, не абмінаў і сыраежкі — чырвоныя, жоўтыя, рудыя, бы тое восеньскае лісце, — і радаваўся, што багата пайшлі грыбы. Кошык вачавідкі напаўняўся, аддаваў у вочы крамянаю жаўцізною, быццам нехта махаў перад ім пукам цвітучага лубіну.

У лесе ўсягды так бывае: калі трымаеш у галаве

арыенцір — не заблудзішся, ведаеш, дзе ты і куды ісці; чуць выпусціў — перавярнуўся свет, як быццам хто ўзяў цябе і, як ката ў мяшку, перанёс у зусім новае, незнаёмае месца.

Грышка заблудзіўся. Не, ён не спалохаўся, бо, куды ні пайдзі, лучыш на дарогу ці поле, а там ужо знайсці сваю вёску можна з завязанымі вачыма, — але нейкі нутраны халадок перасмыкнуў яго. Што з ім? Заблудзіўся? Куды ж яго занесла? Ён хацеў намеціць, дзе поўнач, дзе поўдзень, ведаючы, што на бярозе болей цёмных плям з халоднага боку; перакруціўся, шукаючы знаёмае дрэва ці палянку, але ўсё было чужое, непрыветнае, бы ў страшным сне: асіна з вялікім чорным дуплом, глыбокі акоп з пазелянелым, скарабачаным кірзачом на дне, быццам нехта высунуў з-пад зямлі нагу. Ён закурыў, раз-другі глыбока зацягнуўся; не перастаючы разглядацца, затушыў недакурак на пясчаным кратовым копчыку і саступіў з месца, зрабіў некалькі бязвольных крокаў, спыніўся, а потым смела пашыбаў далей.

Браўся, здаецца, па адным намечаным кірунку, а праз нейкі час апынуўся на тым месцы, адкуль пачынаў ісці. Што за ліха?.. Во і асіна з чорным дуплом, і кірзач у акопе, падобны на высунутую з-пад зямлі нагу, і раздушаны недакурак на кратовым копчыку... Грышка пасігаў у іншы бок, ішоў-ішоў, як быццам не скрыўляючы, і — дзіва-дзіўнае! — зноў вяртаўся на старое, прыметнае месца. Такое з ім ужо здаралася аднойчы, калі малады быў, таксама ў грыбах. Праўда, тады яны з сябрам, які цяпер палкоўнікам у Маскве, добра падпілі. Алёна Чубатчыха, шустрая, з худымі жылістымі нагамі, якія не стамляліся дзень і ноч бегаць па лесе і каля хаты, напароўшыся на іх, параіла вывернуць нападыспад пінжакі. Цяжка сказаць, што ім памагло, але мінут праз пяць яны ўзбіліся на дарогу.

Цяпер, сталаму ды цвярозаму, было канешне, смешна верыць усякім забабонам, і Грышка, усміхнуўшыся, павесялелы ад успамінаў, няспешна пасунуўся без аглядкі — куды выткнецца, туды выткнецца. Доўгі час перад вачыма маячылі камлі нятоўстых, гонкіх сасонак, потым улез у спелы бярэзнік, густа зараслы верасам і бледна-пунсовымі калмаценькімі, як васількі, кветкамі, якія называліся чамусьці «кіслародам». Зямля, здаецца, кацілася пад адхон, і па тым, як ногі пачалі блытац-

ца ў фіялетава-жоўтым зязюльніку і даўгалыгім шабельніку, а каля твару пагусцела камарэчы, Грышка здаўмеўся, што прыбліжаецца да нізкага месца — мусіць, нейкай балацявіны... Во і прэллю ўдарыла ў нос, як не звярнула, і ўслед асвяжыла вільгаццю. На парэпаным камлі алешыны Грышка раптам убачыў ярка-жоўтую, бы лімон, бародку, падобную на лішайнік, і прыпыніўся, уражаны дзіўнаю нарасцю, але на імгненне, бо тут жа здагадаўся, што натыкнуўся на так званую «грыбную лапшу», якая, па народным павер'і, прыносіць шчасце. Грышка ўсміхнуўся: верыць ці не верыць?

Прадраўшыся скрозь зараснік ляшчыны, ён знячэўку, бы хто адсланіў шырму, убачыў перад сабою раздольную лугавіну, рэчачку на ёй — і ўголас рассмяяўся: выперся аж на Рамідоўшчыну. Во-тка ламануў круга! Але тут жа яму падумалася: няўжо нейкае нутраное, як у звера, чуццё, якое аніяк нельга разгадаць, вяло яго іменна сюды, у гэты бок, да вёскі, дзе жыве Любка Гранцішына, пра якую сёння блізка ўспамінаў, і ўспамін гэты сграваў яго, як і раней, калі разварушваліся нервы і захліствоў грудзі халодны, жудасны сум. Грышка раптам схамянуўся — што ўжо не стаіць на месцы, а рухаецца — у нейкім няцямлівым, адчайным роздуме. Ён перайшоў па кладцы-жэрдках рэчку, якая лагодна пабулькавала ўнізе, быццам спявала песню, і апынуўся акурат каля Гранцішынай сядзібы. Узрадаваўся, згледзеўшы на гародзе жанчыну і пазнаўшы ў ёй Любку.

Любка, падпяразаная фартухом, з вядром у руцэ нагінкам ішла між бaрознаў, лэпаючы паабапал сябе бульбоўнік, — збірала каларадскіх жукоў. Калі Грышка быў ужо зусім блізка — мабыць, пачула шорганне крокаў, — тарганулася, стала загладжваць пад хустку валасы.

— Памошнікі не трэба? — сказаў ён, не даступіўшы крокі тры. Любка спярша зіркнула як бы з недаверам ды насцярожанасцю, але, убачыўшы, што Грышка, бы дзіця, адкрыты і з усягдышняю, як ёй здавалася, вінаватасцю ў вачах, заўсміхалася прыветліва і дабрадушна.

— Сёлета столькі жукоў, што аднаго памошніка мала.

— У нас іх тож хоць лапатаю адграбай, — сказаў Грышка, гледзячы Любцы ў вочы, у якіх апроч радасці тлела, бы вугалёк у прысаку, глыбокая, застарэлая ту-

га, а можа, яму так здавалася. — Я дык хларафосам пырскаю — ніч-чога не памагае!

— А ты ета ў грыбы хадзіў! Набраў, бачу... — Любка дзівілася ўжо на кошык.

— Ды прараслі!.. — сказаў Грышка з радасцю, якой чамусьці не даў волі, хоць яна і прасілася з грудзей: можа, ён проста не хацеў паказваць Любцы, што радуецца і грыбам, а не толькі ёй. Нагнуўся, сашмаргнуў з каліва бульбоўніку жукоў, падышоў да Любкі і ўкінуў іх у вядро, з якога смярдзела бензінам. Яна пацiснула плячыма, быццам Грышка вычварыў нешта непамыснае; вусны ў яе былі сухія, абпаленыя сонцам, як і ўся скура на твары. Грышку стала шкада Любку, як і той першы раз, калі павёз яе дахаты, захацелася пагладзіць яе з ласкаю, бы дачку, па якоі засумаваў апошняю параю, але ж смешна ўсё гэта — расчульвацца тут, у полі, і ён адно ўздыхнуў.

— Можа, вады хочаш? — спытала яна, паварочваючы да хаты.

— Ага, выбегаўся, як гончы. Заблудзіў... — Словы вырваліся самі, і Грышка разгубіўся — выйшла, быдта ён адно і чакаў, каб Любка пазвала яго да сябе; а калі папраўдзе, дык у Грышкі нават думкі блізкай не было, проста на дабрату душа ўсягды адзываецца шчыра.

— Грышка... ета чула я, што твайго Мішу судзілі? — спытала Любка, калі ўжо ішлі мяжою — Любка першая, за ёю — Грышка; ён бачыў яе спіну, яшчэ, нягледзячы на гады, прамую, туга абцягнутую кофтаю, паясок ад фартуха, які ўрэзваўся акурат па таліі. Яна, мабыць, адчувала, што ён глядзіць на яе, таму не магла разнявоіліць паходку, ногі ставіла наструнена, роўненька адну за другою.

Грышка падумаў, што няма ўжо тут чаго хаваць, ды яшчэ — ад Любкі, з якою — каб не заводзіць яе ў заблуд — усягды быў шчыры, і расказаў чыстую праўду пра Мішу: за што судзілі і як ездзіў туды — на суд тоі. Любка, слухаючы, уздыхала ды войкала, склаўшы ў падоле між калень рукі; яна так перажывала, акурат за сына. Хто ведае: можа, на сподзе душы — там, куды ніхто не заглядвае, — і насіла яна грэшную думку: а раптам Грышка кіне Лісаветку, то можа стацца і так, што ён перабярэцца да яе, Любкі, жыць разам з сынам, якога і яна ўжо тады павінна будзе называць не інакш, як сынам, а зачы — дольнікам: глыбіня і наіўнасць

жаночай душы настолькі вялікія, што можна даваць волю самай неверагоднай, самай цудатворнай фантазіі.

Грышка глядзеў на яе з тугою ў вачах і надзеяй, але без цвёрдасці — што мае права адкрывацца чужому чалавеку ў самым патаемным. Быццам жонцы. Канешне, гэта ён занадта хапіў — што Любка чужы чалавек, ні яна дрэнна яму не зрабіла, ні ён ёй, па-чалавечы ўсё ў іх было... Дык, разабрацца, па-чалавечы з усімі трэба, адно і бянтэжыць, што іншаму скажаш пра гора, а ён замест таго, каб паспачуваць, здзекавацца пачынае, яхіднічаць, плёткі разносіць і сябе разумным лічыць, а цябе — дурнем.

Прызнацца, Грышка ўжо не раз думаў, ці не заблытаўся ён у жыцці; вельмі падобна, што закруціўся ён, як тая трэска ў віры, — і няма як выбрацца і прыстаць да цвёрдага берага. А можа, чалавеку якраз на латву гэтыя вось муштроўкі, каб, так сказаць, душа не драмала, каб — жыла і на бяду адгукалася. Здаецца, Грышка пачаў знаходзіць апраўданне сабе, сваім ваганням, і тое, што ён рабіў далей, ужо не бянтэжыла яго. Спытаў у Любкі — можа, трэба пасобіць што, падладзіць ці прыбіць, але яна захітала галавою — «добра й так». Тады ён маўчаком узяў свой кошык, які пакідаў каля парога, і адсыпаў ёй на анучу пад загнетам грыбоў. Яна паспела адно падхапіцца ды сігнуць пару крокаў. Горка грыбоў была ладнаватая, але акуратная, быццам цацачная, — на шапачках грыбоў ні шыгалінкі, ні шматочка ліста. У Любчыных вачах стаяў нямы дакор: «Навошта?» — але і тая пакора, што яшчэ ў маладыя гады згладжвала няёмкасць між імі.

— Назад буду ісці — дабяру, — сказаў Грышка на ўсякі выпадак, калі запярэчыць Любка — што няпоўны кошык панясе дахаты.

Яна правяла яго з двара, і ён пайшоў не азіраючыся, а яна яшчэ доўга стаяла каля весніц, абхінуўшыся на слупок, аж пакуль знерухомелі галінкі лазняку, які схаваў яго.

...Грышка паставіў кошык у кладоўку, зайшоў у хату — Лісаветкі не было, — мабыць, яшчэ не вярнулася з тока, дзе адносіць мяшкі ад машыны, што перацірае траву і прасуе ў патрончыкі — гранулы, як іх называ-

юць; увогуле не падкая да работы Лісаветка ў ахвоту памагала іншым і ні разу не ішла дахаты першаю.

Грышка тыцнуўся кружкаю ў вядро, але яно было пустое, нават высахла дно — Лісаветка сцадзіла ваду да апошняй кроплі — ці піць, ці на нейкую патрэбу. Тады ён адчыніў суднік, знайшоў там гарлач з сыраквашаю і папіў набгом. Адчуваў, як звіняць ногі — дзіва што, столькі выхадзіў, адмераў, лічы, кіламетраў дзесяць, не менш. Тут і ў маладога язык вываліцца. Ён прылёг на верандзе на ложак, захінуты выцвілай квяцістаю шырмаю, — тут усягды добра адпачывалася, калі не лезлі мухі ці, як цяпер, камары. У хаце за сцяною мерна, сумна цікалі ходзікі — закалыхвалі... «Многа мошак — рыхтуй кошык», — падумаў ён.

Здаецца, не паспеў заснуць, толькі млявасю стомаю затуманілася галава ды пацяжэла, як пачуў стук хатніх дзвярэй — мяккі, без рыпу. «Прыйшла Лісаветка...» Ён адплюшчыў вочы, але не падымаўся, глядзеў, як лётае над ім худы, празрысты камар. За гэтай забаваю яго і застала Лісаветка — адхінула шырму зялёнаю ад травы рукою. Сіняя хустка, абвязаная ўкруг галавы, закрывала ўвесь яе лоб; шчокі, загарэлыя, але не да чорнае смуглаты, туга блішчалі, як памазаныя здорам аладкі. Спытала — як грыбы.

Грышка стаў гаварыць — са шкадобаю ў голасе, — што крыху зазяваўся сёлета, затлуміўся з «етым Мішам»; ужо можна было б адкрываць грыбарню. Грыбы пайшлі ваўсю — пакуль, праўда, лісічкі, але пракідаюцца і абабачкі, нават барвікі. Усё-ткі не памыліўся Грышка, што грыбны будзе год — зямля, бачыў, скрозь цвіце. Ён гаварыў і гаварыў, хаця гаварыльня ніколі не была яму да сэрца, — пра свае клопаты, што чакаюць яго, грыбавара, акурат баяўся няўзнак прагаварыцца пра Любку ці, можа, такою шчыраю гаворкаю стараўся павініцца перад Лісаветкаю, апраўдацца за тое, што не суняў сябе — хоць і не наўмысна, ды ўсё-ткі заглянуў да Любкі, адсыпаў ёй грыбоў.

Лісаветка слухала, ківала галавою, а часам звужала вочы, моршчыла лоб, і было відаць, што думкі яе далёка-далёка, можа, нават на тым няпэўным краі, за якім бачылася ёй змоладу райскае, бестурботнае жыццё яе летуценнай напаўцыганскай душы. І як яна пазвала Грышку абедаць, абарваўшы яго на паўслове, вязалася якраз з тым, што яе мала займаюць мужавы клопа-

ты, факт, душа за іх не баліць, як гэта бывае ў гаспадарлівых жонак.

Яны пасёрбалі булёну, ці, па-іхняму, жыдкай бульбы з квасоляю, паелі проста з чыгунка дранікаў, якія, пастаўленыя глыбока ў печ, добра ўжалелі — сталі рудаватымі.

— Ну, пайду гатовіцца, глядзець там, што ды як, — сказаў Грышка, зноў папіўшы сыраквашы з гарлача, і, падумаўшы, дадаў: — Вады няма ў хаце...

— Піць? — спытала Лісаветка — яна ўсягды на любую мужаву закідку выстаўлялася так, каб выгарадзіць сябе ад далейшых папрокаў. — Дык я ж кампот з сушаных груш зварыла — стаіць у каструлі... Во бязмозглая! — Стукнула далоняю лёгенька па лбе.

Грышка нічога не сказаў і выйшаў з хаты.

Грыбаварню ён паставіў на гародзе там, дзе і лазню, — крыху бліжэй, чымся ліпы. Прымеркаваў так назнарок, каб лазня таксама служыла на грыбаварню: не захламляць жа гарод living рознымі пабудоўкамі. Вось навесчык зрабіў і—хапае. Чатыры слупы, бэлькі, кроквы, жардзё, і на дах — толь: улетку ад сонца і дажджу — схоў. На зіму вагу зацягваў у прымыльнік, а катлы — на лазню: і снег ці вада не страшныя.

Перш Грышка пахадзіў пад навесчыкам, пакратаў слупы, якія за гады пацямнелі, узяліся сіваватым машком, наваліўся рукамі і праверыў, ці не хістаюцца сталы. Задраў галаву — дах, здаецца, нідзе не свіціўся, але, мабыць, ужо сатлеў: кінь на яго каменьчык зверху, а пад навесчыкам знойдзеш. Трэба неяк шыферу разжыцца ды перакрыць — надзейней будзе. Гэта раней дорам ты толем крылі, а цяпер шыфер у модзе. Глянь на Малінаўку — колькі тых дамоў, але ўсе пад шыферам, акурат снег на іх выпаў. Балазе шыферны завод, лічы, пад бокам — у Крычаве.

Ну, вага пакуль няхай пабудзе у прымыльніку, за зіму ў сухім не сапсавалася; гіры да ее розных калібраў у кладоўцы на вугольніку ляжаць — таксама есці не просяць. А вось катлы... Катлы на лазні. Грышка палез па лесвіцы да дзверцаў, што былі ў франтоне, скінуў кручок і адчыніў іх. Ад самае восені ён сюды не заглядваў амаль. Скразнякі пазмяталі з гары імшынкі (мохам некалі ўцяпляў столь), лісце, што нацерушылася ад сухіх венікаў, і пясок быў гладзенькі, чысценькі, акурат

той, што вылізаны на беразе хвалямі Сажа; не відаць было і слядоў, што, помніцца, засталіся ад ботаў.

Чатыры катлы стаялі папарна — адзін на адным, большыя на меншых — і, закураныя, былі падобныя на гіганцкія грыбы... А што — бываюць: вунь у «Звяздзе» Грышка нядаўна чытаў, што ў Сібіры дзеці знайшлі грыб каля паўпуда вагою.

Грышка ўзяў за вуха верхні кацёл («шапку»), другой рукою падтрымаў пад днішча, саступіў ніжэй на адну пярочку і выпусціў з рук кацёл — ён мякка гупнуўся на зямлю, і пад ім нешта дзвыкнула, можа, патрапіў на шкло ці каменьчык. Гэтак жа зняў і астатнія, адкінуўшы іх далей. Катлы знутры пацямнелі, узяліся шэрым, у крапінку, налётам — тады, помніцца, як усцягваў, яны блішчалі. Кажнагод адно і тое — прывык ужо Грышка і ведае, што рабіць з катламі.

Ён схадзіў у прымыльнік — па анучу, старую капронавую вяхотку, мыла... Але, падумаў, лепш, мусіць, будзе ад'ядаць гэты налёт мыцельны парашок — балазе, Лісаветка неяк гаварыла, што купіла дужа добрага, замежнага (індыйскага, ці што?) парашку. Усё-ткі, якніяк, варыцца ў катлах будзе тое, што людзям есці.

Прынёс растрыбушаны вялікі пачак з намаляванаю на ім жанчынаю ў белай даўгой сукенцы, сыпнуў на далонь парашку — ён быў сіні, акурат сінька, якой некалі фарбавалі сшытае з палатна адзенне: налівалі ў шайку гарачае вады, сыпалі туды сінькі ды яшчэ крушынавай кары, размешвалі і загружалі на гадзіну-другую адзенне, якое потым высушвалі ў цяні. Колер парашку і тое, на што ён прызначаўся, крыху збянтэжылі Грышку. Ён паціснуў плячыма, укінуў у кацёл анучу, вяхотку, прыставіў пачак і, прысеўшы, паддаў ношу на плячо. Пайшоў мяжою, абапал якой прутка стаяў бульбоўнік, асыпаны, бы ягадамі, каларадскімі жукамі; пайшоў да канавы — яна была ў канцы сядзібы, паўз дарогу, якую называлі сценкаю; неглыбокая і нешырокая, канава сцягвала ваду да балотца, а калі доўга не было дажджу — перасыхала, і тады дно яе, роўненька ўсланае ліпкім глеем, трэскалася, нашчаціньвалася крохкімі лушпінкамі.

Крайні ад сядзібы бераг канавы шчытна зарос дзяцелінаю, што акурат рудзела круглымі, як арэхі, мяккімі галоўкамі, па іх поўзалі пчолы, пералятали з кветкі на кветку; Грышка прымеціў і чорнага чмеля, які басавіта,

што бамбавоз, гуў і пад якім, калі садзіўся, згіналася галоўка дзяцеліны: чмелю было зручна тачыцца хабатком у нектарныя чашачкі — ён упіраўся нагамі, быццам нешта цяжкае перад сабою пхнуў.

Хоць і было горача, кацёл, пакуль Грышка нёс, настудзіў яму шчаку, і адчувалася — яна зашэрхла; ён пацёр яе далоняю, прысеў і намачыў у канаве анучу: вада была жаўтлявая, але, сцэджаная з анучы ў кацёл, стала як бы светлая. Грышка насыпаў у кацёл жменяю парашку, паквэцаў анучаю — узбілася шума, беленькая, як цукар, сінява пералівалася на сонцы.

Грышка пакінуў кацёл, каб парашок ад'ядаў цвіль са сценак і дна, а сам павярнуў да лазні. Раз за разам прынёс астатнія катлы. У першым тым часам шума аселя, тонка ўляглася на вадзе. Вяхоткаю, што, як жывая, спружыніла ў руках, стаў шараваць кацёл — сценкі памалу адбельваліся, святлелі, а потым заблішчалі, як люстэрка, хоць заві Лісаветку глядзецца. Грышка так завінуўся, што аж пот выступіў на лбе, стаў уядацца ў вочы і скочвацца з носа. Грышка не зважаў, быццам яго гналі ў каршэль ці край змусілі выдраіць усе катлы. Калі б хто глянуў на яго са спіны, то ўбачыў бы, што кашуля між лапатак прамокла, ліпне да цела, як не распаўзаецца па нітках. Дурны ён, Грышка, ці што, так рупіцца? А можа, гэтаю завішнасцю ён проста хацеў адкупіцца перад сабой за тое, што прамарудзіў трохі, так яму здавалася, прыпазніўся, хаця з раёна яшчэ ніхто нічога не гаварыў, — бо яму ўсягды страх было падумаць, што з-за яго недзе нехта ці нешта пацерпіць? Здаецца, ці не з вайны прынёс ён гэты страх ці, лепш сказаць, — боязь перад людскою думкаю, быццам ён, Грышка Пруцікаў, нешта ў сабе затаіў і робіць усё, каб выехаць на іншых ці, ва ўсякім выпадку, застацца ў цяні. Там, на вайне, маракаваць ды рассусольваць не было як: куля жартаў не любіць: або — або, сярэдзінкі залатой не бывае. Помніцца, вёску адну бралі, на пагорку, ліха яе, стаяла... Май, яблыні белыя, аж кіпяць, акурат у бацькавым садзе, і так не верыцца, што, можа, апошні раз бачыш такі цуд. Немцы пры ваколіцы акапаліся, толькі каскі нізенька ля зямлі бліскаюць — здалёку не возьмеш. А тут і каманда: «Уперад! За Радзіму! За Сталіна!..» Камандзір першы ўскаквае, торгае руку з пісталетам уверх — і... Грышка паспеў убачыць, як спачаткуываліўся з рукі пісталет, а по-

тым камандзір сам неяк запаволена, бы нехаця, асеў у траву. Далей Грышка мала што помніць, бо якраз аднаго баяўся — апынуцца за спінамі, у той суматосе ніхто б, канешне, не разглядаў, але... — з вінтоўкаю наперавес, угнуўшы галаву, нёсся ён па нізкім хмызняку да вёскі. Кулі ссякалі лісце, і яно сыпалася, акурат увосень пры ветры, той і розніцы, што — дробненькімі шматкамі ды зялёнае.

Не ўсе, канешне, дапялі нямецкіх акопаў, але тым, што ацалелі, раз'юшанасці і спрыту было не займаць — штык Грышкавай вінтоўкі мільгаў то спераду, то ззаду, то з бакоў, і, здавалася, на імгненне, на тысячную долю секунды замарудзь... толькі замарудзь — і будзе *канец*.

...На вечар хіліць пачало, калі Грышка скончыў мыць катлы, паставіў іх радочкам — ну, люстры ў рэстаране! Сонца ўжо барвовасцю аддае, і катлы як бы свецяцца, далікатна, тоненька. Беражна, бы ёлачныя цацкі, Грышка аднёс і паставіў іх у прымыльніку, мяркуючы, што скора знадабяцца. Хоць і напацеўся добра, але не катлы самае балючае для Грышкі — іх, як ён жартуе словамі жонкі, і «ў цыгана выпрасіць можна». З бочкамі год ад году замінка — саленні-варэнні і ўсё такое надта ж цяпер у модзе. Разабрацца, дык аж дзіва бярэ: у людзей, якія не так і даўно гналіся за ўсім купленым, апошнія гады раптам аб'явілася такая галадуха на дамашняе, самаробнае, што паліцы паграбоў і кладовак аж трашчаць ад банак-шклянак розных, вёдраў і кадушак. Накрыўкі — смех! — звычайны бляшаны кружок — паспрабуй дастань. «Каб мне самому, — разважаў Грышка, седзячы з папяросаю ў руцэ на парозе прымыльніка, — дык гары б яны гарам, бочкі етыя ці накрыўкі! А тута ж — для дзела... — Ён выкурыў папяросу, а тады ўспомніў, што яшчэ трэба агледзець мешалку; пазалетась рабіў — з бярозавай чачоткі, ёмкая такая, як не сама ў руках скача. Здаецца, зусім нядаўнечка яна лучала яму на вочы. Але дзе? От, сівая, дурная галава, ужо нічагуткі не дзяржыць! Пайшоў у двор, гледзячы сабе пад ногі і ўсё прыпамінаючы, дзе ён бачыў мешалку.

Лісаветка на ганку перабірала грыбы — брала з кошыка, выцірала белаю хусцінкаю і кідала ў вялікую місу з вадою.

— Лісаветка, дзе-та мая мешалка? — спытаў ён у яе.

— Якая мешалка? — Лісаветка скрывіла твар і падкусіла ніжнюю губу.

— Ну, такая палка... — Грышка грабянуў рукамі. — На вясло маленькае падобна.

Лісаветка паднялася, моўчкі пайшла пад павець.

— Ета? — трымала ў руках мешалку — закарузлую, у лупінах ад бульбы і ў муцэ. — Яна ў кладоўцы была, я ёй пойла карове мяшаю...

— Ну ты, баба!.. — Грышка мацюкнуўся. — Што за натура? Схаваю так, што сам не магу найсці, а яна...

— Грыша, ну Грышута... — Лісаветка скаліла зубы. — Плюнь ты на ету мешалку задрыпаную — яшчэ лепшую здзелаеш сабе.

— Ага, мне тока і ёсць час мешалкі дзелаць!.. — Грышка абураўся, але злосць ужо мінула: не мог ён доўга злаваць на сваю жонку, бо ў ёй зусім не было той сляпой бабскай упартасці, што прыводзіць да зацятасці і сварак. Ён паківаў, як на дзіця, галавою, усміхнуўся.

...У райспажыўсаюзе Міротнікава, старшыні, не было: бухгалтарка, адных з Грышкам гадоў, але з даўгімі, па-маладому распушчанымі па плячах валасамі жанчына, неахвотна сказала, што ён паехаў на базу. База, ведаў Грышка, не так і далёка, можа, з кіламетр які набярэцца. Чымся чакаць і гадаць, вернецца старшыня да абеду ці не, дык лепей схадзіць пашукаць яго, балазе на вуліцы (не ў кабінеце) і размову латвей весці, бо не вельмі бянтэжыць, што перад табою начальнік. Заадно, падумаў Грышка, і ў «хазмаг» зайдзе — летась долата свае аддаў нейкаму падарожнаму шафёру, той і прысабечыў яго, а цяпер абручы набіваць на бочкі няма чым; дый на базары — там побач — пацяміцца, чым гандлююць, можа, ужо і грыбамі. Пранырлівыя хапае — не паспеюць тыя грыбочкі вылузнуцца, як пачынаюць мох драць, шыгалле грэбаць, надта гарадскія, асабліва з тых, што прыязджаюць здалёку. Граматныя дужа, а не разумеюць, выходзіць, што жылку — грыбніцу парушаюць і яна тады сохне, не дае прыплоду. А можа, і разумеюць, ды не асцерагаюцца... Што ім, налётчыкам гэтым? Напляваць — душа не баліць. Навыкалупліваліякіх пупсікаў — і будзьце здаровы, «гуд бай» — як яны кажуць. Другім разам — зноў. Варвары, а не людзі!

Грышка, калі пра іх думаў, усягды — непрыметна для сябе — пачынаў гаварыць уголас і, калі спахопліваўся, збянтэжана азіраўся на бакі.

На базары людзей было зусім мала. Стаялі калёсы з даўгою, як труна, скрыняю, у якой вішчэлі парасяты, і ў шчылінах між дошак былі відаць іх ружовыя пятачкі. За прылаўкам сядзелі дзве-тры пажылыя жанчыны, прадавалі яйкі, тварог і ці не суніцы — горка чырвоных ягад. Грыбоў не было відаць.

Грышка пратупаў між прылаўкамі, звярнуў да «хазмага». Пры дзвярах стаяла «будка» — крытая сіняя машына, — і з яе нешта выгружалі дзядзькі ў даўгіх ірваных халатах. Прадаўшчыца ў магазін Грышку не пусціла, сказала — прымае тавар, а «таргаваць» будзе толькі пасля абеду; малады вусаты грузчык з чырвоным тварам, размінаючыся з ёю ў дзвярах, шчыпаў яе за бок, і яна гучна ды гулліва ляпала яго далоняю па спіне. «Клопат... — падумаў Грышка. — Зайду пасля абеду». І павярнуўся ісці, але яго нечакана дагнаў вусаты і шэптам спытаў:

— Што хацеў?

— Ды мне долата... — Грышка адказаў не зразу, бо перш падзівіўся: «Няўжо які знаёмы хлопец?..»

Вусаты склаў два пальцы ў колца і міргнуў:

— Лішні на бочку — і праз мінуту будзе долата. Жалеза — ноне дарагое.

— А етага не хочаш «на бочку»? — Грышка з нечаканым для сябе спрытам тыцнуў яму пад нос дулю і стаяў, не баючыся, — дзень жа, людзі вакол. Дый калі што — кулак яшчэ ёмкі, шахцёрскі: як гваздане — іскры з вачэй пасыплюцца! Але вусаты надзіва спакойна, нават без намёку на абурэнне, адышоў, як паслухмяны сабака на крык гаспадара. Грозны рак, ды ззаду вочы.

Базаю служыла даўгая і шырокая, як гумно, будыніна на высокім бетонным падмурку, які далёка выступаў уперад і на якім грувасціліся новыя (белыя) і старыя бочкі, пірамiды скрынь, маткі ржавага дроту. Вузенькія, акурат у пуні, вокны былі пад самаю страхою — запыленыя, а можа, затканыя павучынаю; праз дзіркі ў шыбах вылятал з будыніны тоўстыя, як мячыкі, вераб'і, садзіліся на вільчык, а потым ужо ляцелі прэч.

З шырокіх, напята расчыненых дзвярэй выйшла на выступ маладая жанчына — у бліскучым цыратовым фартуху і ў блузцы з закасанымі рукавамі.

— Скажы ты мне, дзеўка, ці тута Міротнікаў? — спытаў Грышка, набліжаючыся да выступа і пераймаючы маладуху, якая чамусьці разгубілася і зноў павярнула ў будыніну. Маладуха тыльным бокам далоні (рукі былі мокрыя) папravіла на галаве празрыстую касынку, праз якую прасвечваўся чырвоны грабянёк, і нечакана вясёлым голасам, чым здзівіла Грышку, бо ён прывык, што ў горадзе людзі больш надзьмутыя і строгія, а часам і грубыя да незнаёмага чалавека, сказала:

— Тута-тута!.. Гуркі... засол правярае.

Па сходцах Грышка ўзышоў на выступ, заглянуў у расчыненыя дзверы. У вялікім, як загон, адсеку жанчыны перабіралі свежыя гуркі, ад якіх ажно пярэсціла ў вачах; насілі вёдрамі ў процілеглы кут, дзе іх мылі, узважвалі, засыпалі ў бочкі; востра пахла кропам і часнаком. Там жа стаяў і Міротнікаў, апрануты ў цёмнае. Сам ён быў маленькі, плюгавенькі, і касцюмчык на ім сядзеў шчытненька, як на хлопчыку; над ілбом трымцеў высокі густы чубчык, як грэбень у пеўня, а на макаўцы свяціўся плеш, што ўсягды смяшыла, бо звычайна ў людзей, якія лысеюць, прарэджваюцца валасы і на цемі. Міротнікаў, калі размаўляў, не глядзеў у вочы — прымета скрытнага па натуры чалавека, які, аднак, добра розніць фальш і шчырасць на душы іншага.

Маладая жанчына, якую першаю ўбачыў Грышка, блізка нахіліўшыся, нешта сказала Міротнікаву і паказала на дзверы, дзе стаяў Грышка. Міротнікаў глянуў, каму ён спатрэбіўся, не падаў аніякага знаку і не думаў падыходзіць. Грышка чакаў доўга, пакуль Міротнікаў зрабіў ласку — пан такі! — падышоў. Павітаўся з Грышкам за руку, але поціск быў нямоцны, лічы, аддаў сваю руку ва ўладу Грышкавае далоні, якая мазалямі сваімі, бы каменьчыкамі, мала не расцёрла яе на муку.

У іх, калі папраўдзе, дык здаўна пайшло на разлад ці як яго назваць. Цяжка сказаць, як душою, але па рацы болей цярпеў ад гэтага Грышка. Што з тараю ўсягды загвоздка, дык пра гэта і гаворкі ўжо няма, нават спецый і воцату не кожны раз дастаецца. Планы дай божа якія — моў, лясная вёска, павінна быць шмат грыбоў; і, лічы, на кожнай нарадзе па лініі райсаюза дзяўбуць — тое не так, тое не гэтак. Шчыміць, канешне, душа, калі несправядлівасць чуе, але што зробіш. Пасправаваў неяк апраўдацца Грышка, папрасіўся на трыбуну, ды... марнае гэта стараннe — даказваць сваю неві-

наватасць пасля таго, як выступіў начальнік: хаця і верацъ табе ўсе, але пацяшаюцца, рагочуць ды яшчэ масла ў агонь падліць стараюцца, ілбамі сутыкнуць.

А ў Грышкі зуб за зуб зайшоў з Міротнікавым амаль на самым пачатку (як кажуць: з усходу сонца), калі толькі-толькі грыбы ўзяўся варыць, а пасля ўжо на лепшае павярнуць было цяжка. Нешта і праўда — усё яму не слава богу, быў вопыт з Родчанкам, старшынёю калгаса, дык не-а, і тут стаў на́дыбкі. Мабыць, натура нейкая дужа злая ў яго, Грышкі — хай яе камар! — раз ёй угамону няма. Хаця, разабрацца, дык жа ў кожнага на жыцці столькі бывае ўсякіх сутычак, што не пералічыш — толькі, канешне, не ўсе помняцца.

У адну са жнівеньскіх субот, недзе блізка к вечару, прыязджае на «Волзе» Міротнікаў, расчырванелы, рухавы, як верабей напрадвесні, і гэтак зразу ды прама заяўляе Грышку, каб навaрыў яму «для пэўных мэт» (так і сказаў) бочачку адборных барвічкоў — шапачка не больш «пятака» і ў карэньчыку ніводнае дзірачкі. Грышка, канешне, усягды разумеў, што начальнік ёсць начальнік, ён і загадаць можа, калі што не па яго, але адкуль у Міротнікава такая ўпэўненасць, што сказанае ім павінна тут жа прымацца ды яшчэ і за гонар для таго, каму сказана. Кожны — чалавек і на сваім месцы гаспадар, і ўмешвацца ў яго, так сказаць, уладанні — недалікатная справа, грубасць, бадай. Грышка і ўпёрся: як гэта, моў, у мяне ёсць стандарт на ўсе віды грыбоў, і я трымаюся яго; усё — па інструкцыі, так сказаць. Грышка, можа б, і мякчэйшы быў, калі б з ім па-людску пагаварылі, а можа б, і зусім паслухаўся б Міротнікава.

Міротнікаў на яго доўга і нерухома глядзеў, мусіць, думаючы, як яму зрэагаваць на заяву Пруцікава, які, падобна, рэхнуўся — не разумее простае ісціны: інструкцыя — сіла, але слова начальніка яшчэ мацней, і аспрэчваць яго — пустая патуга і нават — небяспечная. Грышка спакойна прыняў на сябе яго позірк, моў, нічога дзіўнага не сказаў, і Міротнікаў убачыў: тут цвёрды арэшак, зразу не хруснеш. І ён палагоднеў, але не таму, што раптам зашанаваў Грышку (хаця, разабрацца, было за што, і ўжо нават за тое, што не пабаяўся стаць наўпярок начальніку, — гэта калі па шчырасці браць), а таму, што азвалася ў ім тая начальніцкая струнка, якая называецца па-вучонаму дыпламатычнасцю ці, можа, як іначай, калі пачынаеш думаць ужо не пра ўласны го-

нар, а пра страх падмачыць свой кіраўнічы аўтарытэт. Не ўпэўнены, што нават па-добраму, мяккім тонам можна будзе сталкавацца з Грышкам, Міротнікаў круткнуў на задні ход — сказаў з усмешкаю, што пажартаваў, — але злосць затаіў усё-ткі, і хаця пасля яны і былі часам мірныя між сабою, то адно — знешне, а ў душы насілі непрыязнасць.

Грышка гэта адчуў тады, калі ў яго не прынялі на базе дзве бочкі казлякоў, нібыта недавараных і залішне кіслых ад воцату. Грышка бегаў за дэгустатарам, прасіў пасмакаваць яшчэ раз, але той быў няўмольны, адсылаў да Міротнікава — вельмі ўпэўнена і нахрапіста, — чым яшчэ больш даводзіў Грышку да адчаю і абурэння. Ён прывёз тыя бочкі назад дахаты, памяняў накрыўкі, і за другім разам яны пайшлі за маліну — першым гатункам. Грышка нічога не сказаў дэгустатару, адно памахаў пальцам, і той нечакана пачырванеў; а сказаў бы яму Грышка пра сваю «афёру» — ён бы зноў стаў прыдзірацца, шукаць загану ў грыбах.

На гэту глухую зацятасць Міротнікава Грышка натыкаўся, як на сцяну, кожны раз, дала яна пра сябе знаць і сёння; калі б не яна, можа, і зусім не трэба было б прасіць гэтых бочак, прывезлі б самі, без яго рупаты. А то кожан год — едзь, клянчы. Летась дык Грышка за свае грошы ўзяў ды купіў пяць бачурак — з рук, у дабранскага бондара. А што было рабіць — грыбы павылазілі ўжо, а ў Міротнікава толькі голыя, як рыба, абяцанні. Грышка раззлаваўся, мацюка загнуў і зразу з райцэнтра, не зварочваючы дахаты, у Дабранку панёсся. Праўда, Міротнікаў, як дазнаўся, сказаў, што «кампенсуе» Грышку тую плату за бочкі, але — забыў, ці што — і па сённяшні дзень ніхто Грышку капейкаю не ўважыў. Трэба, пры выпадку, напомніць, хаця... Ляжачыя і грошы ржавеюць.

Міротнікаў трымаўся з Грышкам сёння, што называецца, «на дыстанцыі», але вачыма, у якіх не было ўсягдышняй адчужанасці і прытворнай ленасці, яўна паказваў, што не такі ён ужо і непадступны. Калі б Грышка быў крыху больш здагадлівы ці хаця б ставіў сабе на мэце, то, магчыма, упільнаваў бы, што Міротнікаў не проста так гэты раз міралюбны, нешта яго падлашчвае, можа, нават нейкі новы намысел мае. Грышка, канешне, не такі дурны, а вось у хітрыках — слабаваты, што і сам прызнаваў за сабою. Таму, доўга не мудруючы, ён

проста і адкрыта сказаў Міротнікаву, чаго прыехаў,— што быў у лесе і што ўжо, на яго розум, можна варыць грыбы, але краї патрэбны бочкі.

— Мне сігналы таксама пасгупалі — што ёсць грыбы,— сказаў Міротнікаў і ўздыхнуў; пакруціў галавою: дэфіцытная гэта штуковіна — бочкі; не, соль, вядома, не ў тым, што Міротнікаў помніць пра сутычку і знарок скупіцца; з тараю цяпер увогуле цяжка, бо планы падскочылі крута ўверх, адусюль крычаць: давай гуркі, давай памідоры, давай кампоты, давай капусту, давай грыбы...

— Сам жа бачыш, колькі гуркоў у мяне незатараных,— паказаў Міротнікаў на будыніну, у самы яе кут, калі Грышка паспакайнеў, мабыць, добра прыкінуўшы, што ды як.— Прападуць — мяне па галоўцы не пагладзяць.— Міротнікаў наўмысна, як кажуць, згушчаў фарбы, каб зразу скруціць Грышкаву ўпартасць, моў, зразумей ты — не будзе ж ён, старшыня райспажыўсаюза, рызыкаваць пасадаю з-за нейкіх там неладоў у грыбавара. Тут, яснае дзела, быў тонкі псіхалагічны разлік: чалавек, уведзены ў адчай і безвыходнасць, болей згаворлівы і ўступчывы. Грышка, канешне, разумеў — бо і сам пра гэта думаў,— што бочак і праўда не хапае і што Міротнікаў не кінецца яму іх шукаць, але не хацеў пагаджацца з адным: што яго грыбаварня — нешта такое хілае, хліпкае, што на яго фукні — і садзьмеш, як камара, адмахнешся; а гэта ж, калі разабрацца, цэлая фабрыка, і таму ён з поўным на тое правам лічыў, што няхай не закідваюць бочкамі, але адпусціць колькі штук павінны, нават абавязаны.

— Дык што, мне зноў з рук купляць бочкі ці, можа, грыбаварню закрываць? — сказаў Грышка зусім не плаксівым голасам, чым мог бы спекульнуць іншы на яго месцы, а наўпярок, з тою цвёрдасцю, з якой зразу стала відаць — не па міласціну прыйшоў, а па законнае. Міротнікаў, канешне, гэта ведаў, мазгі не высахлі, як ведаў і тое, што любая залежнасць, нават мізэрная, падбівае чалавека на падхалімаж, ад якога прамая дарога да запабягання. Так і тут: мала, што яму, Міротнікаву, таксама край важна, каб ва ўсе грыбаварні былі завезены бочкі, няхай Пруцікаў яшчэ пака́нькае, павыпрошвае... Гэты раз не з-за прынцыпу, які ўсягды стаяў між імі, заядаўся Міротнікаў, а проста, як відаць з самага пачатку, у яго была да Пруцікава адна, ён лічыў,

надта разгоністая справа, з якой тое-ссе, ці нават многае, можа выгараць; а іменна: Міротнікаву пазванілі, што з Магілёва едзе намеснік старшыні аблспажыўсаюза, і не абы-куды, а на Сож — у дом рыбака, дзе якраз і «хазяйнічаў» Пруцікаў. Ведаючы добра па сваёй сям'і, наколькі гасціннасць залежыць ад таго, хто ў доме «галава», ён стараўся зрабіць усё, каб Пруцікаў сустрэў гасцей ветліва, з паклонам, як кажуць, і тады аддача ўся абрынецца ліўнем толькі на яго, Міротнікава. Што грахі таіць, даўно меціць у аблспажыўсаюз, хаця б — для пачатку — якім-небудзь інспектарам, і тут, адчуваў душою, акурат выдаўся шчаслівы шанец высялужыцца і выставіць сябе. У гэтым ён быў цвёрда ўпэўнены, як і ў тым, што Пруцікава тут не абмінуць, а таму круціў-фінціў з бочкамі так, каб, па-першае, справу заблытаць і замудрагеліць, а па-другое, каб Пруцікаў уразумеў: яму зробяць ласку, калі пойдзе на ўзаемнасць.

— Чаму ж закрываць? — сказаў Міротнікаў, бачачы ў сваёй недагаворанасці той намёк, які прымусіць Пруцікава думаць і шукаць выйсце іменна праз расчыненыя дзверцы расстаўленае ім, Міротнікавым, пасткі.

— А што дзелаць? — здаецца, Грышка клюнуў, бо насцярожанасць, што застыла ў вачах, якраз і паказвала на рашучасць Грышкі пайсці на ўсё, што яму пасуляць, абы толькі не варочацца дахаты з пустымі рукамі. І Міротнікаў, скеміўшы, што момант, калі можна гнуць сваё напрамую, акурат начакаўся, расказаў Пруцікаву пра *ўсё*.

Грышку план спярша здаўся падазроным і нязбытным: палохала тое, што каманда сыходзіла ад людзей, якія на дом рыбака, здаецца, ніякага права не мелі, а таму і дамаганне іх нічым іншым не магло быць, як парушэннем, спробаю абвесці вакол пальца. І тое, што Міротнікаў нібыта як падкупляў Грышку, гаварыла акурат. Але Міротнікаў не настолькі быў дурны, каб не бачыць іменна такі ход Грышкавых думак, а таму, наваострany загадзя, вельмі хутка пераканаў Пруцікава, што з выканкомам ён дамовіўся і ад Грышкі хоча толькі аднаго — каб ён, як «хазяін» дома, дабром прывеціў гасцей, і ўжо толькі за гэта ён, Міротнікаў, будзе яму вельмі ўдзячны і не паскупіцца на бочкі: як кажуць, вуха на вуха. Увогуле, не хлусячы Грышку, Міротнікаў купіў яго на тым, чаго той не ведаў і не мог ведаць, — што дом рыбака гэты, хоць і пабудаваны на тэрыторыі раё-

на, быў уласнасцю абласнога начальства, а яно ўжо, калі хацела прыехаць у дом рыбака, званіла раённаму, якое потым і давала ўказанні Грышку. Аб прыездзе *гэтых* гасцей, хоць таксама з Магілёва, такога званка не было, і Міротнікаў, не рызыкнуўшы ўтаіць гэты факт ад старшыні райвыканкома, перагаварыў з ім, але ўсю адказнасць узяў, што называецца, на сябе, і пры якім-небудзь непаразуменні гэты ўчынак расцэньваўся б толькі як яго, міротнікаўскае, свавольства. А каб усё было як латвей шыта-крыта, ён вырашыў, што трэба ісці «Міротнікаву да міру» з Пруцікавым, які, балазе, падвярнуўся. Інакш нахопіцца — тады ўжо нічога не паправіш: вартаўнік ёсць вартаўнік.

Калі напраўду Міротнікаў хоча ад Грышкі толькі аднаго — падрыхтавацца да сустрэчы гасцей — адамкнуць дом, нанасіць вады, выпаліць лазню, — то чаго тут, скажы, упарціцца. Не прывыкаць жа. І не к спеху — у суботу, кажа, прыедуць, к шасці гадзінам вечара. А Грышка, як зазвычай, уранні паедзе туды і спакваля, памалу зробіць усё як мае быць. Клопат — невялікі, дый што тут, «па абязаннасці», затое бочкі будуць цвёрда, бо адкладваць з імі ўжо няма як. З гэтаю ўсцешнаю думкаю Грышка і кіраваўся зноў да «хазмага».

Грыбы, канешне, пайшлі расці, але хто ведае, колькі яны парастуць, можа, тыдзень-другі, — а там зноў сухмень. Хто не паспее ўхапіць, той застанецца з носам. А што гэта за грыбнік, які спіць у шапку і яму абы апраўдацца: «Бочак няма...» — ды развесці рукамі. Апраўданні ўсягды можна знайсці, а паруліцца — не кожны зможа: адзін, бачыш, лішні раз пальцам пашавяліць не хоча, другі мудруе, як выехаць на чужым карку, а трэці зусім лянуецца. Грышка ні першых, ні другіх, ні трэціх не разумеў і з прыкрасцю пляваўся, калі чуў ад некага: не змог, не сумеў (ну, чэснае слова, як дзеці!), бо тое, тое пашкодзіла. Яснае дзела, усё можа быць, але, думаў Грышка, спярша вінаваціць сябе трэба, тады ўжо іншых. Хто яму вінаваты, Грышку, што ў яго дзеці такія няўседлівыя, неўгамоннага нораву?

...Дом рыбака стаяў на Лысай гары, акурат перад спускам да Сажа. Гара называлася Лысая, хаця нічога лысага ў ёй не было — скрозь рос малады сасоннік, там-сям гонкія бярозкі, рабіны і густыя, бухматыя, як воз

сена, кусты арэшніку, у якіх звычайна рыбакі вырэзвалі вудзільны; і нават палянкі былі ўтыканы пірамідкамі ядлоўцу і акуратнымі тугімі елачкамі. Якраз на гары стыкаліся дзве дарогі — адна прамая ад шашы, другая ішла ўздоўж лугу і гублялася недзе ў старым лесе, а перш яе перасякалі яшчэ некалькі пясчаных дарог, саштрыхаваных наўскасы і поперак хвастамі яшчарак, якіх апошнія гады развялося тут вельмі шмат.

Раней, помніць Грышка, на Лысай гары было столькі шуму-гаму — так званыя маёўкі ці, інакш, — «святы працы», на якія збіраўся люд з усяго раёна, прыязджалі машыны, аўталаўкі з гарэлкаю, півам, газіроўкаю, пячэннем і цукеркамі... Людзі спявалі песні, танцавалі; сеўшы на траву пад куст, абедалі, выпівалі, а маладыя хлопцы, «жанішота», задраўшыся, як тыя пеўні, з-за нейкае дробязі, хапалі дручча і ганяліся адзін за адным па лесе ды лузе, квасілі сабе насы. Трошкі пазней на Лысай гары сталі праводзіць спаборніцтвы сандружын — жанчыны ў чорных камбінезонах і белых хустках, з процівагазамі пры боку бегалі з брызентавымі насілкамі, насілі «абпрамененых» і «абпаленых».

Цяпер, ужо гадоў з пятнаццаць, тут было ціха, можа, гэта і падбіла якраз пабудаваць дом рыбака — якніяк, месца дападное і прывольнае. Хто будаваў і па чыім загаду, з тутэйшых людзей ніхто не ведаў, але ўсе, як адзін, радаваліся, што будзе, лічы, свой дом адпачынку — навошта ехаць пад той Чэрыкаў ці Бабруйск? Ды ці мала каму заруліць перадыхнуць, прылегчы ці — усяк бывае — заначаваць — рыбаку, ягадніцам ці грыбнікам, таму ж касцу або пастуху.

Дом пабудавалі вельмі хутка — з новых, моцных бёрнаў, — ашалявалі і асланілі высокім шчытным плотам, які пафарбавалі ў зялёнае, і ён сярод сосен ды бяроз здалёк не калоўся ў вочы — але не гэта здзівіла малінаўцаў. Сюды, у дом, правялі нават электрыку, але чамусьці лінію цягнулі не з якой-небудзь блізкае вёскі, а з райцэнтра ажно, да якога было кіламетраў восем з гакам, — праз балоты і топкія мясціны, праз зарослыя плюшчом азярыны (як толькі тэхніка прадзіралася?); і цяпер, стройна пастаўленыя, бетонныя слупы наўсцяж праглядваліся з гары, а ў сонечную пагоду нясцерпнавостра, як заінелыя ўсё роўна, зіхацелі правады, уводдалі прагнутыя як не да зямлі.

Ужо як стаў вартаўніком, Грышка ўбачыў, што за

плотам стаіць яшчэ і лазня; у доме было пяць пакояў і кухня; тэлевізар, халадзільнік, канапа і ложкі; у зале — круглы стол з мяккімі крэсламі, на падлозе шчытна ляжаў дыван. Словам, гэта быў далёка не горшы, чымся ў добрага вясковага гаспадара, хорам, у які, Грышка не сумняваўся, з радасцю пабеглі б многія гараджане, памяняўшы свае выгоды на чыстае паветра, бераг ракі, свежую ягаду ці грыб. Якая ім радасць ад тых гастраномскіх пакуначкаў ды аўтобуснай мітусні? Гэта зразу заманлівым, ледзь не раем, здаецца такое жыццё, а потым чалавека ўсё адно да зямлі пацягне; будзе жыць хай ды рабіць у горадзе, але прыволле сабе, адпачынак знойдзе толькі сярод зелені, чыстае травы і вады — на зямлі, з якой усё жывое і пачынаецца.

Грышка, як і намячаў, прыехаў на Лысую гару ўранні. У лазняку пры Сажы яшчэ сівеў туман, і на траве ляжала буйная раса, пырскала белым, як магній, святлом. На тым беразе, у дубах, каркалі вароны, але ніводная з іх не ўзлятала. Грышка пастаяў, палюбаваўся на Сож, што рахмана і роўненька, бы адбеленае палатно, каціўся ў далеч, за якою, здавалася, скручваўся ў тугі, бязмерна таўсты сувой.

Замок на варотах быў вільготны ад расы і халодны, як лядзень. Веласіпед Грышка прысланіў да ганка, увітага аднізу бела-ружоваю бярозкаю, і зразу павярнуў да лазні. Яна была звычайная, скляпаная на вясковы манер, хіба што надта прасторная і палок вялікі — можна легчы і выпрастаць ногі. Правы кут займала печка, звараная з таўстых металічных пласцін, — яна стаяла на цагляным падмурачку, у якім была нішка-паддувала, дзе збіраўся попел. У металічнае нутро печкі, закратаванае знізу чыгуннымі каласнікамі, было насыпана каменне — на яго праз духоўку, дзверцы якой зачыняліся адно тады, калі печка палілася, лілі ваду, і яна давала пару. Палок быў на левы бок печкі, а бачок для гарачае вады — справа, ён датыкаўся да печкі і грэўся. Пад халодную ваду быў прыстасаваны звычайны бак з-пад бензіну, які мацаваўся на сцяне пры ўваходзе ў лазню; напроці зерыла невялікае зашклёнае акенца, і пад ім стаяла лавачка — такая, як і ў прымыльніку.

Грышка рэдка паліў у лазні, адно тады, калі прыязджала з раёна легкавічка і чалавек з яе гаварыў, каб сёння ці заўтра лазня была выпалена. Тады ён садзіў-

ся на веласіпед і круціў на Лысую гару. Людзей, для якіх ён стараўся, бачыў, можна сказаць, назіркам, бо ніколі не плутаўся пад нагамі, не вытанцоўваў перад імі, свой клопат справіў, астатняе — старана. Былі яны, як здавалася яму, дабрадушныя, бестурботныя і ў тої ж час упэўненыя ў сабе, сваіх паводзінах, словах і нават у смеху... Смяяліся шмат — і ўсмешкі на іх белых, выпешчаных тварах былі шырокія, шчырыя. Часам, гледзячы на іх, Грышка думаў, ці не ў рай ён зваліўся, да тых людзей, якім за іх бязгрэшнасць бог шчодра ды спаўна, як толькі можа адзін ён, адмераў шчасця. Але, дзіва дзіўнае, Грышка гэтым людзям ні грама не зайздросціў, бо, як здавалася яму ўвесь час, яны не ідуць, а коўзаюцца — ні табе якой задзірынкі, ні патарчакі... Дзе там задзірынка, калі вунь якія далікатныя, крохкія, бы сыраежкі, надта жанчыны — такую жонку, мабыць, не так проста і палашчыш, падлізванне мудронае трэба: хі-хі ды ха-ха, і рукі — каб не граблі, а мяккія, дагледжаныя і без мазалёў; неяк Грышка ваду нёс, а яны акурат загараць разлегліся на траве, ватныя коўдры падаслаўшы, — Грышка наткнуўся на іх зняцяйкі, звярнуць не мог і прайшоў міма; яго Лісаветка яшчэ як звон, а гэтыя такія ўжо рыхлыя — чуе ўслед: «Тонечка, нам перашкаджаюць... Можа, міліцыянера па рацыі выклічам, ох...»

За чатыры гады Грышка ўжо прывык да гэтых людзей і, калі доўга іх не бачыў, пачынаў як бы сумаваць, ці што. Ва ўсякім выпадку, дні яму здаваліся чорствымі, аднастайнымі; на душу ціснуў цяжар, хоць каравул крычы. Грышка станавіўся бурклівым і мог ні з таго ні з сяго ўсчаць сварку з Лісаветкаю, за што потым было сорамна і прыкра. Таму і людзі Міротнікава, якія, пэўна ж, такія, што і раней прыязджалі, былі яму цяпер не ў прымус, а як быццам жаданымі, блізкімі гасцямі, і Грышка намерваўся ім па шчырасці дагадзіць.

Грышка адкруціў краны ў бачках — ваду сцадзілі мінулы раз да кроплі, і добра, бо ўсё адно б зрудзела, — зноў закруціў. Спярша Грышка насіў ваду з Сажа вёдрамі — цяжка, што ні кажы, хоць і нязломкі яшчэ, — гэта ж трэба заліць сем на гарачую і адзінаццаць — на халодную. І бывае, што ўсё роўна мала — пялешчуцца ж, без усякага ашчадку, — тады яшчэ насі.

Але год назад Грышку прывезлі (з будтрэста тыя людзі былі ці адкуль?) рухавічок і шланг да яго —

даўжэзны, калі скруціш у маток — ледзь падняць; плюс яшчэ электрашнур, такой даўжыні, як і шланг. Рухавічок гэты Грышка апускаў у ваду, размотваў шланг і шнур, цягнуў іх да лазні, дзе была разетка; уключаў рухавічок — і ён гнаў праз шланг у бачок ваду... Прыдумалі ж!

Грышка ўзяў пад левую паху рухавічок, кругленькі і гладкі, як кабанчык, а скручаныя ў маток шланг і шнур павесіў на сагнутую ў локці правую руку; пахіліўшыся, панёс да рэчкі. Бераг тут быў адхонны, нізкі — пясчаны клін, усыпаны блакітнымі палавінкамі мёртвых ракушак, плаўна і тонка, бы лямеш плуга, урэзваўся ў ваду, шчытна, як не спрэс, закрытую шырокім лісцем гарлачыкаў. Гарлачыкі якраз цвілі — над вадой на тонкіх шыйках хісталіся жоўтыя, ледзь не плоска расхінутыя бутончыкі кветак. На лісце, там-сям прадзіраўленае бліскучымі цёмна-сінімі жучкамі, любілі садзіцца лёгкія аранжавыя стракозы-кап'яноскі — дзьмуў слабы лугавы ветрык і варушыў ім крыльцы. Фыркнула з вышыні і гупнулася на лісціну, выціснуўшы наверх срабрыстую кроплю вады, плісіца, скрывіла чорную галоўку, каб дастаць кіпцюрыкам вока, запарушанае, мабыць, пылам з прыбярэжнага пяску, што бялеецца між чэзлымі, аб'едзенымі скацінаю лазовымі кусцікамі.

Грышка, хіснуўшыся, шчубоўкнуў рухавічок далей ад берага, дзе было глыбакавата, — забурліла і замуцілася вада, у ёй заблiскалі вяртлявыя ўклейкі, якія перш (ад усплёску) сіганулі ў бакі, бы стрэлкі; Грышка выграб з кішэні крошкі хлеба, пацяруху і сыпнуў на ваду, панаглядаў за ўклейкамі, якіх сабралася цэлая плойма, за жывою і мяккаю, бы пакулле, расчасанаю плынню вады травою, у якую заблыталася чырвоная, падобная на варанага рака лісціна... У плечы прыпякала сонца — паднялося з-за гары, над сасоннікам, у вершалінах якога мільтусілася, дробна высвечвала маладыя смалістыя іголкі, і на іх там-сям загараліся маленькія зорачкі расы.

Ужо як падняўся зноў да лазні, адчуў, што прытаміўся; апусціўшы канец шланга ў бачок для гарачае вады, сеў на лавачку аддыхацца. Канешне, ужо не тыя гады, калі мог утрух дабегчы з Маліваўкі да лугу і не ўспацець нават. Добра во, што хаця ваду не трэба цягаць. Ён, праўда, нікому не скардзіўся, не кволіўся, і

што ўважылі, паспрыялі добрыя людзі — дзякуй ім за гэта.

Хвіліны праз дзве шланг выпруціўся, і з яго зацурчэла, пругка забілася ў дно вада, акурат птушка крыламі. Не адключаючы, ён перанёс шланг у другі бак, наліў і яго; вырваў з разеткі шнур. Спяшацца не было куды, і Грышка не мітусіўся, рабіў спакваля і чынна. Тут жа так: парупся, выпалі лазню раней, чымся прыедуць госці, — яна выстудзіцца, дух схлыне — і ніякага парання; кепска будзе, калі і не ўправіцца ў час, падпіраць будуць: давай ды давай. А гэтага Грышка акурат і не любіў, калі над душою стаяць. Хаця тут турбавацца надта і няма з-за чаго: сказаў жа Міротнікаў, што недзе к шасці вечара павінны быць. Калі яны самі не падкачаюць, то Грышка да мінуты ўсё можа раскласці. Роўна дзве гадзіны папалі ў печцы бярозавага аблету— і духу хоць адбаўляй; каб не было гаркаты, дровы Грышка спальваў датла, на шэры прысак — яго потым выграбаў саўком, і чадам блізка не пахла.

Грышка пакалоў тапаром, які ўзяў пад лавачкаю ў прымыльніку, смаляны чурбачок, прыхаваны знарок на падпалку; схадзіў за лазню і прынёс два бярэмы аблету, які зімаваў складзены пры сцяне. Некалькі полен паклаў у печку, падсунуўшы пад іх смаліну ад чурбачка. Цяпер адно падторкні запалку і — зашумела-загуло; праўда, бывае, што павук затчэ павучынаю комін, і, пакуль дым праб'е яе — цягі няма: дым кудлаціцца ў лазні, выплывае праз дзверы, лезе ў шчыліны акенца; а як прарвецца праз комін, тады над комінам шмаццём, акурат брудная марля, матляецца павучына.

Грышка замацаў у кішэні запалкі, пачак папярос «Беламор» — балазе цяпер папяросы добрыя, не тое, што некалі, да вайны, мох ды лісце сухое смакталі. Сеў на лавачку — з акенца на правае плячо яму падала святло — і закурыў. Віўся ўгору нервовы дымок, а ў галаве круціліся думкі. Колькі таго жыцця ў чалавека, і яно — у вечных турботах, пакутах... От, што праўда, то праўда: век зжыць — не мех сшыць. А можа, чалавеку адно здаецца, што павінна быць іначай? Можа, так яму і наканавана жыць, а там ужо як хто сам выкручваецца? У яго, Грышкі, во з Мішам бяда, а другі — нават *сваю* душу прыструніць не можа, таму яна і не судзіць яго крэпка, калі ўсякую брыду вычварае... Шкада, канешне, што дзеці не ўсягды ад бацькоў бяруць лепшае,

лягчэй благое пераймаюць і, пакуль самі гузакоў не наклепяць — не сунімуцца. А чаму, дзе тут хто вінаваты — спытаць бы ў каго? Урадзіўся, кажуць, такі. Гэта цяпер неяк блытана ўсё, змяшалася ў кучу, а раней — род браў сваё: у працавітага бацькі і дзеці працавітымі выраталі, у злодзея — па вокнах лезлі. Дзіва што — пастаянна жылі пры бацьках, на сенажаці ды палях раслі, пад снапамі; потым жаніліся, ладавалі сабе гняздо — новае ці бацькаву хату дзялілі... Адныя ва ўсіх клопаты-чобаты былі, памагаў брат брату... у шчытным клубку, як рой тых пчол. А цяпер што — вось у яго, Грышкі? Сын... лепш не ўспамінаць, дачка — тая ў свеце, без нагляду, можна сказаць, і няпраўда гэта — што вочы не бачаць, дык душа не баліць. Баліць, ды яшчэ як баліць... Не, усё-ткі латву тыя бацькі ды маткі робяць, каторыя сваіх дзяцей ля сябе прывучаюць, а не выпіраюць «у людзі». Во хаця б таго Валодзьку Шапялёвага ўзяць. З аднаго краю, як быццам усё добра — жыве ў Мінску, сям'ю, кватэру мае, работу харошую, а з другога — шкадуе, што не на зямлі ён, па Малінаўцы тужыць... Знаць, круці не круці, чалавеку гэта сувязь, пупавіна з сваёю зямелькаю край патрэбна, і ніякія там красоты-пашаноты яе не абрэжуць...

Грышка схамянуўся ад таго, што раптам не ўбачыў на плячы сонечнага святла і ў лазні шарэў паўзмрок. Аж потам праняло: няўжо так задумаўся, што часу мінулася шмат? Сутаргава сашмаргнуў з рукі кашулю — гадзіннік паказваў палову другой. «Дык што ж ета засціла сонца?» Выглянуў на двор: неба было зацягнута густою, цьмянаю сінечаю; маленькія лугавыя сонейкі — адуванчыкі — таксама пахаваліся, акрылі свае галовы зялёнымі хусцінкамі; трывожна шумелі чубы бяроз, гнуліся ў бок Сажа. «Зноў на дождж... Недарма ўранні крычалі, дралі глотку вароны», — падумаў Грышка, і не зразумець было, ці то ён радаваўся дажджу, што зноў прамочыць зямлю і будзе латва грыбам, ці то шкадаваў, што дождж зглуміць гасцям свята і настрой. Ва ўсякім выпадку, ён выглядаў неба ў прасветліну між дрэў з прагнаю заклапочанасцю: зачэпіць хмара дом рыбака ці прагоніць міма — туды, аж за Глубку?

Раптам блізка пачуў галасы. Мужчынскія. Гуду машын, здаецца, не было, і душа ў Грышкі адно зварухнулася, але не сцялася, як бывае, ад зляку. Высокі шчытны плот хаваў таго, хто ішоў, але галасы акурат набл-

бжаліся да варот, якія Грышка пакінуў незапёртымі. Ён чамусьці спешна патрухаў да іх, хаця людзі ў такой вусцішнай змрочнасці былі якраз не лішнія — можна перакінуцца словам, аджывіць душу, пасмяяцца.. Але— што за людзі? Амаль нароўні з Грышкам у вароты ткнуліся мужчына ў саламяным шэрым брылі і хлопец год дваццаці, у руках яны трымалі вуды; у хлопца цераз плячо вісела пухлая школьная сумка, а з-пад пінжака мужчыны тырчаў выслізганы кончык тапарышча. Людзі Грышку былі знаёмыя — зрэшты, ён ведаў адно мужчыну, а гэты хлопец, пяйначай, яго сын: у абодвух чорныя бровы і даўгія, з прыплюшчанымі дзюбачкамі насы. Мужчына быў з Дабранкі, Грышка ўспомніў нават прозвішча — Марчанок. Ды і як было не ўспомніць — мужчына ўзяў у жонкі (зразу пасля вайны) іх малінаўскую дзеўку — адну з пяці Чубатчыных дачок; а потым, як вярнуўся з Данбаса, Грышка купляў у старога Марчанка, у якога жыў тады і сын з маладою жонкаю, цёлку; пазней выпівалі разам у сталоўцы райцэнтраўскай. Помніцца, добра ўрэзалі, надта Марчанок, у міліцыю забіралі яго, ды Грышка адстаяў, не даў. Любіў, чутка хадзіла, малады Марчанок гарэлку, дый не дзіва было— тады яе, зусім дзяшовую, прадавалі на кожным рагу; зайшоў у сталоўку абедаць — тут жа, на месцы, бяры малянкоўскую шклянку, так сказаць, для апетыту. Здаецца, Марчанок і цяпер быў цёпленькі: рудыя вочы яго туманіліся, на зацемненым акрайкам брыля лбе блішчаў пот; перасмяглі вусны, і ён аблізваў іх раз за разам.

Марчанок таксама пазнаў Грышку, лісліва заўсміхаўся і переступіў у двор, як гаспадар; услед за ім — і сын. Грышка пастараніўся, але не збіраўся ісці ў бок дома, куды яўна мерыўся Марчанок. Адно цяпер Грышка ўбачыў на ягоным зашмальцаваным пінжаку шырокую планку ўзнагарод і не стрымаўся, пажартаваў:

— Ты як на свята сабраўся.

— А што? — Марчанок не траціў гонару, а, падобна, гатовы быў казырыцца далей. — Сянні і ёсць свята. А ты вот не знаеш. Толькі, бачыш, я... І пры ардзянах! — стукнуў кулаком у грудзі і не адымаў кулака.

Грышка стаў прыпамінаць, што за свята на пачатку ліпеня — ясна, што не вялікае, пра якое звычайна ведаюць усе, а нейкае, мусіць, прафесійнае — іх жа, лічы, на кожны тыдзень прыпадае, і ўсіх не запомніш.

— Э-э, браток!.. — паляпаў Марчанок Грышку па

плячы. — Каму-каму, а табе грэх не помніць пра етае свята. Дом рыбака вартуеш, а не ведаеш, што сянні дзень... рыбака, вот! — Марчанок уставіўся ў Грышку, каб пабачыць, як той здзівіцца. У Грышкі сэрца, канешне, ёкнула, быццам тое, што ён не ведаў пра свята рыбака, і праўда — вялікі грэх, але з твару не змяніўся. Падумаеш, свята! Канешне, для сапраўдных рыбакоў, тых, што па моры ды акіянах плаваюць, гэта — свята, а Грышка ўсягды дзень шахцёра прывячае, але ён, гэты дзень, яшчэ праз паўтара месяца, у канцы жніўня, — тады і чарку бярэ, сяброў-забойшчыкаў прыгадвае...

— Вот я з сынам і сабраўся на рыбу... кінуў свой трактар — не збяжыць. Здаецца, зрання на дождж не паказвала, хаця нешта ўсю ноч раны мае нылі, — спавядаўся Марчанок, быццам Грышку край цікава было слухаць, — а тута зняцяйкі хмары нацягнула... А мы дайжа ніякага плашчыка не захвацілі з сабою, дык во і бяжым сюдой, у дом рыбака. Тута і абначыцца можна будзе... праўда, Мацвеевіч? — дзіўна, што Марчанок ведаў яго, Грышку, па бацьку, і гэта воляй-няволяй адгукнулася ў душы калі не ўдзячнасцю, то прыемнаю лагодаю пэўна. Дзе ж тут заначуеш, падумаў Грышка, калі сказалі яму, як вартаўніком ставілі, — «не пускаць у дом рыбака пастаронніх». Грышка, баючыся, што сваім «чагоканнем» не спадабаецца, і каб не здацца зусім дурным, не спытаў тады, хто ж «пастаронні», а хто свої; пасля ўжо сам паўміў — што ўсе тутэйшыя, каго ён ведае і каго не ведае ( ад аўтара — аналогія з «Пінскай шляхтай»: хто бачыў і хто не бачыў; пад увагу, просьба, не браць), а таксама прыезджыя, аб якіх яго не папярэдзілі, — пастароннія, астатнія — свае, могуць адпачываць у доме рыбака.

— Нельга, — сказаў Грышка не столькі з цвёрдасцю ў голасе, пасля якой у кожнага чалавека не застаецца і каліва сумнення ў зрушэнні сваіх надзей, колькі з упэўненасцю, што іначай ён зрабіць не можа.

— Чаму ета нельга? — спытаў Марчанок, і сын яго, падобна, здзівіўся таксама: заплюскаў вачыма — быццам на яго парывам упаў вецер. — Я — патомны рыбак, у мяне дзед з бацькам рыбу лавілі!..

— А таму што забаронена, — Грышка не паддаваўся на перапалку, а стараўся як след уталкаваць.

— Хто пасмеў забараніць? — здаецца, Марчанок і блізка не прымаў Грышкавы довады. — Я ўвесь час

толькі і думаў, калі дабяруся да етай хаты... Казалі, тута пакояў многа. Аблюбаваць адзін сабе хачу, снасці ў ім пакінуць, во... тапор, — віхнуў азадкам.

«Многа хочаш...» — пасміхнуўся ў душы Грышка, зусім не з'едліва, а толькі ад думкі, якая прыйшла, — што не перавяліся на белым свеце целяпеі, наіўныя людзі; хоць і слова нянаскае — «наіўныя», але, здаецца, тут яму месца.

— Схавацца ад дажджу схавайся, — міралюбна сказаў Грышка, — і то на маю рызыку, а хазяйнічаць тута не дазволена. Дый п'яны ты — шчэ спаліш... Так што не развадзі анцімонію.

У Марчанка забегалі вочы, ён, падобна, не збіраўся ісці да паразумення, як і кожны чалавек, апантана і безаглядна зацяты ў сваёй праўдзе; знутры яго, канешне, падагравала гарэлка, востры пах якой — калі Марчанок падступіўся блізка — шыбануў Грышку ў нос.

— Мне ўсё дазволена! Бачыш?.. — І Марчанок тыцнуў пальцам сабе ў грудзі.

— Я знаю, што ты ваяваў, раніла... Ордэн пасля ўжо вайны ваенкамат уручыў табе... помніш, замочвалі? — Грышка думаў, яго словы Марчанка расчуляць, улашчаць — па той прычыне, што ўсякаму, як кажуць, мёдам на сэрца, калі раптам нехта чужы назаве яго заслугі, — ды выйшла іначай: Марчанок ажно віскнуў ад захлісту пачуццяў, якія, здаецца, перапоўнілі яго з беражкамі, як веснавая вада Сож.

— Вот іменна! Я кроў за Радзіму праліваў, а ты як крот у нару зашыўся, а цяпер камандуеш мной! Сыдзі з дарогі!.. — Марчанок, чырвоны ад натугі, яшчэ больш пацямнеў з твару, і кроплі поту на лбе пабольшалі.

Грышка хацеў сказаць, што ён таксама ваяваў, праўда, куля злітасцівілася над ім, затое снарад па яго душу прылятаў двойчы — адзін раз скубануў каля самых грудзей — сарваў гімнасцёрку і адно скуру апёк, другі — дзюбнуўся ў акоп, ды не ўзарваўся (як потым раскруцілі мінёры — аказалася, пілавіннем нашпігаваны), дык вось, Грышка хацеў пра ўсё гэта расказаць, але падумаў, што ў іх з Марчанком пачнуцца асабістыя дамаганні, папрокі, дый, калі ўжо на тое, град мазгі Марчанку не адбіў, сам ён знае, што Грышка на вайне быў і не абы-кім з яе вярнуўся, а старшым лейтэнантам.

— Калі б ета была мая хата, я б табе словачка не сказаў... — Дзіўна, Грышка паводзіўся так, быццам

толькі яго воля была, пускаць Марчанка ў дом рыбака ці не. — І нават Лісаветку сваю аддаў бы...

— Ды пайшоў ты!.. — Марчанок ірвануўся наперад міма Грышкі, але той залучыў яго рукою; і сын учапіўся бацьку за плячо, першы раз падаўшы голас — аказалася, картавы: «Не тлэба, тата!» — і было відаць, што яму не ўпершыню сунімаць п'яную наравістасць бацькі; ва ўсякім выпадку, хлопец паклаў на зямлю сваю вуду і стаў перад бацькам рукі ў бокі. Грышка таксама наструніўся, гатовы ў любую мінуту кінуцца нагрудкі Марчанку. Невядома, як бы ўсё разыгралася далей, калі б не сыпнуў дождж, не густы, але буйны, як гарох, — кроплі, падаючы ў пясок, узбівалі пыл; потым, калі пясок змачыла, выклёўвалі ў ім ямачкі. Марчанок, з апушчанаю галавою, паправіў пад пінжаком тапор і завярнуўся ісці.

— Куды ты... на дождж? — хацеў спыніць яго Грышка, але Марчанок адчайна махнуў рукою — у плечы яму білі кроплі, дробна, як мак, разляталіся; на сцежцы заставаліся белыя плямы слядоў, а праз мінуту іх пазамываў дождж (ад аўтара: як час замывае чалавечую памяць, каб, даўшы прастору новым уражанням, старыя пахаваць навечна ў бязмежнай прорве невядомасці).

Грышка са злосцю плюнуў — не ўслед Марчанку, якога яму было шкада аж да слёз, а ад прыкрасці — што ўлез вось у гэтае «старажоўства», цяпер пастыляйся з людзьмі, ворагаў нажывай. Мог бы, канешне, вушы апусціць, моў, як сабе хочаце, але навошта тады грошы палучаць. Тут так: або зусім кідаць гэту работу, або цвёрдым быць — і ніякага Якава.

Грышка распаліў у печцы і, пакуль корпаўся каля яе, на нейкі час забыўся пра нядаўнюю стычку. Дождж не забавіўся — хмары зачапілі адно крылом, — і цяпер чыста ды свежа блішчалі бярозы, мокрая вясёлая трава, з якой паравала тонкае, блакітнае марыва і, падагрэтае на вышыні сонцам, бясследна знікала. З норак выпаўзлі мурашы, напалоханыя вадою, насцярожана краталі вусікамі. На ружовым вяночку лугавога васілька сядзеў мокры чмель са склеенымі крыльцамі; Грышка пастаяў над ім, крануў за спінку пальцам — чмель пахіліўся і падняў уверх кручкі сваіх махнатых ног.

У доме, які Грышка адамкнуў адно цяпер, стаяла духата, цяжкае паветра пахла пылам і тою нежывою зат-

хласцю, што немінуча зашываецца ў памяшканне, дзе рэдка бывае чалавек. Рассохлыя за лета, рыпелі пад нагамі масніцы, аж калола ў лоб з сярэдзіны. Грышка паадчыняў усе фортачкі і дзверы, працёр мокраю анучаю стол і падаконнікі. Шчоўкнуў тэлевізарам — паказвалі цёмных, аж чорных, людзей з абкручанымі ў белыя ручнікі галовамі і з аўтаматамі на плячы. Яны ішлі ўразвалку, смеючыся, па гарадской вуліцы, абапал якой перад горкамі яблык, гарбузоў і ўсякай іншай садавіны ды гародніны, назву якіх Грышка не ведаў, сядзелі загарэлыя прыгожыя хлопцы і дзяўчаты, а таксама старыя з чорнымі барадамі, маршчыністымі тварамі і глыбока схаванымі калючымі вачыма. Здагадаўся: мабыць, Афганістан, пра які цяпер шмат і часта гавораць, асабліва тыя, у каго хлопцы служаць у арміі. «Міша мой не папаў туды... Можа, і дарэмна — хаця б абразуміўся. Усё-ткі гонар, як ні кажы, інтэрнацыянальная місія... Так нам палітрук гаварыў, калі мы вызвалялі Еўропу ад фашысцкай сволачы». Цяпер, калі так здзеелася з Мішам, Грышка чапляўся за любы варыянт, які мог бы інача павярнуць сынаў лёс і не давесці да ганьбы, бо горш, чымся атрымалася, — сам чорт галаву скруціць, а не прыдумае. Міша, Міша... Грышка падышоў да акна, каб выгнаць на двор мятлушку, што ўляцела праз адчыненую фортачку, і позірк яго ўпаў на Глубку — змрочнае, глухое балота. Грышка раптам пахіснуўся, стала млява ў грудзях, і ён абапёрся рукою на падаконнік, а ў вачах паплыло-паплыло...

...Выехалі рана. Над вільготнаю, цнатліваю з начы дарогаю плыў туман, ліп да рук, як павучына. Міша, шлёгаючы вожкамі, паганяў каня, Белазорага; колы мякка жавалі густы і белы, як цеста, пясок, на булыжынах і каменні стукалі ў восях, а па шашы дробна, як па арэхах, заекаталі. Ажывіўся і Грышка, зашчупаў у фуфайцы папяросы. «Ці справімся за сянні, сын?» — спытаў, закурыўшы і лаўчэй тулячыся ў фуфайку; спытаў, акурат не ён, сталы чалавек, а малагадовы сын большы ведае толк у сене. «Справімся! А што там спраўляцца?» — Міша ніколі не апускаў вушэй — яму, як і маці яго, Лісаветцы, усягды ўсё ясна і проста, і ад гэтай сынавай бадзёрасці спакайней стала і ў Грышкі на душы,

якая яшчэ ад вечара трымцела ў нейкім незразумелым, брыдкім холадзе...

Глубка — гіблае месца; касіць — яшчэ паўбяды: уступіўся дзе на купіну — і махень касою, а страляваць сена — праблема... Перш вынесці на плячах з балота, потым канём усцягнуць на гару — па грэбельцы. Гэту грэбельку людзі гацілі адвеку — секлі, насілі галлё, ламачча, тоўстыя палкі, звозілі з поля і сыпалі каменне... Але прорва ўсё праглынала ў сваё ненажэрнае,ваўчынае нутро, і грэбелька здрадліва зыбалася, абапал яе рохкала-калыхалася вада пад шчытнаю, як сатканае палатно, раскаю.

Прыехалі, распраглі Белазорага і, навязаўшы на вожкі, пусцілі хадзіць — трава на гары, хоць і падпаленая спёкаю, зеляніць, і скубці яе адна латва. Нябачнае сонца, аднекуль спаднізу, лізнула вольхі і бярозы, і лісце на іх зальснілася ядранаю матавасцю. «Трэба масціць», — сказаў Грышка дужым голасам і ўзяў з калёс тапор; сышоў на адкос гары — і здрыганулася густая алешына, усплакнула расою з лісця. Тапор смачна ўядаўся ў дрэва, і Грышка, з сілаю гахаючы ім, зажмурваў вочы. Адно баяўся, каб тапор не хвіцнуў з алешыны і не лучыў на нагу. Міша ўхапіў алешыну за камель і, змятаючы дробнае сучча, сухую траву, павалок яе на грэбельку.

На грэбельцы — даўно не трывожылі — расла высокая, у калена, асака і распусціў свае ліловыя парасоны балотны дзягіль. Міша, у гумавых ботах, завалок алешыну на самы далёкі канец, патаптаўся па ёй, чуючы, як чвякае-хлюпоча пад нагамі твань; раска па-змяінаму засіпела, стала ўспучвацца ад дробненькіх пузыркоў, якія падымаліся з густой чорнай глыбіні.

Масцілі гадзіны дзве. Пры зямлі дымілася трава, сонца шылася скрозь лісце і лезла ў вочы порсткімі жоўтымі спіцамі — як джаламі вос. З пня на пень, каля якіх Белазоры завішна выгрызаў расяную мяккую дзяцеліну, пералятала плісіца, бойка патрэсвала хвастом — пасвіла каня. «Цівун-цівун», — падспешваў людзей, бацьку і сына, шэранькі, як мыш, лясны канёк, што ўсеўся на самую высокую яліну.

Грышка паглядваў на сонца і выціраў далонёю лысіну. У глушы тоўстых і гонкіх, як сосны, алешын час ад часу сочна, бы лапатаю па вадзе, плёскала — ма-

быць, дурэлі на ранішняй «зарадцы» бабры, ім тут, у недападной ні чалавеку, ні драпежніку Глубцы, прыволле: зімою вока праймае між алешын густа расстаўленыя каля вады чорныя стажкі з галля.

— Ну во, цяпер не бяды, — сказаў Грышка, пратупаўшы, гоцаючы, з канца ў канец грэбельку. Уплішчыў між дошак на калёсах тапор, узяў два скруткі плеценых пяньковых вяровак. — Пайшлі, сын... — Курыў на хаду, ідучы за сынам, — бачыў, як у таго ружова прасвечваюцца вушы, і яму пад грудзі зноў падкацілася нешта даўкае і халоднае, як мёрзлая бульбіна.

Сена было згрэбена ў невялікія копкі — акурат на ношку, — зелянкавае, сырое не толькі ад расы. Міша слаў проста на ваду вяроўку, даўгую і жоўтую, падобную на змяю, якіх тут на купінах, як угрэе сонца, аж блішчыць, а на траве вісяць сухія, бы дробная рыбіна луска, змяіныя вылінкі, якія маці просіць збіраць, бо яны добра памагаюць пры нарывах, — Міша напхаў імі ўжо ці не чатыры запалкавыя карабкі.

Грышка браў віламі з копак цяжкія ашмёткі сена і кідаў на вяроўку; стужвалі першую ношку, затым — другую, бралі, падсабляючы адзін аднаму, на плечы і неслі на сушэйшае — куды можна было дапяць з канём. Вяроўка, мокрая, цвёрдая, як дрот, упівалася ў плячо, з ношкі цурком збягала вада, вымочвала ўсяго ад патыліцы да пятак, праціўна, як жаба, пішчала ў ботах, яе часта трэба выліваць і зноў абувацца стоячы, бо садзіцца ў мокрае, хоць на табе няма сухой нітачкі, не надта прыемна — ёдка. За пятай ці шостай ношкаю Грышка выдыхся — ныла ў крыжы, — прываліўся задубелаю спінаю да алешыны, хаўкаў ротам, а Міша...

Міша, расчырванелы, як памідор, арудаваў віламі, накладаў ношку, сам стужваў, упёршыся ў сена нагою, як усё адно сашчапляў у хамуце клюшні. Грышка стаяў, і яму было брыдка за сваю нямогласць, але, дзівячыся Мішавай вынослівасці, ён адганяў гэты несур'ёзны, нейкі хлапечы сорам і, можа, упершыню за апошнія гады проста, без старэчага ныцця і хныкання, радаваўся за сына: «Ёсць! Ёсць сялянская цягавітасць!» Вяроўка, каляная, шорсткая асака намулялі Мішу шыю — скура гарэла, як апараная, і пэўна ж — садніла.

— Перадыхні, сынок... — сказаў Грышка, калі вада з-пад Мішавых ног (спатыкнуўся) пырснула яму на калені.

Вылезлі на сухое — на купіну, каб стоячы перакусіць. Бралі проста з сумкі нарэзанае яшчэ ў хаце сала, хлеб; адкусвалі цыбулі; потым аблупілі па вараным яйку; запілі малаком. Доўга раз'ядацца не было калі. Сонца стаяла нароўні з вершалінамі дрэў на гары. Пачуўся свіст, потым зашлепаталі ў балоце па вадзе дзікія качкі-лапаноскі — Грышка аж здрыгануўся.

— От бы смалянуць па іх з ружжа! — сказаў Міша і нацэліўся пальцамі дзвюх рук у балота. З вяроўкамі ў руках пайшлі па астатняе сена: мала яго там — на паўгадзіны носу.

Сена склалі ў пляскатыя, як ляпёшкі, копы — лягчэй цягаць, не развальваюцца. Грышка пайшоў па Белазорага, думаючы, што пачынаецца самае рызыкоўнае ва ўсім гэтым сенаванні. Конь пачуў яго і неяк нядобра павярнуў гнядую грывастую галаву, пакасіўся белым вокам з вузенькай, як у ката, зрэнкаю. «Ну, давай-давай, конік», — прывязваючы да гужа даўгую вяроўчыну, Грышка бадзёрліва паляпаў каня па цёплай тугой шыі. Закурыў. Прымеціў: нешта многа сёння смаліць.

Улегцы конь ішоў па грэбельцы спакойна, амаль не правальваўся, як быццам выбіраў месца, куды ступіць. Грышка абвёў каня ўкруг капы, падбіў вяроўку, прывязаў канец да гужа.

— Нэ, конік... Ну пайшоў! — махнуў на Белазорага рукой. Белазоры тузануўся, спорна затупаў нагамі — п-пае-е-ехала копка!

На грэбельцы Белазоры зашлопаў нагамі, правальваючыся то больш, то менш, — браў дужа, як бы ведаў, што гэтае месца трэба хутчэй праскочыць. На гары, калі Грышка развязваў вяроўку, у каня хадуном хадзілі бакі, дрыжалі ў клубах ногі; Грышка і бачыў гэта, і адчуваў, датыкаючыся плячом і локцем да Белазорага, акурат хацеў яго сцішыць ці перадаць сваёй сілы, — разумеў: перацягнуць усе копы будзе ой як нялёгка!

За кожнаю дваццацімінуткаю коп за грэбелькаю меншала, а на гары большала — яны, зялёныя, пляскатыя, блішчалі здалёк, як гіганцкія лягушкі — іх, лягушак, як і баброў, у Глубцы хоць грэбельку гаці, бала-зе бусел у гэтым краі рэдкасць, — і цяпер яны дзяруцца на карчах, аж трашчыць у галаве.

Спрэс па волаку ляжала звітае ў верацёны сена, а ў нейкае імгненне Грышку падалося, што тугі сенны скру-

гак вельмі ж нагадвае маладую Лісавеціну касу. Недарма ўспомнілася Грышку жонка — ужо другі тыдзень ляжыць яна плазам, без крывінкі на твары, сама не можа ўстаць — пáдае; вазіў яе Грышка ў бальніцу — нічога і дактары не прызналі. «А можа, проста не сказалі? — сумняваўся Грышка. — Можа, з яе крывёю самае страшнае?..» Грышка шкадаваў жонку — так у міг звяла, счэзла, бы тая вяргіня ў палісадніку па восені, як зняцяйкі хопяць маразы. Дзякуй во старой Чубатчысе, што згадзілася сёння разам з Ленаю пасядзець пры ёй.

Пад канец, лічы, за кожным разам Грышка даваў Белазораму аддыхацца на гары, скубнуць травы. Грэбелька ўся была разваяваная, галлё Белазоры ўплішчыў у твань і сам правальваўся, клаўся на пуза, з цяжкасцю вырываючы напаверх ногі, якія тут жа зноў лучалі ў глыбокія пячуркі. Стаміўся і Грышка, і калі б ён не быў мокры ад вады, то ўжо даўно быў бы мокры ад поту.

Тралюючы астатнюю капу, Белазоры загруз на грэбельцы і адваліўся на бок: выбіўся з сіл. Грышка абышоў каня, правёў далоняю па гарачых пруткіх ружовых ноздрах, даў з кішэні скарынку, але той не ўзяў яе, вінавата, з мальбою глядзеў нерухомымі белымі, як яйка, вачыма на чалавека, гаспадара. Тады Грышка прысеў і стаў гладзіць каня па лбе, мяккіх, як у сабакі, вушах: «Аддыхай, кося, аддыхай... Не спяшы. Куды цяпер спяшацца?» Гукнуў Міша, і Грышка замахаў яму рукою: заставайся на месцы.

— Ну, конік!.. — Грышка адступіўся, падняў над галавою дзягеліну. — Пайшоў!

Конь ірвануўся, аж, здалося, нешта хрупнула ў крыжы, — здрыганулася капа, але не зрушылася: мусіць, каня моцна засмактала твань.

— Ну, яшчэ! Ну, яшчэ разок!.. — махаў Грышка дзягелінаю, але ні разу не сцёбнуў ёю па кані. Конь ляжаў, мыліў запененымі зялёнымі губамі, якія дрыжалі, бы ў дзіцяці, што хоча заплакаць, — збіраўся з астатнімі духамі; потым, нечакана, сам ірвануўся з такою дужасцю, што, выхваціўшыся, не здзяржаўся на грэбельцы і шуганўў разам з капою ў абманліва спакойную раску.

Залямантаваў, як звар'яцелы, Грышка.

Укруг каня падняліся бурбалкі — яны лопаліся, і ад гэтага, здавалася, на глыбіні вызваляецца месца каню, які асядаў неяк надзіва спакойна і да болю прыгожа.

Грышка на імгненне заплюшчыў вочы: «Можа, сон?..» Падбег Міша: «Тата!..»

Раска з двух бакоў, як шлюзамі, зацягнула спіну Белазорага, засталася адно крывая рудая звіліна, быццам у зялёнае радно, якім накрылі каня, уплялася недарэчна чужая нітка. І тады конь, пэўна, адчуў смерць. Ён гоцнуў — аж паказалася спіна — і забушаваў нагамі, як кувалдамі, па вадзе так, што прыбой пырскаў абдаў Грышку і Мішу з галавы да ног, і твары іх, дасюль белыя-белыя, сталі смаляна-чорныя, як у неграў. Белазоры вярнуў да грэбелькі, але яму, мабыць, не давала вяроўка — напіналася, рэзала шыю.

— Нож-ж-ж!.. — суматошна закрычаў Міша, лэпаючы сябе па кішэнях; нож быў у Грышкі. — Тата, нож!

Грышка са сцятымі кулакамі тупа глядзеў на каня: «Што?.. Нож?..» Не паспеў дастаць — Міша выхапіў у яго нож.

— Куды-ы!.. — закрычаў Грышка: Міша, не раздумваючы, скочыў на капу; перавесіўся, папоўз на жываце з яе. — Назад!!! Утопішся!!!

Белазоры, акурат меў розум, сцішыўся; з шырокіх ноздраў туга выходзіла паветра і выбівала каля храпы ў расцы глыбокія ямкі. Міша цягнуўся нажом да вяроўкі. Грышка маўчаў — зарвала мову, — але вусны варушыліся, як усё адно шапталі малітву.

Вяроўка, мокрая, цвёрда звітая, але ненапятая, не паддавалася нажу — ён саслізгваў, не ўядаўся ў пяньку. Міша, трымаючыся адной рукою за сена, не гледзячы, шмуляў і шмуляў нажом... А конь тым часам асядаў, задзіраючы галаву, як не адрываючы яе ад шыі.

— Вылазь! Сын, вылазь!.. — неяк похапкам, сутаргава, быццам замест зубоў у роце стаялі цвікі, ускрыкваў Грышка, гледзячы на каня.

Міша нарэшце пераццяў вяроўку і карабкаўся на капу, але, цяжкі ад вады, засмактаны ў багавінне, абскаўзаўся — вырывалася жмутамі сена...

Трываць ужо не было як — вада падпірала да ноздраў, — і Белазоры зноў забушаваў нагамі, аж кіпела вакол, бурліла бела-зялёная, як на губах, пена. Капа асела ніжэй — паменшала, бы зляглася, як бывае з начы, — і Міша ўспоўз на яе — рукі, парэзаныя асакою, крывавілі. Грышка бачыў толькі гэту кроў і вочы ў каня, якія, набліжаючыся да вады, рабіліся з белых цёмна-сінімі — расшыраліся зрэнкі.

Міша стаяў ужо на грэбельцы, брудны, у расцы і траве, як лясун, і бачыў, што Белазораму ўжо не павярнуцца, не дастаць капытамі грэбелькі. Грышка чамусьці ўзяў сына за плячо, мусіць, каб абаперціся, і выдыхнуў з нейкаю адчайнай злосцю на сябе:

— Амбец!.. Утапілі каня...

Бацька і сын глядзелі на рваную, непрыгожую мясціну ў шчытнай свежа-зялёнай расцы, і старэйшы з іх, выціраючы вочы, размываў на кулаках закарэлую гразь.

Недзе ў глыбіні конь яшчэ сучыў слабымі, спутанымі тванню нагамі, і вочы яго, крануўшыся вады, ужо фіялетавыя, пустыя без зрэнак, былі падобныя на бурбалкі, што неяк сумна і ўжо спакойна ўсплывалі напаверх і — патухалі, як неўзабаве патухлі ў рудой цёмнай вадзе і фіялетавыя разумныя вочы Белазорага... *Назаўсёды.*

Блізіўся час, калі во-во павінны наскочыць госці, і ў душу Грышкі міжволі запаўзала хваляванне — не таму, што баяўся чым-небудзь не ўгадзіць незнаёмым людзям (звычайна яны мала зважалі на яго), а таму, што чалавеку ўсягды няпроста спасцігнуць тайну першай сустрэчы — сяброў, ворагаў, дзелавых людзей, закаханых; у ёй, мабыць, і спее зародак, з якога вырастае потым і дае сабе волю дабро ці зло. Грышка, вядома, іначай думаў, ён больш адчуваў нутром, як гэта край важна цяпер, пасля сутычкі з Марчанком, застацца калі не ўважлівым, то, сама меней, цярплівым і спакойным да іх, шаноўных гасцей. Не трэба, зусім не трэба яму гэткай адплаты: мне наплявалі ў душу, і я ў даўгу не застануся; а чаму б не так: мне перапала, але я не абазліўся, не азвярэў, бо я... Тут Грышка і не падабраў слова, якім бы мог назваць такога чалавека ці тое, што ў сэрцы яго. Мучыць галаву не стаў, махнуў рукою ды пайшоў падкладаць у печку дровы.

...Піпканне машын учуў зразу — густое, пругкае, як мяч, яно ляцела здалёк: госці, мабыць, назнарок загадзя абвяшчалі аб сваім прыездзе.

Пад'ехалі тры «Волгі», адна з якіх (Грышка пазнаў па імклівым алені на капоце) была міротнікаўская. З іх вылезлі расчырванелыя, з вясёлымі тварамі людзі, адзетыя ў спартыўныя касцюмы. Жанчыны і мужчыны.

Нават хлопчык год пяці — у кепачцы і кароткіх чырвоных штоніках з вышытым ільвянём на кішэні, поўненькі, як памідорчык, — ён стаяў ззаду легкавушкі і на некага нецярпліва, аж дрыгаў ножкамі, зіркаў; нарэшце да яго падышоў мужчына ў белай майцы і сінім, з паласамі трыко (акурат у Валодзькі Шапялёва!), адчыніў багажнік і дастаў адтуль вялікі дзіцячы аўтамабіль — на чырвоных гумавых колах і з напраўдашным рулём.

Жанчыны выцягвалі з машын напакаваныя, цяжкія сумкі; а два мужчыны (адзін з іх тоўсты пузан, другі — лысы) неслі ў дом вялікую скрыню свежай рыбы, здаецца, ляшчоў — шырокіх, здаравенных, па засланцы, з ружаватаю лускою; павіталіся з Грышкам, ён адказаў ім пахапкам, бо глядзеў ужо на Міротнікава, які спяшаўся да яго, заклапочаны, з гармоняю ў дзвюх руках.

— Ну як — усё гатова? — спытаў ён, тузануўшы гармоняю, каб паказаць, што занятыя рукі і таму не можа павітацца за руку. Грышка кіўнуў галавою і ўжо ўслед сказаў, што ўсё «на мазі», вуголле счахае і праз мінуту-другую можна ісці мыцца.

Мітусня чужых людзей Грышку была ўжо прывычная, а таму нішто ў ёй востра не ўражвала, акрамя хіба скрыні ляшчоў, якую, параіўшыся, тыя двое мужчын зразу пацягнулі да рэчкі; следам за імі праз нейкі час падаліся і жанчыны з нажамі ды місамі ў руках. «Ну і ляшчы!.. — цмокаў сам сабе Грышка. — Такенных у Сажы са свечкаю не вылавіш...»

Хлопчык сеў у сваю машыну, узяў у рукі вяровачку і хацеў паехаць, націскаючы на педалі, але дзе там: зямля — не асфальт, колы глыбока ўразаюцца, і не хапае духоў, каб зрушыцца з месца. Тады хлопчык вылез з машыны і, убачыўшы ў траве белыя мячыкі, стаў збіраць іх у кепачку. Гэта былі, канешне, не мячыкі, а звычайныя дажджавікі ці, як маліноўцы іх называюць, заечая бульба, а саспелыя — порхаўкі. Хлопчык вельмі хутка разабраўся, што да чаго, і, згледзеўшы порхаўку, тупаў на яе нагою, з-пад якой густа вырываўся рудаваты дым. Хлопчык смяяўся.

Вольныя ад рупаты мужчыны тым часам аблажылі лазню, і Грышка зразумеў, што мыцца яны будуць групамі, каб не надта цясніцца. Міротнікаву, здаецца, пакуль было не да лазні, ён бегаў па двары, як забрытаны, і ўсё пытаўся ў гасцей — што трэба; жанчыны пасмі-

халіся, мабыць, уяўляючы, якое б шчасце было мець такога спрытнага, скоранькага на падхват мужа.

З адчыненых дзвярэй кухні цягнула смажанай цыбуляю, мяккім пахам лаўровага ліста, разам з якім, здаецца, выплывалі і галасы жанчын — нейкія ўважліва-спакойныя, пакорныя, як у манахінь. А з лазні, напроці, ляцелі крамяныя воклічы, сыты, бадзёры смех мужчын. Нарэшце з прымыльніка ўвесь у клубах пары выхапіўся той пузаты мужчына, які ў пары з лысым нёс скрыню ляшчоў, і на пятках, паднімаючы кверху пальцы ступакоў, пабег да Сажа; цела яго, чырвонае, распаранае, дрогалася, як студзень. Грышка не бачыў з-за пагорка, але чуў, як пузан плюхнуўся ў Сож, загагатаў, бы гусак, ад холаду вады. «Няйначай, хоча жывот трохі скінуць, — падумаў Грышка. — Дзіва што — пырні іголкай, дык гадзіну шыпець будзе».

Грышка стаяў, прысаджваўся і хадзіў, як непрыкаяны, не ведаў, куды сябе дзець. Хоць збірайся ды сунься дахаты зусім, але ж не кінеш дом без прыгляду. Мала што здарыцца можа — тады наракай на сябе. Але такая дарэмная прывольнасць гасцей знелюбела яму аж да грэблівасці, ён не прымаў яе ні ў чым і, каб не распякаць сваю душу, надумаў сысці хоць на якую гадзіну. Падручны ў гасцей гэты раз, дзякуй богу, ёсць, і не абыхто, а сам Міротнікаў. Дзе гэта ён зараз — нешта не відаць?

Грышка пайшоў па гары, каля самага абрыву, што крута спадаў да лугу і быў наўскасы зрэзаны кароўскімі сцежкамі, на якіх гарбякамі выпіралі выбітыя з зямлі тоўстыя і шэрыя, бы чарапахі, карані дубоў і сосен; цяпер, калі ўжо не ганяюць на луг кароў, сцежкі, вылізаныя дажджом, — гладкія, неўскапычаныя, са шчытнымі астраўкамі шыгалля, шышак ды смецця. Грышка спыніўся і доўга глядзеў на высокі, ужо добра струпехлы асінавы злом, з частымі нарастамі, падобнымі на абернутыя талеркі, а яшчэ больш — на моцныя конскія капыты. У зломе было шмат дуплаў (з аднаго ці не чулася санлівае цырканне маладых дзятлаў?), усякіх шчарбін і дзірачак; здаецца, у ім, гэтым зломе, мірыліся птушкі, мурашы, розныя казюлькі, шашалі і вусачы, што былі ці маглі стаць адно аднаму ворагамі, але валтузні іх не відаць было і не чуваць. Роўна, як па нітачцы, снавалі ўверх-уніз чорныя, бліскучыя, як пакрышні вугалю, мурашы, скрыгаў усярэдзіне шашаль, а з круг-

ленькай, бы ад цвіка, дзірачкі высоўвала залацістую галоўку асцярожная аса-журчалка. Каля злома раслі асінкі з чырвонымі, як брушніцы, барадаўкамі на лісці.

Нечакана на палянцы Грышка ўбачыў чалавека, які сядзеў на дыбках і нешта ў траве шукаў. Грышка прыхінуўся да сасны. Чалавек акурат павярнуўся бокам, і Грышка пазнаў Міротнікава — ён трымаў у руцэ шклянку, напалову — аднізу — чырвоную. «Суніцы збірае!.. — здагадаўся Грышка. — Надумаўся ж...» Не зганяючы з твару ўсмешку, абагнуў Міротнікава і пайшоў сваёю дарогаю, выглядаючы бярэзіны, каб пазней, як пагрубее лісце, навязаць на зіму венікаў.

Калі ён вярнуўся, сонца, стухаючы, садзілася за ружавата-дымныя вольхі на Глубцы. Яно было круглае, бы яго нехта, акуратны, абтачыў з усіх бакоў ці сцяў у абруч, — спакойная, мяккая чырвань зусім не сляпіла вочы, разлівалася на лузе неназойлівай, вадзяніста-ружоваю светласцю. У паветры яшчэ вісела млявасць, але адчувалася — у зусім блізкім часе яна ападзе на зямлю расою, асвяжыць кусты і дрэвы, звялую на ўзлобках траву, скрозь якую свіціцца белы, што вапна, пясок. Каля Сажа ажывіліся надвечар гранкі, як называюць тут ластавак-берагавушак, — чуваць было іх змяшанае, густое цывіўканне.

Госці, аказваецца, вынеслі сталы вонкі і цяпер сядзелі ўкруг іх — вясёлыя і ўсё такія жвавыя, бы тыя матылькі, што напырхаліся ўдзень каля кветак, а ўвечары ім заманулася пагарэзнічаць. Згледзеўшы Грышку, госці замахалі яму рукамі, падзываючы да сябе, і ён нехаця падышоў, але сядаць не спяшаўся, хоць яму і выслабанілі месца за сталом — акурат каля хлопчыка, перад якім стаяў сподак з кавалкам смажанай рыбы.

— Штрафную дзеду! — крыкнуў ружовы, як макаў цвет, бліскучы ад поту пузан і падняў высока над галавою поўную чарку; не дакрануўшыся губ, выліў яе ў рот.

Грышку налілі ў шклянку, падалі ў рукі; ужо як стаў піць — каб адкаснуліся, не назалялі, — убачыў, што шклянка нячыстая, у чырвоных плямах і дробненькіх, як блошкі, жоўтых бубачках. Няўжо тая, у якую Міротнікаў збіраў суніцы? А якая ж — яшчэ сумнявацца... Хлопчык ягады паеў, а шклянку паставіў каля сябе, і ў яе без разбору бухнулі гарэлкі. Грышка не гідзіўся шклянкі, не такі ўжо ён, вясковы чалавек, чыстаплюй,

але яго здзівіла такое супадзенне — што са шклянкі, у якую Міротнікаў браў суніцы, яму выпала піць — акурат знак нейкі, — ды яшчэ зачапіла за жывое гэта пузанова «дзеду». Няўжо і праўда ён такі стары? Канешне, столькі апошнім часам перажыў — не дзіва, што асунуўся, змарнеў і пасівеў, мабыць, яшчэ гусцей. Нераўня, канешне, гэтаму пузану, што толькі і дбае, як тлушч сагнаць. У плуг бы яго ды поле араць — дзе што і падзелася б. Такіх пузаноў, прымеціў Грышка, апошнім часам развялося вельмі шмат — пыхцяць у магазінах, на прыпынках і ў аўтобусах, у кабінетах і проста на дарогах, абліваюцца потам, знемагаюць ад смагі і сонца; а дарвуцца да піўнога ларка — пару куфляў заліваюць адным махам, не адрываючыся, толькі вушкі, як у кратоў маленькія, ходарам ходзяць.

На Грышку, здаецца, госці ўжо не зважалі, гамапілі між сабою, мужчыны прысільвалі жанчын піць, тыя прытворна аднекваліся, але чаркі не адстаўлялі і ўрэшце памалу выцэджвалі іх. Адзін з застольнікаў, мабыць, блізарукі ці ўжо добра падпіў, узяў са стала бутэльку і, думаючы, што яна пустая, шубнуў яе цераз галаву за спіну. Бутэлька аказалася, як нехта агледзеў, непачатаю, нават неадкаркаванаю, і ўсе дружна ахнулі, выдыхнуўшы з грудзей: «Во-о-ой-й!..» Няўдаліца-застольнік, сцяміўшы нарэшце, што да чаго, вінавата заўхмыляўся і ляпнуў па плячы Міротнікава, які падвярнуўся пад руку, тузануў:

— А, таварыш дарагі?..

Міротнікаў матлянуўся ў цемень; сагнуўшыся, стаў выглядаць на зямлі бутэльку. Застолле заціхла, як вымерла. Міротнікаў між тым прыступіўся на калені, поўзаў, пляскаючы далонямі па траве, — бутэлька, мабыць, слізганула некуды пад куст.

— Во, цэлая!.. — з дужаю радасцю нарэшце ўсклікнуў Міротнікаў і падняў над галавою бутэльку — мокрую ад расы, у пяску. Ён падышоў, аддаў бутэльку і стаяў, перамінаючыся з нагі на нагу, як дзіця, хоць было пагладзь яго па галоўцы ці дай цукерку.

Грышка ўсёй гэтай сцэны не бачыў, бо трошкі раней, улучыўшы момант, як вылазіў з-за стала хлопчык, яго сусед, таксама ўстаў, украдкаю паклаўшы ля сподка кусанік хлеба. Хлопчык, мусіць, ужо добра прыгледзеўся да Грышкі і, не знайшоўшы ў ім нічога небяспечнага для сябе, цяпер, здаецца, гатовы быў завязаць з ім

дружбу. Грышка спытаў у хлопчыка, як яго завуць, і той назваўся Русланчыкам.

Русланчык хутка асвойтаўся; папрасіў Грышку пакатаць яго на машыне, бо, па-першае, сам не можа, а па-другое, у цемнаце страшна. Грышка спярша разгубіўся: ці не палічаць яго за дзівака, калі ён, стары пень, будзе цягаць за вяровачку дзіцячую машыну. Але падумаў-падумаў і не ўбачыў нічога брыдкага ў тым, што павозіць малога; больш таго — ён адчуў, як усярodку азвалася туга, што раней прыцішана, ды чуйна драмала, а цяпер заявіла ўсёй дужасцю, — ён сам ужо, калі б было ладна-складна з дзецьмі, мог мець унукаў, забаўляцца з імі, няньчыць — Ленка неяк пісала, што — цяжарная, і ў іх з Лісаветкаю скрозь перажыванні прабівалася тады-сяды свежая радасць, пакуль не прыйшло другое пісьмо — «памылілася, усё ў парадку». Хто ведае, як яно там, — можа, проста вызвалілася? І ў Грышкі раптам паднялася з грудзей такая шалёная злосць, што ён з сілаю тузануў машыну, аж хіснуўся ў ёй Русланчык, але сумеўся, бо хлопчык быў тут ні пры чым, ва ўсім вінаваты толькі ён сам, адзін ён, і болей ніхто, можа, яшчэ — Лісаветка. Але Грышка быў не з тых людзей, што ў грахах умеюць вінаваціць увесь свет, толькі не сябе, і замест таго, каб пачаць шукаць загаданы з сябе, упарта, зацінліва, як той дурны вол, шукаюць іх ва ўсіх астатніх, таму ён гатовы быў узяць на сябе і нават жончыну віну: «Баба, што з яе возьмеш?» Проста вось так, па сваёй волі ўзяць, каб несці яе цяжар на сваіх плячах.

Двор быў прасторны, і Грышка меў дзе развярнуцца — спярша павёз Русланчыка паўз плот, далей ад людскіх вачэй, у цемнату, але яго і там заўважылі, запляскалі ў ладкі і закрычалі «брава», і тады ён — ужо, як кажуць, усё роўна — падагнаў сябе на трух. Хуткая язда Русланчыку спадабалася, ён загікаў на Грышку, як на каня, замахаў вырванай на хаду травінаю; соўгаў ножкамі так, што толькі белыя каленькі, бы зайцавы вушы, мільгалі абапал руля.

Грышка, разахвоціўшыся, абдаў яшчэ адзін круг вакол сталоў — намарач нейкая найшла на яго, ці што, можа, галоднаму, гарэлка ўдарыла ў галаву, але ён так стараўся, аж кроплі поту пасыпаліся з сівых скронь, узяла задышка, ды Русланчык гэтага не мог бачыць — азарт засціў перад ім свет, — і ён паганяў і паганяў

травінаю Грышку, з твару якога не сыходзіла нейкая невыразная, як дзікунская, усмешка... Грышка і не прымеціў, як з-за стала выбавілася жанчына і цяпер ішла да яго.

— Дзякуй вам вялікае!.. — сказала яна харошым, расчуленым голасам, падышоўшы, і працягнула Грышку руку. Ён тузануўся, думаючы, што жанчына хоча яму проста пацiснуць у знак аддзякі руку, але яна трымала паперку — дзесяць рублёў; вочы ў яе былі спакойныя, ветлівыя і без меры ўдзячныя. — Вазьміце, вазьміце, калі ласка...

Грышка стаяў, як апараны кіпетнем, моргаў вачыма, не цямячы, што і за што. І за нейкае імгненне не знайшоўшы, што адказаць, паволі адвярнуўся, выпускаючы з рук вяровачку ад машыны. Але жанчына заступіла яму наперад, і з яе рукі цьмяна адсвечвала дзесятка — ужо блізка ў Грышкі перад вачыма.

— За што?.. — спытаў ён сухавата, баючыся быць грубым і чуючы, як у скронях нездарова пульсуе кроў. Жанчына маўчала, з вачыма, поўнымі здзіўлення, і цярпліва чакала, пакуль у чалавека перад ёю мінецца, як ёй здавалася ўсур'ёз, дзіцячы капрыз. — Не зневажайце мяне, жэншчына, — сказаў ён дрыготкім ад узрушанасці голасам, але толькі позірк, якім асмеліўся нарэшце глянуць жанчыне ў вочы, сказаў ёй, чаму ён, Грышка, упарціцца.

А застолле тым часам гуло, смяялася, во і песню зацягнулі — пад гармонь, на якой, мусіць, іграў Міротнікаў — няўмела і бязладна.

Пусть бегут неуклюже
Пешеходы по лужам,
А вода по асфальту реко-о-ой!..
И неясно прохожим
В этот день непогожий,
Почему я веселый тако-о-ой...

Госці весяліліся і не ведалі, як не ведаў і Грышка Пруцікаў, маленькі чалавечак на зямлі, што ў 19 гадзін 56 мінут па маскоўскім часе ў Савецкім Саюзе з аэрадрома Байканур стартаваў новы касмічны карабель з міжнародным экіпажам на борце — пра гэта аб'явілі ў самым пачатку праграмы «Час», і сэрцы мільёнаў людзей, якія гэтаю парою сядзелі каля тэлевізараў, перапаўняў бязмежны гонар за нашу краіну, яе росквіт і

моц. Ім бы, гасцям, зараз гэту навіну ў вушы — якія б тосты гучалі, колькі слоў, узнёслых і высокіх, было б сказана ў шчырым запале, як бы радасць іх набыла касмічныя памеры. Але ў доме рыбака гэтым вечарам тэлевізар, у мітусні не выключаны, высвечваў адно процілеглую сцяну, запаўняючы пакой мёртвым, халодным блакітам. Што ж, так накавана ім было сёння — апошнімі даведацца пра падзею сусветнага значэння; няхай не крыўдуюць добрыя людзі, бо ў жыцці яно ўсягды так: нешта знаходзіш, а нешта — губляеш.

Угаманіліся госці позна, бо святло на іх і на сталы падала ад лямпачкі, што была ўкручана пад стрэшкаю ганка. Усталі няспешна і пайшлі, нічога не прыбраўшы. Грышку ані слова не сказалі, але куды ўжо яму дахаты перціся. Позна. Перакантуецца ночку як-небудзь тут, а ўранні, тады, як госці паедуць, упарадчыць трохі што ды прымкне дом.

Грышка патупаў-пахадзіў па двары, скружыў вакол лазні. Недзе на далёкім, мусіць, дабранскім полі манатонна тарахцеў трактар, можа, і Марчанкоў — хто ведае; а што — пралупіўся ўжо і сеў за руль: у вясковай шафярні так водзіцца. Брахалі сабакі, але нязлосна, пэўна, услед некаму свайму, вясковаму. Груба чамусьці было на душы, хацелася спакою, пабыць аднаму, калі, можа, лягчэй не становіцца, затое ніхто не злякае думкі, не замінае ўздыхаць. І ён павярнуў да Сажа, але не прама ад дома, святло з вокнаў якога нязвыкла-вычварна выскубвала з цемры камлі і нізкія галіны дрэў, а збочыў, мяркуючы спусціцца з гары там, дзе ганяюць кароў. Ён ішоў, ніца апусціўшы галаву, і таму аж здрыгануўся, калі ў вочы неяк мякка, бы пер'ем, аддало светласцю, — колькі імгненняў ён стаяў атарапела, не цямячы, што і адкуль. Адно потым здаўмеўся, што свеціцца гнілы пень і пацяруха вакол яго — мабыць, надзяўбаная жаўною; з цёмнага марыва ночы глядзелі на яго трапяткія, матавыя агеньчыкі — вочы трутавіка, якому дождж выклапатаў вось такую латву, разбудзіў да жыцця. Грышка падняў гнілушку, патрымаў на далоні гэты халодны блакітны вугалёк і кінуў у траву, бо ён пачынаў ужо стухаць.

Каля Сажа цемра была не такая густая, як у лесе, і Грышка зразу напароўся на вялікую, бы мядзведзь, дубовую калоду-туніну, што некалі ляжала ў вадзе і, помніць Грышка, была дзіўна аранжавая на колер, а ця-

пер, ужо гады са тры, як памялеў Сож, апынулася на беразе. Ён сеў на яе, закурыў; глядзеў на зоркі, што адлюстроўваліся ў Сажы; ад шчарбатага месіка наўскасы праз усю раку слалася жоўтая дарожка, дрыжала ад лёгкага зыбу вады, як расплаўлены алюміній, з якога зразу пасля вайны вылівалі лыжкі ды міскі — недзе ў кладоўцы Грышка яшчэ зберагае гэты пасудак як памяць пра тую цяжкую пару, як сведку людской трываласці. На тым беразе, дзе ў шэрым тумане драмалі, нахалоджаныя расою, кусты лазняку, над якімі зданьліва цямнеліся шапкі дубоў, яра, не заціхаючы ні на мінуту, трэнкаў драч, а можа, іх было там некалькі і яны азываліся напераменку.

Заканапачаныя гэтым драчыным пярэгаласам, Грышкавы вушы не зразу ўлавілі за спінаю шорганне крокаў — нехта ішоў смела, не крадучыся, і Грышка не павярнуўся нават.

— Не спіцца, Мацвеевіч? — Падышоў Міротнікаў — у пінжаку наапашкі, з расхінутым каўняром белай кашулі. — Я таксама не ўлежаў, хоць і на верандзе... Такую віскатню-піскатню госці ўстроілі, як мышы тыя. Акурат ім па дваццаць гадоў...

Міротнікаў сеў побач з Грышкам — локаць у локаць. Грышка зацята смактаў папяросу, раз ад разу асвятляючы твар калінаваю чырванню, і тады былі відаць яго вочы, што глядзелі ўперад з упартаю нерухомасцю, тонкі нервовы нос. Кінуў недакурак ад сябе на ваду, і ён неяк ядавіта пшыкнуў у царстве гарлачыкаў. Грышка ўздыхнуў, а можа, проста выпусціў астаткі дыму. Міротнікаў паварушыўся, пагмыкаў, ачышчаючы горла і паказваючы, што гатовы на размову.

— Ты не крыўдуеш на мяне, Мацвеевіч? — зняцяйкі спытаў, прама гледзячы на ваду, голасам, новым для Грышкі, бо не было ў ім звыклай начальніцкай закамянеласці, як і не было гальштука на шыі, што Грышка таксама бачыў упершыню.

— А што крыўдаваць? — Грышка выпраставу нагу, і яна, бы макароніна, хруснула ў калене, — ён сказаў гэта з такою апушчанасцю ў голасе, акурат здаўна было ясна: крыўдуй не крыўдуй — дзела не паправіш; а яшчэ таілася на душы ў Грышкі думка — што не тых ён гадоў, калі можна капрызамі сваімі некаму сагразіць, напрасіцца на спагаду.

— Ёсць за што... — сказаў Міротнікаў і ўздыхнуў. Грышку, бадай, здзівіла, што старшыня райсаюза быццам прыйшоў да яго з пакаяннем. — Я вось падумаў: каму ўсё гэта трэба — нашы прэтэнзіі, дамаганні... Урэшце, мы ўсе людзі, і ўсіх нас чакае адзін канец, як кажуць, адна магіла прыгорне... — Міротнікаў, няйнакш, задумаў нейкую малітоўную споведзь. — А ў жыцці — мы? Ого-го, трымаем марку, гонар, баімся ўраўняць сябе з іншымі. Куды там! Карона з галавы ўпадзе. Лухта ўсё гэта несусветная!.. Я сёння на гасцей, начальства свае паглядзеў, і горка мне стала. Тады я, Мацвеевіч, і падумаў... вось павер, цюкнула ў галаву — што, можа, і ад мяне каму-небудзь спакою няма, не саладка жывецца ад майго інтрыганства... ёсць такое слова. Думаў, займаю пасаду, дык цар і бог, аж не — бачу... — Міротнікаў нечакана асекся, бы спахапіўся, што перабраў меру, лішняе сказаў, — нязвыкла яму было сыходзіць з нябёс на грэшную зямлю і бачыць сябе простым чалавекам і такім жа смяротным, як усе людзі. Падточваў яго ўсё ж прывучаны да прыволля ў душы чарвячок самалюбства, і ажно страшна было: а раптам пасля гэтага прызнання можа рухнуць увесь свет, развеяўшы яго, Міротнікава, у пыл, які разнясе вецер і не застанецца ані следу. — Мы ўсе, скажу табе, Мацвеевіч, з аднога цеста і звязаны адзін з адным, як і куды б ні пнуліся — у старшыні, у дырэктары...

Грышку такі напышлівы, складны говар Міротнікава, здаецца, пачаў надакучваць ды «нярвіраваць», і не толькі таму, што нічагуткі амаль не цяміў у ім, а яшчэ і таму, што не любіў ён, калі пачыналі хныкаць перад ім людзі, у якіх усё ў руках і нават дадзена права камандаваць іншымі, — ён, Грышка, станавіўся тады няскрутлівым, няўломным, як той вунь дуб на далёкім беразе. Было такое ўжо з ім аднаго разу, яшчэ па маладосці, як з шахтаў вярнуўся, — калі заеўся ён са старшынёю калгаса Родчанкам. Яны, старшыні, мяняліся ў тыя гады часцей, чымся ў цыгана коні, — Грышку спадабаліся пачутыя ад жонкі словы. Гэтага, Родчанку, малінаўцы зразу ахрысцілі Мялляньскам — за драбнату і маленькі рост. Такім некалі быў іх аднавясковец Мяллян, чыё імя стала хадзячаю назваю — у кожнай вёсцы на Беларусі ёсць такія імёны, якія служаць трапным знакам чалавеку або яго паводзінам і якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

...Да прыбіральшчыцы Чубатчыхі Алёны, кабеты з чырвоным, трохі калмыкаватым, а таму і нязвыклым тварам, у Родчанкі прыдзірак ніколі да сённяга не было. Яна да пылінкі вылізвала падлогу, акуратна палівала вазоны з кветкамі, і яны буялі пышнай крамянай зелянінаю, не тое, што нейкая там бульба ці кукуруза ў полі, куды не дапрасіцца ў неба дажджу; стол у яе ўсягды люстрана зіхацеў, акурат і шыбкі вокан, якія яна мокрай анучаю, а ўслед паперою працірала штораніцы. Любата, адно задавальненне прайсціся па такім кабінеце — чыстаю дарожкаю, пасланаю ад дзвярэй да стала, а то і проста па масніцах, чуючы яблычна-хрусткі рып новых туфляў.

Калі шчыра, дык, можа, і не Чубатчыха вінавата, што з самага рання ў Родчанкі збаламуціўся настрой, можа, проста яму трэба было на некім вымесціць злосць, і ўжо нейкая заведзеная спружынка даўно раскручвалася ў ім, аж пакуль зусім не сышла, і тады... І тады яму здалося, што дарожка паслана няроўна і не стыкаецца краем з парогам. Ён выглянуў на вуліцу, каб знайсці там і адчытаць Чубатчыху, але той нідзе не было — дзіва што, будзе сядзець яна, калі плойма дзяцей у хаце зяўлае.

Ну, клопат, урэшце, Родчанка — чалавек мяккі і памяркоўны да тых, хто не лезе яму ў вочы. Вось іменна — не лезе! Ён сеў за стол, дастаў з шуфлядкі паперы — астатнія зводкі па ўраджайнасці. Кепскія, канешне, справы, таварыш старшыня! Жыта шэсць цэнтнераў з гектара ледзь-ледзь набягае... Як ставілі за старшыню (ён тады ў насеннай інспекцыі рабіў), гаварылі ў райкоме партыі — слабы калгас, ставіць на ногі трэба. Што праўда, то праўда: куды ні кінься — на поле, ферму, — галава кругам. А што рабіць? Іншыя давялі, як кажуць, да ручкі, а яму цяпер падымай? Да яго не знайшлося гаспадара, выходзіць; і ён жа не дамадзей які-небудзь, таксама перадавы чалавек...

У адчаі, які, можа, мала знешне праяўляўся, бо калі б ён быў нават і вельмі вялікі, то ўсё адно на такім драбку, як Родчанка, не надта б яго ўбачыў, дык вось, у адчаі Родчанка і не пачуў, як у кабінет зайшоў чалавек. Гэта быў Грышка Пруцікаў, трактарыст. Стаяў каля парога ў рабочым камбінезоне, але з яшчэ чыстымі рукамі і тварам — мабыць, едучы ў поле, прыпыніў трактар і забег. Можа, адпрасіцца куды хоча ці давед-

ку якую, ды мала што — Родчанку іншы раз так абрыдзеюць такія вось, ён лічыў, дробязныя тузанні, што кідае ўсё, залучае каго-небудзь з прыбліжаных — і ў кусты, а там ужо, сам бог сведка, без гарэліцы і прыволле не прыволле.

Родчанка маўчаў, маўчаў і Грышка, думаючы, што старшыня надта заняты, і чакаючы, калі той абзавецца.

— Гавары, што ў цябе? — сказаў нарэшце Родчанка, не адрываючы вачэй ад папер, што шалясцелі ад ветру, які дзьмуў з адчыненай фортачкі.

— Вы ўжо даруйце, што позна прыстукаўся, але во што...

Родчанка ўскінуў галаву і насцярожыўся сваімі жаўтаватымі быстрымі вачыма — за час яго старшынёўства гаворку з ім вось так, каб зразу каяцца, здаецца, яшчэ ніхто з людзей не пачынаў. Што ж такое? Няўжо мужык так крэпенька правініўся? Але падазрэнне гэта пачало развейвацца, а яго месца заступаць трывога, калі Пруцікаў стаў расказваць... Быццам ноччу, пераніцоўваючы ў Панітоўшчыне ржышча, ён бачыў, як да сціртаў пад'ехалі бартавыя (ды яшчэ са стойкамі!) машыны, навалілі пад неба саломы і цяжка, акурат паросныя свінні, пакалываліся на шашу, і толькі тады во цюкнула яму, Пруцікаву, у галаў, што не ў калгаснае гумно яны патарабанілі саломку, а некуды, ліха іх, набок, і па тым, з якою смеласцю гэтыя начныя людзі ўвіхаліся, відаць — за спінаю ў іх, няйнакш, нейкая важная шышка.

Во чорт! Гэта ён, Родчанка, дазволіў дырэктару райбыткамбіната ўзяць пару машын травяністае саломы, а той, са свайго боку, пакляўся хутка зрабіць рамы і дзверы на асабняк. Яго выкрутлівы розум тут жа пачаў шукаць выйсце, хаця, канешне, нічога яшчэ не пагражала. Ну, падумаеш, нейкі трактарыст злодзеяў асачыў. А можа, гэта зусім і не злодзеі — хто дакажа? Міліцыя, як відаць, не спыніла. Дый не за мяжу яе, салому, павезлі, а нашым людзям. Але тым не менш гэта быў сігнал — што трэба болей асцярожнасці яму, а то і ўліпнуць можна, як тая муха (ён глянуў спадылба на рудую ліпучку, што вісела пад столлю). Ды, на яго бяду, гэтым візітам не скончылася, хаця, здавалася, Родчанка і павёў сваю крутню-мутню з аглядкаю, на цвярозую галаву.

Гэты раз той жа Пруцікаў запаймаў яго на трактар-

ным стане. «Ну і ўедзіна!..» — Родчанка хацеў адмахнуцца, але Пруцікаў не адставаў. Дзікаю сілаю волі ён прымусіў сябе супыніцца і слухаць, калупаючы наском туфля прапахлы мазутам гарачы, як прысак, пясок.

— Пайшоў ета я ў грыбы, у калгасны лес, — стаў, заікаючыся, гаварыць Пруцікаў, паглядваючы на старшыню, — і на незнаёмых мужчын напаў... Валяць сосны, ды самыя тоўстыя, самыя гонкія, — падаюць, аж звіняць, што косы. Вот... Я пробаваў пытацца, адкуль ды што, але бачу, невясёлы народ етыя лесарубы, не рады яны мне... І словы неяк дзіўна картавяць, не панашаму гавораць, значыцца, таго і глядзі, каторы тапаром замахнецца....

Тут Родчанка не сцярпеў ужо, ускіпеў — пры ўсіх:

— Што за кантралёр такі знайшоўся, га? Кажу табе, Пруцікаў: не сунь носа не ў сваё проса! Адцяпаюць!..

Як знаць было, Пруцікаў яго пагрозы не надта спалохаўся — саступаць не думаў. І, мабыць, не столькі з-за свае маладое ўпартасці, колькі з-за ўпэўненасці, нейкай дурной, казлінай упэўненасці, што правільна, упраўна робіць. Яму што — мірна жыць не хочацца? Дзівак, чэснае слова! Дзярэцца, як тая жаба на карчы, шахцёрышка задрыпаны.

Родчанка кіпеў недарма. Ціхачом ён будаваў у горадзе асабняк. Гледзячы, як кажуць, далей носа, ён разумеў, што не векаваць яму ў старшынях. Але, думаў ён, асланіўшы сябе з усіх бакоў хаўруснікамі-сябрамі, будзе потым адчуваць сябе ў трывалай крэпасці іх ласкі і адплаты. Тут, трэба сказаць, Родчанку здрадзіла самаўпэўненасць, бо так званыя сябры калі і кляліся яму ўсё жыццё спрыяць, то адно таму, што ён асядлаў крэсла старшыні, у мяккай раскошы якога было ўтульна і ім, а не таму, што знаходзілі з Родчанкам нейкае душэўнае паразуменне, — словам, яны былі шчырымі дзецьмі таго круга людзей, якіх збірае да кучы выгада.

Пруцікаў, канешне, пра ўсё гэта не думаў і таму, можа, нават неўпрыцям сабе, стаў Родчанку перак дарогі, ён гэта зразу адчуў. А калі старшыня зразумеў, што Пруцікаву проста так язык не прышчэміш, наважыўся на крайнасць — выкурыць яго з калгаса, балазе ён уладыка, у ягоных руках тэхніка, зямля, грошы і... вера ва ўласную непагрэшнасць — можа, і ёсць чым прыціснуць.

Грышка Пруцікаў, канешне, павек-вякоў не паддаўся б Родчанку, дудкі б яго чым узяў: галоўнае — рукі, а іх языком не звяжаш — кароткі, калі б Родчанка не зачапіў за душу, — на кожным сходзе пачаў бэсціць Грышку, маўляў, гультаяваты, пасля яго агрэхаў шмат на полі, карацей — зрабіў з Грышкі Пруцікава зусім нягоднага трактарыста, нікудышніка. Грышка, яснае дзела, не анёл з крыллікамі, можа, дзе і схібіў — жывы ж чалавек, як кажуць, — але каб такое слухаць... Людзі, вядома, бачылі, што перагінае палку старшыня, але каму хочацца лезці на ражон з начальнікам — ніхто не заступіўся, праўда, можа, хто-кольвек паспачуваў у душы, аднак усё-ткі былі і такія, каго суталка Грышкі са старшынёю радавала, — іх, гэтых людзей, іначай, чымся няўдачнікамі ў жыцці, не назавеш, і, зрэшты, няўдзячная іх доля — сплываць з зямлі чорнаю смалою зайздрасці.

Грышку баданула іменна вось гэтае — нягодны трактарыст, — і ён, як гэта амаль усягды бывае з чыстымі перад сабою людзьмі, якіх у нечым недаацанілі, несправядліва зганілі, адчаяўся на смелы ход — кінуў калгас і папрасіўся ў «Сельгастэхніку» — спярша раманцёрам, потым сеў на бульдозер; зімою расчышчаў заносы на шашы і дарогах, вясною і ўлетку, падчапіўшы коўш, грузіў на машыны і трактары торф... Няўрымста распякае чалавека, пэўна, тады, калі ён не згодны з думкаю іншых і не задаволены тым, што зрабілі да яго, — гэта, канешне, больш усякіх артыстаў ды пісьменнікаў кранае, але і Грышка адчуваў нешта падобнае: незразумелая сіла ўлілася ў яго — не вылазіў з кабіны мала не суткамі, адно, што шкодзіла яму, дык гэта дарога — няпроста было дабірацца з лясной Малінаўкі (пазней, у 70-х гадах, такія вёскі назавуць неперспектыўнымі) у раён: зрэдку, калі дазваляў механік, гробся дахаты на сваёй «чарапасе»-бульдозеры, а часцей — лавіў спадарожную, бо мінскі аўтобус, які ішоў з Крычава акурат па часе, на малінаўскай паваротцы супыняўся адно тады, калі нехта з яго вылазіў, і то не ўсягды браў — як вадзіцель: добры чалавек — падвозіў, які-небудзь хамула перад самым носам бразгаў дзвярыма.

...Тая зіма абрынула на зямлю шмат снегу, нават старажылы не помнілі, калі яшчэ такое было; сумёты

ляжалі нароўні з стрэхамі, пахавалі пад сабою нізкія прыбудоўкі, парканы, і толькі самы высокі частакол тырчаў там-сям вяршковымі дзюбачкамі, здалёк падобнымі на ланцужок слядоў. Яна, тая зіма, і прынесла бяду. Магілёўская зямля — пясочак ды лясочак, яе не ўпоіш: вада прасочваецца, як праз сіта, а на Палессі, дзе дрыгва ды багны, вада паднялася і пайшла... Зносіла стагі сена, якія не паспелі за зіму звезці, размывала капцы бульбы на палях, крышыла лёгка, бы цацачныя, масты і слупы, затапляла пагрябы і сіласныя ямы... Гінула скаціна, звяры ў лугах і балотах; людзі ратаваліся на стрэхах дамоў, у лодках і доўбленках пераплывалі вуліцу, а той-сёй умудраўся і кабанчыка ці авечку ў лодку зацягнуць — тады віскатні, тарараму было на ўсё ваколле.

Раней, калі кожны жыў сам сабе, такога зладу ў людзей, мабыць, не было, але цяпер на падсоб палешукам падняліся ўсе: трактары, машыны, катэры, маторкі з усіх канцоў, як мурашы да свайго стажка, узялі кірунак на Палессе. І Грышкаў бульдозер — таксама: парторг, вясёлы хлопец, Грышку не ўгаворваў, адно намякнуў і здзівіўся, як у стомленага чалавека ў замасленым камбінезоне загарэліся вочы, а сам ён напяўся, акурат для скачка. Двое сутак Грышка тарахцеў на сваёй «чарапасе» ў Столінскі раён, аж пад Давыд-Гарадок, дзе вар'явала-шалела Гарынь, — перакусваў на хаду, разгарнуўшы побач на сядзенні газету з хлебам і салам; курыў рэдка, але цыгаркі згортваў па таўкачу.

Такое Грышку адкрылася ўпершыню — мора ён не бачыў, і яму неверагодна дзікай падалася прастора вады. Як сцягнуць вокам — вада, вада... І на ёй, аж да небакраю, — чорныя астраўкі будынін, хмызняку і дрэў, паўзверх якіх з моташным крыкам насіліся-куляліся птушкі — дробныя і вялікія, белыя і чорныя... Тудысюды шнуравалі катэры; раўлі, шукаючы пад вадою дарогу, трактары; звінелі, як струны, тросы, лопаліся — лёгка, без трэску, бы перапаленыя ніткі.

Усякага, канешне, люду сабралася — адчайнага і менш адчайнага, але, як зазвычай бывае ў суматоху, той-сёй разгубіўся, калі мужчына ў штармоўцы, з-пад якой віднеліся белая сарочка і гальштук, у гумавых ботах з даўгімі падкасанымі халявамі, прыплыўшы на маторцы, сказаў, што трэба адвесці (націснуў: «неотложно») ваду, інакш праз пару мінут яна затопіць ферму,

і ў канцы дадаў: «Дело, дорогие товарищи, как видите, рискованное». Грышка адчуў, як душу зварухнуў забыты ад вайны халадок, калі даводзілася не раз чуць нешта падобнае, і яму чамусьці стала сорамна — можа, таму, што на нейкае імгненне засумняваўся, вызвацца яму першым ці пачакаць, пакуль гэта зробяць іншыя.

Ферма стаяла за вёскаю ў спадзіне, яе з аднаго боку затуляў невысокі сасоннік, а з процілеглага — высокі, круты ўзлобак, да якога прытыкалася гравійка; вада, падымаючыся, пагражала хлынуць праз гэтую гравійку — да фермы; можна скіраваць ваду за ўзлобак, тады яна знойдзе сабе волю на лугавіне; але для гэтага трэба прарэзаць ва ўзлобку гарлавіну — яе прарэзаць можна было адно падабраўшыся з тыльнага боку ўзлобка, і рызыка ў тым, што вада, знайшоўшы ход, усім сваім напорам ударыць у бульдозер — калі не разлічыш і не паспееш адкаціцца назад у тое імгненне, як будзе яшчэ заставацца маленечкі перашыек некранутае зямлі між гарлавінаю і вадою.

Грышка ацаніў і прадумаў усё гэта вельмі хутка; страявым крокам падышоў да чалавека ў штармоўцы, які па-ранейшаму не вылазіў з маторкі, стаяў і ківаўся ў такт хвалям, што біліся ў борт.

— У тебя, товарищ, бульдозер? — спытаў чалавек.

— Так точна! — адказаў Грышка па-салдацку, зусім не жартуючы, бо адчуваў, што рухі пачынае скоўваць тая сабранасць, з якою адыходзіў некалі на баявое заданне.

— Попытайтесь, — дазволіў чалавек. Відаць, гэта быў нейкі начальнік, якому даручылі быць камандзірам у барацьбе з паводкаю, — на гэта паказвалі ягоны сур'ёзны, строгі голас і ўменне распараджацца; адзенне таксама, канешне.

Грышка сеў за рычагі, крута развярнуў бульдозер, згарнуўшы гусеніцамі ў кучу гразь, — паехаў: ручнічком дарога! Усе бачылі, як ён збочыў з гравійкі на ўзлобак, паддаў газу, пусціўшы ўверх чорны дым, у які на нейкае імгненне трапіла варона, што павольна пралятала міма; праз нейкую паўсотню метраў бульдозер нырнуў за ўзлобак, акурат кульнуўся ў прорву; пачуўся натужны роў матора — мабыць, нож уклініўся ў зямлю і цяпер раздзіраў яе, рассоўваў на бакі. Кабіна над узлобкам яшчэ не вытыркалася, і таму ніхто не мог бачыць, што твар у Грышкі быў спакойны і зася-

роджаны; ад таго, што напружваў рукі і пільна, да болю ў вачах углядаўся, на шчоках хадзілі жаўлакі, а лоб пакрыўся дробным выпатам. Грышка ў гэты час ні аб чым не думаў, сцяўшыся, глядзеў на ўзлобак, за якім злою сілаю прытаілася вада. Вада... Якая яна ўсягды ласкавая, жаданая, надта пасля дарожнай пылюкі, а цяпер вось — небяспечная, падбірайся да яе, як да ворага. Грышка аж здрыгануўся ад думкі, што зняцяйкі іголкаю кальнула пад рэбры: «А што — калі?..» Не за сябе спалохаўся, дома ў яго засталіся сын і дачка — адзін пад адзін, зусім малыя, і бязбацькавічамі ім расці будзе вельмі ж не соладка. Грышка раптам уявіў іх яшчэ слабенькіх, бяспомачных, як толькі нарадзіліся, — зморшчаныя, смуглыя, з няцямлівымі, пад пухлымі вочкамі; адно тыдні праз два тварыкі пасвятлелі, гэтак жа, як і галоўкі, ды ўсё роўна было знаць, што валасы будуць кучаравіцца, а вочкі, спярша ў абаіх сінія, у Лены неўзабаве пацямнелі, а ў Мішуткі, здаецца, і застануцца сінімі, акурат у яго, Грышкі...

Грышка разумеў, што расчульвацца зараз зусім-зусім не варта — гэта пашкодзіць яму, адбярэ пільнасць, без якой наўрад ці зможа асцярожна зрэзаць узлобак, — і ён стараўся, як мог, адганяў ад сябе гэту здрадлівую думку... І тут нечакана ўбачыў белую чайку, яна зусім блізка праляцела каля бульдозера; схіліўшы чорную галаву, глядзела ўніз — здалося, проста ў кабіну, — акурат пыталася: «Чалавеча, над чым гаруеш — такое вакол прыволле?» Грышка не ўсачыў, як думка выскачыла з яго галавы, і болей не варочалася, быццам чайка, падчапіўшы яе крылом, як павучыну, знесла наўсягды.

Грышка перахітрыў ваду — тады, як засталося, можа, адзін раз штурхануць бульдозерам, ён выехаў з прарытае ім гарлавіны, зноў узгробся на ўзлобак і скрышыў нажом перашыек зямлі. Вада рэзка ўдарыла ў праход — і белы ад пены язык, крута расплываючыся, папоўз на лугавіну...

Тым часам, як Грышка змагаўся з вадою, на гравійку апусціўся верталёт; з яго вылезла некалькі чалавек у даўгіх брызентавых накідках, і цяпер яны кіраваліся да ўзлобка — настрэч бульдозеру. Грышка заглушыў матор і вылез з кабіны. Высокі чалавек (ён ішоў наперадзе усіх) з прыветлівым, дабрадушным тварам, усміхаючыся, падаў Грышку цёплую руку, поціск якой аказаўся

па-мужчынску дужы і надзіва працяглы, нешта яшчэ сказаў, але Грышка, збянтэжыўшыся, не ведаючы, на каго глядзець і каго слухаць, не пачуў. І толькі потым аж увечары, ён дазнаўся ад сяброў-таварышаў, што яго віншаваў сам Пётр Міронавіч Машэраў. А крыху спагадзя пасля гэтых падзей-людзей Грышка прачытаў у газеце Указ: «...за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе са стыхіяй, узнагародзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ПРУЦІКАВА Рыгора Мацвеевіча...»

Тады, помніцца, як з'ездзіў у раён, дзе сакратар райкома партыі прышпіліў яму ордэн, Грышка з радасці кульнуў добрую чарку; радасны, узбуджаны, ён не мог справіцца з пыхаю, што раптам узыгралася ў ім з крутою сілаю, і заявіўся да Родчанкі проста ў кабінет. Родчанка аж адхіснуўся — столькі парыву было ў Грышкі, калі ён пляснуў на стол ордэн.

— Глядзі, сабака, які я нягодны трактарыст!!! — Ні слова больш не сказаўшы, забраў ордэн і павярнуўся спінаю да старшыні; ужо на вуліцы зноў прышпіліў яго на грудзі.

Дзён праз пару Родчанка прыязджаў да Грышкі сам, упрошваў вярнуцца ў калгас, суліў самы лепшы трактар — можа, ордэн прамыў яму вочы ці, хутчэй за ўсё, прыгнала старшыню тое, што ў калгасе не стала хапаць механізатараў; а можа, і зусім падумаў Родчанка, што нейкі Грышка Пруцікаў — пылінка для яго, каб ісці з ім на зацятасць, дрыжаць за свой гонар. Так ці іначай, але Грышка не прыняў старшынёвых упросаў — нават тады, калі ўжо абрыдла ездзіць кожны дзень у горад, ён перавёўся на смалакурню. «Раз я нягодны — нечага да мяне патыкацца!..»

І цяпер, седзячы з Міротнікавым на дубовай туніне плячо ў плячо і з болем прыгадваючы тое даўняе з Родчанкам, Грышка пакутліва думаў, што і праўда яно так: людзі не могуць поразь, рана ці позна стыкаюцца, якія б яны чужыя ні былі, дзе б яны ні рабілі, у якіх бы дамах ні жылі, бо ва ўсіх у іх пад ботамі зямля, як той асінавы злом для розных птушак, мурашоў ды казюлек... Толькі яму не падабалася, што ён як быццам калі не на пакору ды мір ішоў, то ўсё ж утаймоўваў, не распальваў у сабе злосць, ці што, на людзей, якія, ба-

чыў, так яра пнуцца паставіць на сваім — несправядлівым ці нават брудным.

Злаваць — кроў псаваць; і ён проста пагарджаў імі — без крыку і лаянкі, убіваючы сабе ў галаву, што не трэба так, як яны, рабіць самому, іменна яму самому, акурат у ім здаўна жыла вера, што толькі так ён зможа адкалоць сябе ад гэтых людзей. Але — што яго і бадзёрыла — гэта аніяк не было ціхае прымазванне, гэта была ўсё ж барацьба, мабыць, не столькі ім зразуметая, колькі выкрасаная з душы нутраным чуццём, якому ён не мог загадаць, як і не мог кіраваць ім, інačай, думалася, чуццё гэта прытупіцца, сціхне, а то і зусім счэзне. Грышка — нешта яму падказвала, можа, тое загадкавае чуццё — проста бярог сябе, бярог, як ні дзіўна, раздзіраючы-кроячы сваю душу тою няшчаднасцю да сябе, суд якой чысцей за ўсе астатнія чалавечыя вымудры.

Грышка быў рады, што Міротнікаў не зашкодзіў яму пасядзець-паразважаць, успомніць, як і збіраўся, ідучы сюды, на бераг начнога Сажа, можа, нават у нечым памог, зачапіўшы ў душы тое хліпкае, што знябела ледзь-ледзь і задрыжаць якое на поўную сілу мог прымусіць адно чужы дотык. Грышка гатовы быў падзякаваць Міротнікаву, што той пасядзеў з ім, бо ўсё-ткі, як ні кажы, вусцішна аднаму ў цемры глядзець, бы ў рай які, у залатое глыбокае скопішча зорак, ажно кружыць галаву і мроіцца — зараз нейкая чарадзейная сіла падніме цябе і пацягне ў глыбіню, адкуль ужо не будзе звароту назад, а апошняю, факт, мільгне думка: «Як шкада, шкада, хоць плач, разлучацца са светам, людзьмі, так мала зрабіўшы, але і паправіць нічога ўжо нельга...» Раптам у вадзе чырхнула роўная белая палоска, і Грышка з Міротнікавым пераглянуліся — гэта метэарыт, праляцеўшы па небе, адлюстраваўся ў Сажы... А можа, той прышэлец з космасу, пра што цяпер часта пішуць і гавораць? Ды ўсё адно добра, падумаў Грышка, што і Міротнікаў убачыў яе, гэту як адлінееную палоску, — знаць, і ён не проста сядзеў так, а глядзеў у глыбіню, якая, калі доўга на яе глядзіш, усягды наводзіць на сумныя думкі, у якіх часцей за ўсё і родзіцца святы чалавечы боль. Грышка нават не прымеціў, як стала лёгка яму ўсяму, быццам свежасць ад Сажа, ад матавай у расе зямлі, акрамя бадзёрасці, пры-

носіла ў душу святло і яснасць, каб хапіла яму іх не толькі на сённяшні вечар, а і на заўтра, і на паслязаўтра, і на астатнія дні.

...У аўторак машына прывезла Грышку цэлы кузаў бочак. Ён скінуў іх каля двара, а потым памалу перанёс да лазні. Людзі бачылі ўсю гэту мітусню і без лішняй абвесткі зразумелі, што Грышка Пруцікаў адкрывае сваю грыбаварню. Дый грыбны пах, што ўжо некалькі дзён зацята плыў з-за шашы, хваляваў-бударажыў вясковую душу, якая адвеку не была глухою да покліч лесу.

Грышка ўжо даўно закупіў воцату (цэлую скрыню), тры мяшкі солі і ўсякай духмянасці — лаўровага лісту, перцу, гваздзікі; кропу і пятрушкі, дзякуй богу, на градах хоць касою касі — Лісаветка як ні выполвала, каб не заглушалі буракі ды цыбулю, усё адно толку мала.

Вагу з лазні ён выцягнуў з шафёрам, які прывозіў бочкі. Вынес пад навес і скрыню-рашотку, што служыла для прамыўкі грыбоў, і катлы — каб не спатыкацца на іх. Надвечар таго ж дня моцна напаліў у лазні, ды так, што сам памыўся так-сяк, а Лісаветка збаялася духу. Дзіва што — нездарма нажарыў Грышка лазню, аж каменне ды бёрны трашчалі: ён завалок у яе з дзесятак бочак, ашпарыў кіпетнем і, паддаўшы духу столькі, што той кусаўся-пёк, бы чмель, шчытна зачыніў дзверы. Крыху счакаўшы, зноў палез у лазню, чухнуў у духоўку кружкі тры вады — і ходу. Не напёкшы гарачым духам бочкі, ён ніколі не залівае ў іх грыбы — і ад гэтага ці не ад гэтага, але ніводную бочку ў яго не ўзарвала, нават грыб не сапсаваўся.

Назаўтра з самага рання Грышка таптаўся-кружыў каля грыбаварні — у светлай кашулі, чыста выгалены, свежы і быдта памаладзелы; падмятаў, расчышчаў, падбіў глыбей у зямлю дзержакі для катлоў. І ў гэтай завішнасці не прамінаў тады-сяды азірацца на бакі, ці не ідзе хто, ці не нясе грыбы. Здаецца, паўдзённе хутка міне — сонца гарачае, смаліць у твар, хоць не вылазь з цяньку, адно дурніцы мухі як быдта не зважалі ні на што, бзыкалі, ліплі да сцен, цёрлі лапкамі галовы, як той кот перад гасцямі, — пільныя ад неспакою і наця-

тасці, Грышкавы вочы прымячалі нават такое, за што іншым разам яму было б сорамна.

Ён пачуў, як у двары ляпнулі весніцы, і сэрца ў яго апала. *Нехта* нёс грыбы. Ён, заюшаны каля вагі — раўняў яе, соваючы пад ножку камень, — не павярнуўся, але наструнена чакаў — хто паявіцца. Чакаў доўга, але нікога не было — можа, паштарка газеты прынесла, а можа, хто няспешна ішоў, ды засланялі лазня і яблыня пры ёй. Перш, бадай, Грышка пачуў дыханне — цяжкае, перахліпістае, — якое можа быць ці то ў чалавека моцна прастуджанага, ці ў старога. Ён устаў: па сцежцы да яго тупала, сагнуўшыся ў крук, старая Чубатчыха, несла за плячыма стаўбун грыбоў — жоўтая пачопка з вожак упілася ёй як не пад самым горлам. Грышка кінуўся напярэймы.

— Во спасібачка табе, дзетка!.. — з прыдыхам сказала Чубатчыха, калі Грышка зняў з яе плячэй стаўбун. — Чуць даперла... А шчэ нахадзілася, аж ногі рвуць, што сабакі... — Яна была босая; пот блішчаў у маршчынах на шыі і лбе, на скуластыя шчокі лягла густая, нездаровая чырвань. — І далёка ж не хадзіла. У сасонніку ля могілак казлоў нарэзала... Ці бярэш жа іх? — Яна глянула на Грышку не па-старэчы вострымі вачыма, з якіх, здавалася, тут жа, адно скажы — не, паліюцца слёзы — столькі духоў выпетрана і, выходзіць, дарма.

— Усе грыбы прымаю, цётка! — адказаў Грышка дужым голасам, каб не толькі падбадзёрыць старую Чубатчыху, але і паказаць ёй, што для яго, грыбавара, няма розніцы, якія грыбы, абы яны былі ядомыя.

— Ці-та шчэ ніхто не прынёс табе? — Чубатчыха дзівілася на чыстыя, выскабленыя нажом сталы, азіралася мітусліва па баках, можа, дзе ўбачыць грыбы.

— Ты, цётка, — першая ў мяне, во што, — сказаў Грышка, паставіўшы стаўбун на вагу; прысеў і стаў пільна ўглядацца ў грыбы. — Калі ты палупіць успела?

— Го, столькі мне ўнукаў ды ўнучак навезлі!.. Пасадзіла — ураз, як тэя мышы, абялілі. — Чубатчыха не зводзіла з Грышкі ўсё тых жа насцярожаных вачэй.

Ён узяў вялікі, як лапаць, казляк, разламаў яго, чамусьці панюхаў.

— І не глядзі дайжа, галубок, чыстыя, як малако

з-пад кароўкі. Я па караньках глядзела... Яй-богу! Чарвівыя зразу выкідала. Вочы шчэ маю, пакуль...

— Ды я бачу, што чыстыя, але вадзяныя дужа... пасля дажджоў. — Грышка сціснуў у кулаку казляк, і з яго пабегла зеленаватая, як сыроватка, жыжка. Грышка, канешне, знаў, што грыб без вады — не грыб, ён, лічы, увесь з вады, толькі дзесятая долька мякаці; вось не дай грыбу дажджу — і не будзе яму з чаго нагульваць сваё цела, набіраць туку. Але знаў Грышка і другое — што ў дождж некаторыя грыбы так раскісаюць ад вады, што грузу ў іх на пуд, а наедку — худому вераб'ю клюнуць. — У цябе восем кілаграм, цётка. Паўпуда роўна. На ваду, яснае дзела, трохі скінуў. Во што...

— Глядзі ўжо сам, як знаеш, — не пярэчыла Чубатчыха, мабыць, радая, што Грышка такі нястрогі, пакладлівы да яе.

Грышка падняў з вагі стаўбун іываліў грыбы на стол — яны рассыпаліся, але былі і зляжалыя, камякамі — Грышка разгарнуў іх рукою па ўсім стале, зняў некалькі парушынак, слімака.

— Добра, цётка, я во тута пазначу, — сказаў Грышка, вымаючы з кішэні складзены напалам вучнёўскі сшытак і сіні фламастэр, — колькі і чаго здала. А грошы пакуль мне не выдалі, дзе-та праз тыдзень будуць...

— Ажно нядзелю ждаць... — сумна, са шкадаваннем прамовіла Чубатчыха — падобна, што яна была настроена атрымаць грошы адразу ж. — А я ўнукам хацела гасцінца купіць. І хусткі ў краму красівыя прывезлі... — Яна ўжо не гаварыла, а як бы марыла сама сабе; завярнулася і пайшла, зажураная ўся, згорбленая, на худых нагах, аплеценых, як карэннем, сінімі жыламі. І Грышку было да болю шкада яе, гэту цягавітую, заядлівую да работы жанчыну — адну з тых, на якіх усё яшчэ ліпіць вёска і якія на старасці нават не даюць спачыну рукам ды нагам.

Да вечара Грышку прынеслі грыбы яшчэ некалькі чалавек — найбольш, канешне, дзеці, якім цяпер такая латва зарабіць капейчыну на цукеркі ці газіроўку, а то і на адзенне ды кніжкі скапіць можна — не ўсё ж лета гойсаць бесталку, калі карысць у лесе такая дармовая. Грышка, помніць, як сам малы быў, дык на цёмнай зары ўспорваўся — каб першаму забегчы ў лес; сам, мо-

жа, не прачынаўся, але бацька будзіў яго кожныя ранкі. Прыбяжыш у лес, увесь вымачаны ў расу, — нічога яшчэ не відаць — галіны ў вочы торкаюцца, а зямля як сажаю засыпана. Тады здымаеш чаравікі і босымі нагамі саўгень-саўгень па траве — глядзіш, і напорашся на барвік; бывае, што і скапыціш, а то зусім раздушыш — дзе там чуйны будзеш, калі галава як чыгун і вочы зліпаюцца, хоць запалкамі павекі распірай. Але колькі, помніцца, радасці было за ўсе гэтыя мукі, калі нёс дахаты (яшчэ сонца нізка, у халоднай расе палошчыцца) поўны кошык ядраных з начы барвікоў. Цяпер, канешне, і барвікоў такіх ды столькі няма. Як і бацькі з маці ўжо даўно няма — ранавата яны памерлі, лічы,адначас: перш бацька, а праз тры дні і маці рукі злажыла, акурат не хацела заставацца на гэтым свеце без чалавека свайго. Так руліла думаць, і так многія малінаўцы думалі, бо жылі Мацвей і Надзёжа Пруцікі, як кажуць, душа ў душу, ні лаянкі, ні крыку не ляцела з іх двара, і ля калодзежа Надзёжу ніколі не ўбачыш, калі Мацвей у хаце...

Нуда па мінулым, па маці з бацькам навалілася на Грышку, і ён, каб атрэсціся ад яе, стаў парадчыць грыбы: ababaчкі і падасінавікі кідаў у адзін кацёл, лісічкі і валуі, такія ж жаўтавата-белыя, адно больш крохкія, — у другі, казлякі — у трэці... Падышла Лісаветка, у новай жоўтай блузцы з кароткімі пухнатымі рукаўчыкамі, з падмаляванымі вуснамі, і Грышка ўсё-ткі, нягледзячы, што жонка прыбралася, залучыў яе да грыбоў: хаця ноч яшчэ не скора — у яе цяпер між вечарам і раннем зусім кароценькі перашыек, — але клопату ў Грышкі дай божа.

Зразу Грышка надумаў варыць абабачкі і падасінавікі, бо першыя вельмі хутка шуплеюць, становяцца мяккімі, а другія — сінеюць так, што драпаюць вочы нават звараныя — акурат чарнілам аблітыя. Вада ў катле, павешаным над цяплом на дзвюх жалезных, наўмысна сплясканых у кузні рагазюлінах, пачынала закіпаць — кудлацілася пара, і яе тут жа злізваў вецер. Грышка паднёс бліжэй кацёл з наабіранымі грыбамі і, зачэрпнуўшы вялікім, з даўгой драўлянаю ручкаю чарпаком кіпетню, лінуў на грыбы. Раз, тады — другі. Мінут пяць пачакаў, сцадзіў і прамыў халоднаю вадою; потым заліў свежай і разам з Лісаветкаю (раз падтра-

пілася ўжо — раней дык Мішу прасіў) павесіў кацёл над цяплом.

— Ты во што — абірай лісічкі і валуі ды глядзі тута, каб не пацякло цераз край, — загадаў ён жонцы, стукаючы далонь аб далонь, — а я па ваду яшчэ разы два з'езджу.

Хоць і недалёка калодзеж, праз двор, Грышка возіць ваду ў бітоне з-пад малака, які прыладзіў на колы з дзіцячага веласіпеда, — як-ніяк, палёгка і зразу чатыры вядры тут як тут. З абабачкамі, падасінавікамі дый казлякамі тымі ж, не кажучы ўжо пра барвікі, Грышку важданіны меней: ото зварацца, астынуць — у бочку зліў, трухнуў наверх спецый — і будзь здароў, не пырхай. А над лісічкамі ды валуямі пакарпець трэба: спярша ў падсоленай вадзе з паўгадзіны паварыць іх, затым на рашотку вываліць ды добранька прамыць; а пасля ўжо гэтай «працэдуры» зноў у кацёл засыпаць, заліць свежай вадою, дабавіць воцату, солі і варыць да канца. Так што ваду давай і давай...

Калі Грышка прыставіў да сцяны лазні свой «самакат», Лісаветка ўвіхалася ўжо ўкруга катла, як ліса каля збана, ад старання аж кончык языка прыкусіла, — друшляком з такою ж даўгою ручкаю, як і ў чарпаку, зграбала пену і не шлёпала яе на зямлю, а скідвала ў чыгун-вядзернік, каб потым пасуліць карове. Вада ў катле бурліла, пена ледзь не перавальвалася цераз край, і Лісаветка хапатліва арудавала друшляком. Грышка качаргою трохі развярнуў дровы пад катлом, і вада апала, дробненька забулькацела каля беражка, і бачыў Грышка, што яна зусім мутная, а знаць — грыбам яшчэ доўга варыцца. Але няможна і так іх даводзіць, каб пераварыліся, — смак тады ў іх улятучваецца. Праўда, гэта нават не ўсякі з дэгустатараў высмакуе, ды Грышка ўсё адно ўзяў сабе за правіла — грыбы акурат, калі яны самі асядуць на дно, а расол стане светлым і празрыстым, як вада ў бітоне.

Грышка ўзяў мешалку, яшчэ не абноўленую, і стаў ёю варочаць у катле. Павалiла густа пара, паплыла ніцымі воблачкамі. Шапкі грыбоў, нават тыя, што шчытна, як світэр шыю, абліпалі карэньчык, павыкасаліся і пазагнуліся кверху, як акрайкі ў брылі, — падыспад у іх быў белы і пяшчотны, бы смятана, і адно дзівіла, чаму грыбы не распаўзаюцца ў вадзе...

Канешне, дзедаўскі гэта манер — варыць грыбы ў катлах, марокі хапае, але што зробіш... Праўда, разляцеліся чуткі, што павінны спецыяльныя машыны-печы грыбаварам падвезці. Там усё аўтаматыка робіць — і мяшае, і прамывае, і градусы паказвае, час, колькі варыцца... Словам, толькі стой ды мазгамі круці. З аднаго боку, рукам латва, а з другога... хто ведае, як там і што ў той печы, калі зварана, а калі недаварана. З радасцю думаючы пра гэту машыну-цуд, Грышка той жа час адчуваў і нейкую насцярогу да яе... Яно, пэўна, усягды так было ў родзе людскім. Дзікі чалавек спярша баяўся і ратаваўся ад агню, які потым стаў яго падсобнікам, а дзяды і нават бацькі жагналіся на першы трактар... Цяпер, канешне, час не той і людзі не тыя, што ні кажы, век тэхнікі. Кругом грукочуць камбайны, касілкі-малацілкі, трактары і цягачы, машыны і легкавікі; дугаюць, аж шархаціць за шпалераю гліна, самалёты; газеты пішуць пра апарат, які камандуе і гаворыць замест чалавека; у тэлевізары мільгаюць ракеты — вырываюцца з-пад зямлі і вады, з трэскам бухаюць, аж гіганцкі дымавы грыб падымаецца — чорны, што смала, ён так віруе і расце, проста на вачах, што, здаецца, за нейкія паўгадзіны шапкаю сваёю акрые ўсю зямлю. Грышка шмат паганых грыбоў ведае, але гэты — самы-самы ядавіты і страшны. Во яго і трэба выдзіраць пад корань з усім прычындаллем, каб сцерці з «ліца зямлі» на векі вечныя. Грышка гатовы хоць сёння не з нажом, а з касою на яго выйсці. Грыбавар і ёсць грыбавар — сваё дзела знае туга.

Так што Грышка — чалавек біты, падкаваны на ўсе сто і справіцца з любою, самай мудронаю тэхнікай. Гэта толькі ў кніжках... чытаў неяк, трагедыі з такімі, як ён, разыгрываюць ды спісваюць у запас, моў, састарэў, адстаў — дай дарогу вучоным! Не ведае Грышка, можа, дзе і ёсць так, але ў іх калгасе просяць-моляць пенсіянераў хадзіць на работу, і, пакуль рукі ды ногі служаць, многія цягаюцца. Якая розніца, стары ты ці малады — абы з цябе гаспадар быў харошы.

Над вуліцай стаяў пыл; рыкалі каровы, і пахла малаком.

Першая зорка, бледная, як ільдзінка, прыліпла да

неба і акурат падала сігнал салаўю — ён зацёхкаў у балотцы з такою заўзятасцю, як усё роўна была ўжо глыбокая ноч. Грышка прымеціў, што гэты позні дзівак-салавей, як праліўся дождж і папаўнела ў канаве вады, ажывіўся зноў, стараўся на ўсе лады, да якіх Грышка, пад настрой, спрабаваў нават падабраць словы: «Салавей грыбы пёк-пёк-пёк, вада кап-кап-кап, расол — цур-р-р!..» І цяпер Грышка стаяў і, чакаючы, пакуль астынуць звараныя грыбы, слухаў салаўя. З балотца пацягвала вільготным халадком, з мінуты на мінуту там павісне туман.

Грышка вылавіў у катле абабачак, узяў на зубы — цуд, смаката, а колькі пахаў у ім — здаецца, што заплюшчыў вочы ды лёг тварам у траву. Недарма, выходзіць, ганяюцца людзі за грыбамі. Грыб — ён не проста грыб, а яшчэ — і лякарства, вітамінаў у ім шмат. Унь вучоныя адкрылі, быццам некаторымі грыбамі нават алкашоў можна лячыць: з'еў грыбок, а калі хоць кроплю гарэлкі выпіў — цябе выверне ўсяго, не мірацца, так сказаць, у арганізме гарэлка і тыя грыбы. Але чуў Грышка недзе і зусім дзіўнае, з чым аніяк не мог пагадзіцца, на смех пускаў: што ў Швейцарыі шмат барвікоў, але там іх не ядуць нібыта. Дзівакі яны, тыя швейцарцы, ці што? Мабыць, лухта ўсё гэта, хаця, як у той казцы, — свет вялік, можа быць і праўда.

Бачуркі Грышка выбраў не надта вялікія, лічы, вядры па тры, і таму дзве запоўніў зразу. Наверх паклаў выскабленую і ашпараную кіпетнем накрыўку — яе вострым, як нож, брыжыкам патрапіў акурат у пазік на клёпках, надзеў на бачурку абруч і долатам ды малатком туга насадзіў яго; забіў драўляны шпунт-заткала і лёгенька стукнуў нагою ў бачурку: гатова! — прымай, таварыш Міротнікаў.

Лісаветка падаіла ўжо карову і цяпер ішла да яго, усміхаючыся. Яшчэ даволі гнуткая, асвежаная ў твары ўсякімі памадамі, яна была і праўда «красівая», і Грышка міжволі залюбаваўся ёю, нешта даўняе, прыглушанае не толькі гадамі, але і жыццёваю мітуснёю, здрыганулася ў ягоных грудзях і не выпала з душы, а, пачуў, затрымалася, разлілося цяплом па ўсім целе.

— О, такі момант прапусціла!.. — сказаў Грышка і патукаў малатком у бачурку — глуха, бы ў валун.

— Во-о-ой, гора мне — ратуйце!.. — пляснула ў ладкі Лісаветка. — Шчэ за лета апастылеюць етыя грыбы.

— Не, жоначка, лапці ты пляцеш! — Грышка быў дужа вясёлы, здаецца, ці не ўпершыню за апошні час, і было відаць, як нават у паўзмроку свецяцца сінія крышталіны яго вачэй. — Тут нягрэшна і чарчыну ўзяць, скажу табе... — Грышка прысеў, прыхінуўся шчакою да бачуркі, ці чуваць цяпло, мяккае, пяшчотнае, як ад грудзей жанчыны, і ў Лісаветкі гэта чуллівая сцэна вызвала яшчэ адну насмешку, на якія яна не скупілася ўсё жыццё.

Жарты жартамі, а яны і праўда змудравалі вячэру, і першым прысмакам у ёй былі грыбы — цэлая міска, свежых, яшчэ цёпленькіх, — Лісаветка пасыпала іх тоненькімі, як пярсцёнкі, колцамі цыбулі, падліла алею. Знайшлася і бутэлька настойкі з чарніц — леташняй, а таму і з густым пахам спірту, — як жа без хмелю ў свята? Яны згодна пасядзелі, як некалі, хоць і не за такою даўнінаю, — ажыўленыя і той жа час прыцятыя нейкім маладым хваляваннем, зародак якому давалі, бадай, вочы, што глядзелі адно ў адно як бы са здзіўленнем: «Няўжо, няўжо ета маё? Няўжо я маю права хоць зараз змусіць яго на сваё жаданне?..» Грышку было б зусім-зусім лёгка, аж закружылася б галава, мабыць, гэтак жа, як і ў Лісаветкі, калі б не дамешваўся ў сэрца жаль, які, можа, і не шкодзіў чуллівасці, затое адбіраў у радасці паўнату і безаглядcurrently насць, — жаль да жонкі сваёй, Лісаветкі, чыя даверлівасць прыдалася яму дзеля сваіх таемных, хаця і не далёкіх, мужчынскіх намераў. І Грышка, як бы вінуючыся за ўсе свае грахі разам і хочучы як лепш ашчасліціць Лісаветку, узяў яе на рукі беражна, як нявесту, і панёс у другі пакой, куды не даставала святло з кухні.

...Мусіць, калі б цяпер, у пятроўку, выпаў снег, Грышка не так здзівіўся б, як таму, што на трэці дзень прынёс здаваць грыбы Валодзька Шапялёў. Прывёў за руку і дачку — танюткая, як саломінка, са светлымі валасамі і жоўтым бантам на макаўцы, яна была падобная на пушысценькі адуванчык; глядзела на Грышку з несхаванаю цікаўнасцю, сачыла за яго рухамі, вуснамі, як баючыся, што ён пакрыўдзіць яе татку. Ва-

лодзька, мабыць, і сам адчуваў, што людзі, бадай, не зразумеюць, што прывяло яго да грыбаварні, а злыя языкі нават асудзяць: як гэта чалавек з такой сям'і, жыве ў Мінску, начальнік—і кваліцца на капейку. Таму Валодзька зразу неяк баяўся адкрыта глянуць у вочы Грышку. Паставіў на вагу сумку і чакаў, нервова перабіраючы пальцамі, пакуль Грышка ўзважыць. А Грышка назнарок не спяшаўся — як нежывы, дзюбаў указальным пальцам у калодачку бегунка,ураўноўваў вусікі на шалях і думаў тым часам, што сказаць Валодзьку, каб не пакрыўдзіць яго, а можа, нават і пахваліць, бо — як ні круці — чалавек добрае дзела робіць. Грышку бянтэжыла акурат тое, што, пэўна, і ўсіх астатніх, — чаму, з-за чаго Валодзька надумаўся здаваць грыбы? Ці то яму абрыдла гультайнічаць і ён наважыў хоць чым людскім заняцца, ці проста не хацеў марнаваць час? Хто ведае іх, гэтых гарадскіх, — у іх кожная капеечка сваё месца знае. І Грышка пачаў з самага абыклага: спытаў у Валодзькі, дзе ён збіраў грыбы — усё на тых Шахтах? Валодзька — таксама не дурань, разумеў, што яму трэба не столькі адказаць на пытанне, колькі зразу праясніць, што падбіла яго на здачу грыбоў.

— А-а, шмат дзе быў!.. — сказаў Валодзька. — Па лесе дужа люблю хадзіць... І сумку на плячо — глядзіш: к канцу прагулкі грыбоў набраў. Ужо слоікаў пяць маці мне ў Мінск закатала, з паўсотні барвічкоў насушыў... — Па тым, як Валодзька стаў спавядацца, было відаць, што ён напраўду перажываў, ідучы сюды, і цяпер стараецца паставіць усё на сваё месца.

— Малайцом! Са шчасцем, як кажуць у народзе, добра і ў грыбы хадзіць, во што. І капейка ў кішэні не лішняя, — пахваліў Грышка, аб чым тут жа пашкадаваў, бо Валодзька пачырванеў у твары і, міргаючы вачыма, не ведаў, што казаць далей. Яго зразу збілі з панталыку Грышкавы словы, бо тое, чаго баяўся — каб не падумалі, што прынёс грыбы дзеля грошай, — акурат, выходзіць, і здарылася. Гэтая пахвальба — як нажом паласнула па сэрцы. Нешта такое помніцца яму са школьных гадоў. Тады ў маліпаўскіх хлапчукоў была завядзёнка збіраць суніцы і прадаваць на шашы. Шафёры (часцей з легкавікоў), а то проста пасажыры ахвотна куплялі першыя ягады. І тыя выручаныя капейкі вельмі ўжо прыдаваліся на іх хлапчукоўскія намыс-

лы, самы вялікі з якіх, канешне, быў — складанчык, і чымся больш у ім лёзаў, тым лепш. І вось каторага дня настаўніца хіміі, якую ніхто з вучняў не любіў, бо яна ўсягды высмейвала вінаватага не выбіраючы слоў, праафішыравала Валодзьку перад усім класам: «Вунь з Валодзі Шапялёва бярыце прыклад: не толькі добра вучыцца, але і грошы бацькам памагае зарабляць. А што — правільна!..» Здаецца, і не сказала нічога благога, адно пахваліла, але колькі тут было наўмысна прыхаванай з'едлівасці: па-першае, маўляў, глядзіце, чый сынок — настаўнікаў, а па-другое, і гэта самае балючае, выходзіць, — Валодзька такі сквапнюга, што нават продажам ягад не грэбуе.

Грышка, канешне, сказаў цяпер без усякага злога намеру, але ўсё адно Валодзьку стала непамысна, бо ўжо загадзя настроіў сябе на любую пстрычку, а гэта аніяк нельга было рабіць, таму што самае нязначнае слова, нават проста сказанае, здаецца, нацэлена акурат на тое, каб цябе ўнізіць, пакрыўдзіць, — як з тою ранаю: усягды чапляешся іменна ёю, а ўсё па той прычыне, што астатнімі, здаровымі, мясцінамі не адчуваеш, калі імі да чаго датыкаешся.

І ўсё-такі, усё-такі няпроста нам праясніць, чаму раптам Валодзька прынёс здаваць грыбы. Жонка, канешне, на расстанне не праміпула сказаць, каб не біў у вёсцы лынды, а «займаўся дзелам», але сказала адно пра кампоты і варэнне. Дык, можа, Валодзька хацеў паднесці сюрпрыз і здзівіць яшчэ грыбамі ды грашыма? Можа, дзе на сподзе душы такая думка няпэўна і жыла, але каб яна кіравала ім, то наўрад, бо Валодзька цвёрда ведаў, што перад жонкаю сваёю не выслужыцца нават тады, калі дастане ёй зорку з неба, — яна, гарадское дзіця, самыя капрызныя жаданні якога бацькі без слоў, а часам і з ахвотаю задавальнялі, прымае ўсё як звычайнае.

Дык тады, можа, Валодзька, апынуўшыся ў мясцінах, дзе рос, так узрушыўся, што захацеў зноў перанесціся ў той незабыўны, далёкі, але яскравы ў памяці і вачах свет, а яго акурат і нельга было ўявіць без гэтых грыбоў? Магчыма. Але ж верыцца і ў тое, што адно гэта не штурхнула б Валодзьку на даволі смелы, на вачах усяе вёскі, крок. А што тады?

Не забываючы, што ўжо сказана, намалюем і пры-

кладзем да Валодзькі такі слоўны трафарэт: зусім верагодна, што ў душу Валодзькі, які ладнага пажыў у горадзе, пранік сваёю жылкаю грыбок, назва якому прагматызм; грыбок гэты, разрастаючыся, непазбежна родзіць прагу да накаплення, пагоні за шыкам, прэстыжам, а ўрэшце ператварае душу ў гнілое балота. Якое лякарства ад гэтае нутраной хваробы, пры выпадку спытаем у Грышкі — ён грыбавар, можа, і ведае.

О, каб пра гэта ўсё мог падумаць Грышка, ён бы тут жа высмеяў, нягледзячы ні на што, і пасарамаціў Валодзьку: навошта, навошта табе, маладому, усё гэта? А так, застаўшыся адзін, толькі дзівіўся, і не больш: «Даў, во што, копаці Валодзька... Ніяк не чакаў я. Ды мне-та што, мне латва — хай носіць грыбкі. Ты глядзі, — не пераставаў дзівіцца Грышка, — ніколі б не паўміў!.. Хлопец ён, канешне, змалку стаpанны быў... Не тое, што мой басяк...» — Як толькі Грышка ўспомніў Мішу, зразу зніякавеў, апаў, і думкі пра Валодзьку вылецелі з галавы — паспрабуй злаві. Сын быў Грышкавым болем усё жыццё, болем, які кожны дзень ныў-шчымеў і аніяк не зажываў. Няўжо да смерці ён так і будзе круціць душу? Днямі вось Грышку сон брыдкі прыблюзніўся, аж цяпер волка ў грудзях. Нібыта пайшлі яны з Мішам у сажалку рыбу лавіць — муцёнкаў, як у іх называюць. Сажалка прыгожая, сіняя ў зялёнай траве, бы ў вяночку. Міша раздзеўся да трусоў і палез з лазовым кошыкам у ваду; яшчэ некалькі новых кошыкаў на беразе засталіся ляжаць — навошта? Міша пачынае боўтацца ў сажалцы, ваду муціць, значыцца, каб рыба ўсплыла... І бачыць раптам Грышка, што не вада ў сажалцы, а — бруд, смецце, нечыстоты ўсякія... Міша хоча грабянуць каля сябе кошыкам, але скрозь патарчакі розныя, іржавыя драты, паленне — замінаюць. Ён стараецца, аж прысядае, падымае кошык — поўны глею, бруду, і паверх расплываецца зялёная ляпёшка. Фу! Грышка адварочваецца, зашчамляе пальцамі нос — і чуе... смех. Нехта галасна рагоча, быццам гром грыміць. Глядзіць: на процілеглым беразе стаіць, хапаецца за жывот Васіль Муранкоў. А Міша, абляпаны ўвесь з галавы да ног чорным глеем, як ачмурэлы, пялешчацца ў сажалцы, што падобна ўжо болей на свіную рыцвіну. Нарэшце вывальвае кошык на бераг, на зялёную траву, раскапвае сінюю твань і выхоплівае з яе раптам

блакітную, як аловак, маленькую рыбку. Міша жмурыцца, быццам глядзіць не на рыбку, а на сонца...

Сон сном, а Грышка маляваў сабе, як і што будзе далей, — ну вернецца Міша праз год — куды яму? Канешне, зноў заягліць, як да арміі, на геолага ісці. А гэта, як на Грышкаў розум — бадзяжнае жыццё — па гарах, тайзе, пясках лазіць... Заманліва, канешне, але... Але ці для Мішавай натуры такая работа. Ён што агонь, рэзвы, неабачлівы, як тады на Глубцы, з канём... мог бы ўтапіцца. А ўдабавак — горды, як чорт. Каб гэту рэзвасць ды на добрае скіраваць, Мішу б цаны не было, гарэла б усё ў ягоных руках... Да зямлі трэба яго, зямля — яна ўсіх лечыць, бацька казаў...

І тут Грышка ўлавіў думку, якая спярша акурат варам яго абдала, закруцілася-зазвінела ў галаве, бы пчала. Ён ухапіўся за яе і ўжо не адпускаў — сеўшы пад лазню, круціў яе і так, і гэтак — блага, што рукамі не памацаеш, і чымся далей над ёю мучыўся, тым ясней праяўлялася, крэпла, прыдавала радасці. Грышка падняўся, акінуў паглядам гарод — сотак пятнаццаць ён займае, расце на ім бульба, яблынькі сохнуць пачалі, некалькі выкарчаваў; схіліў, бы ў жалобе, жоўтую галаву-кацелку сланечнік, што выткнуўся з-за паграбні; магутна стаялі адно ліпы — адцвіталі ўжо, скідвалі свой жаўтацвет, пакідаючы замест яго зялёныя мяккія бубкі, што к восені зацвярдзеюць, а ўвесну, яшчэ пры снезе, на вусіках-прапелерах разляцяцца па гародзе, прарастуць у траве пад плотам. Грышка падышоў да ліп, змераў перамежак між імі — набіраецца метраў дваццаць. Але, Грышка пашкроб галаву, навошта шчаміцца, ён паставіць *хату* крышачку воддаль, каб галіны ліп адно краналіся даху і сцен, затулялі ад нягоды. Так, гэта думка прыбілася зусім зняцяйкі, бо выспявала, мабыць, не адзін год, і цяпер так ускалыхнула Грышку, што ён не мог суняцца, спакойна разважаць, а бегаў, як ачмурэлы, па гародзе, прыкідваў і замяраў. Услед хадзіў сабака, Босы, нюхаў зямлю, акурат правяраў, ці свая, ці не чужая.

І цяпер ніякая-ніякая сіла, ніякія і нічые ўгаворы-адгаворы не перапруць Грышку на інакшае — ён цвёрда наважыўся будаваць сыну хату: сказаў жа ў апошні міг: «Тата, чакай мяне!..» Прыйдзе, ажэніцца... Хаця тут цяперака і дзеўку са свечкаю шукаць трэба — ра-

ней адна Чубатчыха магла ашчасліваць усю Малінаўку нявестамі... Хоча, няхай са свету бярэ, як ён сам некалі, Грышка, узяў. Так ці іначай, сям'ю завядзе, і трэба будзе свая хата, свой курэнь, як кажуць, а ён, Міша, будзе ў ёй «хазяінам». Навошта яму чужы, мітуслівы свет, куды ўсе рвуцца і адкуль з плачам варочаюцца, але ўжо не могуць адарваць сябе ад яго — во, хаця б той Валодзька Шапялёў... І ўнукаў яму, Грышку, край хочацца — не прывозных, інкубатарных, як у Шапялёвых, а сваіх, пастаянных, выняньчаных ад пялёнак...

Першае, што Грышка зрабіў назаўтра, — гэта з'ездзіў у лясніцтва і выпісаў пятнаццаць кубаметраў лесу: пакуль надыдзе восень ды скапаюць бульбу, дык і выгралюе, сцягне хлысты на пагон, там распілуе, а тады ўжо прасцей будзе рубіць з бёрнаў хату.

...З гаркавым дымком спаленага на сядзібах бульбоўніку прыйшла восень. Як баючыся, што запазнілася, яна неяк вобміг зжаўціла на ліпах лісце, вецер шуршэў ім, мёртвым, падбіваў да частаколу, круціў разам з папераю ў закутках, а то паднімаў у паветра, што сваёю празрыстаю яснасцю аж калола ў вочы, і нёс у чыстае поле. На пагоне, сабраўшыся ў чародку, дажыроўвалі астатнія дні шпакі, крута заломвалі ўверх, спытваючы моц крылаў перад далёкаю дарогаю. Толькі, бадай, вароны з усяго птушынага царства пачувалі сябе спакойна — мерна, ківаючы хвастамі, расхаджвалі ўслед за трактарам; шукаючы спажыву, разбівалі шэрымі дзюбамі свежыя камякі зямлі, лянiва пераляталі і бестурботна патрэсвалі пер'ем, акурат выстаўлялі яго перад хмарамі — такімі ж шызавата-цёмнымі і густымі, яны выплывалі з-за небасхілу маленькімі рэдзенькімі шматкамі, якія ўсё згушчаліся, зрасталіся ў вялізныя кудзелі, з якіх ужо сыпаўся шорсткі, ядраны халадок.

Змораныя, зацяганыя за лета коні звозілі з поля тугое, што камяні, качанне капусты, водар якой не выветрываўся нават уночы, а калі нахапіліся першыя замаразкі, яшчэ пагусцеў, сачыўся ў хаты праз няўцепленыя вокны і дзверы, нёс з сабою свежасць і крамяную гаркавінку. Дзеці з асалодаю грызлі сакавітыя храпкі, кідаліся імі, азартна смяяліся, быццам лепшае забавы

яны ў жыцці не бачылі і не ведалі. Хіба што цяпло ды печаная бульба маглі гэтак жа забавіць іх.

Акурат гэтаю парою Малінаўку абудзіў стук тапара, і па вуліцы разгуляўся нязвыклы для восені пах смалы — ну, бывае, што пахнуць трэскі на дрывотні, калі падмерзнуць, але нядоўга і тоненька, — а гэты з кожным днём цяжэў і мацнеў, акурат нехта варыў у двары жывіцу. Стук тапара і пах смалы браліся з аднаго месца — на гародзе пад ліпамі Грышка Пруцікаў ставіў зруб: паклаў ужо некалькі вянцоў, і яны кожнаму кідаліся ў вочы спелай, васковаю жаўцізною. Вёска, канешне, не сундук пад сямю замкамі, і людзі ўжо ведалі, што не сабе і не на продаж ладуе хату Грышка — дзеці ў яго дарослыя, хутка Міша вернецца, дый Ленка не будзе ж век на тым БАМе.

Калі надаралася пагода і колькі дзён стаялі сонечныя дні, на бёрнах зруба празрыстымі крышталінкамі выступала смала — яна блішчала, як слёзы, і салодка пахла.

* * *

Калі б ад мяне залежыў лёс Зямлі і калі б яна апынулася ў такім становішчы, што адным голасам гэты лёс можна было навечна засцерагчы ад ліха, і ў мяне спыталі б, як гэта зрабіць, я сказаў бы: усім людзям (у тым ліку і героям аповесці) трэба ў космас, каб адчулі, з касмічнай вышыні ўбачылі, што планета ў нас — *адна* і яна маленькая, безабаронная і блакітная, як дзіцячы шарык... Пасля гэтага, думаю, кожнаму, нават самаму чорстваму чалавеку не працівіла б жаданне — стаць спінаю да злога ветру і затуліць сабою гэты кволы, далікатны шарык, каб не напароўся ён на патарчалку, якую, пераводзячы на мову электронікі, іначай можна назваць *кнопкаю*. Толькі для малінаўскага грыбавара Грышкі Пруцікава (прабачце за такую выбраную прыязнасць) я зрабіў бы выключэнне і не пасылаў у космас з падобнаю мэтаю. Хіба што дзеля цікавасці, і то — калі б здароўе дазваляла.

# ГРЭЦКІ АРЭХ

Чаму тое, аб чым шкадуеш, успамінаецца заўсёды са светлаю журбою і ціхім сумам — што нечага не дабраў, нешта не так зрабіў, чагосьці было мала, а па сутнасці разабрацца, дык розніца між тым, чаго хацеў, і тым, што было, намі часта расцэньваецца як няўдача, фатальны збег акалічнасцей, як папрок (менш за ўсё самому сабе) і аніяк не ўспрымаецца лагічнай, можа, нават самай шчаслівай для нас арбітай жыццёвага лёсу.

Я ніколі не думаў, што мяне цягнула на хутар: каханне ці матухна-прырода, да якой з маленства нераўнадушны. Хутар стаяў кіламетраў за восем ад горада Зялёнае, дабрацца да яго льга было толькі дызелем: сысці на раз'ездзе Вербіж, а потым яшчэ два кіламетры топаць пехатою. На хутары захаваліся дзве хаты: у адной жыла сям'я Драздовікаў, а другая пуставала ўжо некалькі гадоў: чалавек з яе, блізкі сваяк Драздовікаў, перабраўся ў Вербіж, і паколькі хата, яшчэ даваеннага склёпу, дыхала ўжо трухлявасцю, перавозіць яе было рызыкоўна. Цяпер яна служыла Драздовікам складам: там грувасцілася ўсякае лам'ё і прычындалле; стаялі кросны, якія ўжо ўбачыш хіба ў музеі; стары, паточаны шашалем, бы хто стрэліў зарадам з проса, драўляны ложак, на якім у летнюю спёку стомленаму латва прылегчы; вялізныя, уроўні з чалавекам, бочкі — пад крупы і муку; печ была нізкая — села ў зямлю, — з цёмнага незаслоненага жарала нязвычна патыхала стынню, і маркотнымі цёмнымі вачніцамі глядзелі на вокны пячуркі.

Хата, у якой жылі Драздовікі, была з выгляду люднейшая, хоць таксама цёмная ў бёрнах, але яе ажыўлялі, як чалавека свежая сарочка, белыя разьбяныя ліштвы.

Дзве гэтыя хаты — усё, што засталося ад вёскі, якая некалі набірала паўсотню двароў і вуліцы якой ужо даўно заараны пад калгаснае жыта. Што прымусіла Драздовікаў застацца ці, дакладней, што не дало ім сарвацца разам з усімі ў перспектыўны, электрафікаваны Вербіж — гэта мяне здзіўляла і не перастае здзіўляць: як у наш час людзі могуць жыць без радыё, тэлевізара, газу і ўсіх іншых выгод, што прынесла энтээр? Адгадкі заўсёды адназначныя, а тут, няйнакш, было не менш як дзесятак меркаванняў, і таму я не браўся нават што-небудзь праясняць. Бачыў, людзі — жылі: смяяліся, калі

было весела, сумавалі падчас непрыемнасцей і згрызот, якія, на жаль, пакуль чалавека не абмінаюць; раслі дзеці, сталелі, набіраліся мудрасці, старэйшая дачка ўжо выйшла ў Мінску замуж, нарадзіла «сына-мацака» (так казалі дзед і баба). Ведаў я і тое, што ў Драздовікаў вялікая гаспадарка: дзве каровы і цялё, чацвёра кабанчыкаў, добрая плойма індыкоў і курэй; а яшчэ — сабака, пчолы.

Днём над хатаю, як і над усім светам, свяціла сонца, уначы вісеў месяц і мігцелі зоркі, кожны раз — новыя. Яе абвяваў вецер, мылі дажджы, маладзіў першы, цнатлівы сняжок.

Упершыню на хутар мяне прывезла Зіна; я кахаў яе, здаецца, шчыра, без фальшу, які часта звычайны мужчынскі эгаізм можа эфектна маскіраваць пад сапраўднае пачуццё. Гэта было ўлетку; мы пахадзілі па садзе, светлым ад яблыкаў, каля шматлікіх град, што натапырыліся пёркамі цыбулі і блакітнымі галоўкамі маку; я падзівіўся на пчол, якія чорнымі шнуркамі з усяго неба сцягваліся да вузенькай шчыліны ў вуллі. Пасядзелі на цёплай траве пад грэцкім арэхам, які прыжыўся, але не радзіў; слухалі, як недалёка за жытам тарахцела касілка: паветра пахла густым водарам лубіну.

Тады ж, надвечар, я пазнаёміўся з Зініным бацькамі. Маці, невысокая, з мяккімі, добрымі вачыма, працавала настаўніцай, яе сціпласць і ціхі нораў перадаліся дзецям, асабліва Зіне; затое ад бацькі-лесніка, рослага, жылістага, лысага мужчыны з белымі ад сівізны скронямі, дзяўчаты пабралі статнасць, якая рабіла іх па-жаноцку прывабнымі ці, калі сказаць іншым словам, якое мне асабіста папахвае пашлаватасцю, — фігурнымі. Хлопец, Вадзік, усім удаўся ў маці: дробны і бяскрыўдны, як ласкавае цялятка.

Здаецца, мне ўсе былі радыя, а яшчэ, мабыць, і задаволены, што і другой дачцэ падтрапіўся хлопец як быццам сур'ёзны і з твару не брыдкі.

Між тым наступіла зіма. Мае адносіны з Зінаю сталі настолькі пэўнымі і блізкімі, што сумнення ў нашым шлюбе ні ў кога не было, і гэта здымала з мяне скаванасць, калі я прыязджаў на хутар. На той час Вадзік ужо служыў у арміі. Бацька Зінін (я называў яго афіцыйна — Сцяпан Кузьміч) звычайна прыходзіў дахаты позна, не часта яго пераймала па часе і маці: вяла ў школе прадлёнку, і мы кожны раз, лічы, заставаліся ў хаце

адны-адзінюсенькія. Тут льга і падумаць, што ад такое латвы ў нас кружыліся галовы, і, няўладныя над сабою, мы задыхаліся ў бяздонні маладых, гарачых страсцей, а напраўду — дык былі мы сарамлівыя і стрыманыя, як дзеці. Самае вольнае, што дазволілі сабе, калі, катаючыся на лыжах, намачылі ногі, — гэта залезлі на печ і, лёгшы побачкі, пагрэліся на чарэні. У мяне той момант моцна білася сэрца, а самалюбства цешыла нейкая прытарна-ліслівая думка, што Зіна некалі будзе належыць мне, пакорлівая і адданая; я акурат назнарок аддаляў, зачыняў дзвярыма пачуццёвай глухаты імкненне да блізкасці, пакутлівае чаканне якой акрамя таго, што ўяўлялася мне высакародным, яшчэ і множыла наперадзе радасць.

Аднойчы ў суботу, пад Новы год, мы выбраліся на паляванне — утрох: я, Сцяпан Кузьміч і дзядзька Іван — той сваяк, які пакінуў на хутары хату. Усе пры стрэльбах, нават для мяне выпаралі ў кладоўцы запыленую аднастволку: хоць сказалі, і дае асечку, затое лёгкая. З двара выйшлі раненька: паветра цёмна-сіняе, а снег — блакітны; мёртвыя, сухія былкі лебяды на ім чарнелі як намаляваныя тушшу. Босы (на лапах у яго былі белыя «шкарпэткі», ці, інакш, сам руды, меў «босыя» лапы), звечара не кормлены, старанна нюшкарыў па свежым снезе, што выпаў уначы, чмыхаў каля купін; хвост, звычайна апушчаны, загнуўся да спіны і падрыгваў, як у авечкі. Босы заекатаў, нечакана для мяне, у хмызняку, потым схаваўся ў сасонніку. Я зняў стрэльбу і пабег туды, куды паказаў мне дзядзька Іван: на прагаліну ў сасонніку, дзе была, мусіць, дарога. Брэх аддаляўся некуды ў глыбіню, і я пайшоў паціху. Следапытныя навыкі ў мяне такія-сякія былі: яшчэ школьнікам я часта хадзіў у лес з суседавым сабакам (вядома, без стрэльбы) і ведаў, што заяц бегае кругам і — хочаш не хочаш — вяртаецца на тое месца, дзе яго паднялі.

Я стаяў на ўзлеску пад сасонкаю, заціснуўшы ў падпашшы аднастволку; як ні затойваў дыханне, серабрысты шнурок — святло ад месяца — звіхаўся то на адзін бок ствала, то на другі. Крокі за тры ляжала пад снегам дарога, каляіны якой былі пазначаны дзвюма паралельнымі спадзінкамі, цямнейшымі, чымся горбік, што пабліскваў між імі дробнай разнаколернай імглою.

Я так прудка ўядаўся вушамі ў сабачы брэх, што нечакана пачуў дзіўныя гукі: «ііцірiцр-ііцірiцр»; яны то

заціхалі, то набліжаліся, і тады, у нейкі момант, мне здавалася, што нада мною звіняць камары, як улетку на Сажы. Я ўжо забыўся на сабаку, а толькі лавіў гэта незвычайна тоненькае папіскванне ўверсе. Раптам з сасны, з галіны, на якой ляжаў боханам снег, сасмыкнулася ўніз лёгенькая, акурат папяросны дым, блакітнаватая пасмачка; слізгануўшы па ёй вачыма, я ўбачыў дробненькую, бы мятлік, птушачку, крыльцы якой трымцелі ў паветры, як маленькі прапелер; яна раз-пораз торкалася даўгаватай дзюбкаю ў шыгалле і кару на галіне, не садзілася ні на міг: пералятала вышэй ці ніжэй; натапырваючы вострыя, як шыльца, аранжавы чубок, тачылася пад снег. Зразумеў: мне пашчасціла ўбачыць рэдкую ў нашых беларускіх лясах птушачку, якую за драбнату называюць еўрапейскім калібры, а сапраўдная назва яе — каралёк.

У адно імгненне я пачуў сабачы брэх і ўбачыў зайца: ядавітае, залівістае яханне сабакі было недзе зусім блізка, а заяц каціў па дарозе проста на мяне. Я разгубіўся і не памятаю, ці наўмысна гахнуў паверх зайца, лічы, у самае неба, ці ў спешцы не адвёў да адказу курок, і ён шчоўкнуў міжвольна. Заяц крутнуў з дарогі і неяк мякка, лёгка, не кранаючыся зямлі, пасігаў у сасоннік.

Праз нейкую хвіліну на дарогу выскачыў сабака, пранёсся міма і адчайна, акурат папракаючы мяне, няўдаліцу, хапянуў каля маіх ног снегу; крута заламаў на заечы след.

Каралькоў не было відаць — дзіва што: такім стрэлам слана садзьме, не тое што нейкіх пушынак. У мяне ў самога звінела ў вушах, і я не чуў, а толькі бачыў, што да мяне трухае дзядзька Іван і ўсім сваім выглядам пытаецца: «Ну што?..» У яго расхрыстаны кажух і аўчыну на грудзях з двух бакоў шчытна пабяліў іней; стрэльбу ён трымае ў руцэ.

— Прабег, — сказаў я, паказваючы на заечы след.

— А ты што, тута і стаяў? — Дзядзька Іван спыніўся, ён часта дыхаў, у яго гарэлі шчокі, акурат на канцы вусоў уселіся два снегіры. — Ну і стралок, па совісці сказаць, з цябе!.. — Ён засмяяўся, без з'едлівасці, хутчэй паблажліва, як бы з гонарам, што не такая простая гэта штука — паляванне. — Цяпер касавокі махане далёка — можна перакурыць...

Падышоў і Сцяпан Кузьміч, спытаў у мяне, як бег

заяц — па дарозе ці поперак перамахнуў. Я сказаў — што пёр насустыч мне.

— Я таксама бачыў яго, — Сцяпан Кузьміч зняў рукавіцы, засунуў у кішэнь, — падалося, бытта грудзіна ў яго ў крыві... Можа, думаю, параніў...

— Не-е! — чамусьці з радасцю ўсклікнуў я. — Пульнуў... само... вышэй.

Сцяпан Кузьміч пахітаў галавою і болей нічога не сказаў.

Мы селі на паваленую сасніну з абсечаным галлём; ад пня ў наш бок мышка прастрачыла ланцужок кропак-слядоў. Мудрасць лесу не толькі ў тым, што ён, бывае, маўчыць, а і ў тым, што прымушае, як разумны субяседнік, думаць. З яго патаемных гушчароў глядзіць насцярожаная немата, выплывае нябачнымі хвалямі, ахутвае і бярэ ў палон ніколі не разгаданая тайна жывой існасці.

— Усё-ткі, па совісці сказаць, упусціў ты, Коля, зайца, — сказаў дзядзька Іван, са смакам выдыхаючы з грудзей дым папяросы.

Бачачы, што цяпер, як і перш, ён не папікае мяне, а проста не можа астыць ад паляўнічага азарту, які заўсягды змушае абсмоктваць з усіх бакоў няўдачу, я таксама нацэліўся на жарт.

— Ды з гэтай бярданкі толькі на мышэй і палявадь! — Я паказаў ствалом на мышыныя сляды.

— Го! Я з яе такіх дзікоў валіў — пудоў на пятнаццаць. З першага маху.

— Ну-ну!.. — таўхнуў яго локцем Сцяпан Кузьміч.— Не разганяйся дужа... Помніш, як цябе кабан уссадзіў на карак і пранёс метраў сто. Во, глядзі, Коля, — паказаў на шыі ў дзядзькі Івана бледна-шызыя палоскі, — што ад сучча засталося.

Дзядзька Іван утуліў у каўнер галаву.

— А табе хоць і ракету дай, дык ты не ўпалюеш нават здохлага вераб'я.

У іх, я прымеціў раней яшчэ, з любой нагоды разгаралася перапалка — нязлосная, без абраз, проста, мабыць, кожны меў сваю цвёрдую думку на адну і тую ж з'яву ці прадмет, што зацятаю супярэчлівасцю наўрад ці можна было назваць.

— Я, каб мая воля, не толькі ракеты, а і ружжы забараніў бы. — Сцяпан Кузьміч увогуле быў чалавек негаваркі, але норавам круты і таму збоку мог здац-

ца жорсткім, хаця ў сутнасці меў душу мяккую і тонкую. Я, канечне, мог адно меркаваць так, а дзядзька Іван, пэўна ж, ведаў яго і таму вельмі не заядаўся. Больш таго, праз нейкі час, надзіва мне, яны прыйшлі да згоды, мусіць, вельмі рэдкай, а можа, і першай увогуле, і лаялі не адзін аднаго, а некага трэцяга. З усяго іх крыку я зразумеў тое, што яны разносілі ўшчэнт «буржуяў, етых дурняў набітых, якія робяць ракеты, акурат бліны пякуць...».

Рахунак з вайною ў дзядзькі Івана асаблівы: прайшоўшы яе ад пачатку да канца (партызаніў на Прапойшчыне, потым у 43-м іх атрад уліўся ў 362-ю дывізію генерала Далматава) і застаўшыся жывым, што само па сабе было ўжо вялікім шчасцем, ён, аднак, шчаслівым сябе не лічыў: лёгка паранены, аказаўся пустым — без галоўнага мужчынскага козыра. Пакутаваў ад гэтага шмат, надта ў маладыя гады, і дасюль жыве бабылём, гэтакі чырванашчокі жылісты краж. І таму зазвычай, калі размова заходзіла пра вайну (апошнім часам гэта здаралася часта), ён сціскаў кулакі, аж кіпелі вочы, і на вуснах выступала сінька; у такія хвіліны падобны да вар'ята, ён, здавалася, быў раззлаваны на ўвесь свет. «Ракет настаўлялі па ўсёй Еўропе, ліха іх!..— ён глушыў паветра сваім ёмкім кулаком, быццам трушчыў усё ненавіснае яму. — Хай у мяне дзяцей няма. А ў каго дзеці, па совісці сказаць?!»

Я, прыпёршыся да сасніны, моўчкі слухаў дзядзьку Івана, і такой жахлівай недарэчнасцю, самай бяздарнай чалавечаю дурасцю здаваўся мне тут (сярод блакітнай, чыстай белізны, тонелька-шклянога, празрыстага паветра, у якім нерухома застылі галіны сосен) факт, што ёсць на зямлі цывілізаваныя, жалезна-бяскроўныя дыназаўры, якія ў сіле не толькі спляжыць на мапопел зямлю, а і мяне сцерці ў парашок, мяне, зусім маладога, што так мала пабачыў і паспытаў красы, што яшчэ толькі саспеў для самааддачы.

— Глядзіце!.. — раптам крыкнуў я, убачыўшы, як дарогу перабег заяц. Усе хапіліся за стрэльбы, ды дзе там: густы аснежаны сасоннік дбайна, з яхіднай натдзейнасцю схаваў шарака, гэтага, мабыць, адмысловага «стаера», які намнога апярэдзіў не менш адмысловага ганчака — Босы падаваў рэдкі і слабы за далёкасцю голас.

— Чорт, зноў прамаргалі! — прахрыпеў дзядзька

Іван і з сілаю кінуў у снег недакурак. Твар у Сцяпана Кузьміча быў надзіва спакойны.

Босы, аб'інелы, з вываленай набок лапаткаю языка, блiснуў ад нас далей, чымся заяц, — браў напярэймы.

— Ну, цяпер заяц, халера, можа саўсім збіцца з круга і сабаку звесці на край свету, — заклапочана сказаў Сцяпан Кузьміч. — Босы не кіне яго, у ноч пойдзе...

— Давай усё-ткі разбяжымся, — сказаў дзядзька Іван. — Можа, яшчэ перахвацім.

Я, задраўшы галаву, чамусьці аглянуўся на бакі, шукаў маленькіх, трапяткіх, як прапелер, каралькоў, ці што, і пагробся ў глыб лесу, з нематы якога, здавалася, глядзеў нейчы дакорлівы позірк і веяла халоднай, цвярозаю разважлівасцю, якой, мабыць, не ўсім хапае ў свеце.

Сабака наш і праўда прапаў. Недзе пад абед чуўся брэх, але Сцяпан Кузьміч сказаў, што гэта — не Босы, і я здзівіўся, як тонка ён розніць галасы сабак; а неўзабаве рэха прынесла і стрэл, які пацвярджаў, што ў лесе яшчэ нехта палюе.

Дахаты вярталіся свежай саннай каляінаю. Сцяпан Кузьміч час ад часу прыпыняўся, калупаў наском валёнка снег між канаўкамі ад палазоў, незразумела бурчаў пад нос; пераламваў ружжо, з якога яшчэ раней дастаў патроны, трубіў у ствалы: зваў Босага.

— Прыцягнецца, — суцяшаў яго дзядзька Іван, але і сам падкручваў канцы вусоў: пераіжываў.

Я тупаў моўчкі за імі і адчуваў у нагах і плячах салодкую, нейкую мяккую стомленасць; уяўленне паслужліва малявала, як прыйдзем мы да дзядзькі Івана (запрасіў), ён паставіць на стол самавар, нарэжа мёрзленькага, тугога сала з пахам кмену і часнаку. Будзем мы сядзець, гаманіць, смяяцца і не думаць, што нам хораша, лёгка, прыемна, а некаму ў свеце гэтым часам бязрадасна і горка; такі ўжо закон: чалавек не можа быць адначасова ў радасці і горы, хоць на жыцці яму ўсяго хапае: і першага, і другога.

Запырхалі ў паветры лёгкія рэдкія сняжынкі, а потым снег паваліў густа, празрыста-блакітнаватымі хлапякамі, быццам на небе нехта распатрушыў вялізную падушку і трос ёю. Цераз поле ўсё па той жа саннай каляіне выбіліся мы акурат на Вербіж. Вокны ў хатах яшчэ не свяціліся, хоць пачынала ўжо вачавідкі цямнець. Наперадзе ў пройме вуліцы варушыўся натоўп

людзей, і дзядзька Іван сказаў, што сабраўся ён не проста так. Мы падышлі.

Мужчыны, падпяразаныя патранташамі, лупілі дзіка: звязаўшы заднія ногі вяроўкаю, яго падвесілі за дошку, якую прыбілі на развілку электрычнага слупа; шкуру сцягвалі мяшком — верхняя палова тушы была ўжо абеленая і фіялетавая на колер; з гарбатага клыкастага лыча капала кроў — расплылася па снезе чорнаю плямаю.

Пры частаколе стаяў запрэжаны конь — на санях, на сене, ляжаў белы, як авечка, сабака і лізаў на баку рану.

Каля дзіка камандаваў лёгкі, сухі стары, якога ўсе называлі Конанам; гэта яго сабаку секануў ікламі дзік, ужо, аказваецца, чацвёрты раз. «О-о, Конан! — сказаў дзядзька Іван мне. — За ім не ўгонішся. Хоць восем дзесяткаў мае».

З яго, старога, жартавалі маладзейшыя мужчыны, кампаньёны ў паляванні.

— Дзік прэ міма Конана, — расказваў шыракатвары, як мангол, але з вялікімі вачыма малады дзяцюк, надразаючы фінкаю шкуру дзіка каля спіны, — а ён цісне на курок, цісне — глядзі, зламае...

Усе рагочуць, але самае смешнае наперадзе.

— Ды дзе ружжо стрэліць, калі куркі не ўзведзены...

«Ледзь не мая гісторыя», — падумаў я і таксама не стрымаў усмешкі.

— Ды не слухайце вы Калупайку, балаболку ету!.. — даволі крамяным, а можа, і зусім дужым голасам звярнуўся да натоўпу стары. — Спярша гаварыў, што як на хату біў, а як выпіў — што на сто метраў. Цалок!

Рогат зноў страсянуў вуліцу і снег на дрэвах.

Пакуль мы стаялі, глядзелі, як мужчыны лупілі дзіка, а заадно слухалі «перастрэлку» дзецюка са старым Конанам, ужо дабравата ссутонела і ў хатах загарэлася святло, толькі ў дзядзькі Івана (калі падышлі) вокны былі цёмныя, і душу мне міжволі зварухнула нейкае магільнае, журботнае пачуццё — адзінае ў сваім родзе, але блізкае, мабыць, тузе, што крамсае чалавека, які апынуўся на чужой зямлі.

Хата была прасторная, нейкая ўся дзябёлая, гулкая, бы звон; у гэту хату, падумалася мне, яшчэ б звон дзіцячых галасоў, тады б не звісала аж да падлогі ядранае лісце з вазонаў, якімі застаўлены падаконнікі, і не было б гэтай мёртвай непарушанасці і правільнасці ў сталах,

табурэтках, дарожках-ходніках і падушках-дзяружках... Ды што зробіш, так бывае: той, хто можа мець дзяцей, іх не хоча, цацкаецца з адным ці, як подзвіг, з двума, а таму, каму хацелася б іх, дзяцей, мець, не дае, як кажуць, бог.

Стол дзядзька Іван сабраў багаты, але я лепей за ўсё ўпадабаў марынаваныя барвічкі ў смятане і пахваліў іх гаспадару, а ён аджартаваўся: «Калі добры кусман сала, дык і грыб навара». Дзядзьку Івану, бачыў я, было ў ахвотку з намі зюкаць, бо, як ні круці, чалавеку аднаму цяжка, могуць, кажучы нашым вясковым выслоўем, і курапкі ў галаве завесціся. І дзядзька Іван, расчуліўшыся, зноў навёў размову на тое сваё «бальное» пытанне...

— Што я во пражыў свой век?.. Пустацвет, па совісці сказаць, а не чалавек. Памру — і ўсё. — Ён доўга маўчаў, ківаў сівой калматай галавою, мусіць, каб мы лепш уталкавалі, што ў гэтым «усё». Але тым, што стаў гаварыць далей, ён і сам растлумачыў. — Маёй крыві на свеце болей не будзе. У другіх... у каго дзеці, кроў і пасля смерці будзе рабіць сваю работу, можа, якога і віднага чалавека, па совісці сказаць, дасць... Усяк жа бывае. У Хроліка вунь Казіцкага сын, казалі, пісацель...

Сцяпан Кузьміч, махнуўшы рукою і крэкнуўшы, выйшаў на двор перакурыць, і я зразумеў, што дзядзька Іван ужо знадаеў яму сваёй «гарадою» — адной і тою ж размоваю. А я, прызнацца, слухаў яе з цікавасцю.

— Ды што — дзеці, дзеці... — Дзядзька Іван сцяў зубы і на пашчэнках пад скураю суха выступілі жаўлакі — сведчанне злосці. — Ты кусай, кусай... — Голас у яго нечакана аслаб, памякчэў, і мне стала чамусьці непамысна, што іменна цяпер дзядзька Іван звярнуўся да мяне. — Я, па совісці сказаць, ніводнай жэншчыны не пазнаў. Да вайны малы, у партызанах не да любошчаў было, а пасля... Скажу, маменты выпадалі. Я ж не крычаў усім, што ў мяне... значыць... А бачаць, малады, здаровы.

Помню, на падсочцы рабіў. Адборнікам шчоўк ды шчоўк ля сосен... каб смала цякла. А Рыпіна з Бакуновіч ету смалу выбірала з прыёмнікаў... Тожа маладая баба, удава, ці не двое дзетак у яе. Мужык спіўся і падох у лужыне, як сабака. А баба красівая, ногі такія таўстыя... лыткі во па гарлачу. Ну, ета самае, каб не бегаць двору, з сабой бярэш чаго перакусіць. Кусануў

якога сала з хлебам, гурок, дый ладна. А тут і граза нахвацілася, ды такая, што сосны хадуном ходзяць, гнуцца... ну трава, і ўсё. Вада валам пайшла, па кароўскіх сцежках асабліва. Я ў імшанік... там бочкі-дошкі ўсякія, сталы, дзе смалу ачышчаюць, стаяць. Сядзіць там Рыпіна. Намокла ўся, спадніца во да сцёгнаў прыліпла, і каленкі голыя блішчаць... Цяпер у дзевак нейкія вострыя, а то круглыя, як боханы. Ну, што, я паглядзеў толькі... «Змоклі во, пагрэцца нада, — кажа яна,— у мяне якраз бутылка ёсць... — Дастае з сумкі. — Ягаднікі з горада далі, за ўслугу, што паказала, дзе ягад многа, чарніц... Сілаю ўпёрлі ў сумку і пайшлі». Ну, хто ета адмовіцца ад дармовай чаркі. Выпілі мы, тады яшчэ раз... Глядзіць-глядзіць на мяне Рыпіна. Ведама ж, баба маладая, і без мужыка. А я, па совісці сказаць, усякай пустатой забаўляю яе, бытта ў мяне і думкі ліхой няма. Яна мяне і слухаць не хоча, от... «Іван, — кажа і руку на плячо паклала, а ў вачах, каб ты бачыў, такая вінаватасць... не, не вінаватасць, а нешта нападобія таскі. — Дождж не скора шчэ кончыцца. Дык, можа, і абначымся тут?..» Ужэ на вечар было дзела. Мяне з цяпла ў холад, па совісці сказаць... Во папаўся заяц! Сяджу, маўчу, не знаю, што рабіць. Думаю, дай пацалую, можа, адчэпіцца на етым. Дурны, як бот... канечне. Етым толькі растравіў яе. Пацалаваў, а яна і раскісла ўся перада мной, шэпча... я ўжо не помню, што яна мне шаптала, нешта харошае, ласкавае...

А я маўчу, не скажу ж ёй, што ў мяне... што я не магу. Гордасць жа ёсць, ну... мужчынская. Я і кажу ёй: «Совісна, Рыпіна, не красіва будзе... Мы жа з табой не мужык і жонка, каб...» Яна мне тады па мордзе, па мордзе — і выскачыла на дождж. А я сеў у цёмным куце, за бочкамі, і заплакаў. У вайну, смерці бачыў — не плакаў, а тут заплакаў, — выдыхнуў дзядзька Іван і горка зморшчыўся.

Сцяпан Кузьміч сядзеў ужо за сталом і таксама чуў канец споведзі.

— Любоў ета прырода, а прырода — вялікая сіла,— нечакана сказаў ён з філасофскаю строгасцю і з нейкай дзіцячаю бояззю трапіць неўпапад.

Я, яшчэ юнак, нейкім падсвядомым чуццём разумеў, што ў сутнасці ўсяго, чаго чалавек дабіваецца, чым жыве і куды імкнецца, ляжыць вялікая сіла Любоў, у якой каханне да жанчыны займае, мабыць, не першае месца.

* * *

З той пары мінула пяць гадоў. І зараз я мушу здзівіць чытача тым, што з Зінаю мы не пажаніліся. Як часта бывае, спярша ўсё ішло на гэта, і «счастье было так возможно, так близко», пажылыя жанчыны на рабоце адкрыта гаварылі, што мне страшэнна пашанцавала: Зіна будзе добрая жонка, працавітая, не разбэшчаная, ніколі не скажа крыўднага, душа ў яе мяккая, ласкавая. Адна жанчына дык проста з харошаю, як мне здалося, зайздрасцю пашкадавала, што Зіна не падтрапілася яе сыну. Наколькі ведаў я Зіну, так яно і было, і, гаворачы пра яе з ухвалою, ніхто ні на макулінку не перабольшваў. Аднак у каханні, як і ў кожнай пачуццёвай з'яве, назіраецца дыялектычны працэс: з аднаго боку, час і сустрэчы яму спрыяюць, як дождж траве, яго мацуюць, з другога боку (і гэта амаль непрыметна), ёсць сілы, што, падобна эрозіі, раз'ядаюць і падточваюць яго. Мне асабіста імпануе думка, што ад знаёмства да шлюбу крок павінен быць найкарацейшы. У нас ён зацягнуўся, і — мы рассталіся, праўда, без абраз, спрэчак і звадак, чаго звычайна ў падобных сітуацыях цяжка мінаваць; мы проста зразумелі, што нам, у адным хамуце, будзе нязручна і не пад сілу цягнуць рыпучы сямейны воз. Кожнаму свайму ўчынку чалавек шукае нейкую — як тут сказаць? — падкладку, і калі не з безаглядную ўпэўненасцю, то ў душы абавязкова апраўдвае яго; з гэтых апраўданняў, здаецца, і нараджаецца тое, што мы называем чалавечымі слабасцямі, ці — апошнім часам — комплексамі.

Усё выяснілася, калі Зіна з рэдакцыі, дзе працавала сакратар-машыністкаю, перайшла на наш філіял завода «Калібр»: я падшукаў ёй пасаду інспектара-кантралёра; мы апынуліся ў адным калектыве, сярод адных людзей.

Наіўная, чыстая, як ліст паперы, хутаранская душа, яна, Зіна, часта трапляла ў няёмкія сітуацыі, чырванела, як неўрастэнічка, гублялася не тое што перад нахабствам, з якім на людзях не так ужо і рэдка сутыкаешся, а перад любою (нават не насмешкаю) усмешкаю, заўвагай, проста словам. Мне, «пашліфаванаму» вялікім горадам, студэнцкім інтэрнатам, вядома, было прасцей арыентавацца сярод людзей, у іхняй усякай там моўнай эквілібрыстыцы — ад звычайнае бяскрыўднае рэплікі да

ядронае пахабшчыны. І часам, калі не бачыў іншага выйсця, я стараўся сваімі паводзінамі, жартамі паказаць ёй, як можна натуральна глядзець на людзей ды іх выбрыкі, — гэта яе злавала, калі не сказаць болей, яна гатова была расплакацца, і здавалася мне, што ў такія моманты яна проста ненавідзіць мяне: твар яе блажэў на белае, а вочы станавіліся чужымі і далёкімі. Мне страшна было гэта ўразумець, і я нейкі час адганяў ад сябе думку (але ў непазбежнасці ёсць свае законы): што Зіна — чалавек, які аніяк не хоча прымаць у людзях заган. Уявіце, як цяжка не тое што жыць, а нават гаварыць з ёю, і якія ж мы дурныя ды недалёкія, калі з першага позірку даём незнаёмаму чалавеку ацэнку. Да таго пераходу на наш філіял Зіна здавалася мне зусім-зусім іншаю, а пасля я ўверыўся, што яе так званая пакорлівая рахманасць ішла ад абмежаванасці, ад бедных, няхай і самых чыстых, уяўленняў пра свет чалавечай душы, і гэта ў яе так урасло, што яго наўрад ці пахіснеш, яно, як маладое дрэва, будзе гнуцца, ківацца на ўсе бакі, але стаяць незварушна на месцы.

Я тым часам ішоў далей, хоць і з аглядкаю, але перамежак між намі няўмольна даўжэў і расцягваўся... А неўзабаве я пераехаў (па службовых прычынах) у Мінск. Перапіска наша, як перш сустрэчы, напачатку была частай, нават цікавай і чуллівай, потым патрэба ў ёй стала глушэць, асыпацца халодным попелам раўнадушша, а праз месяцаў восем яна ўвогуле абарвалася, як нітка, у якой заўсёды недзе ёсць канец.

І вось праз пяць гадоў мне пазваніў Жур, былы калега па рабоце ў Зялёным. Прапанаваў сустрэцца. У канцы змены ён чакаў мяне каля прахадной. У чорным кажуху з белаю аблямоўкаю, такі ж ладны, дужы, з шырокім тварам і кучараваю грываю за плячыма, які помніўся мне ад пачатку знаёмства. І нават у куточках вачэй, каля носа, раслі тыя ж кутасікі цёмных валаскоў, якія заўсёды нагадвалі мне птушку драфу — у яе абапал дзюбкі тырчаць даўгія вусы.

Мы павіталіся.

— Ну, якім ветрам цябе занесла сюды? — спытаў я, адчуваючы, што іменна з гэтым пытаннем прыйшоў да мяне Жур.

— Уладкаваўся на працу.

— У Мінск? — чамусьці здзіўлена перапытаў я.

Жур засмяяўся, і ў куточках вачэй заварушыліся

валаскі: ад задавальнення, маўляў, і мы не лыкам шыты.

Жур расказаў сваю гісторыю, якая, калі чэсна, мяне не здзівіла. Ён палаяўся ўшчэнт з дырэктарам філіяла, і той выжыў яго, а мякчэй сказаць, стварыў такую псіхалагічную атмасферу, што Жур вымушаны быў звольніцца. Вінаваты ва ўсім, на маю думку, не хто іншы, а сам Жур; чалавек няўступчывы, бескампрамісны і да таго ж яхідны, ён належыў да групы тых людзей, якія, павесіўшы на сябе ярлык змагара за справядлівасць, шчырасць, лезуць ва ўсё і да ўсіх са сваёй дробненькай праўдачкаю, якая не мае нічога агульнага з тым высокім і жыццесцвярджальным сімвалам, што стаіць за словам «праўда», а толькі шкодзіць справе, уносячы нервовасць і мітусню ў адносіны між людзьмі.

— Ды ён падонак, падонак ён! — абураўся Жур, а я думаў, што ўсё наадварот, і словы гэтыя можна смела адрасаваць іх аўтару. — Дрыжыць за сябе, за сваё месца. Бесчалавечны, на людзей яму напляваць... — Шчокі ў Жура вачавідкі наліваліся чырванню.

Я не пярэчыў, моўчкі слухаў, хаця, падтакваючы яму, Журу, мог успомніць, што і мне дырэктар філіяла патузаў нервы, калі я звальняўся: не хацеў адпускаць, давёў справу да райкома партыі, і ў мяне адбылася не вельмі прыемная размова з першым сакратаром, якая і дасюль мутным асадкам калышацца ў душы і якой магло б не быць, калі б дырэктар загадзя не нашаптаў на вуха, што я нібыта хачу «збегчы».

— Работу я знайшоў у... — назваў прадпрыемства.— Толькі ты ўжо нідзе не гавары, а то яшчэ дойдзе да таго ідыёта, можа пазваніць... — І нечакана (Жур на гэта мастак) спытаў: — Ці ёсць у цябе хто са знаёмых, каб прапісацца? Ведаеш, праблема...

— Яшчэ якая! — згадзіўся я, прыпамінаючы, што і сам з паўгода не мог прапісацца, дык жа быў халасцяком, а Жур — сямейны, жонка і сын. — На тры чалавекі наўрад ці знойдзеш лішнюю плошчу. — У Жура, ведаў я, у Зялёным уласны цагляны асабняк з верандаю, хлеў, гараж (для матацыкла з каляскаю), і таму прапанаваў яму: — А ты размяняйся — сваю хату на кватэру ў Мінску.

— Ды я... — Жур запнуўся, паказаў на лаўку ля газетнага кіёска. — Хадзем прызямлімся. Ведаеш, і ў мяне такая думка была, нават пенсіянеры знайшліся, якія

далі згоду пераехаць у Зялёнае... У іх двухпакаёўка, вялікая — трыццаць шэсць эм. Раён добры...

— Ну дык за чым справа? Скажу табе, нічога не губляеш. Зялёнае — такая глушэча, забітаўка...

— Жонка рогам упёрлася — хоць у лоб страляй. Хоча, каб яшчэ дзесяць тысяч даплацілі... Кажа, яны, старыя, купяць дом, а потым прададуць тысяч за трыццаць ды пераедуць да дзяцей сваіх жыць.

— Ну і што ёй да гэтага?

— Дык во скажы ж! Плачацца, там ні градкі, ні куронка-свінёнка... Знаеш, як ёй вясковай ад кораня.

— Павер мне, браце, варыянт добры. Упусціш — будзеш шкадаваць.

— Ну, баба! — раптам вылаяўся Жур і сцяў кулакі. — Прыеду, звяжу к чортавай мацеры і забяру дакументы. Яна мне ўсё жыццё поперак дарогі стаіць, параноікам хутка зробіць. А я адчуваю, што магу дабіцца многага. На філіяле мне ўжо нічога не свеціць...

— Што там яшчэ ў Зялёным новага? — спытаў я, калі Жур супакоіўся, з твару адліла чырвань.

— Непрыемная вестка ёсць. — Уздыхнуў. Сашчапіў пальцы. — Зінін бацька павесіўся...

— Хто? Сцяпан Кузьміч? — Я падхапіўся з лаўкі. На галаве пад валасамі і па спіне прабег варашны драбненькі халадок. — А што такое?

— У пуні, зачапіў за крокву дзягу і... Толькі ўранні знялі, ужо стылага. Чорт знае, што загнала яго ў пятлю.

Я, калі мы з Журам разышліся, падумаў, што ён, далёкі сваяк Драздовікаў, мабыць, усё-ткі ведаў прычыну самагубства, ды проста не захацеў мне прызнавацца. Можа, Драздовікі ўсім родам пакрыўдзіліся на мяне? Віна перад Сцяпанам Кузьмічом, Зініным бацькам, абвалілася раптам на мяне гарачым шквалам, які апякаў сэрца і думкі, бунтаваў фантазію. Няўжо Сцяпан Кузьміч панёс з сабою ў магілу сумненні ў маёй шчырасці? Хаця — што я такое зрабіў? Я ж не ўлізнуў, як вуж у нару, я, помніцца, тлумачыў і Зіне, і яе бацькам, у чым мы, кажучы сучаснаю моваю, не сумяшчальныя. Тым болей было відаць, што Зіна аніколькі не перажывае наша расстанне, бо на той час, як я бачыў, у сэрцы яе ўжо засела адчужанасць, хоць і былі мы з ёй па-ранейшаму ветлівыя і адкрытыя.

Я адчуваў сябе засмучаным і непрыкаяным. Мне не

хацелася ісці дамоў, дзе чакала жонка з паўтарагадоваю дачкою.

Дзень выдаўся не надта марозны, але ветраны. Кволыя, дробныя сняжынкі ляцелі паралельна зямлі. Ногі грузлі ў жоўтай снежнай кашы, і неўзабаве я адчуў у чаравіках макрэдзь. Мяне праняла дрыготка, мусіць, не толькі ад холаду, і я, паддаючыся інстынкту самазахавання, зайшоў у рэстаран — у цяпло.

У зале стаяў паўзмрок, чырванавата-глухі ад шчытных аксамітных штор на вокнах і квадратных свяцільнікаў, што густа віселі на сценах. У куце на невысокай пляцоўчацы блішчалі барабаны і ўдарнік, але музыка гучала, аж разрывала вушы, з чорных, як труны, калонак: граў замежны ансамбль у стылі рок-н-рол, можа, нават папулярны «Бі-Джыс» — хто яго ведае, бо я не з тых меламанаў, якіх развялося апошнім часам вельмі шмат; дый настрой у мяне быў далёка не лірычны.

Насупраць мяне за столікам сядзела кампанія маладых яркіх дзеўчынёх; яны пілі, смяяліся, самаўпэўнена падзывалі афіцыянтку, выходзілі за дзверы (шкляныя) курыць і вярталіся назад нейкія паспакайнелыя, засяроджаныя. Гэта іх мадэрновая распешчанасць раздражняла мяне: мне здавалася, калі ў чалавека гора, усе астатнія не маюць права весяліцца.

Я заказаў сабе піва.

Адпіў пару глыткоў, закусіў салатаю і, абхінуўшыся на шырокі чорны пластмасавы падлакотнік, чакаў шніцэль «па-міністэрску». Збоку, мусіць, я здаваўся глыбокім іпахондрыкам.

— Дазвольце? — раптам пачуў і схамянуўся: за столік да мяне прысаджвалася дзяўчына — з тых размаляваных дзеўчынёх за суседнім столікам. — Бачу, малады чалавек сумуе? — Яна была прыгожая тою штучна фарсіраванаю прыгажосцю, якая не толькі не падабалася мне, а нават адпужвала: чыстыя, нарумяненыя, аж ільсняцца, шчокі, тоненькія бровы-нітачкі і вялікі, спакуслівы, крыклівы ад цёмна-вішнёвай памады рот.— Давай да нас — весялей будзе...

Я не сказаў яшчэ ні слова, а дзяўчына, як было відаць, і не чакала майго адказу, яна, упэўненая ў сваёй жаночай магічнасці, мабыць, не сумнявалася, што я не ўстаю супраць яе націску. Вунь як вочы глядзяць, проста выдзіраюць з крэсла, падсвечаныя хмельнай і пачуццёвай млявасцю, прызыўныя. І праўда, на такую дзяў-

чыну цяжка не спакусіцца. Але я, па-адно, што не здольны, мусіць, на такія хуткія кантакты ці так толькі думаю, каб здавацца прыстойным, а па-другое, як кажуць, не да гэтага.

— Прабачце, — сказаў я, даволі смела гледзячы ў магічныя вочы дзяўчыны, — але сёння я вельмі спяшаюся, зараз закушу і пайду. А другім разам, канечне, з задавальненнем пасядзеў бы з вамі...

— Ты не хлусіш? — дзяўчына па-ранейшаму паводзілася бесцырымонна.

— А які сэнс хлусіць?

Мабыць, гэты намёк, маўляў, хто з мужчын адмовіцца ад шчасця пабыць у акружэнні такіх прыгажунь, палесціў дзяўчыне болей, чымся мая згода, і яна, не папрасіўшы прабачэння, з гонарам адышла. Але хутка, убачыў я, накіравалася да дзвярэй курыць.

Я без апетыту пакалупаў відэльцам шніцэль і папрасіў афіцыянтку разлічыць мяне.

Паветра, затуманенае і пранізанае святлом ліхтароў ды рэклам, а таксама снег на асфальце былі невыразнага колеру, цьмяныя; такая ж няпэўнасць ляжала і ў мяне на душы.

Жонка мяне не сустрэла — дзівам было б адваротнае. Сядзела ў халаце на кухні і чытала польскі часопіс «Урода», назва якога ў перакладзе гучала парадаксанальна: «Краса». На стале ў попельніцы ляжала некалькі скамечаных, дакураных да паловы «бычкоў» (іменна жончына слова).

Распрануўшыся, я дзеля нейкага дзіцячага капрызу падышоў да пліты і падняў у каструлях накрыўкі: пустата, як вымецена. Так амаль заўсёды. Жонка мая належала да тых сапсаваных эмансіпацыяй жанчын, якія цвёрда лічаць, што мінулі часы, калі жонка павінна была дзень і ноч таптацца каля печы, на кухні, каб сустрэць мужа з абедам. І яна прынцыпова стаяла на сваім, а я быў надзіва памяркоўны да яе фокусаў, не дакараў і не прасіў, каб на мой прыход дыміліся ў талерках стравы. Было што згатавана, дзякаваў і садзіўся за стол, не было — сам станавіўся да пліты, спакойна, не тоячы на жонку злосць і не шукаючы, чым адпомсціць.

Жонка нават не павярнулася, і я нічога ёй не сказаў, тым болей што есці мне пасля рэстарана не хацелася.

У колькі б гадоў ты ні жаніўся і які б разумны

ні быў, сямейнае жыццё — гэта цемра, якая, на жаль, пачынае праясняцца тады, калі тое, што ў ёй адкрыецца, цяжка паправіць. Уявіць сямейнае жыццё ва ўсёй складанасці з чужых слоў нельга, толькі (і толькі) уласны вопыт раскрые табе яго таямніцы.

Пэўна я не магу сказаць, пашанцавала мне з жонкаю ці не. Стары, мудры чалавек, якому я спавядаўся перад вяселлем і словам-двума абрысаваў Зіну і цяперашнюю сваю жонку, шматзначна намякнуў: «Глядзі, Мікалай, каб з гэтай, што «дужа лёгка з ёй», не завыў воўкам. Можа, якраз з той хутаранкай і трэба жаніцца. А то будзеце спрачацца, каму шкарпэткі мыць...» І як тут зноў не ўспомніць жанчыну па рабоце, Сяргееўну, якая шкадавала, што Зіна не «папалася» яе сыну. Усёткі, мабыць, старых людзей у такой сур'ёзнай справе, як жаніцьба, трэба слухаць.

Так, нягледзячы ні на што, мне па-ранейшаму было лёгка і проста са сваёю жонкаю. Яна не мела да мяне ніякіх прэтэнзій, не пыталася, дзе я і з кім прападаў. А што можа быць даражэйшае за волю пасля трывалых цянётаў сямейных абавязкаў? Дык няўжо яна, мая жонка, у поўнай меры надзелена залатою якасцю — усё разумець? А можа (і гэта, мабыць, самае страшнае!), яна абсалютна раўнадушная да мяне і ёй напляваць, куды я і што я? Абы не п'яніца, прыносіў грошы, клапаціўся пра дачку...

Я не раз парываўся пачаць курыць, не раз заяўляў аб гэтым і жонцы, але яна ўпарта адгаворвала мяне. Сёння я ўпершыню закурыў. Дачка ўжо спала, і мы адчынілі на кухні фортачку.

Курыць таксама трэба ўмець, і я часта кашляў ад дыму. У галаве не праяснілася, здаецца, яна пацяжэла яшчэ больш.

— Што хвалюешся? — спытала жонка і паглядзела на мяне сваімі праніклівымі чорнымі вачыма. Пра Зіну яна ведала: я расказаў яшчэ да таго, як падалі заяву на шлюб. Захавалася ў мяне і Зініна фотакартачка з надпісам: «Здесь нет красы — она не всем дается. Простая здесь душа, простое сердце бьется. Зіна Д. 3 мая 1978 г.» Жонка неаднойчы трымала яе ў руках і не парвала, не сказала, каб знішчыў. Нават тады, калі я даставаў з пакета фотакартачку і, задуменны, доўга на яе глядзеў. Канечне, не кожная жанчына магла б пахваліцца такою вытрымкаю і больш таго — выхаванас-

цю. Спадзеючыся на гэта, я і сказаў ёй проста, не хітруючы:

— Заўтра еду ў Зялёнае.

— Як хочаш. Я цябе трымаць не буду, а ты не настолькі дурны, каб рушыць сям'ю.

— Ну дзякуй табе! — сказаў я са з'едлівасцю, маўляў, якая ты высакародная і даверлівая, а тым не менш махаеш рукою на бацьку сваёй дачкі. — Мяне гоніць туды віна. Разумееш, віна перад гэтаю дзяўчынаю, гэтымі людзьмі, аднаго з якіх ужо няма на свеце.

Мне і праўда было цяжка, Зіна часта снілася: быццам я пакідаю яе, хворую, бледную, а то зусім параненую, у чыстым полі, яна цягне да мяне рукі... Цяпер, калі не стала Сцяпана Кузьміча, я наогул не ўяўляў, што будзе са мною. Жонка — яна ўсё разумее, і тут павінна зразумець.

* * *

Дызель спыніўся, расчыніліся дзверы, і я саскочыў з падножкі. Раз'езд Вербіж! Як усё тут знаёмае: і масляны вострыя пах прамерзлых дубовых шпал, цьмяны сталёвы бляск рэек, што, нібы іголкі, падшываюць зямлю да неба; і зялёная будачка, згубленая сярод вузкіх і стройных, як кіпарысы, ялін; і нарэшце — дарога і ледзь пазначаны адростак сцяжыны ад яе...

Хутар адкрыўся вачам зразу, як толькі вынырнуў з ельніку. З коміна слупіўся ўгару густы, тварожна-белы дым — ёсць у хаце жывая душа. Здаецца, дрогнуў, пасвяжэў, бы ад струменьчыка вады, мой настрой.

На галінах у садзе ляжаў снег, і ад таго яны здаваліся тоўстымі, ватна-пушыстымі, як рукі-ногі мядзведзіка, якога я нёс у сумцы на падарунак Зіне. І на вуллях ляжалі шчытныя высокія падушкі снегу: мабыць, яго даўно ніхто не счышчаў. Каля ганка сустрэў мяне і завіляў хвастом Босы. Няўжо пазнаў? Я пагладзіў яго па маленькай касцістай, як у чарапахі, галаве, і ён удзячна лізнуў мае пальцы цёплым языком.

Вокны былі замураваны, і мяне з хаты ніхто не бачыў. Я падзугаў на ганку нагамі — абіваў снег, — потым яшчэ ў сенцах. Калі адчыніў хатнія дзверы, то ўбачыў, што сюды, да парога, спяшаецца Зіна, хаця... у нейкае імгненне мільгнула ў галаве думка: «Ці Зіна гэта?» Так, без сумнення — Зіна, толькі яна вельмі змянілася — па-

худзела: вочы, і раней вялікія, сталі, як у народзе кажуць, па яблыку, вакол іх скразіла натуральная густая сінь, з нейкім нездаровым салатавым адценнем; усё гэта было чужое, і я ледзь не заплакаў.

Зіна ўскрыкнула і спынілася; мусіць, аслабелі ногі, і яна не падышла да мяне, а села на табурэтку да стала, глядзела адтуль дзікімі вачыма. Я, роблена, а таму фальшыва, надаючы сабе весялосці, пацалаваў яе, здранцвелую, у шчаку і дастаў з сумкі залацістага плюшавага мядзведзіка і пучок прывялых за дарогу ружовых гваздзікоў: не помню, як Зіне, а мне з маленства падабаюцца кветкі бледна-ружовага колеру, як і дзяўчаты ў сукенках такога ж колеру... Дарэчы, можа б, і не сышоўся я з Марыяй, сваёй цяперашняй жонкаю, калі б не была яна на тых памятных імянінах братавай жонкі ў даўгой атласнай ружовай сукенцы, якая ў мігценні святламузыкі пералівалася, як рыбіна.

— Ну ты і даў! — сказала Зіна, і, калі б не ведаў яе, мог бы падумаць, што яна незадаволена маім нечаканым візітам; яна, канечне, ведала, што я ўжо маю сям'ю, — такія навіны знаходзяць людзей самі. Я спытаў у яе пра бацьку, Сцяпана Кузьміча, паспачуваў: харошы быў чалавек. І зрабіў гэта не па адвечнай завядзёнцы ўспамінаць нябожчыкаў толькі добрым: Сцяпан Кузьміч Драздовік напраўду мне падабаўся, можа, я і не растлумачу да канца — чым, але яго немітуслівыя думкі, простая манера паводзіцца з людзьмі, незалежны, прамы погляд на рэчы — з'ява не такая ўжо частая ў наш век дыпламаты — знаходзілі ў маёй душы тую струну, трымценне якой дае адчуванні прыемныя і ўзвышаныя.

Зіна — яна не ўмела ўтойваць — расказала мне пра бацьку.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ноч была светлая, бо месік у небе стаяў ясны, аж сіні, — вакол ніводнага воблачка, толькі зоркі, і снег на зямлі чысты, блакітны і лёгкі, як шлюбны вэлюм. Светлы смутак наваколля змрочным адбіткам клаўся на душу Драздовіка, можа, чарнейшым, чымся цень ад яго самога, чалавека, і сабакі, — усё здавалася мёртвым.

Ён ішоў згорблены, разбіты, ледзь пераастаўляў ногі. Тут, сярод пустога поля, ён мог бы завыць воўкам, калі б не Босы — адзіная істота, якая магла цяпер яго зразумець.

«Ну што, Босы-Басяк, затрашчалі мы па ўсіх швах. Матка наша... ета мая жонка, наставіла рогі, выходзіць... Ты не разумееш, як у людзей ета бывае. Кажуць, з дырэктарам школы знеслася. Во і давярай бабе. Давярай, ды правярай. Ну, позна, позна прыходзіць — клопат, хадзі, работы, канечне, усім хватае. А з дзяцьмі? Папроб навучы кожнага, уталкуй... Ета не зайцоў ганяць. Але як бы ні скрываў сябе, усё наверх рана ці позна вылазіць. І не падумаеш, адкуль і калі вылезе. Рахвяёнкаў дзіцёнак шалік там нейкі гер... р... махеравы... чорт! — шчэ во мацерным словам ні за што ні пра што краянеш. Ну, карацей, нейкі вельмі дарагі, забыўся. Лупіў-лупіў Рахвяёнак сына — не ідзе той па шалік, кажа, баюся. Пайшоў сам... жонка яго з ангінаю ўсю зіму качаецца. Ён блізка ля школы жыве. Не запёрта яшчэ. Ён у адзін клас ныкнуў, у другі... Голыя ногі з-за грубкі тырчаць, дзве пары якраз. У цябе, Басяк, дзве пары дык ты адзін, а калі ў чалавека, дык іх ужо двое... Месік, во як сянні, у акно свеціць, яму і відна. Дзверы рыпнулі — тыя ногі зняцяйкі і падхваціліся... Во такое дзела, брат Басяк. Скажу табе, ніколі і не падумаў бы на сваю жонку... Яна-та не прызнаецца, а я сам не бачыў. Людзі, яны што хочаш выдумаюць, плётку пусцяць, а ты папроб дакажы, так ці не так. Цяпер во сварымся кажнадзень. А толку? Адно нервы свае апошнія смурыжым. Дзеці за яе, за матку... Унук — радасць, але ён далёка. Во як...» — Драздовік уздыхнуў, і сабака глянуў на яго — добрымі, спагадлівымі, але няцямлівымі вачыма, вільнуў хвастом — як знак увагі да гаспадара.

«А на рабоце што ў нас здзеелася, брат Басяк?.. Цэлую дзялянку ў маім абходзе спляжылі, каб іх... Сянні абнаружыў. Пні высокія — нехта спяшыў. Злодзей ён і ёсць злодзей. Па скатах мы з табою кінуліся — на шашу прывялі. Ішчы-свішчы ветру ў полі. Аб'ездчыку заявіў... Ён камісію сабраў, і дырэктар наш, лясгасаўскі... Добры ён чалавек, скажу табе, ты бачыў яго — на лася разам хадзілі залетась. Кажа: «Штрафаваць, Кузьміч, не будзем, але, брат, не спі ў шапку». А ці я штрапу баюся? Штрапам лягчэй за ўсё аддзелацца. А ў совісці ж дзірку ім не залапіш. І будзе ў ёй свістаць вецер, зудзець... Дырэктар наш — чалавек золата, такіх на маім вяку нямнога пападалася. Страм цяпер у вочы яму паглядзець. Ты вот, Басяк, і ёсць Басяк, не знаеш, што калі вінаваты, дык глядзець у вочы чэснаму чалавеку —

пакуту большую не прыдумаеш. А нам жа сустракацца з ім. І сянні во чарку з ім узялі. Ён — чалавек харошы, кажа: «Табе, Кузьміч, цяжка на душы, давай вып'ем...»

Сабака зноў павярнуўся да гаспадара — адно і тое ж слова, пачутае некалькі разоў, мабыць, насцярожыла яго: можа, каманда якая. Не, гаспадар сунуўся як нежывы і, здаецца, ніякага жадання да яго, сабакі, не меў.

Тым часам і хутар паказаўся — чорныя плямы на іскрыстым, блакітным палатне. Чалавек спыніў хаду. Куды я іду? Навошта я там?

Спыніўся і сабака, лёг на снег і стаў выгрызаць між пальцаў намёрзлыя лядзяшкі. Падхапіўся, бо гаспадар патупаў далей. На сабаку на поўсці льсніліся сняжынкі — бы тыя зорачкі на небе, не змяніўшы памераў, апалі на яго.

Ціха, чыста, светла было на двары, што на небе ад зорак. Чалавек адчыніў дзверы ў пуню — цемната, хоць вока выкалі, і ён ступіў у гэту цемнату, як у магілу. Дзверы, зачыніўшыся, схавалі ад яго святло і зоркі. Можа, з мінуту стаяў нерухома, адна думка калола яму свядомасць: «Як цяпер жыць?» Раптам здалося, што пасвятлела ў вачах, — падняў галаву: у самым вільчыку, са шчыліны між шыферам свяціла буйная зорка, блішчала, хіталася, акурат яблык. Ён намацаў лесвіцу, па якой лазілі на вышкі па сена, і пабраўся ўверх... Зорка то хавалася з вачэй, то зноў паяўлялася, рэзала вочы. Сена каля праёма было выбрана, і ён стаў на пераплеценыя лазою жардзяныя латы — святло са шчыліны шабельнаю палоскаю ўдарыла яму па галаве і плячы — белым камяком снегу засерабрылася скроня: шапку чалавек трымаў у руцэ, потым выпусціў яе, і яна паляцела ў праём. Уздыхнула ўнізе карова.

Чалавек расперазаў дзягу, зрабіў пятлю і прывязаў канец за крокву, каля самай зоркі. Прыпадняўся на дыбачкі, аж хруснула ў крыжы.

...Па шыферы пайшоў трэск, канула ў цемру зорка, а белую скроню закрыла чорная паска дзягі.

Уранні, яшчэ на цёмнай зары, тужліва завыў на двары сабака — і тое ж імгненне расчыніліся ў хаце дзверы.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

— Мамы няма — у дзядзюша Івана, ён закалоў кабана, — сказала Зіна, калі мы, здавалася, ужо ўсё абгаварылі. — Вадзік у Зялёным — кажуць, ён п'е... — Яна

была як нежывая, рыхтык мумія, прыгнечаная, вочы глядзелі міма мяне, на вокны, з тугою і нейкаю старэчаю асуджанасцю. — Есці хочаш? Ой, што я пытаю!..

Зіна заўсягды, колькі помню, была ўважлівая да гасцей, хваравіта чулая да іх просьбаў. Можа, таму да іх, Драздовікаў, часта наязджаў начальнік міліцыі, нібыта далёкі сваяк. Неяк быў (пасля кастрычніцкай дэманстрацыі) і дырэктар філіяла.

Зіна дастала з печы і паставіла на стол боршч з зялёных памідораў, утушаную з індычацінаю бульбу — дыміла густою параю. Наліла мне калінавай настойкі і сабе ўпліснула кроплю — дзеля гасціннасці. Нават яна, гэта пякучая, бы перац, настойка не разбудзіла мой апетыт: я нехаця сёрбаў зачэрпістай драўлянай лыжкаю боршч.

— Калі нясмачна — не еш, — сказала Зіна вельмі непасрэдна, і мне, як заўсягды, здалося, што толькі адна яна ў свеце жыве па законах прастаты і даверу, а не самалюбства.

Утушаная бульба, мяккая, хрупяная, была такая смачная, што міжволі прасілася да рота; кавалачкі індычаціны, падсмажаныя да чырвані, духмянілі самым салодкім, які існуе, водарам вясковае беларускае стравы. І тым не менш уся гэта сідня за сталом была для мяне пакутаю і ніяк не асалодаю. Яна, асалода — ведаў здаўна, — была заўсягды там, на полі, парослым на ўскраінах дробным хмызняком і куртатымі, як венікі, бярозкамі, а таксама ў лесе, сцішаным і здранцвелым у зімовай пакорлівасці лёсу.

Я і папрасіўся ў Зіны туды — на старыя сцежкі. Яна, падобна, узрадавалася: мусіць, ёй было прыемна думаць, што тут, у гэтым краі, і мне ёсць нешта дарагое. А можа, думалася ёй інакш: што я аб нечым незваротным шкадую, — і тады яна, мабыць, бліжэй да праўды. Так ці іначай, я ўзяў, бадай, дзеля прыліку знаёмую мне ламачыну-бярданку і выйшаў на двор. Босы, згледзеўшы мяне на ганку, завішчэў і стаў падскокваць ад радасці. Я лёгенька патузаў яго за мяккае, бы шкумат, вуха, а ён пастукаў мне хвастом па нагах — мы паразумеліся, але адно да... вясніц. Я выйшаў з двара, а Босы спыніўся і апусціў хвост. Я пасвістаў яму, пакратаў пальцамі. Сабака глядзеў на мяне як на дзівака: «Ці я табе дурная курыца, што ты маніш мяне, быццам зерне сып-

леш?» Я вярнуўся ў хату, па дарозе лісліва правёўшы далоняю Босаму па спіне, папрасіў у Зіны хлеба.

У мяне была надзея давесці Босага да заечых слядоў, а там — адкуль і шал возьмецца! Толькі дарэмна я спадзяваўся: так-сяк, кідаючы вакол сябе кавалкі хлеба, я заманіў Босага ў поле, паказваў яму свежыя начныя сляды, але ён гідліва чмыхаў, як калісьці каля купін, і круціў галавою. Дзіва, дый толькі! Сабака не ішоў за мною і не хацеў мне служыць, хоць, пэўна ведаю, ссумаваўся і па вострым паху слядоў, і па гарачым гоне. Ён што — усё яшчэ тужыць па Сцяпану Кузьмічу ці проста быў і застаецца верным аднаму чалавеку?

У мяне зразу прапала наваяўленая зухаватасць, і я не вельмі радасным вокам глянуў на чорны, глухі лес. Аднак не павярнуў, пайшоў туды — на чорную, глухую, маўклівую сцяну. Азіраўся: Босы, прыпыняючыся раз-пораз, плёўся за мною.

У лесе пад елкамі ляжаў снег, усыпаны ржаваю ігліцаю, на камлях застыла жоўтая сухая смала; з лаўжа бязладна тырчалі чорныя сукі, акурат вужыныя галовы... Дарэчы, пра гэтых вужоў. Не так сабе я пра іх падумаў. Днямі, сярод сумных сноў пра Зіну, прысніўся і гэты. Нібыта я натрапіў на краі поля на клубок чорных змей. Поўзаюць — я хачу ўдарыць палкаю, але яны хаваюцца пад бульбоўнікам, у траве, паяўляюцца новыя, усё нейкія рахманыя, спакойныя... І тут прыбягае мая дачка, носіцца па бульбе, а мяне страх ахінае, каб не наступіла на змяю. Змеі шыпяць проста каля яе ножак, і я прымяраю, на якой вышыні яны дастануць укусіць: ведаю, чымся бліжэй да галавы, тым небяспечней. Да чаго б гэты дурны сон?

Мне стала вусцішна, і я мацней прыціснуў да сябе бярданку. Свістаў і зваў Босага. У адным месцы здалося, быццам яго рудое цела мільгнула між куп'я, пасля па слядах убачыў, што спудзіў лісу. Босы — калі быў дзесь паблізу — зацахліў бы. Знаць, не пайшоў за мной, знаць, вярнуўся на хутар. Мабыць, чакае гаспадара і баіцца прапусціць момант, калі той заявіцца. А што будзе, калі Зіна з маці пераедуць у Вербіж? Няўжо Босы застанецца тут на хутары? Канечне, застанецца. Пісалі ж неяк у газеце, што сабака, аўчарка, два гады чакаў свайго гаспадара на аэрадроме, з якога той паляцеў на самалёце.

Мне было непрытульна тут, у змрочным лесе, далё-

:ка ад сям'і, думаць, што жыццё ў сваім цячэнні няспыннае і ў логіцы сваёй непарушнае і што са змроку чалавек заўсягды выходзіць да святла... І шмат яшчэ аб чым думаў я ў гэты свой паход у лес, і радасна мне было за Зіну, нягледзячы ні на што, і шкада самога сябе, а можа, і не сябе, а падобных да мяне людзей, якія, бы ўклейкі на крошкі хлеба, кідаюцца, мітусяцца, шукаюць у высях сваю жар-птушку, ды яна, мабыць, зусім не ў высях.

Я выйшаў нарэшце з лесу на поле, на чысты і белы снег — і зажмурыўся.

* * *

Подласць і ёсць подласць, яна — адна, а шляхоў-дарожак у яе шмат. Як у мурашоў, што выпаўзаюць з адное глыбокае чорнае норкі.

Вярнуўшыся з Зялёнага, я некалькі дзён хадзіў як апушчаны ў ваду. Меланхалічны змрок асеў на мяне страшэннаю сілаю, якая душыла і ўночы. Я баяўся глянуць у люстэрка, ды яскравейшым у свеце люстэркам мне служыла цяпер жонка, «мой разумечык», і па яе твары я чытаў усё, што было напісана на маім. Яна ківала галавою, хмыкала, але маўчала — да пары да часу: у жаночай гордасці таксама ёсць мяжа.

— Што? — пытанне гарачым недакуркам сарвалася з яе губ і ўпілося мне ў сэрца.

— Ты мела рацыю, калі гаварыла, што сям'я — святое дзела, — сказаў я з нястрымнаю дрыготкаю ў голасе: не мог, змучаны перажываннямі, саўладаць з сабою. — У любой сітуацыі дачка застаецца маёй дачкой. Але... Ты павінна зразумець мяне да канца.

— Я слухаю, — жонка, як прадчуваючы замах на яе гонар, села ў крэсла, і вочы яе сталі налівацца нейкай калючаю, яхіднаю помслівасцю.

— Мы не будзем з табою разводзіцца, але я... Я проста не магу не паехаць туды... на хутар, да Зіны.

Я ўбачыў, як у жонкі пачалі імгненна звужацца зрэнкі, у мяне гэты час, адчуваў, яны расшыраны, як у вар'ята. Я і праўда, мабыць, нёс лухту.

— Я не ведаю, што мяне там чакае. Канкрэтна Зіне я нічога не гаварыў. Яна павінна мяне зразумець...

— Дык гэта ж самая вялікая подласць! — сутарга перакрывіла жонцы прыгожыя, поўныя вусны, на сярэдзіне якіх фарбу забрала цыгарэта. — Гэта я не дарую

табе ніколі. Ты — здраднік! Разумееш, самы подлы на свеце здраднік!.. Як я магла пражыць з табою цэлыя тры гады? Жах!..

— Марына! Марына, сядзь!.. — здаецца, і мяне пачала біць істэрыка. — Жыць без кахання — таксама подласць. Адказнасць, скажаш? Так. Але яна не зніжаецца ў цябе ад таго, што ты выйшаў з дому на вуліцу і доўга не вяртаешся. Я выходжу іменна на вуліцу, а не з сям'і.

— Не! Я справу гэту не кіну так, я пайду к табе на працу, к дырэктару. Хай разбяруцца. Ты — амаральны тып! Як я гэта зразу не разгледзела? Дурная баба!

— Чалавек усё жыццё памыляецца, і толькі гэта прымушае яго шукаць ісціну, а ісціна адкрываецца толькі перад смерцю. Можа, і я памыляюся.

— Ты не круці хвастом. Я дала табе волю, я старалася ўсё зразумець. А цяпер я не хачу цябе слухаць! Так... — у яе надзіва хутка параўнеў голас. — Або заяву на развод — і тады ты можаш прыходзіць да нас... дачкі. Проці закона не папрэш. Або вымятайся — і ні кроку сюды.

Я дасюль не магу зразумець, што мяне падбіла выбраць другі варыянт. Можа, няўпэўненасць у тым, што намысліў? А можа, наадварот — упэўненасць! Я быў сляпы і бязглузды, як каценя. Са мною ніколі такога яшчэ не было, каб я кідаўся безразважна ў нейкую крайнасць. Няўжо так хутка сасмыкваюцца на нішто ў чалавека нервы?

Праз два дні, сказаўшы на працы, што, можа, буду звальняцца, я зноў паехаў у Зялёнае. Можна ўявіць, якою доўгаю, быццам у ад, неймаверна пакутліваю здалася мне дарога...

— Ты зноў? О, божа!.. — прастагнала Зіна, адчыніўшы мне дзверы, і апусціла сашчэпленыя ў пальцах рукі. У хаце была і маці — Галіна Сямёнаўна: сядзела пры акне і правярала сшыткі. Здаецца, з твару яна не змянілася, а калі змянілася, то на лепшае — як бы пагладчэлі, расправіліся шчокі; нешта новае, насцярога, ці што, была ў мяккіх, шэрых вачах.

Сутнасць маёй блытанай гаворкі Зіна ўлавіла па першых сказах, вочы яе сталі адчужацца, і яна заматала галавою.

— Ты што, не кахаеш мяне? — я ўжо вымушаны быў пайсці на абразлівую адкрытасць.

Зіна задумалася.

— А чаму мы не пажаніліся? — пытаннем на пытанне адказала яна.

— Па маладосці ўсё бывае. Галава ходзіць кругам, а сэрца рвецца ўдалеч. Вось і разлучыліся.

— У цябе сям'я, Коля. Ты што? Прачніся...

— Бывае, што і не адну сям'ю чалавек заводзіць, — сказала Галіна Сямёнаўна, якая дасюль маўчала, і мне здалося, што яна падтрымлівае мяне, а не дачку.

— Не і не! — Зіна заўсягды была да тупасці ўпартая, але надзіва спакойная, у роўным настроі. — Нам нечага з табою папраўляць, Коля... Мы нічога не разбуралі...

«Што цяпер рабіць? — думаў я, ушчэнт разгублены. — Няўжо ў яе душы нічога не засталося ад нашых сустрэч?»

— І няпраўду кажаш. Я пастаянна думаю пра цябе. А хіба можа так быць, калі між намі пустата? Можа, мы, маладыя-дурныя, нешта не разгледзелі ці нешта нас стрымала. Не анёлы ж мы. Галоўнае — не зацінацца, а выпраўляць памылкі.

— У цябе дачка, Коля...

«Усё!.. Яна не саступіць. І чаму я не падумаў пра гэту яе ўпартасць? Што ўсё-ткі яе стрымлівае: ці боязь да смерці іграць незайздросную ролю разлучніцы, ці чаканне таго, свайго Адзінага?»

Я выйшаў з хаты, бы з туману, і позірк мой зразу чамусьці ўпаў на грэцкі арэх. На маленечкіх чорных, бы вугаліны, арэхах слупкамі стаяў снег. Я доўга глядзеў на арэхі і на снег: вузельчыкі арэхаў былі зморшчаныя, неразвітыя, і ў душы ў мяне прачнуўся і зноў зашчымеў з новай сілаю даўні боль. Мне так хацелася шчырасці, спагады, чысціні...

Па сцежцы да раз'езду мяне праводзіў Босы: ішоў адзаду, пята ў пяту. Я пачуў далёкі свісток дызеля і спыніўся: «А куды мне ехаць?» Хутар адсюль, дзе я спыніўся, быў яшчэ відаць. Да Мінска намнога-намнога далей, ды не адлегласць мяне палохала.

# АПАВЯДАННІ

*



## ПЕРАД ВЯСЕЛЛЕМ

Шайдукевіч выйшаў з універмага. У «дыпламаце» ў яго ляжалі дзіцячы пісталет і шэсць пластыкавых патрончыкаў у вузенькай чорнай абойме. Ён сам упершыню бачыў зарадны дзіцячы пісталет і радаваўся, што натрапіў акурат на універмаг, а не на цацачны магазін, дзе такіх пісталетаў, можа, не было б. Уяўляў, як заскача сын ад радасці, як загарацца шчасцем яго вочы.

У абласным цэнтры Шайдукевіч быў некалькі разоў, але ўсё праездам, і горада амаль не ведаў. Цяпер ён пажыў у ім чатыры дні, трохі сарыентаваўся, ды ўсё роўна вялікі горад не проста вывучыць.

Камандзіроўка скончылася, і Шайдукевіч збіраўся ад'язджаць. Афіцыянтка гасцінічнага кафэ, у якім абедаў, сказала яму, калі на развітанне запісваў ёй падзяку, што да вакзала дзесяць мінут хадзьбы, але не прамою дарогаю, а па вуліцах і завулках. Час у Шайдукевіча быў, і ён адправіўся на вакзал пехатою: якраз хацеў купіць падарунак сыну, якога ўзяў з сабой і пакінуў на гэтыя чатыры дні ў вёсцы ў маці.

Была восень. Дзень выдаўся ціхі, тонкая ружаватая смуга плавала па вуліцах. Клёны і ліпы стаялі ўжо светлыя, нейкія аж празрыстыя: здавалася, усхопіцца вецер і панясе іх, як лёгкія адуванчыкі, на край свету. Шайдукевіч быў у рудым плашчы, без шапкі, у светлых, кафейнага колеру туфлях. Твар у яго заўсёды строгі, задумённы — і гэта відаць, — а на душы ўсяк бывае: не заглянеш. Цяпер, бадай, Шайдукевіч знаходзіўся ў роўным, лагодным настроі, які прыйшоў да яго, можа, і ад таго, што ён хутка справіўся з заданнем: аб'ездзіў усе раённыя агенцтвы «Саюздрук», распытаў, як ідзе падпіска на газеты і часопісы. Начальнік, Мікашоў, калі афармляў камандзіроўку, папрасіў: «Ты пытайся не толькі пра тыражы, а і пра новыя формы распаўсюджвання перыядычных выданняў». Здавалася б, дробязная падказка,

але дала Шайдукевічу нітачку, якая зразу завязвала пэўную, дзелавую размову.

З трох кітоў, на якіх, кажуць, стаіць чалавек — здароўе, сям'я, работа, — апошні быў для яго цяпер, мабыць, самы надзейны.

— Скажыце, колькі зараз часу? — пачуў Шайдукевіч і спыніўся. Перад ім стаяла дзяўчына ў чорным скураным паліто і з чорнаю сумачкай у руках. Яна глядзела на Шайдукевіча з такою вытрыманасцю і спакоем, што ён падумаў, быццам яны знаёмыя.

— Дваццаць мінут на трэцюю.

Дзяўчына падзякавала, і ў нейкае імгненне Шайдукевічу здалося, што яна не спяшаецца ісці далей, а можа, проста яму самому захацелася яшчэ трошкі пабыць з ёю, і ён сказаў:

— А вы мне, можа, падкажаце, як да вакзала дабрацца?

Дзяўчына квола варухнула поўнымі, з крутымі завілінамі вуснамі — усміхнулася, — і, павярнуўшыся, стала паказваць рукою і расказваць, як знайсці вакзал. Шайдукевіч, можа б, і запомніў, калі б слухаў уважліва. Дзяўчына некага яму напамінала, яе адкрытая, мабыць, вясковая дабрадушнасць яму падабалася (як і раней у людзях), і ён, нечакана для самога сябе, папрасіў:

— Калі ў вас ёсць час, то праводзьце мяне, калі ласка.

Дзяўчына паціснула плячыма, па твары ў яе прабег цень сарамлівасці.

— Давайце правяду, — згадзілася яна.

Шайдукевіч не толькі здзівіўся, яго ўразіла, што гэта маладзенькая зусім, з чыстымі і яснымі вачыма дзяўчынка згадзілася ахвяраваць сваім часам дзеля яго, незнаёмца. Яму стала аж няёмка, свой эгаізм нечым трэба скупляць, і ён лагодным, можа, нават вінаватым голасам спытаў у яе:

— А вы гуляеце па горадзе ці едзеце куды?

— Еду, але вечарам...

— Куды?

— На вяселле. — Дзяўчына адказвала проста, не задумваючыся, як добра вывучаны ўрок.

— На чыё? — Не то гэта былі такія моманты ў ягоным настроі, не то людзі траплялі́ся такія, але іншы раз Шайдукевіч мог дазволіць сабе і бесцырымонныя пытанні, ад якіх потым яму было прыкра.

— На сваё.

— На чыё?.. — Ён умеў здзіўляцца часам прытворна, ад наіву, ці што, а тут здзівіўся натуральна, шчыра: мілая, светлая, зусім юная дзяўчынка і раптам — вяселле.

— На сваё, — паўтарыла дзяўчына, і ў яе голасе Шайдукевіч улавіў ганарлівую нотку.

— Віншую! Такая падзея...

Яны перайшлі дарогу. Тратуар цяпер прыціскаўся да высокай мураванай сцяны нейкага завода — з труб валіў чорны дым, пахла паленаю гумаю. На клумбах раслі кветкі, але цвілі толькі ліловыя астры.

— А вы працуеце ці вучыцеся?

— Працую.

— Кім?

— Зубным тэхнікам... Кончыла Віцебскае медвучылішча. І тут па накіраванню. — У размове дзяўчыны паявіліся яшчэ большая свабода і раскаванасць, а ў яе чыстых, ясных вачах засвяцілася не то гарэзлівая ўсмешлівасць, не то заняволеная напышлівасць, што сведчыла аб несапсаванасці душы і здаровым самалюбстве.— Толькі тры месяцы працую.

— Падабаецца работа?

— Падабаецца... — усмешка растуліла ёй вусны, і між імі бліснулі дробныя, як гарох, зубы. — Знаеце, як памагаць людзям — харашо...

Іменна па слову «харашо» Шайдукевіч упершыню ўлавіў, што дзяўчына трошачкі расцягвае зычныя гукі, і гэта надае голасу густую мяккасць, а ёй самой сціплую, некрыклівую мілату, якая не магла не кранаць.

— А жывеш дзе? — Шайдукевіч перайшоў на «ты» і сам не ведаў чаму, але нейкае нутраное пачуццё яму падказвала, што далейшая афіцыйнасць будзе абразліваю для абаіх.

— У інтэрнаце, з дзяўчатамі... Яны паслязаўтра прыедуць да мяне на вяселле. А я адпрасілася на два дні, у мяне былі адгулы... Знаеце, трэба ж памагчы маме... — Дзяўчына ад чыста дзіцячай непасрэднасці ў размове пераходзіла на дарослую разважлівасць, якая яшчэ болей гаварыла аб чысціні і прастаце яе натуры.

— А бацькі ў цябе хто?

— Тата дырэктар саўгаса, а мама ў бухгалтэрыі працуе.

— О, багатая нявеста! — міжволі ўсклікнуў Шайдукевіч і спахапіўся, што, можа, варта было і стрымаць свае эмоцыі.

Дзяўчына зноў усміхнулася, з мяккім, прыемным ёй самой надрывам сказала:

— Усе так гавораць... Ты багатая, раз у цябе бацька дырэктар саўгаса. А мы нічога і не багатыя, у нас нават машыны сваёй няма...

— Саўгас бедны? Адкуль ты?

— Не, не бедны... З Чэрыкаўскага раёна.

— Магілёўшчына? — спытаў Шайдукевіч не таму, каб выпнуць сваю кампетэнтнасць, а каб паказаць, што ён не нейкі выпадковы тып, а свой, тутэйшы, усё ведае, і дзяўчыне няма чаго асцерагацца.

— Ага... Да Чэрыкава на аўтобусе, а там мяне тата сустрэне.

— Так-так, у цябе важны паварот у жыцці, — Шайдукевіч адчуваў, што пачынае хвалявацца. — Віншую яшчэ раз і жадаю светлай прамой дарогі і вялікага сямейнага шчасця!.. — Голас у яго крыху задрыжаў. Колькі часу ішлі моўчкі. Шайдукевіч не заўважаў, што паскарае крок, адно чуў, як шамаціць у дзяўчыны скуранoe паліто — яна ледзь паспявае за ім. Думкі віліся ў ягонай галаве, але ўжо не каля дзяўчыны, а каля сваёй сям'і, якая распалася. Вясной развяліся з жонкаю. У разладзе сям'і рэдка бывае вінаваты адзін чалавек, звычайна вінаваты абое — Шайдукевіч пра гэта ведаў і, тым не меней, лічыў, што ў іх разводзе вінавата жонка калі не на ўсе сто працэнтаў, то на дзевяноста дзевяць пэўна. Яму не пашанцавала з жонкаю. Ён зразумеў гэта на самым пачатку сумеснага жыцця. Яна аказалася з тых, хто зусім не прызвычаены да жыццёвых турбот і цяжкасцей. Удабавак эгаізм, хваравітае самалюбства, якое не дае чалавеку прызнаваць свае памылкі, віну. Шайдукевіч як мог настройваў жонку, раіў уцягвацца ў быт, «урубацца», як ён любіў казаць, у жыццё; жонка нічога не прымала, адхіляла ўсе яго парады з тупою саманадзейнасцю і, замест таго каб перавыхоўвацца, пачала абвінавачваць яго, што ён не памагае ёй. І гэта была несправядлівасць, якая болей чымся што абурае чалавека сумленнага і засланяе ад яго часам ісціну. Шайдукевіч акурат і мыў сам, і стравы гатаваў лепей, чымся жонка, і па магазінах бегаў, і потым вадзіў у сад-яслі сына. Пачаліся сваркі, папрокі, абвінавачванні, з паву-

чыны якіх выблытацца было немагчыма, і, каб разарваць яе ўсё-такі, выйсце было адно — развод. Заяву падала жонка, ён, Шайдукевіч, не пярэчыў, у чым і дасюль не раскайваецца. І цяпер сям'я, адносіны мужа і жонкі былі для яго балючаю ранаю, якую акурат і зачапіла сустрэча з дзяўчынаю, што збіралася замуж, і Шайдукевіча пасля сухіх, абавязковых камандзіровачных размоў цягнула пафіласофстваваць на «жывую» тэму.

— Які складаны арганізм сучасная сям'я! Вельмі складаны. З электронікай можа смела супернічаць. Як завядзеш яго напачатку, у першыя дні, месяцы, так і будзеш жыць. — Шайдукевіч гаварыў пафасна, агульнымі словамі, і яму самому такая гаворка не падабалася. — Трэба старацца як менш, а лепей зусім не гаварыць, — ён павярнуўся да дзяўчыны, глянуў, ці слухае: кожная клетачка твару яе, здаецца, была насцярожана, — калкасці, абразы адно аднаму, благое, заганнае пра сябе і сваіх родзічаў, а таксама пра сваё мінулае... маецца на увазе: нехта цябе кахаў, некага ты кахала...

— Чаму? — спытала дзяўчына, і было відаць, што ёй і праўда дзіўна чуць пра нейкія забароны: усё ж так проста, зразумела, хараша.

— У тым і бяда, што чалавеку не ўсё дадзена зразумець, і часам у звычайным бяскрыўдным факце бачыцца... ледзь не трагедыя, падзенне. Адсюль папрокі... незаслужаныя, а яны нараджаюць непрыязнасць. Трэба як менш папрокаў, бо яны, на жаль, не забываюцца, асабліва жанчынамі... І тады непрыязнасць перарастае ў нянавісць. Мужчына не ўмее ненавідзець, ён толькі злуе, а жанчына можа ненавідзець.

Шайдукевіч не ведаў, ці разумее яго дзяўчына; тое, што ён хоча ёй сказаць, а ў нейкі момант ён увогуле засумняваўся, ці трэба ёй ягоныя разважанні і тое, што ён вынес з асабістага жыцця, але апраўдваў сябе, што гаворыць з адною мэтаю: каб засцерагчы дзяўчыну ад бяды, у якую сам трапіў, можа, і па нявопытнасці, і каб ёй было ў жыцці лягчэй, чымся яму. Бо калі ўжо мужчыну, які страціў сям'ю, цяжка, часам адзінота даводзіць да такой прыгнечанасці, што, здаецца, звар'яцееш ці пакончыш жыццё самагубствам, то што ўжо гаварыць пра жанчыну, слабую, эмацыянальную істоту.

Дзяўчына слухала Шайдукевіча, здаецца, уважліва, можа, нават занадта, бо яе твар яшчэ болей пастражэў, на ім і ў вачах патухла святло, быццам дзяўчына над

нечым непрыемным думала ці ў нечым засумнявалася.

Яны звярнулі направа, і вачам зразу адкрыўся вакзал — двухпавярховы светлы будынак. Каля яго было многа аўтобусаў, легкавых машын і людзей. Пад стрэшкамі стаялі лаўкі, і Шайдукевіч прапанаваў дзяўчыне сесці. Яны селі побач, і дзяўчына неяк даверліва, шчыра прытулілася да яго, і гэта было як сведчанне яе і ўдзячнасці, і, можа, — хай дарує! — сімпатыі да яго. Шайдукевіч даўно прымеціў, што нечым у сабе, тварам, вачыма ці чым іншым, дае падставу дзецям пытацца, колькі часу, а выпівохам прасіць капеек. Здаецца, і гэта маладзенькая дзяўчына прыгарнулася да яго душою, і, мабыць, не словы тыя, што сказаў ёй дарогаю, былі галоўныя. А што тады? Яму ніколі не падабалася, калі кантакты людзей завязваліся на чыста знешнім эфекце; такія адносіны ён лічыў халоднымі. Сам ён шукаў людзей (і падтрымліваў з імі сувязь), якія былі «закадзіраваны» на яго сваёю ўнутранай сутнасцю, і тады між імі ўсталёўваліся ненавязлівыя, прыемныя, лёгкія і карысныя адносіны. Здаецца, і гэта дзяўчына была з тых людзей, ва ўсякім выпадку, яна за паўгадзіны іх знаёмства не надакучыла яму: ён хацеў адцягнуць расстанне. Ён цяпер бачыў яе твар зусім блізенька: на шчацэ ніжэй мочкі вуха ў яе браўся лёгенькі, паветраны пушок, быццам там наліплі парашуцікі з адуванчыкаў; у яе маленькі, капрызліва задзёрты носік, а ў вачах вакол зрэнак свецяцца жоўценькія, бы проса, кропачкі. Чакай-чакай... Успомніў, у каго былі такія кропачкі і на каго падобна дзяўчына. На Галю Фядоткіну, аднакурсніцу. У Шайдукевіча да яе ніякіх пачуццяў не было, але вось помніцца яна, яе даверлівы, адкрыты твар і жоўценькія кропачкі ў вачах. Жыццё — загадка з многімі невядомымі, і дзе тут усяму дасі тлумачэнне.

— Ты даверлівая, зразу пайшла са мною, — сказаў Шайдукевіч, шукаючы для сябе якую-небудзь логіку ў пераходзе ад думак да слоў.

— А я заўсёды веру людзям.

— І жаніху свайму верыш?

— Веру, — дзяўчына паглядзела на Шайдукевіча, быццам ён жартаваў.

— Кахаеш яго? — У Шайдукевіча была не проста цікаўнасць, ён хацеў вывудзіць і адвесці ўбок любую макулінку, якая б магла б стаць перашкодаю ў сямейным

шчасці. Не такі ён, канечне, мудрэц, але жыццё таму-сяму яго навучыла.

— Канечне...

— Сварыліся хоць раз?

— Не.

— Ну а табе хочацца бачыць яго, сустрэцца з ім? — Шайдукевіч пытаўся ў нейкім несвядомым, гарачлівым запале і злаваў на самога сябе за нахабства, з якім лез у душу дзяўчыны.

— Ой, канечне!.. — Дзяўчына ўсміхнулася, глянула ў вочы Шайдукевічу, і ён убачыў, як у нейкае імгненне ў яе рэзка расшырыліся зрэнкі, амаль схаваўшы ўсе жоўтыя кропачкі на радужцы, потым зноў звузіліся, бы ад яркага святла. Што гэта: імпульс гневу? Мабыць, не: усмешка свяцілася на поўных, з крутымі завілінамі вуснах.

— А дзе ён зараз, там у вашай вёсцы?

— Не, у Магілёве... Шафёрам працуе ў трэсце.

— Твой равеснік?

— Не. На пяць гадоў старэйшы...

— На пяць? — чамусьці зноў здзіўлена перапытаў Шайдукевіч і адчуў, як недзе глыбока ў душы азвалася маркота, якая ўсё нарастала, пакуль не змяніла яе рэўнасць, ці што, нейкае незразумелае пачуццё зайздрасці да хлопца, жаніха дзяўчыны, які ўсяго на два гады маладзейшы за яго, лічы, равеснік, а значыць, і ён, Шайдукевіч, мог быць мужам дзяўчыны. Хто ведае, колькі людзей праходзіць міма нас, людзей, якія былі б нам лепшымі сябрамі, блізкімі душамі, але чалавек у жыцці, на жаль, не можа выпрабаваць усе варыянты і выбраць з іх найбольш дасканалы; звычайна ён выпрабоўвае два-тры, а то і зусім спыняецца на першым і думае, што гэта якраз той, які і патрэбен яму.

— А дзе вы жыць будзеце?

— У Магілёве ў яго кватэра.

— Ужо атрымаў?

— Не. Маці пакінула яму. Яна выйшла замуж за другога і перайшла да яго жыць...

— А з першым мужам...

— Ага, развяліся, — падхапіла дзяўчына, і Шайдукевіч зразумеў, што пра гэты развод яна шмат гаварыла з жаніхом. — Ён пакахаў другую жанчыну...

Шайдукевіч крыва ўсміхнуўся: ён-то ўжо ведаў, чаму звычайна разводзяцца, хаця, зноў-такі, бываюць, ка-

нечне, усякія і разводы. І ён з апаскаю падумаў, каб бацькава легкадумнасць не стала прыкладам для сына, жаніха дзяўчыны: факт, дзеці — люстэрка бацькоў.

— П'е?

— Курыць, але не п'е... Я ж казала: ён шафёр.

— Бацькам падабаецца?

— Тата хваліць яго.

Шайдукевіч у душы ўжо лаяў сябе за ўніклівасць, але яму краї хацелася ўпэўніцца, ці трывалая сцяна за плячыма ў гэтай чыстай, даверлівай дзяўчыны, можа, у той сцяне ёсць ужо дзіркі, правалы, праз якія неўзабаве разам з ветрам легкадумнасці выскачыць і каханне, і шукай тады яго ў чыстым полі. Здаецца, усё добра, прыстойна, турбавацца няма чаго, і на Шайдукевіча сышоў раптам дзіўны спакой, быццам сядзеў ён не на вакзале з незнаёмаю дзяўчынаю, а з сястрою ў маці за дамашнім сталом, і ён ажно прыўзняўся, калі ўспомніў пра свой аўтобус: было тры гадзіны. І яшчэ ўспомніў, што не спытаў, не ведае імя дзяўчыны.

— Прабач, як цябе завуць?

— Наташа. А вас?

Шайдукевіч назваў сябе.

— Запішыце мне ў блакнот адрас, — яна дастала з сумачкі тонкі, бы шакаладка, сіні блакнот і ручку.

Шайдукевіч колькі імгненняў думаў: ці варта пісаць у блакнот дзяўчыне чужое мужчынскае імя.

— Толькі ты, Наташа, зразу скажы свайму жаніху, што гэта за імя...

— Ой, што вы! Я раскажу яму... У мяне столькі ўражанняў! — Яна глядзела яму ў вочы шырока адкрытымі вачыма не міргаючы. Нарэшце падышоў аўтобус, з лавак да яго гуртам падаліся людзі, а да Шайдукевіча раптам падышоў хлопчык і спытаў, колькі часу.

— Во бачыш! — усміхнуўся Шайдукевіч і ўстаў. Наташа доўга і шчыра смяялася — бліскалі яе дробныя зубкі, а шчокі браліся румянцам.

Ён моцна пацісну́ў халодную мяккую Наташыну руку, працягла паглядзеў ёй у вочы і адчуў, а Наташа, мабыць, зразумела, што яму цяжка развітвацца, што толькі непазбежнасць — адпраўленне аўтобуса — забірае яго, а так яны яшчэ б доўга сядзелі, гаварылі, не хаваючы прыязнасці адно да аднаго, хаця яе, прыязнасць гэту, нараджалі ў іх сэрцах зусім розныя пачуцці. Шайдукевіч павярнуўся і пайшоў да аўтобуса. Ён чакаў, пакуль зой-

дуць у аўтобус людзі, і краем вока бачыў, што Наташа стаіць і сочыць за ім. Чаму яна не пайшла? Ён зайшоў у аўтобус, сеў на сваё месца і глянуў у акно: Наташа стаяла ў натоўпе тых, што праводзілі. Перахапіла ягоны позірк і ўсміхнулася, пакратала пальцамі. Ён кіўнуў галавою, і яму стала сорамна, няёмка і балюча, што Наташа праводзіць яго, чужога ёй чалавека, і нават дзявочы гонар не перашкаджае ёй...

Вадзіцель завёў матор, даў задні ход і крута развярнуў аўтобус — Наташа замахала рукою, і тут жа вачам Шайдукевіча адкрыўся сіні, чысты прастор глыбокага восеньскага неба, высокія светлыя, аж празрыстыя клёны за зялёным прывакзальным плотам, і на яго абваліліся і туга, і радасць, і сум — усё разам хвалявала, сеяла ў душы яшчэ няпэўнае, але такое жаданае чаканне сустрэчы з сынам.

---

## СКАРБ

Акно было мокрае, слязілася, як вочы ў майго прастуджанага сына. Таполі стаялі ледзь не голыя, выпруціўшы ўверх лядашчыя, тонкія галіны; адно каштаны пляміста рудзелі пустымі і лёгкімі, бы прамакатка, лістамі, якія падварушваў вецер. На траву, што неяк вобміг паблякла за апошнія дні, нудна сыпаўся дробны дождж, і яна падала, лажылася на зямлю ў пакорлівай і мёртвай безнадзейнасці.

Я паліў на падаконніках кветкі, і вада імгненна прасачылася на падстаўленыя пад вазоны спodкі, акурат пацвельвалася з мяне: ты што забыў, учора ж надвечар палівау? Не, я не забыў, проста рупіла нечым займацца — каб прыглушыць тугу адзіноты. Сядзець цэлы дзень у крэсле, нават абклаўшыся кнігамі, невыносна цяжка, пакутліва.

Схадзіць у кіно? Узяў з тэлевізара газету, прабег вачыма па кінатэатрах: знаёмыя назвы фільмаў... Амаль пасля кожнае ў дужках светлымі літаркамі — «для дарослых». Адно дзеля рэкламы і пішуць: калі даводзіла-

ся хадзіць на фільмы з гэтаю шматзначнаю і, як мне здаецца, цынічнаю прыпіскаю ўсягды недаўмяваў, што ў іх дарослага: пацалунак ці высока аголеная нага выпадковае жанчыны, што залазіць у таксі? Але гэта— між іншым. А вось назва — рэклама добрая. Помню, як у дзяцінстве, калі ў модзе былі фільмы пра шпіёнаў, мы падкупіліся назваю «Парушальнік граніцы». Колькі было ажыятажу! У маленькі клубік, што яшчэ зусім нядаўна быў хатаю сям'і, якая выбралася на заробкі ў Сібір, памесціцца ўсе не змаглі: тым болей горкім было нашае расчараванне: парушальнікам граніцы аказаўся звычайны вожык.

Ніводзін фільм мне не прыпаў да вока, і я, уздыхнуўшы, адлажыў газету. Дождж па-ранейшаму кляваў у шыбы і кроплі, пакуль не расплываліся, былі падобныя на каноплі: не зусім круглыя і шэрыя. Мусіць, я нямала прастаяў перад акном, бо шмат паспеў перадумаць: пра жонку і сына, якіх адправіў да бацькоў у вёску — восеньская макрэдзь шкодзіла здароўю малога; нарэшце ўспомніў, што тут, на Паўднёвым Захадзе, куды я пераехаў, атрымаўшы кватэру, павінен жыць Вася Крэмень; сябар не сябар, але чалавек з тых людзей, якія, калі ўведаеш іх, доўга не забываюцца: таму, што існуюць у тваёй свядомасці прывідам нейкае дзіцячае дзівакаватасці і бяскрыўднае непасрэднасці.

Мы жылі з ім разам у пакоі інтэрната будаўнічае арганізацыі: Вася на законных правах, бо рабіў бульдазерыстам, а я, журналіст, на птушыных, займаў часова ложак свайго земляка-аднавяскоўца, які ажаніўся «на мінчанцы з шыкоўнаю кватэраю» — факт, што ўсё яшчэ бунтуе нашу Маліnаўку. Да выгляду Васі як найлепей стасавалася ягонае прозвішча — Крэмень; быў ён невысокі, але важкі ў плячах, кароткая мускулістая шыя цвёрда (інакш не скажаш) трымала на сабе невялікую, як у штангіста, лабатую галоўку; глыбока з-пад лоба спакойна свяцілі зеленаватыя, з жаўцізною, бы цвет сурэпкі, вочы. Вася быў маўчун і маруда, якімі зазвычай і робіць прырода дужых вясковых хлопцаў. Размаўляць з ім было цяжка, на пытанні ён адзываўся неахвотна, сам надзіва нічым не цікавіўся, і гэта тадысяды раздражняла: ну, аніяк не зразумееш, што чалавек думае, вораг ён табе ці сябар, шчыра ставіцца да цябе або зацята...

Родам Вася быў з-пад Слаўгарада, з невялікае вё-

сачкі: аднае з нямногіх, што прытуліў Сож на правым, высокім, беразе, які спадаў, парослы соснамі і дубняком, да мурожнае лугавіны, дзе шырока разбегліся кусты ляшчыны і блакітнага вербалозу. Летам 69-га падчас маёўкі, на яе сабраўся ўвесь раён, Вася хапіў за каршэнь маладога сысунка, які нахабна кідаў бітыя бутэлькі ў раку, і даў яму выспятка; той сысунок аказаўся сынам вялікага начальніка, і Вася воляй-няволяй вымушаны быў з'ехаць у свет. Назад у вёску, дзе памагаў свайму роднаму дзядзьку Паўлюку на камбайне, ужо не вярнуўся: вычытаў у газеце, што «ў Мінск патрабуюцца будаўнікі».

Мы сустрэліся з Васем ужо тады, калі ён паўгода (пасля курсаў) круціў рычагі свайго дужага, цягавітага, як і сам, бульдозера; мы доўга не маглі сысціся на блізкай ноце, паразумецца. Не памагала і чарка, да якой, аказалася, Вася не быў вялікім ахвотнікам, і я не раз яго хваліў і цяпер гатовы біць сябе ў грудзі, даказваючы, што няпраўда гэта, быццам сярод простых людзей, рабацяг, шмат забулдыжнікаў; вып'ем, ён пакурыць, я нешта раскажу (анекдоты не любіў ні я, ні ён), і кожны пачынае займацца сваім: я, звычайна, чытаць, ён корпацца ў скрыначцы, дзе па сваёй сялянскай дбайнасці складваў розную драбязу — вінцікі, заклёпкі, маточкі дроту, гайкі; захапіўшыся, ён забываў, што я чытаю, і пачынаў мармытаць пад нос песню, словы якое разабраць было нельга. Потым з гэтых вінцікаў-шпунцікаў «выраcталі» рухавічкі, дэтэктарныя прыёмнічкі, мініяцюрныя машынкі, якія стракаталі і поўзалі па стале, як мышы.

Надаралася, што Вася не начаваў дома; а ўранні заяўляўся, стомлены, бледны, з чырвонымі вачыма. Я, з-за далікатнасці, не пытаўся, дзе прападаў, а сам ён ніколі мне не гаварыў.

Але некаторага дня ён прыйшоў позна, узрушаны. Здаецца, я ні разу не бачыў яго такім: ён не ведаў, што рабіць — гаварыць, садзіцца за стол ці ісці мыцца; яго камбінезон і чаравікі былі густа выпацканы ў мазут і гліну. Нечакана ён вярнуўся да дзвярэй і шчоўкнуў ключом. Ад здзіўлення я міжволі ўтуліў у плечы галаву, акурат на яе паклалі стопудовы груз.

— Ведаеш, Саня, я знайшоў скарб, — сказаў ён і, забі мяне, я зразу паверыў яму: не жартуе ён, бо калі і быў адзін у свеце чалавек, не здольны на такія фокусы,

дык гэта, мне здавалася, Вася Крэмень. Не даўшы мне як след расшалопаць, здзівіцца голасам і вачыма, ён выняў з кішэні цэлую жменю залатых манет і высыпаў на стол: каторыя ляглі зразу, а каторыя разбегліся ў бакі, як тыя самаробныя машынкі, але Вася не варухнуў рукою, каб іх залучыць. Я ўпершыню бачыў такое багацце: манеты адлівалі густым чырвоным бляскам; здавалася, што кожны кружок — гэта маленькі адмысловы ўваход у нейкую ружовую тайну, глыбіню, нечым блізкую, па ўяўленні, да топкі катла, у якім бушуе полымя.

Вася зноў стаў самім сабою: твар і вочы яго былі адкрытыя, дыханне роўнае, быццам тое, што дасюль яго хвалявала, тут жа, без слоў, павінен быў узяць на сябе я. Пакінуў на стале золата і пайшоў у душавую: спачатку загудзеў, вібрыруючы, кран, потым з шумам заляскалася вада; у пакоі запахла сунічным мылам, пазней — махровым ручніком, які Вася прынёс на плячы. Здаецца, ён ні разу не глянуў на стол, акурат высыпаў туды жменю не золата, а гарбузовых семак; у яго злёгку пакручастых светлых валасах, памытых і распушаных, была нейкая анёльская паветранасць, а сама маленькая галоўка напамінала адуванчык, і ўсё гэта сапраўды аніяк не стасавалася з тым усемагутным і грубым, што людзі прывыклі ўкладаць у слова «золата».

— Пэўна, заўтра я адвязу яго ў міліцыю, — сказаў Вася без усякага намёку на тое, каб яго словы я прыняў як пытанне і ў адказе на яго даў нейкую параду; а няўпэўненасць яго, мусіць, была толькі ў адным: калі несці, сёння ці заўтра.

— Чвэртка, па закону, — табе, — сказаў я, прыпамінаючы вычытанае з газеты.

— Нават так? — здзівіўся, нечакана для мяне, Вася. — А я думаў, менш... — І далей стаў расказваць спакойным, ураўнаважаным голасам, якому пазайздросцілі б тыя, каго самая дробязь (прыемная ці непрыемная) узрушае да гулкага стукату сэрца. — Я капаў траншэю, ля Кальварыі... водаправод у новы мікраранён цягнем. Цямнець ужо стала, фары ўключыў, ды людзі, бачу, чамусьці не разыходзяцца. Стаяць сабе, гамоняць — больш такія... пажылыя. Ну, думаю, вы як хочаце, а я норму перакрыю... каб не адступацца ад завядзёнкі. Калі ўжо надта запазнюся, паеду пераначую на вакзал...

І адно тут мне цюкнула, чаму Вася іншы раз прыходзіў дамоў (пад раніцу) змарнелы і нехлямяжы: ён, каб

не турбаваць вахцёра і мяне, начаваў на вакзале. Дзівак, канечне... Вася, убачыўшы, што я зачапіўся за апошнія словы, зніякавеў, акурат адкрыў мне вялікую тайну, пашараваў далонь аб далонь, перамагаючы ў сабе нечаканы прыліў сарамлівасці.

— Дык вось... Пасоўваюся, пасоўваюся паўз агароджу, кідаю зямлю на левы бок, з якога, значыцца, і людзі стаяць... Звычайна ж не прыглядаюся, а тут раптам нешта бліснула ў вачах — ядрана так, востра, бы жар з цяпла. Людзі, як па камандзе, кінуліся да кучы... Што такое, думаю? А яны грабуцца навыперадкі, няўклюдныя, як цюлені, бо ногі грузнуць у пяску дый, казаў жа, пажылыя... Я ўключыў коўш, каб ён махаўся, ды — сам з кабіны лёцьма. Разграбаю пясок — золата! Ціт тваю налева!.. Нейкі мяшэчак там, ці што, сатлеў, яно і высыпалася. Жывенькае, аж дыхнуць боязна. Я ў кішэню яго, і руку там трымаю, каб зняцяйкі не выхапіў хто. Тут адзін падыходзіць... праўда, маладжавы, з «дыпламатам»: «Тры тысячы плачу на месцы — аддаеш?» — «Дурненькага знайшоў!» — адказваю. «Чатыры!» — «Не!..» — І хутчэй ходу. Во так было дзела... — закончыў Вася, цяпер, ад расказу, прыметна расхваляваўшыся: манетка, якую трымалі яго пальцы, дробненька, як зубы, стукала па стале.

Назаўтра Вася аднёс у міліцыю золата. Вярнуўся з каньяком і нейкімі імпартнымі кансервамі ў вузкіх і плоскіх бляшаначках, падобных на дзіцячыя сандалі; потым яшчэ спусціўся ўніз у буфет і прыпёр цэлую тушку курыцы, засмажанай з часнаком, які густа і апетытна духмяніў. Я падзякаваў Васю за яго шчодрае хлебасольства, але ад чэсці, як у нас кажуць, адмовіўся: была субота, на якую мне выпала дзяжурства па нумары.

Увесь вечар таго дня і потым нядзелю я быў адзін, Вася некуды знік; мне ўжо з трывогаю рупіла — куды. Дахаты паехаць не мог: далёка; вельмі падобна, што да яго прысталі інтэрнацкія выпівохі і цяпер дзе-небудзь рабалююць за чужыя грошы. Толькі аж у панядзелак раніцаю, нацяты роздумам, я здрыгануўся ад стуку ў дзверы. «Вася!..» Нават не пытаючы адчыніў. Перада мною стаяла незнаёмая жанчына з порсткімі, нахабнымі вачыма, якія, пакуль я чакаў пытання ці «добры дзень», глядзелі міма мяне, спрабуючы як болей абшнарыць пакой у шчыліну прачыненых дзвярэй.

— Дзе ён? — спытала яна ўладным голасам, як быц-

цам той, каго яна шукала, дужа правініўся і зараз жа павінен упасці перад ёю на калені, інакш расплаты не мінаваць. Не чакаючы адказу, жанчына прыгнулася пад маю руку, якою трымаўся за вушак, і ступіла ў пакой. Села на крэсла і, заклаўшы нагу за нагу, паставіла на калені абшарпаную бліскучую барвовую сумку; пазногці былі таксама барвовыя, і здавалася, што пальцы ўраслі ў сумачку.

Жанчына была ўжо, як кажуць, даўно не першае маладосці, але даволі вабная з твару і дужая ў стане, паўнагрудая — з тымі жаночымі завілінамі, якія, мабыць, і дазвалялі ёй паводзіцца так саманадзейна і ўпэўнена нават з незнаёмымі мужчынамі. Яна, канечне, бачыла, што я зразумеў, хто ёй патрэбен, і наколькі дзёрзкаю была ўпачатку, настолькі вытрыманаю стала цяпер. Сядзела, абапёршыся локцем на стол, і злёгку гуташыла нагою, стрэсваючы з падэшвы боцікаў пясок. Але, як толькі я спытаў, што здарылася з Васем, яна хмыкнула і нервова паварушылася ў крэсле, падбіраючы ямчэйшыя словы, якімі б можна было выказаць сваё абурэнне, што ўсё яшчэ, мусіць, не ачахла ў яе грудзях.

— Ды ён жа дурань! Разумееш? Дурань!..

Прасіць аб нейкай ветлівасці жанчыну, бачыў я, было гэтак жа марна, як іголкаю дзяўбці сцяну цаглянага дома. Я разгледзеў вочы жанчыны: яны былі вялікія, але з надзіва маленькім радужным кружком няпэўнага колеру.

— Ён жа мог стаць мільянерам! Узяў аднёс золата ў міліцыю — нейкую дохлую тысячу выдалі. А колькі зубоў можна было б паставіць!..

— Дзяржаве дзяржаўнае і належыць, — сказаў я такім тонам, каб у ім жанчыне адчулася як болей строгасці і цвёрдасці. Ненаўмысна, ды я пацэліў акурат: жанчыны, падобныя гэтай, зразу вянуць-абяззбройваюцца, як толькі натыкаюцца на таго, хто з-за свайго няўмення сталкавацца з імі ці проста ад нежадання ісці ў іх на павадку пачынае рэзка і колка пярэчыць ім.

Так-сяк стрымліваючы сябе, жанчына расказала, быдта яна даўно знаецца з Васем, але ён такі «вася», што не сам бегае за дамаю, а даме трэба бегаць за ім. І што яна (назвалася: Рытка) проста выручае яго, па сваёй душэўнай дабраце саграваe жаночаю ласкаю. А тут раптам дзіва: сам прыйшоў, прынёс шампанскага, каробку «Асарці», кветкі. Лічы, дамовіліся пажаніцца,

а ён збег. У вачах у Рыткі быў адчай і такое неўразуменне, што хоць ты паспагадай ёй: трэба ж, такія чэрствыя мужчыны, чалавек стараецца для іх, а яны не цэняць гэтага. Але я, канечне, без асаблівай цяжкасці ўявіў, што там магло быць і што давялося перажыць беднаму Васю, калі гэтая Рытка пачула пра залаты скарб.

Пазней ужо, калі перабраўся на новую кватэру, якую наняў паблізу Камароўкі ў адзінокай бабулі-пенсіянеркі, я даведаўся, што Рытка ўсё-такі ажаніла на сабе Васю, не выкруціўся ён ад яе. А потым, месяцы праз два, выпадкова сустрэў іх саміх на рынку. Вася быў у новым, ладна скроеным паліто, белай трусінай шапцы і пры гальштуку, які скасабочана і неяк мёртва звісаў з яго моцнай шыі; за руку ён трымаў бледную дзяўчынку год сямі — Рытчыну дачку ад першага шлюбу. Мы толкам, лічы, і не пагаварылі, бо замінала зразумелая ў такіх выпадках скаванасць, калі адно і думаецца, каб хутчэй разысціся і хто першы адступіцца; дый Рытка, якая, канечне ж, не пазнала мяне, стоячы ўводдалі, незадаволенымі позіркамі падспешвала Васю. Адно, што пэўна ён змог мне сказаць, а я запомніць — гэта адрас.

І вось цяпер, ужо ва ўласнай кватэры, я ўспомніў гэты адрас. Сум тым часам не праходзіў, ад успаміну, здаецца, яшчэ пацяжэў; а дождж пачаў ушчукаць, злягаў, клаўся ў траву вецер. Таго і глядзі: выбліснe сонца. Я апрануў балоневую куртку, усё яшчэ модную ў горадзе, і выйшаў на вуліцу, на свежую зямлю.

Тратуары былі мокрыя, да іх прыліплі лісты, брудныя, раструшчаныя: неяк бачыў, як адна важная даміцэля, прагульваючыся з сабачкам па парку, нанізала на шпількі цэлы стос лісця і так, не прымячаючы, хадзіла ў «вусатых» туфлях. Сцены дамоў патыхалі холадам і сырасцю, як з занядбаных падвалаў. Наперадзе ішла пад парасонам жанчына, смешна адстаўляючы ў бакі ногі. Я глядзеў ёй услед і спачуваў, думаючы, што адзіная загана, якую не можа схаваць жанчына, — крывыя ногі. Жанчына звярнула ў магазін «Кветкі», а я пакіраваў на алею, абапал якой стаялі клёны з круглымі і жоўтымі, як лімон, кронамі. У сонечныя дні на

алеі было шмат дзіцячых калясак з маці, бацькамі, дзядулямі і бабулямі пры іх; цяпер было пуста і ціха.

Тая вуліца, якую назваў мне Вася, была не так блізка, але часу я меў шмат і таму пайшоў пехатою. Алея падвяла мяне акурат да гастранома, збоч якога быў (нядаўна вынесены) віна-гарэлачны аддзел; я зайшоў і купіў бутэльку сухога віна.

Дом адшукаў не зразу, бо ён стаяў у двары — корпус нумар два. У пад'ездзе ўсё яшчэ гарэла святло, і добра былі відаць нумары кватэр на дзвярах. Я падняўся на трэці паверх, адчуваючы, як пачашчаюцца ўдары стрывожанага сэрца. Стараючыся быць спакойным (як-ніяк, няпрошаны госць), утапіў кнопку званка: ён мякка задзілінькаў у глухаце за сцяною.

Дзверы адчыніла Рытка — я зразу яе пазнаў — і, разгубленая, пэўны час разглядала мяне, не запрашаючы зайсці. Я сказаў, што мне патрэбен Вася Крэмень і што ён мой сябар. Рытка, мабыць, аддалена ўсё-такі стала прыпамінаць, хто перад ёю, бо твар яе расслабіўся, імітуючы нешта падобнае да ўсмешкі, і яна рухам галавы паказала, каб я заходзіў.

— Разышліся нашы пуці-дарогі, — сказала яна, забіраючы з падаконніка попельніцу, калі я, зняўшы ў пярэдняй туфлі, зайшоў у кватэру: надзіва ўтульную, з густам ахарошаную мэбляю і дыванамі. У яе голасе, здалося, не было шкадавання, хіба што адценне нейкай робленай асуджанасці прымусіла яго крышку задрыжаць. Прызнацца, навіна мяне не здзівіла так, каб ажно варашна стала: я ўвесь час, калі ўспамінаў Васю, думаў, ці будзе ён жыць з Рыткаю, ці аднае вышыні іх палёт... ну, ну не тое што залішне цікавіўся лёсам Васі і, крый бог, жадаў яму чаго-небудзь благога, а проста па інтуіцыі, што зазвычай памагае чалавеку выразна ўявіць жыццё іншых і аказваецца зусім бездапаможнаю, калі ён звяртаецца да сябе, адчуваў: Вася трапіў ва ўмела расстаўленыя цянёты напорыстае жанчыны. І вось цяпер яна, гэта жанчына, расказваючы, лаўчыла стаць так, каб я не бачыў яе вачэй; і, адносячы на кухню попельніцу з недакуркам, здаецца, размінулася са мною бокам. А можа, разумеючы Рытку, я маляваў не што іншае, як міраж, звязваў слізкія канцы бескампраміснай логікі? Ва ўсякім выпадку, Рытка памылялася ў адным: быццам я, даведаўшыся пра іх разлад, буду ўшчуваць яе. Яна проста не хацела, дый не магла, уявіць сабе,

што ўсё тое, што рабіў бы я, каб зблізіць іх зноў, было б накіравана іменна проці Васі: сасуд, з якога выцякае вада, не закупорыцца, калі яго з сярэдзіны стала пераставіць на край. Вася падабаўся мне з самага пачатку, здаецца, і ён мною не пагарджаў, і людзям у такіх выпадках, як разумелася мне, трэба не раз'ядноўвацца, а брацца за рукі шчыра і надзейна.

З Васем здарылася бяда: ён падставіў свой бульдозер пад набіты людзьмі аўтобус, які з-за недагляду разявакі-шафёра пакаціўся з горкі да кар'ера; бульдозер загарэўся, і пакуль Васю выцягнулі з маленькае, бы шпакоўня, пакарабачанае кабіны, ён абпаліўся; доўга ляжаў у бальніцы, яму рабілі трансплантацыю скуры, пералівалі кроў; выпісаўшыся з бальніцы, Вася не вярнуўся да Рыткі (з яе слоў).

Я, паслухаўшы Рытку, адно паківаў спачувальна галавою і, забыўшыся развітацца, выйшаў з кватэры. Куды ішоў, не думаў. Адно як апынуўся на аточанай каштанамі алеі, схамянуўся: яна хвілін дваццаць таму вяла мяне да Васі. Дзе ён цяпер? Зноў у інтэрнаце? Рытка, можа, і ведала, дзе яго прыстанішча, ды ўтаіла. Шэрыя пліткі пад нагамі, каструбаватыя, пабітыя на дзірачкі, бязлітасна напаміналі мне абгарэлы Васеў твар, знявечаны пакутаю і болем, але спакойны і валявы: я не сумняваўся, што, сустрэўшы Васю, убачу яго твар іменна такі. Іменна такі, які помніўся з часоў таго цеснага інтэрнацкага пакойчыка.

Я рашуча звярнуў з алеі, каб не распальваць уяўленне і каб не думаць лішне над тым, што вырашана цвёрда: знайсці Васю. Я сеў на таксі і паехаў у глыбіню горада.

За акном мільгалі стрэчныя машыны; патокі людзей, што ў мітусні здаюцца добрымі і задуменнымі; пустыя рукавы завулкаў, утульнасць якіх пахне нейкаю нязвыклаю, як вясковаю цішынёю... На павароце з прарэхі між высокімі беласценнымі дамамі на імгненне мне бліснула па вачах круглае чыстае і чырвонае, як залата, сонца.

Я заплюшчыў вочы...

# ЛЮСІНКА

Люсінцы хацелася кахаць, як і ўсім жанчынам, але, думалася, яна не мае на гэта права. Ды ўсё роўна расхваляванае ўяўленне малявала ёй ціхі закутак, пацалункі і пяшчоту, якія, мусіць, нішто ў свеце замяніць не можа. І яна адчувала, як у вачах пачынае трымцець, а ў грудзях слабее ад незразумелай дрыготкі...

Люсінка сядзела за сталом, калі ў атэлье зайшоў малады мужчына з «дыпламатам» у руцэ. Па тым, як ён адразу разгубіўся, яна зразумела, што гэта — заказчык, і падсунула бліжэй стосік бланкаў. Але мужчына не спяшаўся, стаў чытаць на сцяне вывескі. Яна ўкрадне, раз і другі, кінула на яго пагляд. Невысокага росту, з шырокімі, як у барца, плячыма, але бледны і худы. Вялікія, глыбока запалыя шэрыя вочы глядзелі сумна. Калі ён спытаў хрыплым, густым голасам, ці можна прыталіць сарочку, яна падумала, што ён, мабыць, хворы і, адказаўшы: «Можна», працягла паглядзела ў вочы мужчыне. Напісала на бланку, пад якім хрумсцела капірка, нумар заказа, дату, затым спытала ў мужчыны прозвішча і адрас. Павярнулася, гукнула ў дынамік, што вісеў у яе за спіной на сцяне:

— Несцераўна!

З шырокіх паліраваных дзвярэй, што былі збоч кабін, пранумараваных лічбамі «1» і «2», выйшла маладзіца — у цёмна-сінім сарафане, кароткія рукавы якога не хавалі яе мяккіх белых рук, з даўгою і чорнаю касою за плячыма. Адсунула ўбок дзверцы першае кабіны, паказала мужчыне, каб заходзіў. Ён нерашуча, неяк бокам прасунуўся ў кабіну.

Люсінка чула іх невыразную гаворку, бы знарок прыглушаную, і ёй чамусьці здавалася, што Несцераўна вельмі доўга прымярае. Яна не разумела сябе і баялася гэтага адчування. Адкуль і навошта яно? Ну, была б чарга — тады іншы каленкор: людзі спяшаюцца, няма калі чакаць. А тут... Як быццам ёй не ўсё адно, хутка мужчына выйдзе ці не. Яна, каб не заказ, нават носам не павяла б у той бок. Вунь адвярнулася б да акна ды назірала б, як трапечацца на таполях лісце — цёмнае, мала не чорнае, а блішчыць неяк светла, быццам фольга...

Люсінка так задумалася, што зняцяйкі здрыганулася, пачуўшы шоргат дзвярэй кабіны. Спярша паказала-

ся Несцераўна з сантыметрам на шыі, трохі спагадзя— мужчына; ён трымаў у руках шэрую сарочку. Несцераўна паклала на стол спярэшчаную лічбамі паперку і прымасцілася побач на крэсла. Падышоў і мужчына.

Люсінка пачала спісваць з паперкі лічбы, крайком вока бачачы, як рукаў сарочкі, звісаючы кранаецца стала. Яна магла б і не пытацца, ці доўга насілася сарочка — было відаць і так, — але не ўтрывала, можа, з-за таго, што ёй закарцела раптам зноў пачуць голас мужчыны, і не столькі сам голас, колькі яго тон, які сказаў бы ёй, што думае пра яе мужчына.

— Вы даўно куплялі сарочку?

Мужчына паціснуў плячыма; абыякава, як толькі можна паказаць абыякавасць голасам, прамармытаў:

— Так... Даўно... Ляжала. Я не насіў яе...

Люсінка хмыкнула, незадаволеная абыякавасцю мужчыны, бо ўгледзела ў ёй пагарду да сябе, хоць на самай справе яго бянтэжыла Несцераўна, якая нахабна ела яго вачыма. Мужчына, мабыць, аднаго і чакаў, каб хутчэй пайсці. Ды Люсінка, раззлаваўшыся, спытала яшчэ раз, ужо з большаю настойлівасцю:

— Сарочку вы даўно куплялі?..

Абыякавасць у голасе мужчына, пэўна, хацеў змяніць на незадаволенасць і ўжо сцяў вусны, а ў вачах замігцелі іскрынкі, але стрымаў сябе, нервова выціснуў:

— Відаць жа па ёй, што новая.

«Гэта ўжо занадта!» — падумала Люсінка і ўтупіла вочы ў паперы, каб мужчына зразумеў, што яна яго ігнаруе. І ад таго, што ўсё гэта яна рабіла свядома, у душы спакою не было, бо проці волі ісці заўсёды цяжка, яна гэта ведала, таму і палічыла, што змагацца з сабою, па крайняй меры, бязглузда. Напятая, яна запісала — «знос шэсцьдзесят працэнтаў» — і, рэзка павярнуўшы бланкі, дала мужчыне распісацца. Ён узяў ручку, высока ад пяра, няўважна крамзануў і палез у кішэню па грошы. Люсінка наўмысна маўчала — не называла кошт заказа, мяркуючы, што мужчына спытае, чым і прайграе гэту неаб'яўленую барацьбу нораваў (Люсінцы здавалася, што барацьба ішла). Ды мужчына, не пытаючыся, адлічыў грошы і паклаў іх на стол.

Люсінка зноў хмыкнула, рыўком вышмаргнула бланк. Мужчына ўзяў яго і, не складваючы, павярнуўся да дзвярэй. Пайшоў шырокім крокам, нахіліўшыся ўперад,

быццам хацеў як хутчэй выскачыць за парог. Дзверы зачыніў мякка, амаль нячутна.

Несцераўна скрывілася на Люсінку, гарэзліва бліснуўшы вачыма на дзверы, і ўся яе міміка чыталася прыкладна так: было б з-за чаго пераживаць. Несцераўна, як і ўсякая прыгожая жанчына, магла тонка падмячаць тое, што было не па нутры не толькі ёй, але й астатнім, хто дамагаўся мужчынскае прыхільнасці. Яна, устаўшы з крэсла, пачала суцяшаць Люсінку, але тая, чырванеючы, адмаўляла сваю цікавасць да мужчыны-кліента: маўляў, не смяшыце людзей, Несцераўна.

Люсінка, застаўшыся адна, пасядзела нейкі час бяздумна, але спакою не было, і яна падышла да акна; паклаўшы падбародак на падаконнік, маркотна глядзела на вуліцу, але бачыла ўсё тыя ж вярхушкі таполяў, скрозь якія прасвечвалася сіняе, чыстае неба...

Яна ледзь дачакалася канца змены. Хоць прыпынак быў ля самага атэлье, яна не села на тралейбус, а пайшла дамоў пешкі: лепш за ўсё ёй думалася ў хадзьбе, на адзіноце.

Асфальт так напякло сонца, якое праз увесь дзень не прытушылася нават воблачкам, што ён здаваўся мяккім, бы падушка, і абцасы туфляў глуха прыпячатваліся да яго. Нізкія кусты язміну паўз тратуар цвілі белымі кветкамі, над якімі пырхалі матылькі і рупліва дудзелі чорныя чмялі — яны, як і людзі, жылі па сваіх законах, якія дазвалялі ім верыць у вечнасць. А яно і праўда: хіба не вечныя на зямлі людзі, гэтыя кусты язміну, матылькі і чмялі?

Люсінка, надта ў апошнія гады, часта задумвалася над тым, што прырода абдзяліла яе нечым вельмі важным і неабходным, без чаго існаванне ў свеце не мае сэнсу.

Яна ўсумнілася ў сабе пасля таго, як пабыла ў бальніцы, куды трапіла са звычайнаю (узімку) хваробаю— застуда, высокая тэмпература. Аднога дня да іх у палату на ложак, які толькі што вызваліўся, прывезлі на калясцы такую ж маленькую, як і яна, Люсінка, карліцу. У карліцы быў страшна белы твар, вочы закрытыя. Жаночую палату на шэсць чалавек тут жа разварушыў таямнічы шэпт: атруцілася. Ля карліцы дзяжурылі дактары — давалі ўколы, мацалі пульс, нечым едкім змочвалі губы, і тады Люсінка бачыла, як у хворай варушыліся ноздры. Калі дактары выходзілі, Люсінка набліжа-

лася да карліцы і ўважліва глядзела на яе прыгожы, асветлены нейкаю нутраною ўзрушанасцю твар — роўныя нітачкі броваў, даўгія начэрненыя веікі, мяккія, пухлыя вусны...

Нарэшце хворая ачуняла — бліскучымі, прымглёнымі туманком вачыма абвяла палату. Люсінку, якая, седзячы ля стала, чытала кнігу пра Нязнайку і яго сяброў, як быццам не заўважыла. У Люсінкі ў грудзях затрымцела крыўда: праігнаравала і яна, сяброўка па нятшчасці... Але крыўда была небалючая, лёгкая, бо разумела ж Люсінка, што карліца калі і не прамінула яе поглядам, дык палічыла за звычайную хворую. Гэта проста яна, Люсінка, так ужо настроілася на сяброўства, што нават самая макулінка няўвагі з боку карліцы здавалася здрадаю ў тым, што павінна іх, няшчасных, яднаць.

Растрывожанай, Люсінцы ўсю ноч сніліся кашмары, яна, мусіць, ускрыквала, бо, калі прачыналася, чула, як звала яе суседка па ложку, Калістратаўна, дабрадушная старая з маленькімі, чырвонымі ад бяссоння вачыма. Люсінцы мірсцілася, што вялізны дзядзька з казлінымі рагамі заместа вушэй і вогненнымі, нейкімі плоскімі, як папяровыя застаўкі ў чучала зайца, якое зрабіў ёй бацька-ляснік, вачыма наравіў ухапіць і занесці яе ў цёмную, ані прасвету, пячору, з якое чуліся незразумелыя (тым, што ў іх не было адчаю) крыкі, стогны, плач... Сэрца ў яе стукала з такою сілаю, быццам яно было цвёрдае, што камень.

А ўранні карліцу прыйшоў адведаць яе знаёмы — таксама карлік. У капелюшы з шырокімі палямі, ён быў падобны на Нязнайку — з такімі ж вялікімі ўсмешлівымі вачыма і блазенскаю, да вушэй, усмешкаю. Яны сядзелі ў калідоры ля акна на лаўцы, абняўшыся, радасна шчабяталі, а то проста моўчкі глядзелі ў вочы...

Назаўтра карлік у сваім шырокім капелюшы зноў наведаўся да хворай, і Люсінка, ідучы ў бытавы пакой, мелькам убачыла, як яны цалаваліся... Ёй стала так страшна, быццам гэтаю падглядкаю выдала немаведама якую тайну, і яна, зашыўшыся ў ложак пад коўдру, моўчанька ляжала там і перажывала. І раптам (яна не помніць, праз які час) яе пляча кранулася карліца і пазвала з сабою ў калідор. Люсінка адразу павесялела і

з незалежным выглядам прайшла міма Каліstrataўны, якая сядзела на ложку і вязала.

Карліца назвала сябе Жанэтай, адкрыла Люсінцы цэлы свет. Што ёсць нават карлікавы цырк, які гастралюе акурат тут, у іх горадзе, і што яны з мужам — артысты гэтага цырка. Люсінка адно цяпер зразумела, чаму незвычайным здаўся ёй твар карліцы — артысты, яны ўсе з нейкім таямнічым налётам хараства і вытанчанасці. Жанэта пабывала ў многіх гарадах, нават за мяжою, шмат ведала і, бадай, упершыню так блізка адкрыла Люсінцы жаночыя таямніцы, ды не проста жанчын, а іменна карліц. Люсінка не столькі галавою даймала тое, аб чым расказвала ёй новая знаёмая, колькі нутром адчувала, што гэта, мусіць, самая страшная загана ў жанчыны — нямогласць да родаў. Але Жанэта не надта сумавала, і хутка Люсінка пачула ад яе такое прызнанне, што аж холадна стала на душы: быццам ёсць такія лякарствы, якія памагаюць карліцам стаць маці. І вось яна, Жанэта, прымаючы іх, мусіць, перавысіла дозу... А можа, і не ад лякарстваў хапіў жывот, можа, што-небудзь нядобрае з'ела ці выпіла. Ці, можа, зусім (гэта было вымаўлена таямнічым шэптам) «адбываецца перабудова арганізма». Так думае і муж, і цяпер яны жывуць абое вялікаю надзеяй... У нейкі момант Люсінка падумала, што і расказ Жанэты — той кашмар, які абрынуўся на яе мінулаю ноччу.

Цяпер, ідучы з атэлье дамоў, Люсінка іначай і не ўспамінала яго, расказ Жанэты, як кашмарны сон. Аднак тое, што яна ўведала тады пра свой арганізм, не давала ёй спакою, тлуміла галаву, лічы, штодзень і прымушала з цвярозым неспакоем паглядваць на мужчын. У ёй прачнулася і ўпарта заяўляла пра сябе жаданне інтымнага пачуцця і хвалявання. А можа, усё было якраз наадварот? Можа, спярша яе аблытала нераўнадушша да таго шыракаплечага кліента, а затым паявілася жаданне? Строгай мяжы Люсінка не знаходзіла і ад таго пакутавала яшчэ болей.

Ну чаму, чаму яна самая нешчаслівая, чаму не такая, як усе? Здаецца, і бацькі ў яе не горшыя, чымся ў астатніх, — працавітыя вясковыя людзі, і сястра з братам... А вось яна, Люсінка, урадзілася такою недарэкай. Ну хіба ж гэта па справядлівасці, адкажы, бог, калі ты ёсць на свеце? Такім пытаннем Люсінка кроіла сваю душу часта, яшчэ ў школе, калі і парты для яе былі

завысокія; і дошку, каб пісаць, даставала адно тады, калі станавілася на табурэтку; і голас у яе быў не тоненькі, а густы; і на ўроках фізкультуры не магла прабегчы так, як сяброўкі, — шчыгульненька, зграбненька, на пальчыках, як у балеце...

Яна і ў швейнае атэлье пайшла працаваць не па сваёй ахвоце, а па волі лёсу. А што рабіць: вопратку па сабе ў магазіне не купіш. У маленстве, помніцца, маці сама шыла, потым да краўчых вадзіла. Але ж усё жыццё не будзеш слухаць спачуванні ды вохканні незнаёмых людзей, лепш з аднымі пазнаёміцца, прыцерціся да іх і жыць, працаваць, супакойваючы сябе тым, што людзі цікаўныя толькі напачатку.

Люсінка была поўная адчаю, бунтоўных думак і не здзівілася, а толькі пудліва страпянулася ад нечаканасці, калі ў яе перад самым носам з натужным рыпам застыла, аж хітнулася перадком уніз, белая бліскучая легкавушка — шафёр, пажылы мужчына з чорнымі вусамі і сівымі бакенбардамі, не закрычаў на яе, не папікнуў, што сунецца на чырвонае святло, а толькі спачувальна, з нейкаю тупою асуджанасцю паглядзеў ёй услед; і ад гэтага яго позірку (яна яго адчувала, разумела) яе раптам захліснула злосць на самую сябе, хоць было крычы на ўсю вуліцу.

Яна завярнула ў кафэ. Там, пры заслоненых чырвоным аксамітам вокнах, стаяў паўзмрок, іграла музыка, і тэлевізар, што свяціўся экранам у куце на тумбе, здаваўся нямым. Бармэн за стойкаю, з прыкра-ліслівым і пустым тварам, паглядзеў на яе бы на малое дзіця, ажно перагнуўся, каб убачыць яе ўсю, наліў ёй шклянку гранатавага соку. Яна падышла да століка і, стоячы, маленькімі глыткамі адпівала сок — ён быў цёплы, кіслы, з даўкаю гаркавінкаю і перацінаў ёй дыханне. Выпіўшы, яна паставіла шклянку і, збіраючы спінаю здзіўленыя позіркі наведнікаў, выйшла.

Было яшчэ ясна, а сонца мяккае; яго промні кідалі аранжавы водсвет на сцены дамоў, і вокны ззялі адраенымі латуннымі напарсткамі. На прагулачнай калясцы маладая маці везла дачку, якая, скрывіўшы да пляча галоўку, ціхамірна спала, і ў яе бездапаможна матляліся ножкі. Люсінка ўсміхнулася, нават сорамна стала за свае перажыванні і турботы: так спакойна і добра на зямлі, і гэта ж (як адкрыццё!) не толькі во зараз, гэту хвіліну, а пастаянна, увесь час — сёння, і ўчора

было, і заўтра будзе. Правільна Несцераўна кажа: няма чаго перажываць... Але, успомніўшы Несцераўну, яна тут жа зноў прыгадала сённяшняга кліента. І — уявілася раптам — якое бязмернае было б яе шчасце, калі б убачыла зараз яго. Але—гэта адно фантазія, чаго яму тут быць, ля кафэ, у гэтым раёне, калі ён жыве... Яна імгненна аднавіла ў памяці адрас, зарыентавалася: так, гэта, лічы, на другім канцы горада. Тое, што ёй прыйшло ў галаву ўслед за адрасам, ужо не здалося нечым фантастычным, хоць і было мала рэальным, — яна ведае яго імя — Сяргей — і пашле яму пісьмо, прапануе спаткацца. Яна не будзе пакуль тлумачыць, хто ды што, хай ён толькі прыйдзе... Яна ўявіла, з якім трымценнем і бояззю будзе ісці на першае ў жыцці спатканне, у якім толькі і назва што спатканне, а ўсяго таго, што яно за сабою хавае, мусіць, не будзе. Затое ў яе будзе магчымасць паглядзець на кліента, які так перавярнуў ёй душу, і не яго ў тым віна, яна проста сама ўжо даўно жыла гэтым трывожным чаканнем — нешта павінна з ёю здарыцца такое, што прымусіць яе іначай паглядзець і на сябе, і на людзей, і на ўвесь свет. І вось гэта «нешта», здаецца, прыйшло да яе разам з шыракаплечым худым кліентам.

Дома (яна здымала прыватны пакойчык) Люсінка напісала пісьмо, прызначала сустрэчу на сем гадзін, ля кінатэатра. Яна звярнулася да кліента «Сяргей», а не саладжава «Сярожа» ці «Сярожка» — каб не падалося пісьмо легкадумным жартам якой-небудзь закаханай фіфачкі.

З гэтага дня Люсінку ў атэлье ніхто не пазнаваў — яна спявала, смяялася і амаль не выходзіла з кройнага цэха, дзе працавала шмат маладых дзяўчат, ахвочых да вольных размоў і пустой балбатні; яна як быццам напраўду закахалася. Нават Несцераўна здзіўлялася, наглядаючы за ёй, жартавала і падміргвала, гарэзліва матляючы сваёй даўгою чорнаю касою. Люсінка забаўлялася, і ў яе адказах на падколкі ўжо не было тае хваравітае чуйнасці, што раней, і яна з ахвотаю згадзілася падмяніць Несцераўну, калі той надарылася нявыкрутка з другою зменаю — прыехала ў госці свякруха.

Да спаткання было яшчэ тры дні. Люсінка на рабоце і дома часта паглядвала на гадзіннік, і ад гэтага час яшчэ болей доўжыўся. Яна ўжо некалькі разоў прымервала адзенне, у якім пойдзе на спатканне, — лёгкую ру-

жовую блузачку і даўгую, аж да зямлі, цёмна-сінюю спадніцу, якая рабіла Люсінку трохі вышэйшаю — адно кепска, што не відаць ног, і збоку Люсінка, мабыць, падобна на матрошку. Але што зробіш: такая ўжо Люсінка — зусім маленькая. А з твару як быццам і неблагая — яна, седзячы перад люстэркам, разгладжвала пальцам бровы, выпучвала, расшырала вочы, з радасцю думаючы, што яны ў яе чыстыя, пранізлівыя; пакруціла галавою, уяўляючы на мочках завушніцы... Эх, шкада, што не пракалола раней вушы, — даўгенькія, на ланцужку, завушніцы, якія бачыла ў Несцераўны, здаецца, так былі б ёй да твару і пасавалі да яе светлых валасоў, скручаных на патыліцы ў тугі валік. Але не бяда — пасля спаткання Люсінка абавязкова праколе сабе вушы.

Яна прыйшла на паўгадзіны раней. Ля касы кінатэатра стаяла чарга. Люсінка спярша прыстроілася, але, бачачы, як чарга хутка скарачаецца, адышла, каб потым не бянтэжыцца, калі наспее браць білет, які ёй не патрэбны. Яна пакружыла ля рэкламных шчытоў, чытаючы на кожным, што фільм «для дарослых», і гэта раздражняла яе. П'яны балбес у расхрыстанай кашулі, хістаючыся, зачапіў яе нагой, ледзь не паваліў. Люсінка наяршылася, як здзічэлая кошка, хацела накрычаць на п'янага, але падумала, што, можа, ужо прыйшоў Сяргей і недзе стаіць, чакае. Яна агледзелася па баках— не, здаецца, няма, усе людзі занятыя, заклапочаны думкамі.

Стрэлка набліжалася да «сямёркі». У Люсінкі ад хвалявання адпацелі далоні і сталі халодныя, як у лягушкі. Ёй самой было б прыкра кранацца такіх рук. Шкада, што забыла ў спешцы насавічок: гэта ўжо як закон — калі збіраешся куды, абавязкова што-небудзь ды забудзеш.

І вось ужо сем, а Сяргея нідзе не відаць. Яна стаяла ў куточку, прысланіўшыся да сцяны, і прагна лавіла вачыма кожнага новага чалавека, надта пільна ўглядалася ў таго, хто спяшаўся... Але спяшаліся ў кіно, пачатак якога прыпадаў таксама на сем.

Здавалася, было мора людзей, і раптам стала пуста, і Люсінка засталася адна, як травінка на ўзмежку поля, сіратлівасць якой кожнаму кідаецца ў вока. Дык што ж гэта? Сяргей не прыйшоў? Люсінка заглянула за вугал кінатэатра: і там нікога не было, адно выпюх-

ваў нешта ў пыльнай траве худы чорны кот. Ну куды кінуцца беднай Люсінцы? А гадзіннік паказваў ужо восьмую гадзіну. Ад той жа Несцераўны, якая любіць пахваляцца сваім аўтарытэтам сярод мужчын, Люсінка пачула, што на спатканне раней заўсёды прыходзіць кавалер, а дама, каб праверыць сілу яго кахання, можа нават спазніцца. Выходзіць, Сяргей не прыйдзе? А чаму? Няўжо ён безуважны да тых, што яго кахаюць? А можа, ён не атрымаў пісьмо, можа, яна, Люсінка, наблытала што-небудзь у адрасе? Зажураная, Люсінка пайшла на прыпынак тралейбуса.

Назаўтра Люсінка пераглядзела свае запісы ў бланку — не, адрас яна ўказала правільна. Дык што ж гэта робіцца? Чалавеку прызначылі спатканне, а ён не прыйшоў. Хіба так можна? Хіба не думаецца яму, што нехта яго чакае, перажывае і богведама што можа зрабіць з сабою? А мажліва? У Люсінкі, здаецца, прамільгнула здагадка: можа, ён захварэў зноў, быў жа нейкі нездаровы на выгляд, і цяпер у бальніцы, і яе пісьмо не трапіла яму ў рукі. Але ж не адзін ён жыве, хто-небудзь абавязкова перадаў бы яму пісьмо. Ад нервовае напругі ў Люсінкі расколвалася галава, і ўсе ў атэльe цяпер зноў не пазнавалі Люсінку: была вясёлая, лёгкая, як адуванчык, а стала зажуранаю, замкнутаю, злаславаю, як засілкаваны звярок.

Яна зусім разгубілася, калі, пасля выхадных, убачыла, што Сяргей забраў сваю сарочку. Ну трэба ж, акурат у той дзень (раней тэрміну), у які не працавала Люсінка. Яна паспрабавала дапытацца, хто прыходзіў па заказ пад нумарам дзвесце трыццаць пяць, але ніхто, і нават Несцераўна, не ведаў. Яно і праўда: хто гэта запомніць, калі за дзень у атэльe пераварочваецца не менш як сотня людзей.

Значыць, ён! Ён сам забраў сарочку, і нічога ён не хварэе, ён проста чэрствы, бессардэчны чалавек, эгаіст, якіх трэба караць! Люсінка стаяла ля акна і выцірала слёзы, яе вочы былі чырвоныя і сумныя, як восеньскі ліст.

Потым хапілася пісаць другое пісьмо, зусім кароценькае — жорсткае, абвінаваўчае. Але адно паклала перад сабою чысты аркуш паперы, як сэрца яе пачало астуджвацца, мякчэць. Сапраўды, дзівачка яна, чаму так узбурылася, яна не мае права на гэтага Сяргея, ён жа не сябар ёй і не каханы, каб патрабаваць ад яго

чуласці, узаемнае згоды. Ён нават і сніць не сніў, хто яму напісаў. Дый сур'ёзны чалавек не адклікнецца, не пабяжыць на першую прапанову невядома каго, за жарт усё прыме: пайдзі, падумае, абсмяюць, можа, нават і сябры задумалі пацвяліцца.

І Люсінка зноў напісала спакойнае, ураўнаважанае пісьмо, хіба што з маленькаю горыччу, маўляў, чакала, а ты не прыйшоў. Зноў прапанавала сустрэцца на тым жа месцы і ў той жа самы час.

І на спатканне выправілася ў той жа самай адзежцы, што і перш, толькі прычоску змяніла — распусціла на плячах валасы — і густа наклала цені пад вачыма, бо пад імі засінеліся кругі.

Сяргея не было, але яна ўбачыла высокага хлопца, які стаяў плячыма да сцяны. Не, гэта не Сяргей. А можа, Сяргей паслаў заместа сябе сябра, каб той спярша выведаў, хто гэта разыгрывае яго? Можа, ён, Сяргей, занадта далікатны і асцерагаецца такіх жорсткіх штучак? Пакуль Люсінка так разважала, ужо і хлопец некуды знік, а сямі гадзін яшчэ не было. Значыць, ніякі гэта не сябар, бо да сямі гадзін ён пачакаў бы абавязкова. І тут Люсінку быццам аглушыла: ну, канечне ж, ён, Сяргей, ведае, хто яму прызначае спатканні! Па почырку пазнаў — ён жа тады, як распісваўся на бланку, угледзеў, колькі каштуе заказ, а значыць, і почырк запомніў. Так, толькі так! Люсінка не сумнявалася, што нарэшце праясніла ўсе здагадкі. І па заказ ён наўмысна раней прыйшоў, каб не сустракацца з ёю, Люсінкаю. Смеху, канечне, варта — думаць, што ён прыбяжыць да яе на спатканне. Ідыётка нейкая, падумае.

Люсінцы стала прыкра і балюча, што Сяргей так проста разгадаў яе тайну, сорам паліў ёй грудзі; з кашмарнаю цяжкасцю ўяўлялася, што ёсць у горадзе чалавек, мужчына, які ведае, што ў яго закахалася карліца і невядома чаго дабіваецца. Люсінцы цяпер здавалася, што ўжо нічога ў цэлым свеце не суцешыць яе, яна ўвесь час будзе жыць у гэтым нязносным самакатаванні — найгоршае для сябе ўявіць было немагчыма. Дык навошта так жыць?

Яна пайшла за горад, да ракі, адхіляючыся ўправа, дзе, ведала, крутыя берагі. Але яшчэ здалёк убачыла, што каля ракі шмат людзей, голых і апранутых, па вадзе з ровам носяцца маторкі. Тады яна ўспомніла мост цераз пуці. Падымецца па сходцах наверх, дойдзе да

сярэдзіны і... Але прыйшло на памяць, парэнчы высокія, і пакуль яна будзе караскацца, яе затрымаюць: за гарэзлівае дзіця палічаць. А трэба так — каб адразу. Думкі ў яе мітусіліся смелыя і адчайныя, бы ў той гераіні фільма, які нядаўна глядзела па тэлевізары. Люсінка нават параўнала сябе з ёю — нешта ў іх становішчы было агульнае. Дзякуй табе, Анна Карэніна! Ты падказала мне — цягнік. Яна борздзенька пабралася па адхоне, каб адразу лучыць на вуліцу, ад якое блізка да чыгункі. Запыхалася, умлела, і ногі слаба неслі яе. А тут яшчэ на дарозе сустрэла бабульку — тая запынілася, спытала, дзе гэта Зялёная вуліца. Люсінка не ведала такой вуліцы. Бабулька стала паясняць, што там жыве яе дачка, і яна сама там некалі жыла, ды во забылася. Люсінка нічым не магла памагчы бабульцы, адно параіла спытаць у каго тутэйшага, але далей ужо ішла, адчуваючы, як нейкая невыразная пакуль думка пачынае тлуміць галаву. Ціш-ш! Люсінка прыступілася. Здаецца, дарэмна яна страціла надзею. А чаму з ім, Сяргеем, не магло быць так — проста назваў не свой адрас ці наогул абы-які, каб толькі запоўніць графу? І пісьмы яе недзе лётаюць, як бязглуздыя матылькі, бо зваротны адрас яна, вядома, не пісала. А ў лепшым выпадку, іх нехта атрымлівае і рве, але і ў яго павінна ж быць сэрца, некалі яно растопіцца, і ён перадасць Сяргею пісьмы, якія яна будзе слаць і слаць...

Люсінка напісала трэцяе пісьмо і праз тры дні такая ж прыгожая, як і першыя разы, прыйшла да кінатэатра і... Сяргей стаяў у шэрай сарочцы, якую прытальваў, трымаў у руцэ кветкі. Яго вочы разгублена бегалі, шукалі, гатовыя ў любую хвіліну прывеціць кожнага, хто падыдзе. Твар яго Люсінцы здаўся яшчэ больш бледным, чымся тады ў атэлье. Яна замерла на месцы, стаіла дыханне і баялася варухнуцца. Сяргей раз-пораз пазіраў на гадзіннік, і тут жа азіраўся па баках, акурат баяўся прапусціць імгненне, у якое з'явіцца тая, што закахалася ў яго.

«Прыйшоў!..» — салодкае цяпло ўскалыхнула Люсінцы грудзі, яна адчула, як ёй на вочы накаціліся слёзы, — пачаў туманіцца, ірвацца на кавалкі свет... Здалося раптам, што Сяргей прапаў. «Ой!..» Яна працерла вочы — не, ён стаяў у ранейшай позе, і неспакой рук, што трымалі кветкі, выдаваў ягонае хваляванне. «Бедненькі...» — пашкадавала Люсінка і, разгубленая, спы-

нілася блізка ад Сяргея, але ён не звярнуў на яе ўвагі, акурат яна не чалавек, а голая сцяна, на якой няма за што зачапіцца вачам. Чымся бліжэй было да сямі гадзін, тым больш нерваваў Сяргей, саступіў з месца, прайшоўся ўзад-уперад, глянуў уздоўж па вуліцы. Да яго ніхто не падыходзіў і, як відаць было, не збіраўся. Гэта Люсінка, гэта яна адна вінавата, што да яго ніхто не падыходзіць. Яна бачыла, як ён, уздыхнуўшы, апошні раз глянуў на гадзіннік і спакваля, азіраючыся, пайшоў...

Люсінка хацела крыкнуць яму наўздагон — пазваць, але ў яе адняло голас, а з грудзей вырваўся слабы стогн. Яна ступіла крок, потым падалася назад, адчула спінаю газетны кіёск. Не павярнулася — баялася ўпусціць з вачэй Сяргея, постаць якога меншала, а потым і зусім згубілася сярод людзей.

---

## АДЛІЖНАЯ НЯДЗЕЛЯ

Ведаеце, якая самая прыгожая жывёліна ў беларускіх лясах? Казуля. Яна зграбная; на быстрых нагах зялёныя капыткі-туфелькі; галоўка маленькая, точаная, а шыя даўгая і гнуткая. Вочы ў казулі вялікія, цёмныя, круглыя, бліскучыя, здаецца, у іх глыбіні можа ўтапіцца ўвесь свет. Казуля няхай ідзе, бяжыць ці стаіць — свет факусіруецца ў белую, бы ртуць, кропку і топіцца ў яе вачах.

Я да таго выпадку, пра які хачу расказаць, двойчы ўжо бачыў казулю. Аднаго разу яна пераплывала Сож. Было зусім яшчэ рана, сонца толькі ўстала, лізала промнямі ваду — цьмяную, з нейкім нежывым бляскам, усё роўна як накрытую поліэтыленам. Што прымусіла казулю з таго берага пераплываць на мой, дзе я лавіў рыбу, не ведаю. Я не чуў, як яна саступіла з высокага абрыўчыка ў раку, а толькі ўбачыў на дымнай вадзе чорную бліскучую мызку, падобную на мячык; мячык гэты плыў і цмокаў, акурат быў прабіты, а нехта яго раз-пораз сціскаў.

Гэта было на згоне вясны, калі ясная, чыстая зелень травы моцна пахне густой сонечнай цеплынёю, а ў пры-

бярэжных лазняках белаю пенаю кіпіць царыца лясоў чаромха, якую ў нас вельмі хораша называюць — калакалуша. А ўвосень таго ж года я ўбачыў казулю ў Вялькім балоце, куды хадзілі з маці ў журавіны. Казуля стаяла якраз напроці рудога крушынавага куста, і мне здалося, што яна бязрогая, бо мой зрок пераплятаў яе рогі і галіны з куста. «Мам, глядзі, казуля бязрогая», — прашаптаў я, і маці засмяялася, стрымана, ціха, ды казуля ўсё роўна пачула: здрыганулася, паглядзела на нас і, высока паднімаючы над мохам ногі, пасігала ў кусты.

Вось такімі штрыхамі намаляваная, стаіць у маёй памяці самая прыгожая жывёліна беларускіх лясоў — казуля. Два словы пра сябе. Цяпер мне чатырнаццаць гадоў, вучуся ў сёмым класе, у вольны час люблю маляваць. Маці мая школьная тэхнічка, бацька трактарыст.

* * *

...Казуля выйшла з затуленага кучмастымі елачкамі акопа, дзе аблюбавала сабе лежбішча. Стаялі адліжныя дні, і снег набрыняў вадою, быў цяжкі і сіні, з яго тырчалі аранжавыя лусачкі кары і шыгаллё. Снег і паветра пахлі жывіцаю. Рухі ў казулі былі спакойныя, як бы млявыя, а ў вачах бліскалі трывожныя агеньчыкі: яна паўгода ўжо насіла ў сабе новае жыццё. Казуля рабіла ўсё, ахвяравала сваімі радасцямі і спакусамі, каб гэтае жыццё паявілася на свет. Яна знарок адбілася ад статка, нават уцякала ад гордага прыгажуна казла, які пад канец лета і ў верасні быў незвычайна пяшчотны і ласкавы з ёю. У казулі быў добры нюх, і яна чула пахі як вабныя, жаданыя, якія ўлівалі ў яе спружыністае цела сілу і бадзёрасць, так і трывожныя, ад якіх сутаргава кідалася ўбок.

Сёння дзень пачаўся для яе прыемнымі пахамі. Сонца добра прыпякала, і было чуваць, як асядае, шамаціць, бы сена, снег: ш-ш-ш... ш-ш-ш... Ёй да няўцерпу закарцела паласавацца сенам, і яна рызыкнула выйсці на дарогу, па якой, ведала, машыны возяць сена. Зялёнае, духмянае, мятны мурог ды ніцы гарошак, яно кружыла галаву і здавалася, што ўвесь лес танцуе перад ёю.

Казуля ішла памалу і лёгка дыхала, каб водар сена не так густа разліваўся па жылах, бо тады ў яе пачынаў

балець пад грудзінаю жывот, які з кожным днём станавіўся тужэйшы і тужэйшы. Абапал дарогі густа раслі елачкі, папараць ды асіннік і маскіравалі яе. Сена сама болей натрушвалася ў лагчыне, дзе было шмат калдобін. Раптам, ужо блізка ля дарогі, казуля замерла: пачуўся гуд матора. Стаяла з паднятаю пярэдняю нагою і слухала: гуд быў не натужны, з падвывам, а нейкі лёгенькі, мяккі, як трапятанне бярозы ў вецер. Яна насцярожылася. Павярнула галаву і пачула, як на шыі заскрыпелі пазванкі, а спіну ад самых рагоў да хваста пранізаў гарачы востры, як страла, звон.

Гуд бліжэў, і ўжо запахла дымам, і тады казуля ўбачыла ў прасветліны між дрэў гарбатую жоўтую, як балотная сыраежка, пачвару — легкавічку: яна плаўна зыбалася, паўзла; на калдобінах нудліва зныбела, бы той дзікі хворы парсючок, якога неяк напаткала казуля на краі аўсянага поля.

Прырода жыве інстынктам; невядомая сіла падкінула казулю ўверх і на лёгкіх, высокіх нагах панесла ў гушчар.

* * *

Адама Сёмчыка дражнілі Куцобка: на адной руцэ ў яго не было кісці. Руку без кісці ў нашым краі называюць «куцка», адсюль куцобка. Нехта перайначыў слова, але не так сабе, не выпадкова, а наўмысна: Адам скалечыў руку не на вайне і не ў рабоце, а на «промысле» — глушыў у Сажы рыбу, і толавая шашка разарвалася ў яго руках.

Адам Сёмчык быў заядлы паляўнічы. І самае дзіва: скалечаная левая рука не замінала яму страляць. Біў ён без промаху: па зайцу ці проста ў мішэнь, па птушцы ці (з машыны) у прыдарожны пень. Выстаўляў перад сабою сагнутую ў локці куцку, клаў на яе ствол, прыклад упіраў у плячо і наводзіў мушку не рукою, а паваротам тулава.

У Адама былі два сабакі і «нянаская», імпартная двухстволка. Сабак звалі Снэп і Лахмач. Клічка Снэп, казалі, ішла з даўніх часоў: нейкі там Сёмчыкаў «прапрапра» трымаў цэлую псярню. У Лахмача была даўгая шэрая, бы ў ваўка, поўсць, якая на жываце звісала да самай зямлі; узімку Адам абстрыгаў яе, бо яна замінала сабаку бегаць па глыбокім снезе.

Хаця Адам Сёмчык жыў за два кіламетры, у сусед-

няй з нашай вёскаю Дабранцы, я ведаў пра яго ўсё ці амаль усё: пра людзей адметных, як маці кажа, з лысінкаю, болей чымся пра іншых, расказваюць, перадаюць з вушэй у вушы і праўду, і плёткі. Удабавак з Дабранкі ў нашу вёску дзеці хадзілі ў школу, у іх ліку і Сёмчыкава дачка, Люся, самая прыгожая дзяўчынка ў класе. Яна усім падабалася: у яе чысценькі, светлы, бы шкельца, прадаўгаваты твар і надзіва крутыя дужкі броваў; блакітныя вочы глядзяць адкрыта, гарэзліва і крышачку здзекліва.

Сёмчык меў паляўнічы білет, з якім смела і з поўным правам хадзіў у лес. А часта не хадзіў, а ездзіў — на сваім жоўтым «Масквічы»: адчыняе заднія дзверцы, свісь — і сабакі тут як тут на сядзенні, ад нецярплівасці перабіраюць лапамі і стукаюць хвастамі. Сам садзіцца за руль, у скураной лётчыцкай куртцы, янотавых унтах і бабровай шапцы. Хто скажа, што ён гаспадарнік у раённай бальніцы?

* * *

Той дзень якраз прыпаў на нядзелю. Маці папрасіла мяне, каб я памог ёй аднесці на падол бялізну. Я быў у шэрым зімовым палітончыку, катанках і шапцы-вушанцы. Нёс у руках пранік, а пад пахаю вылізаную вадою, жоўтую, бы косць, яловую дошку, на якой летам секлі свінням бацвінне і лебяду. Маці, у мужчынскіх гумавых ботах з высокімі халявамі, ішла паперадзе мяне.

Цераз сядзібы да падола — канавы — рукою дастанеш, але снег глыбокі, і мы пайшлі дарогаю па вёсцы. Дарога разбітая трактарамі ды машынамі, снег на ёй у адлігу заўсёды брудны, жоўты і хлюпае пад нагамі, як балотная твань.

Канава нават у марозныя зімы да дна не прамярзае: праз лёд відаць, як бяжыць вада, нясе з сабою гніляшкі, траву, а на роўным коціць дробныя, бы жучкі, каменьчыкі. За мосцікам канава ўпадае ў катлаван, у якім каля берага дыхаюць палонкі — у іх жанчыны палошчуць бялізну.

Канава была ўжо блізка, у палонках блішчала чорная вада — быццам на лёд вылезлі няўклюды-бабры, і футра іх ільсніцца на сонцы. І тут я пачуў сабачы брэх: ці не ў Велькім балоце? Сабак, здаецца, было

двое, але галасы іх за далёкасцю зліваліся ў суцэльны гул; гул набліжаўся, і галасы можна было ўжо адрозніваць, адзін тоненькі: я-я-я-я, другі — як качулкаю ў бубен — бух-бух-бух.

Маці ўбачыла, што я прыслухоўваюся.

— Мабыць, зайца ганяюць, — сказаў я.

Маці прамаўчала. У вёдрах на каромысле яна несла бялізну; вёдры былі цяжкія, зыбаліся.

Я ўтаптаў дошку ў снег каля палонкі: вада ў ёй была светлая, а дно цёмнае. Маці завінулася паласкаць бялізну. На боты ёй і на снег ляцелі пырскі вады: на ботах блішчалі, а на снезе застывалі блакітнымі плямкамі. Рукі ў яе вобміг пачырванелі, быццам яна ўтапіла іх у журавінавы кісель. Яна плёскала бялізну на дошку, а я дубасіў пранікам. Пранік быў ёмкі, з бярозавай чачоткі: бялізна пішчала і ліпла на дошку, як цеста. Адрывістае, тлустае рэха ляцела туды, дзе ямкаталі сабакі. І рэха і сабачыя галасы пераклікаліся недзе ў кліне поля пад Велькім балотам.

У мяне замлела спіна, і я выпрастаўся. За калгасным садам на вузкай белай, бы ручнік, палосцы поля рухаліся тры кропкі: адна — святлейшая — уперадзе, за ёю, блізка адна каля другой, астатнія. Сабакі некага гналі, але не зайца, як думаў я.

— Мама, глядзі!

Маці разагнулася, паклаўшы на паясніцу руку далоняю ўверх; кончыкі пальцаў на ёй былі белыя і зморшчаныя, бы кавалачкі мякішу.

— Ці не казу? Можа, тую, што мы ў Велькім балоце бачылі?

— Казу? — перапытаў я і стаў шчырэй углядацца ў кропкі. Маці сагнулася зноў паласкаць, а я сачыў за кропкамі: здавалася, нізка над зямлёю ляцяць тры вароны.

Мінула колькі часу, і я ўжо ні на каліўца не сумняваўся, што сабакі гоняць дзікую казу — казулю, адстаюць ад яе метраў на трыста, а можа, і меней: здаля не вызначыш. Казуля бегла вялікімі скачкамі, сабакі ішлі за ёю ўрасцяжку, роўна, як па нітцы. Маё сэрца трывожна забілася ў грудзях, як тая сініца ў сілку.

— Яны не дагоняць яе?

— Дзе ім дагнаць! Яна што вецер... — упэўнена сказала маці, але гэта яе ўпэўненасць мне чамусьці не перадалася.

Казуля была ўжо зусім блізка — у калгасным садзе. Ствалы яблынь і казуля былі аднаго колеру — шэрыя, але сабакі ішлі назіркам, без голасу. Казуля кіравала прама на катлаван. Яна, мабыць, не магла звярнуць, бо сабакі тут жа ўзялі б ёй наперарэз. Я пазнаў сабак, гэта былі Сёмчыкавы ганчакі. Успомнілася, што чуў ад мужчын-паляўнічых: «Лахмач і Снэп сваё не ўпусцяць». Мне стала горача пад палітончыкам.

— Мама, яны яе дагоняць.

— Казу ж, мабыць, нельга забіваць, — засумнявалася і маці. — Не дазваляюць.

Я, здаецца, убачыў вочы казулі — дзве круглыя маленечкія палонкі, поўныя жаху. І ўся казуля, здавалася, была працята жахам. Яна ляцела над зямлёю, бы страла. Абагнула катлаван і панеслася цераз сядзібы да вёскі. Там забрахалі дваровыя шаўкі, забразгалі ланцугамі, і яна павярнула ўсцяж калгаснага саду. Ганчакі крута заламалі ад катлавана — бралі напярэймы: першы бег руды віславухі Снэп, услед рослы мехаваты, бы куль, Лахмач.

«Бедная казуля...»

Ганчакі заходзілі ад вёскі, каб залучыць казулю на ранейшы след і гнаць на гаспадара, зноў у Велькае балота. А можа, яны пайшлі ў лес самахоць?

Казуля скінула ў сад, а сабакі з разгону метраў пяцьдзесят дубічылі прама; потым заекаталі, адчуўшы, што адсталі. Палёт казулі ў паветры быў плаўны, грацыёзны, як у запаволеным кіно, што ўчора глядзеў па тэлевізары: пярэднія ногі падагнуты да грудзіны, задпія выструнены, як у бусла. Казуля зноў павярнула да катлавана. Я не ўтрываў, кінуўся ёй насустрач. Снег быў глыбокі, а пад ім яшчэ рыцвіны, і бегчы было цяжка. Не ведаю, ці згледзела мяне казуля, але яна не заварочвала, хоць перамежак між намі скарачаўся. Ганчакі зайшліся ў шалёным скавытанні. Я выхапіў на хаду сукаваты дручок з плятня, якім быў абнесены сад, і замахаў ім. Казуля на міг спынілася, як урасла капытамі ў зямлю; мітнулася паўз мяне. Я нават не агледзеўся, стаяў наперадзе ў сабак, сціскаючы ў руцэ дручок. Сабакі абмінулі мяне і не глянулі вокам, быццам я для іх не чалавек, а звычайны слуп ці ствол яблыні. З раскрытых зяп у іх звісалі даўгія шырокія, як лапаткі, ружовыя языкі.

«Ваўкарэзіны!..» — вырвалася ў мяне з грудзей спёртае паветра. Казуля яўна не хацела бегчы ў лес і таму не магла набраць разгон, і сабакі яе наганялі — ізноў моўчкі. Я рвануў услед за імі па здратаваным лапамі снезе. Сям-там я прымячаў і сляды казулі — ямачкі, бы ад кійка: капыты лёгка прашывалі снег да самай зямлі.

Казуля пайшла на другі круг. Я адставаў і, толькі змарыўшыся, зразумеў, што мне лепей стаяць на месцы, і тады казуля, зрабіўшы паварот, будзе збліжацца са мною. Сабакі насядалі, а скачкі ў казулі былі ўжо не такія спружыністыя.

Я стаяў, распасцёршы рукі, на ўскраіне саду, а казуля і сабакі набліжаліся да мяне. Казуля пранеслася гэты раз ледзь не ўпрыцірку, і я ўбачыў зусім блізенька яе вялікае чорнае бяздоннае вока і пад ім мокрую падкоўку. Цяпер я стаяў на дарозе ў сабак. Яны падбеглі, і я, бы звар'яцелы, закрычаў:

— Куды!!! Куды вас гоніць!.. Ану! — і, сціскаючы зубы, з сілаю махаў дручком.

Не збаўляючы хуткасці, сабакі перлі проста на мяне — белыя вострыя зубы і ружовыя прагныя языкі.

— Куд... г-гых!.. — Я адчуў адначасна цеплыню на твары і моцны ўдар у плячо: Лахмач, які бег першы, збіў мяне з ног. Я ў гарачцы падхапіўся. Дручок мой ляжаў на снезе. Каля канавы лямантавала маці і, здаецца, ці не грэблася сюды, уставала і падала. Казуля і сабакі былі між маці і мною. І раптам казуля застыла на месцы, толькі на імгненне, каб прапусціць наперад сабак, і павярнула ў мой бок. Яна імчала без усякай асцярогі — вялікія чорныя мокрыя вочы... Яны спыніліся акурат напроці мяне, блішчалі, бы люстэркі, і ў іх я ўбачыў сябе — маленькага, як муха, ліліпуціка.

— Куды!!! — я рынуўся на сабак і з усяго маху выцяў Лахмача па галаве дручком. Лахмач цяўкнуў, скочыў убок і, ашчэрыўшы жоўтыя зубы, захрыпеў. Спыніўся ад нечаканасці і руды віславухі Снэп. Казуля спуджана стрыгла вушамі, тупала тонкімі, бы кіі, ножкамі; крутыя бакі ў яе хадзілі хадуном, а чорная бліскучая мызка трапятала, бы крыльцы вялікай начной мятлушкі-стужачніцы. Сабакі, натапыраныя кожнаю шарсцінкаю, глядзелі на мяне са злым здзіўленнем і нахабнаю ўпартасцю.

— Гэ-х! Ваўкарэзіны!.. — Я махнуў на іх дручком.

Здрыганулася і казуля, адступіла ад мяне. Маці была ўжо блізка, у руцэ яна трымала пранік, і я зусім асмялеў. — Толькі паткніцеся, — гразіў я сабакам, — агрэю так, што...

Сабакі нечакана павярнулі галовы да Велькага балота і паставілі тырчком вушы. І я глянуў туды, куды глядзелі сабакі: на белым снезе жоўтаю, бы сланечнік, плямаю варушылася легкавічка. «Сёмчык!..» — Мне здалося, што на галаву мне высыпалі вядро жару. Сабакі заматлялі хвастамі, завішчэлі; пачалі брахаць, падступацца да казулі. Казуля, дробна перастаўляючы ногі, ціснулася да мяне. Я хапіў яе рукамі за шыю, каб утрымаць, на імгненне адчуў, якая яна цёплая, вільготная і пахне ўся малаком-сырадоем, які маці прыносіла з-пад каровы на першы дзень пасля ацёлу. Але казуля — малая недаверлівая дзікунка — ірванулася з маіх рук, да яе кінуліся сабакі, і яна, высока падскокваючы, зноў паляцела да вёскі. Яна ўвесь час імкнула не ў лес, а ў вёску, як быццам ведала, разумела, што толькі там зможа ўратавацца ад вострых сабачых зубоў.

Маці гукала мяне, але я бег услед за казуляю і сабакамі. Казуля перамахнула пляцень, жардзянае прасла, за якім пачаліся сядзібы. У канцы іх роўным шнурам стаялі хаты. Я спатыкнуўся і потырч паляцеў у снег, а калі падхапіўся, то ўбачыў, што казуля кружыць каля пуні Кулічонкавага двара. Сабакі стаяць, а Кулічонак, як пудзіла, махае на іх рукамі; ён без шапкі, у расхрыстанай фуфайцы.

Я падбег і ўсё зразумеў: казуля ўбілася ў загон, у які ўлетку Кулічонак выпускае свіней. Толькі цяпер убачыў, што ў мяне на левым катанку няма галёша, мабыць, згубіў тады, як упаў.

— Ото-то, мяса прама ў двор прыбегла!.. — Кулічонак закладваў уваход у загон жэрдкамі. — Толькі двух япручкоў сваіх зашчаміў, а тута і дзічына... Мая, мая! Сёмчыку дудкі... — Ён раз-пораз сціраў з белай лысіны сняжынкі (шапка валялася на снезе), што закружыліся з неба, хіхікаў, як дзіця, і ўсе выхадкі ў яго былі дзіцячыя. Кулічонак падоўгу нідзе не працаваў, так, збоку прыпёку дзе-небудзь, але жыў багата: лета і восень цягаў грыбы, сушыў, марынаваў, а ўзімку вазіў прадаваць аж на Поўнач. — А ты што тута круцішся, пацан? — напусціўся на мяне. — Гэць дахаты!..

— Я за казуляю прыбег, — сказаў я наўмысна цвёрдым голасам, хоць сам увесь калаціўся. Левы катанак прамок, і назе было ёдка, калола ў падэшву.

Кулічонак зноў захіхікаў, аж заікала ў горле. Пакруціў пальцам каля вуха.

«Сам ты дурань!..» — падумаў я. Сабакі хакалі ротам, шчамілі галовы між частаколін і аблізваліся.

— Маё, маё мяска!.. — Кулічонак цёр далоні. Даў Снэпу пад зад нагою.

Вёска пачынала гудзець, пераклікацца галасамі: ад хаты да хаты, як тая сарока-белабока, паралятала вестка. З двароў сыпанулі дзеці. З-за іх я не ўбачыў, як падышоў мой бацька. Мабыць, толькі злез з трактара, бо на шчацэ ў яго чорны пісяг, а каўнер кажуха і плечы зацярушаны торфам.

— Тата, гэта каза...

— Мне маці расказала... — Бацька мой заўсёды спакойны, мала гаворыць, але шмат робіць: што ў калгасе на трактары, што дома — і рамы, і табурэты, і бочкі. Далоні ў яго шырокія, цвёрдыя, трудавыя: як хопяць у абдымкі — косці трашчаць. — Трэба яе назад, у лес.

— Што?.. — вытарашчыў вочы Кулічонак. — Ідзііздзі адсюля. Сказануў: «У лес». Я ж не гнаў яе сюды, сама ўбілася...

Дзед Аўтух, Кулічонкаў сусед, якраз выйшаў на гарод. Убачыў зборышча і прытупаў з кійком, у кажусе і чорнай скуранай шапцы. Ад ветру вочы ў дзеда пачырванелі, а клінок сівой барады матляецца, як у казы хвосцік.

— Мабыць, каза? — Дзед Аўтух шморгаў носам і слепавата жмурыў вочы. — Грэх, людзі, грэх жывёліну мучыць...

Казуля і праўда не магла ўжо трываць людской мітусні, крыкаў, нехта з хлапчукоў шчоўкаў фотаапаратам, і схавалася ў свіной пуньцы, дзверы якой былі расчынены напята.

— Дзічынка! — Падышоў з сякераю ў руках Шурка Аляповіч. Ад яго вечна пахне смалою, бо ён працуе на падсочцы. — Зараз я... З маіх рук тапор не выкаўзнецца.

— Ну ты! — бацька таўхануў яго ў шырокую і глухую, бы валун, спіну.

— Што я? Хто яе прыб'е, той і забярэ. Сцягняк Сём-

чыку... Па закону. Нясі, Кулічонак, вяроўку, скруцім у два шчота!..

Дзеці ажно запішчалі, і вочы ў іх заззялі, а ў мяне анямела ўжо левая нага, і здалося, што я падаю ў глыбокую-глыбокую яму. Я ўчапіўся за бацькаў рукаў.

— А дзе твой галёш, сын?

— Зваліўся недзе...

— Трэба пашукаць.

Нарэшце паявіўся і сам Адам Сёмчык. Ён паставіў легкавічку на вуліцы напроці Кулічонкавага двара і цяпер адчыняў весніцы.

— Во і тапор не трэба. Зараз машыну падкоцім, пятлю на шыю кідзь — і тут як тут казулька, — засмяяўся Шурка, і вакол рота ў яго сабраліся пучкі маршчын, і твар Шуркаў стаў падобны на сытае кацінае мурло.

— Пабойся бога, ірад! — Дзед Аўтух замахнуўся кійком. — Жывадзёр... І шчэ вуна другі ідзе-брыдзе.

Нехта ўжо рассунуў жэрдкі, і дзеці хлынулі ў загон да пунькі. І я зазірнуў у цемнату: у куце блішчалі дзве зорачкі-плямкі — вочы. Кулічонак тым часам мітнуўся да Адама Сёмчыка.

— Я першы, Сцяпанавіч, асачыў, як яна ў мой загон шлыкнула. А я во з пунькі гной выкідаў...

Сёмчык не сказаў ні слова, кіўком галавы павітаўся з маім бацькам. Прадаўгаваты Сёмчыкаў твар быў чамусьці невясёлы, і ў вачах сум, ці што. Сабакі загарцавалі вакол яго: станавіліся на заднія лапы, быццам хацелі па вачах гаспадара зразумець, што ён хоча. Сёмчык атукнуў на іх. Падышоў да пунькі, абапёрся рукой на дзверы, аж заскрыпелі завесы.

— Выратавалася, красавіца? — сказаў, мне здалося, з ласкаю ў голасе. Дзіўна! Дзіўны нейкі Сёмчык. Адышоў. Ляпнуў па каленку і свіснуў. Лахмач і Снэп падскочылі да яго. Пайшоў да весніц шырокім крокам; сабакі пабеглі за ім. Усе бачылі, як ён адчыніў дзверцы легкавічкі, і сабакі скочылі на задняе сядзенне. Сёмчык з сілаю стукнуў дзверцамі, аж у пуньцы здрыганулася і закідалася казуля. Кулічонак стаяў з вяроўкаю і моргаў вачыма; на жыдзенькіх валасах каля вушэй зачапіліся сняжынкі, раставалі. Шурка Аляповіч папляваў на чорныя ад смалы далоні і сціснуў тапарышча каля самага абуха.

Твар у Сёмчыка ўсё яшчэ быў спахмурнелы, а вочы

нібыта паяснелі, у іх загарэліся іскаркі. Ну чыста як у ягонай Люсі! Яна заўсёды глядзіць адкрыта, даверліва, і калі б не здзеклівая іскарка ў вачах, ёю можна было б захапляцца як лялькаю. Але ўсе лялькі на адзін манер, а людзі розныя, з характарамі сваімі. І Люся з характарам, таму і крыўдуе, калі з яе пацвельваюцца хлапчукі.

— Ну-ка, ну-ка, разыдзіцеся! — Кулічонак развёў рукамі, адпіхваючы ад сябе дзяцей, але толькі апусціў рукі, як дзеці зноў апынуліся каля дзвярэй пунькі.

Сёмчык залез у пуньку. Адтуль пачулася яго глухое бубненне, стукат: мабыць, казуля вырывалася, не давала сябе ўзяць. Нарэшце з дзвярэй паказаўся Сёмчык. Ён трымаў на руках казулю, на рогі ёй наліпла павучына, матлялася.

— Упусціш!.. — Кулічонак сціскаў кулакі і трос імі перад сваім носам. — Вяроўкай яе, ліха мацеры! Тапор, Шурка, давай!.. — камандаваў ён.

Я глядзеў на Кулічонка і дзівіўся з яго не меней, чымся нядаўна з Сёмчыка. Але дзівіцца не было калі: усе глядзелі на Сёмчыка. Асцярожна ступаючы, ён панёс казулю ў край гарода. Паставіў яе на снег і лёгенька стукнуў далоняю па спіне. Яна тузанулася, крыху адбеглася і стала; глядзела на людзей, і ўвесь свет зноў умяшчаўся ў яе бяздонных вачах.

— Ідзіёт!.. — узвіўся, як віхор, Кулічонак і, выхваціўшы з рук Аляповіча сякеру, кінуўся за казуляю. Яна рванула вялікімі скачкамі, і Кулічонак запусціў у яе сякеру. — Стой-й-й, такую тваю!..

— Пацалуй цяперака ёй пад хвост! Яна акурат падняла, — засмяяўся дзед Аўтух. У роце з-пад сівых вусоў у яго тырчаў адзін вострЫ, як шыльца, зуб; і кончык барады ў дзеда быў востры; і дзюбачка носа вострая; і на язык дзед быў востры.

Дзеці свісталі і крычалі ўслед казулі, а я глядзеў на яе з радасцю і незразумелым смуткам. Нюхаючы снег, казуля пайшла ў бок Велькага балота. І я пайшоў следам: адліга будзе стаяць доўга, у хаце яе не перасядзіш, і трэба шукаць галёш.

* * *

Майскаю раніцаю ў небе ляцеў рэактыўны самалёт і, набіраючы хуткасць, выбухнуў так, што страсянулася наваколле. Акурат у гэты час ў Велькім балоце ў акопе

пад густымі елкамі курчылася ў пакутах мацярынства казуля. Ад выбуху здрыганулася не толькі зямля, але і казуля — з ялін пасыпалася жоўтая леташняя ігліца, і ўжо не толькі на казулю, а і на двух мокрых плямістых цялятак, што квола сучылі нагамі і жмурылі мутныя, блакітныя вочы. Сонца прабівалася скрозь гушчыню елак і мяккімі зайчыкамі скакала па спінах цялятак, па маладым пахучым верасе, і ўся гэта стракатая мазаіка прыдавала цёплую вясёлую акрасу маленькаму кавалачку зямлі.

---

## АДЗІН ТОЛЬКІ ДЗЕНЬ

Балшэтка нават не падазраваў, што ўсё так павернецца, хоць ужо даўно пераканаўся: у жыцці шмат выпадковасцей.

Дзень пачаўся звычайнаю рупатаю. Балшэтка дачакаўся, пакуль прачнецца сын, адзеў яго; даўшы ў руку яблык, павёў у яслі. Тратуар быў чысты і сухі, прыемна чуўся пад нагамі. З-за дамоў, што разбегліся абапал спадзістай вуліцы, развінала промні сонца, кранаціся маладых тапаляў, ад чаго лісце на іх дробна, як пацеркі, бліскала. Так яшчэ, згадалася, бліскалі хвалькі Сажа, калі ледзь-ледзь наклюнецца світанак і пацягне з кустоў лазняку вострым, азноблівым ветрыкам. Гэты напамін раптам абудзіў у душы глухое ныццё, і Балшэтка зноў — ужо каторы раз за апошнія дні! — падумаў, што жыве ў нейкім трывожным чаканні. Але якім? Чаго яму пачынала не ставаць?

Сын, забыўшы на яблык, круціў галавою, не спускаючы вачэй з легкавушак, што жыгалі па вуліцы. Балшэтка гэту цікавасць сына прымаў спакойна, бо час не прыспешваў, а ён сам любіў раніцу — з яе блакітнаю, рэдзенькаю смугою, адбіткам ціхамірнасці на ўсім: на тварах людзей, вокнах магазінаў, грудах цэглы ў дварышчы будаўнічай пляцоўкі...

На траве пад таполямі паслася парачка шпакоў, і Балшэтка радасна ўсміхнуўся: і тут, у горадзе, жывуць

шпакі — успомніў, што першы раз бачыў іх у красавіку, а не на пачатку сакавіка, як у вёсцы. І яму было радасна пра гэта думаць, адчуваючы ў сваёй далоні цёплыя, даверлівыя пальцы сына.

Ужо на прыпынку тралейбуса спахапіўся, што забыў лісткі якасці, якія звечара і мала не да поўначы запаўняў, прыпамінаючы свае паездкі на хлебазавод. Іншым разам, можа, і не вярнуўся б па іх, а сёння — тэхвучоба — і яны край патрэбны.

Ён адамкнуў кватэру, сабраў са стала лісткі. Не паспеў зашпіліць усе мудрагелістыя зашчапкі на паліцы, як коратка, нервова дзынкнуў званок. Балшэтка адразу падумаў, што здалося, і нейкі момант нацята слухаў цішыню, потым усё ж адчыніў дзверы: на парозе суседняй кватэры—паспела ўжо адысціся—стаяла старая, белая-белая, як смерць, з пустымі, нейкімі незразумелымі вачыма. Балшэтка сумеўся.

— Ванечка!.. — Гэта была суседка. — Вох, Ванечка, паміраю... Хадзі пабудзь каля мяне...

Балшэтка, яшчэ не ачомаўшыся, ступіў следам за старою, і яму патыхнула ў нос едкімі медыцынскімі пахамі. Старая грузна завалілася на канапу; уткнуўшы сівую галаву ў падушку, застагнала. Балшэтка таптаўся на месцы і не ведаў, за што ўзяцца. Старая падняла руку, і ён зразумеў, што трэба памацаць пульс. Няўпэўнена сціснуў запясце, стараючыся пачуць пад пальцамі дрыготкае патузванне. Рука была халодная і мяккая, быццам з губкі, і здавалася, у ёй ужо нічога не жыло. Балшэтку ахапіла трывога, ды ён не адступіўся, трымаў старую за руку, акурат хацеў перадаць ёй сваё цяпло.

Старая стагнала, ледзь вымаўляючы словы.

Двухстворкавыя дзверы ў спальню былі адчынены насцеж, і адтуль чуўся роўны, глыбокі храп. Балшэтка здагадаўся, што на ложку, край якога вытыкаўся і блішчаў білам, спаў дзед Кузьма. Ён, хаця меў за восемдзесят і быў тугаваты на вушы, браў яшчэ добрую чарку: Балшэтка не раз бачыў, як ён насіў у сетцы здаваць парожнія бутэлькі. Але вочы і памяць у дзеда былі надзіва вострыя і шмат чаго ў сабе таілі, і Балшэтка ўжо даўно песціў намысел паталкаваць з ім адзін на адзін— шчыра і ўсур'ёз.

Старая аблакацілася, і голас у яе стаў выразным, трохі дзяркатым, зусім не такім, як хвіліну назад; яна,

паказаўшы вачыма на буфет, папрасіла падаць ёй лякарства і зноў утапіла галаву ў падушку. Балшэтка ўзяў у рукі высокі жоўты карабочак, прачытаў назву.

— Карвалол?

— Ага, карвалол... Вой, паміраю... — У яе проста дзіўна мяняўся голас, і гэта крыху бадзёрыла Балшэтку — што старая яшчэ не зусім слабая.

— А колькі яго вам?

Старая падняла галаву, вочы ў яе былі цьмяныя.

— Лі вунь у кубак... Там вада ёсць? Многа? Лі ўсё... Вой, мне блага... — І голас яе зноў выразаўся на плаксівы.

Балшэтка выліў у кубак карвалол, якога было толькі на дне, падаў старой, і калі яна брала, ён яшчэ раз адчуў яе халодныя пальцы. Балшэтка ніколі не бачыў, як млее чалавек, і таму зусім разгубіўся. Што рабіць, куды кінуцца, калі раптам старая напраўду пачне захліпацца? Тармасіць дзеда? Ды пакуль ён растуркаецца, паўгадзіны пройдзе.

— Вой, няўжо да мяне смертанька падлашчылася?..— стагнала старая. Балшэтка хапіўся суцяшаць яе — што цяпер нават маладых часта трывожыць сэрца, маўляў, шалёны рытм жыцця, стрэсы, спешка... Але нічога — пабаліць і супакоіцца. Пажартаваў нават: у чалавека заўсёды павінна па нечым балець сэрца.

Старая, мусіць, уважліва слухала яго, бо падчас гаворкі сціхала, адно ён змаўкаў, як яна тут жа пачынала вохкаць. А ён забыў, што яму на працу, і наогул ні пра што не думаў, усё замкнулася на старой, адсланіўшы астатняе глухой сцяною. Схамянуўся тады, калі пачуў стук у дзверы. Смелы, патрабавальны.

— Во, гэта доктар!.. — сказала старая і яшчэ мацней застагнала.

Балшэтка павярнуўся сустракаць госця. У пярэдняй убачыў жанчыну ў белым расхінутым халаце, з-пад якога віднелася зялёная сукенка. У руцэ жанчына трымала ёмісты сундучок.

— Выклікалі? — спытала яна і чамусьці ўсміхнулася тонкімі, па краях падмаляванымі, вуснамі. Балшэтка не ведаў, ці выклікалі ўрача, але па тым, як старая здагадалася, хто пастукаўся, зразумеў: жанчына трапіла па адрасу. Ён правёў яе ў пакой, дзе ляжала хворая. Жанчына села каля канапы на крэсла, якое падсунуў

ёй Балшэтка, расчыніла сундучок. Як бы між іншым сказала старой: «Раздзеньцеся».

Балшэтка, адчуўшы, што цяпер ён тут лішні, развітаўся, пажадаў старой хуткай папраўкі і выйшаў.

* * *

Пераступіўшы парог лабараторыі, Балшэтка адчуў, што на яго ўсе красамоўна паглядзелі, і здагадаўся: тут толькі што быў Карабінаў. І не проста быў, а цікавіўся ім, Балшэткам.

На новага загадчыка лабараторыі Карабінава многія крывіліся ўжо з-за таго, што ён быў малады, і яго нечаканы ўзлёт сам па сабе выклікаў плёткі і намёкі. Да таго ж, як і ўсякі малады кіраўнік, Карабінаў узяўся апантана разбураць устоеныя парадкі, за што тут жа паплаціўся. прыпісалі, што суровы да падначаленых.

Балшэтка выняў з папкі лісткі і пайшоў у кабінет загадчыка. Зачапіўся вокам за чорную таблічку, на якой акуратнымі жоўтымі літарамі было выведзена: «Загадчык лабараторыі навуковай арганізацыі працы Карабінаў У. П.»

Карабінаў сядзеў за сталом і чытаў газету: па тым, як трымцелі старонкі, можна было меркаваць, што ён расхваляваны. Ён быў у шэрым касцюме, пры чорным гальштуку, які кантраставаў з белым каўняром сарочкі. Павітаўся і, пакратаўшы на пераноссі акуляры, запытальна глянуў на Балшэтку, мусіць, чакаючы, што той адразу пачне бараніцца.

Балшэтка, стаўшы побач, паклаў перад Карабінавым лісткі.

— Мяне ваша работа цікавіла крышку раней, а зараз цікавіць іншае: чаму вы парушаеце распарадак працоўнага дня? — Карабінаў штучна прыдаваў свайму голасу строгі, пагардлівы тон, і гэта не магло не закрануць Балшэтку, які ні ў чым не цярпеў фальшу і абвострана адчуваў яго ў словах, усмешцы, жэстах, нават у дыханні. — Тым больш у нас сёння тэхвучоба, на якую запрошаны сам дырэктар ПКБ. — Карабінаў умеў надзіва шматзначна націснуць на гэтае «сам».

Балшэтка, разумеючы, што ў такіх выпадках, не марудзячы, трэба павініцца перад начальнікам і заракціся больш не спазняцца, не мог, аднак, сябе перасіліць—

можа б, ён і зрабіў так, калі б не адчуў з боку Карабінава пыху і боскую ўсемагутнасць караць і мілаваць, — і таму сказаў як мага спакайней, упэўнена:

— Была прычына, Уладзімір Паўлавіч.

— Прычын, я ведаю, шмат, і калі кожны аддасца іх волі, а не дысцыпліны, то што атрымаецца? — Карабінаву яўна не лёг на душу адказ, а выстаўляць сябе перад падначаленым мяккацелым, беспрынцыповым — значыць, не шанаваць сваё самалюбства, гэта ён добра засвоіў яшчэ працуючы ў «Белгіпрабіясінтэзе», а таксама і тое, што толькі дай адчуць людзям слабінку, тут жа сядуць на галаву. — Я прашу адказаць мне па сутнасці.

Балшэтка бачыў, што прышчаміў Карабінаву хвост, але наважыў таксама не саступаць, лічачы, што праўда за ім, і таму, калі даражыць ёю, трэба патрабаваць, каб да яе ставіліся чыста, з даверам.

— Выходзіць, вы мне не давяраеце?

— Як разумець?

— Ну раз дапытваецеся... па сутнасці. Значыць, лічыце, што прычына можа быць і не істотная, — сказаў Балшэтка, з прыкрасцю згадваючы хлусню і выдумкі лабаранткі Люсі, якімі яна апраўдвалася за спазненні і прагулы. Канечне, прасцей простага выдумаць важкую прычыну, ацаніўшы ўсе «за» і «супраць», але — застацца пасля спакойным... Вядома, здолее не кожны. Дык, можа, лепей пакінуць некранутай сваю шчырасць, чым выстаўляць яе, далікатную, пад цвёрды ґрад сумненняў. Бо, бясспрэчна, Карабінаў усумніцца ў тым, што скажа яму Балшэтка. І навошта, навошта гэта распытванне, гэты намер зрабіць з яго, Балшэткі, чарвяка, які поўзаў бы каля ног? Калі б Карабінаў быў на самай справе такі, а то ж яўна, што напінаецца, вылузваецца са скуры, баючыся за свой начальніцкі гонар. Драбнееш, таварыш загадчык, драбнееш... Канечне, ёсць і ў тваёй душы дабрата. У кожнага чалавека ёсць дабрата, толькі ў аднаго яна адкрыта, як кветка сонцу, а ў другога пад ільдзінкаю, якую трэба растапіць. Вось як растопіцца на тваёй душы льдзінка, тады і пагаворым шчыра, без лішняй падазронасці.

Карабінаў адчуў гэтую зацятасць Балшэткі і, каб усё-ткі ўтрымаць свой гонар на вышыні, цвёрдым голасам сказаў:

— На першы раз я зніжаю вам каэфіцыент працоўнага ўдзелу, інжынер Балшэтка.

У лабараторыю Балшэтка вярнуўся спахмурнелы. Яму ўсе спачувалі. Журыцца надта, вядома, не было з-за чаго, бо надзейней падтрымкі, чым сама рэальнасць, ад якой нідзе не дзенешся і сіла якой у тым, што яна аб'ектыўная, наўрад ці знойдзеш, але заўсёды пасля такой прыдзірлівай строгасці брыдзенька было на душы, акурат па ёй нехта патупаў у кованых ботах. Нелады, мітусня, тлум... Няпроста з імі, але ж і без іх таксама, мабыць, нельга, як нельга паставіць сябе па-за тым, што называецца ЖЫЦЦЁМ.

Схіліўся над паперамі, вочы адно прабягалі па радках, а думкі кіравалі зусім у іншы бок. Хацеў быў пазваніць свайму сябру з тэлебачання Ігару Малетку і прапанаваць куды-небудзь схадзіць адвесці душу, на што той заўсёды ахвотна згаджаўся, але падумаў: гэта будзе не лепшае выйсце. Ну, пойдуць яны ў піўбар, возьмуць бутэльку сухога, упадабанай імі «Манастырскай хаты», перагавораць... І ўсё як быццам забудзецца, сплыве з хвалямі лёгкага хмелю. А назаўтра, Балшэтка ўжо ведаў, зноў тое ж самае.

Ён узрадаваўся, успомніўшы пра сына. Як будзе забіраць яго з ясляў, як не пойдуць яны адразу дадому, а завернуць на алею — там шырока і прасторна. І, дзіва дзіўнае, некуды імгненна адрынулася засмучанасць, здаўшыся дробязнаю і нікчэмнаю, а душа стала напаўняцца радасцю.

* * *

Ён не прымеціў, як да яго падышла лабарантка Люся, схамянуўся адно тады, калі пачуў яе знаёмы хрыплаваты голас: «Цябе да тэлефона».

Званіла жонка. Адразу адчула мужаў настрой, хоць, здавалася, Балшэтка і не выдаў сябе нічым, затурбавалася: «Што на рабоце здарылася?» — «Дробязі...» — «На прагрэсіўку не паўплывае?» Жонка (загадкавая штука, жаночая інтуіцыя!) была на правільнай здагадцы. Балшэтка здзіўляўся і радаваўся ўзаемаразуменню, што склалася ў іх з жонкаю за тры гады сямейнага ладу і якое чамусьці так надавала ім аптымізму ў жыцці. Ён, канечне, не мог зараз расказаць ёй пра ўсё, і не толькі таму, што патрэбен быў час, — проста не хаце-

лася варушыць ужо прыціхлае і аддаленае, бо яшчэ раней адкрыў ісціну: вяртацца памяццю ў даўняе — значыць паўтараць усё спачатку і па-новаму перажываць; а ў наш імклівы век чалавек павінен жыць вялікаю мэтаю і няшчадна адсейваць мішуру штодзённшчыны.

Жонка, крыху супакоіўшыся, спытала, як і кожны дзень, ці не перашкодзіць яму што-небудзь забраць з ясляў сына; Балшэтка нават спалохаўся: раптам жонка сама захоча забраць сына і, не даючы ёй нават намёку, што яму нявыкрутка, адказаў: «Не-не, я сам!» Жонку гэта, як і варта было чакаць, не засмуціла, а, падобна, узрадавала. Яна сказала: «Я пад'еду да мамачкі — званіла, што дастала нарэшце мне брыльянтавыя завушніцы, трэба ацаніць». Ён ніколі не быў процi яе адлучак, наўпярок, нават іншы раз падбіваў на іх: прапаноўваў схадзіць у кіно, тэатр ці дамаўляўся з тым жа Ігарам Малеткам, каб правёў жонку ў студыю, дзе запісваюць славутага пісьменніка ці папулярнага артыста. Дарэчы, і жонка не пярэчыла Балшэтку, калі ён адлучаўся па нейкай надабе.

Прапікала шэсць гадзін, і ўсе дружна пакінулі лабараторыю. Балшэтка пачуў, што следам нехта ідзе. Ступіў яшчэ некалькі крокаў, аглянуўся: блізка ад сябе ўбачыў Люсю. У даўгой блакітнай сукенцы, яна была высокая, зграбная, з цёмнымі бліскучымі валасамі; у вачах разам з рашучасцю тлела і сарамлівасць. Ён спыніўся і чакаў. Яна падышла. Ён глянуў на яе імкліва.

— Ваня... Ты спяшаешся?

— А як жа інакш? — здзівіўся Балшэтка, адразу пераключыўшыся на лёгкі тон: ведаў, што пры такой размове яго адмаўленне не надта закране Люсю і не дасць ёй падстаў для думкі, што ён зацікаўлены ў іх збліжэнні таксама. — Сямейны чалавек, прыкладны бацька, якога ў яслях чакае сын... — Балшэтка не хаваў іронію.

— Шкада, канечне... — Люся апусціла павекі, якія ўжо на працы асвяжыла зеленаватымі ценямі.

— Здаецца, шкадаваць няма аб чым. Усё гэта гульня, не больш... Ты ўжо прабач мне за мой дзіцячы лепет. Прабач, калі ласка, Люся... Я нічога не магу табе абяцаць.

Яна засталася стаяць разгубленая, а ён пайшоў далей, не азіраючыся.

* * *

Спачатку ён вёў сына за руку — цераз дарогу, па якой праносіліся машыны, паўз магазін, дзе таўклося шмат людзей — прадавалі мараканскія апельсіны, — малы, як разумеючы, ахвотна тэпаў побач. Толькі звярнулі на алею, сын выпусціў Балшэткаў палец і самастойна падыбаў па ўкладзенай пліткаю дарожцы, абсаджанай з абодвух бакоў клёнамі, ад якіх на зялёны газон кладаліся млявыя цені. Спыніўся, убачыў, што бацька зусім блізка, — пабег. Пераваліста-няўпэўнены, з растапыранымі ручкамі, ён быў падобны на пінгвіна.

Балшэтка таксама прыспешыў хаду. Адчуваў, зрушылася нешта ў ім, нават не сёння, а, як падумаў раніцаю, за апошнія дні. Няўжо чалавеку заўсёды, каб стаць відушчым, усумніцца, трэба перажыць непрыемнасці, трэба па нечым ці ад нечага засумаваць? У Балшэткі разбягаліся думкі. Так ці не так, у любым выпадку яму адно здаецца, што ўсё ў жыцці гладка, ён проста прымушае сябе так думаць, а іншых думак жахаецца, як бязлітаснай хваробы. Жыццё гладкім ні ў кога не бывае.

Ну, канечне ж, усё не так проста ў гэтай крутаверці, якая падхапіла яго. Вось толькі варта адкрыць вочы і паразважаць цвяроза, як гэтае іх узаемаразуменне з жонкаю здасца падманлівым і штучным, і ўжо будзе думацца, што сярод іх знайшло прытулак раўнадушша, што ім карціць адасобіцца, знайсці паразуменне з іншымі. І, мусіць, не толькі фальш з боку Карабінава сутыкнуў іх сёння, а і яшчэ нешта. Зайздрасць? Не. Балшэтка ніколі не лічыў сябе няўдачнікам. Закрануты гонар? Дык на гэта рэагуюць бурна адно людзі без годнасці або з якім-небудзь комплексам.

Або ўзяць тую ж Люсю. Ну як, як яму паводзіцца з ёю? Пра каханне, якое арыентуе людзей на самае высокае і дзёрзкае, здаецца, гаварыць смешна. А што тады яна мае да яго? Няўжо ёю кіруе звычайны разлік развядзёнкі? А можа, проста эгаістычнае жаданне жанчыны пафліртаваць з жанатым мужчынам і пераканацца лішні раз у сваёй неадхільнасці?

Вось, вось як яно ўсё закручваецца, і паспрабуй разбярыся, што да чаго.

...А сын бег і бег, абсалютна безуважны да таго, над чым пеклаваўся ягоны бацька. Можа, і тады, як вырас-

це, яго будзе займаць іншае, бо інакш будзе жыць, зусім не так, як бацька, пасляваенны вясковы хлопец, якога жаданне вучыцца занесла ў горад.

Дарога ўперлася ў высокі цагляны дом, каля вокнаў якога віселі пакункі. Гэта быў інтэрнат медінстытута, у які Балшэтка бегаў званіць па міжгароднім тэлефоне да бацькоў у вёску і дзе пазнаёміўся са сваёю жонкаю.

Сын абагнуў вугал дома, за якім адразу пачаўся шырокі заасфальтаваны пляц. Сын разгубіўся — дасюль ён адчуваў сябе засяроджаным, рашучым, а цяпер яму здалося ўсё нецікавым і простым, як тыя магазінныя цацкі, што ляжалі ў вялікай кардоннай скрыні і да якіх ён ужо даўно не дакранаўся. Хацеў нават павярнуць назад, але ўбачыў, што яго даганяе бацька, усміхнуўся і паклыпаў далей.

Пляц уціснуўся нарэшце між будынкамі, і сын спыніўся. Ён не ведаў, што рабіць, — кругом было гола і чыста. Чакаў бацьку, каб узяць яго за палец і павесці ў іншае, больш цікавае месца. Раптам увагу прыцягнула шчарбіна ў асфальце. Ён доўга глядзеў на яе. Потым прысеў, пачапаў рукою зямлю. Знайшоў трэску і пачаў калупацца ў шчарбіне. Ён так заюшыўся, што не заўважаў бацькі, выкідваў на асфальт сухі пясок.

Балшэтка, наблізіўшыся, паспрабаваў яго адцягнуць, але дзе там: сын яшчэ ўвішней заторкаў трэскаю.

— Пойдзем, сынок.

Сын, скрывіўшыся, павярнуўся да бацькі спінаю. Балшэтка яшчэ крыху пачакаў і зноў лёгенька тузануў сына за руку, але той не даўся. Тады Балшэтка, сказаўшы: «Я пайшоў», — схаваўся за будынкам. Сын не зварухнуўся, сядзеў і торкаў у шчарбіну трэскаю.

Дзіва, і толькі! Знайшоў занятак... Балшэтка ўзяў сына за падпашкі і прыпадняў, той скурчыўся і не хацеў выпростваць ногі. Тады Балшэтка панёс яго, але сын забрыкаўся нагамі і заплакаў. «Во прыкіпеў!..» — падумаў без злосці Балшэтка і адпусціў сына. Што гэта з ім? Адкуль такая цяга да гэтай ямачкі з сухім пяском у дзіцяці, якое нарадзілася ў горадзе? Няўжо ў ім абудзіўся нейкі покліч продкаў? Няўжо і яго, якому жыць у горадзе і ніколі не ведаць вёскі, трывожыць, вабіць да сябе зямля? Ці, можа, гэта проста дзіцячая забава? Але што тут заманлівага? Куды цікавей прабегчы па плітках, што кратаюцца пад нагамі, якія і самі яшчэ няцвёрдыя.

Здаецца, яго думкі і адчуванні пачалі праясняцца, і ў грудзі прыліло трапятлівае цяпло: успомнілася вёска. Дзякуй, сын! Даўно не быў у вёсцы, у тым ласкава-прывычным свеце, у якім, бы ў сне, было заўсёды хораша і бестурботна і які ўсё яшчэ, аказваецца, жыве ў душы прытоена-далёкім родным водгуллем, якому, як і небу, і сонцу, і дрэвам, мабыць, наканавана вечнасць.

Сын, ужо ўкленчыўшы, зацята выкалупваў на асфальт зямлю са шчарбіны. А Балшэтка стаяў і думаў: «Няўжо я і праўда так звыкся з горадам, што пачаў забываць вёску?..» Так, так, гарадское жыццё ўжо ані не палохае яго, як некалькі год назад. Ён стаў разбірацца ў ім і знаходзіць выйсце нават з тых сітуацый, перад якімі раней бянтэжыўся, апускаў рукі, і сённяшні дзень, толькі адзін дзень пацвердзіў гэта.

* * *

На лавачках вакол стала, за якім звычайна мужчыны гулялі ў даміно, сядзелі жанчыны-пенсіянеркі і стрымана гаманілі; у іх былі нейкія роспачныя твары.

Балшэтка падумаў: няйнакш, нешта здарылася, і тут жа ўспомніў сваю хворую на сэрца суседку. Не, яму не хацелася ні ўва што благое верыць, і таму ён падхапіў на рукі сына, панёс яго ў пад'езд, акурат баючыся, што яго аклікне хто-небудзь з-за стала і пра ўсё расскажа.

Уражаны, сумеўся, калі чалавек, які без званка зайшоў у кватэру, аказаўся не жонкаю, а... сынам старой суседкі: матавая бледнасць ляжала на яго сухіх, па-мангольску скуластых шчоках. Ён спачатку папрасіў табурэткі, а потым ціха сказаў, стрымліваючы ў голасе дрыжыкі:

— У мяне мама памерла...

— Памерла?.. — Гэта было не здзіўленне, проста ім, Балшэткам, смерць старой успрынялася як нечаканая і вялікая ўтрата.

— Сёння... У адзінаццаць гадзін.

— Якое гора!.. — выдыхнуў Балшэтка. Ён завярнуў на кухню, каб папіць вады, і ўбачыў у акно, што дзед Кузьма таксама нёс у дзвюх руках табурэткі з суседняга пад'езда. Дзед быў без кепачкі, прывычна налепленай на голую макаўку; скура ўкруг яго вачэй свяціла чырванню.

Якое зменлівае жыццё!.. Чалавека, з якім раніцаю размаўляў, ужо не стала. І пастаянна так: нехта пакідае зямлю, а нехта, нарадзіўшыся, займае яго месца. І той, хто займае, павінен ісці далей.

Каб развеяць смутак, Балшэтка пачаў забаўляцца з сынам: кідаў мяч так, каб ён адбіваўся ад падлогі. Сыну гэта падабалася, ён смяяўся і падносіў бацьку мяч зноў і зноў...

У той жа вечар, дачакаўшыся жонку, Балшэтка ўвайшоў у прыціхлы, нежывы, напоўнены лампаднавасковымі пахамі пакой, дзе ляжала нябожчыца; яна ляжала ў труне з каменна сашчэпленымі на грудзях рукамі; верхняя губа закрыла ніжнюю.

Балшэтка моўчкі пастаяў; выйшаў з пакоя. Спытаў у жонкі цыгарэту, выйшаў у двор пакурыць. Цьмяна адсвечвалі дошкі стала і дзвюх лавачак, што не траплялі ў цень: неба над горадам было незвычайна мігатлівае і жоўтае, быццам недзе на краі зямлі гарэла вялікая казачная свечка.

---

## УСЁ ЖЫЦЦЁ ЛЮБІЛА...

Яна стала Мар'ечкаю тады, як нарадзілася (на другі тыдзень ёй далі імя), застаецца Мар'ечкаю і цяпер, калі ёй за шэсцьдзесят. Усіх дзяцей у сям'і Калютаў было сямёра, Мар'ечка — пятаю. Два браты і Мар'ечка засталіся ў Малінаўцы, абжыліся, астатнія дзеці разляцеліся, бы тыя падлёткі з гнязда, у розныя бакі, хто куды.

Бацька, стары Дзяніс Калюта, памёр даўно, яшчэ перад вайною, ад сухот, і Мар'ечка доўгі час жыла з маці. А гады з тры назад не стала і маці: яшчэ тупала ўранні з кіёчкам па двары, выганяла з гарода курэй, а пасля абеду пайшла горлам кроў, якую ўжо нічым спыніць не змаглі.

Мар'ечка засталася адна, і хата яе стаяла ў адзінотнай зажуранасці — суседка Насця пасля таго, як загарэў яе двор, перайшла жыць да сына, а сусед справа,

Храмянок, перавёз сваю даміну ў райцэнтр — і гэтыя прарэхі ў шчытным радзе хат неяк нязвыкла шырока адкрывалі вачам прастор і глядзець на іх было не то сорамна, не то балюча.

З братамі, што аселі разам з Мар'ечкаю ў Малінаўцы, Лявонам і Петраком, выйшла неяк няўдала: першы п'яніца, ходзіць з сінім носам, зараслы шчаціцаю; і ніжняя таўстая губа ў яго таксама сіняя, а знутры, каля зубоў, чырвоная-чырвоная. «Каля зубоў» — смех! У Лявона ўжо і зуба няма ніводнага: хлеб, мякіш, жуе, а сала з'есці не можа. І ўсё-такі, што рэдка бывае з п'яніцамі, Лявон глядзеў гаспадарку: каля свайго двара вечна ляжыць куча дроў, і ў Мар'ечкі хлеў з усіх бакоў абкладзены дровамі — парэзанымі і паколатымі.

Канечне, без бутэлек не абышлося, ды яно ўсё роўна трэба плаціць, свайму ці чужому. Дык свой жа хаця не надта крывіцца будзе, што мала заплаціла, бо нават малую плату сорамна браць у сястры. Але тут была не так плата, як выручка: у Лёксы, жонкі, Лявон не вельмі пабярэцца — звяглівая, хоць вушы затыкай.

Пятрок, той не п'е зусім, але абгарадзіўся высокім шчытным плотам, на варотах і весніцах парабіў цяжкія дубовыя завалы — і паспрабуй дастукайся. Ён сам прысылае да Мар'ечкі дачку, калі яму трэба адпасвіць радоўку. У Петрака жонка аграном, з гонарам, так паставілася, што зганяць кароў для яе — ледзь не абраза. Рэдкі, канечне, у вёсцы чалавек, нават на цяперашнюю пару, але з жыцця Мар'ечкі яго не выкінеш.

Пра гэтых кароў калі гаварыць... На ранкі гоняць, у вёсцы адной Мар'ечцы не трэба крычаць пад акно, стукаць кіем па плоце ды сабак цвяліць. Пастух яшчэ толькі ідзе ў канец вёскі, а яна ўжо сядзіць на прасле-загародзе, як тая курыца на седале.

— Здароў, Данілавіч! — крычыць мясцоваму фельчару, які ідзе па другі бок вуліцы. На плячы ў яго пуга, хвост яе цягнецца па пяску і пакідае белую палоску. Фельчар чалавек нетутэйшы, вучоны, «інцелігент», яго ўсе называюць па бацьку.

— Добрага здароў'ечка! — так на прывітанне Мар'ечцы адказвае чамусьці адзін фельчар.

— Куды пагоніш?

— Ды, мабыць, паўз шашу, па тэлефоннай лініі... Потым да Сажа завярну, папаю.

— Гані ў Заручэўе, я тама ўчора ягады брала — столькі травы!

— Ну тады пасля абеду паганю ў Заручэўе, — фельчар ляскае пугаю, і сухі стрэл мякка патанае ў алешніку за вёскаю. — Гэ-эй, кароў ганіце!..

Мар'ечка выганяе з хлява карову, сцёбае хлудам — не дае карове сагнуць галаву і скубнуць травы на двары. У Мар'ечкі на двары ніколі не ўбачыш гразюкі, свінных рыцвін. Не двор, а лужок — прасторны, сонечны, і роўненька парос травою-муравою, якую адно куры калі і шчыпнуць, падкароцяць, — толькі ад ганка на вуліцу бяжыць вузенькая, бы шнурок, сцежачка, уплятаецца ў пясчаную, разбітую трактарамі і машынамі дарогу.

Мар'ечка адганяе карову далей ад хаты і чакае, пакуль прыблізіцца чарада.

— На́пале, на́пале пайшлі! — Данілавіч ляскае на кароў пугаю. Каровы шумна чмыхаюць, цягнуць у сябе паветра, спыняюцца... У нечым двары сонна гаўкае сабака — незадаволены, што разбудзілі.

А Мар'ечка бяжыць у двор. На сцірце дроў стаіць лазовы кошык; вытрасае з яго рэшткі звялай лебяды і як той каток коціцца па гародзе. Высокі расяны бульбоўнік мые халявы гумавых ботаў, стукае па каленях. Над зямлёю ў нізіне вісіць туман, нерухома, як застыў, а Мар'ечка разганяе яго — далоні і твар у яе вільжэюць, ногі ажно спружыняць ад мяккай, прыемнай прахалоды.

Сасоннік у тумане сіні, шчытны, як гара. Цемнавата ў ім яшчэ, морак плавае, але Мар'ечка невысокая ростам, і вочы ў яе блізка ад зямлі: не трэба ўглядацца. Круг за кругам Мар'ечка аббягае сасоннік, як падпяразвае яго, і на душы ў яе лягчэе, а кошык у руцэ цяжэе: кладуцца і кладуцца ў яго каласавікі — чорнагаловыя крэпенькія, таўсмаценькія барвічкі. «А! Га! А-у-у!» — разносіцца па сасонніку: грыбнікі прыйшлі, а ў Мар'ечкі ўжо цэлы кошык, дужка муляе сагнутую ў локці руку.

Мар'ечка ляціць дахаты — над жытам хустка плыве; і сонца спяшаецца ўстаць з-за алешніку, пасвяціць у вочы — прывеціць, абагрэць рукі, падсушыць адзенне. Промні мяккія, ласкавыя, і такая ж мяккая ўсмешка на твары і ў вачах у Мар'ечкі: у жыце на васільках пераліваюцца, як ліхтарыкі, вялікія чыстыя ліловыя кроп-

лі. Мар'ечка ўсміхаецца, а ў галаве ткуцца-снуюць думкі: зараз прыбяжыць яна двору, напаліць у печы, наіжа на драцяныя пруткі барвікі, пакладзе іх ў печ на цагліны, і густы водар грыбоў, зямлі, хвоі будзе кружыць ёй галаву, будзе весела на душы, бы ад той вясельнай чаркі, будзе скакаць-прытупваць на масніцах Мар'ечка, і ў яе зап'янелых ад шчасця вачах будуць скакаць вокны, рамкі з картачкамі, фікус у куце каля стала, белая печ — і будзе ў хаце цэлае свята.

Але свята праходзіць, і трэба зноў брацца за работу. Патаўчы паранку, замяшаць кабану, курэй накарміць ды ношку травы якой нажаць: што карове падкінуць цяпер, як з поля вернецца, што растрэсці па дровах — хай сохне, на́зіму будзе.

Мар'ечка носіцца то з хаты ў сенцы, то з сенцаў у хлеў, то з хлява зразу ў хату, і тады за ёю бяжыць цэлая плойма белых, чыстых, як снег, курэй; сакочуць, лопаюць падрэзаным крыллем — падганяюць гаспадыню. «А каб вас, сакатухі! Мае б вам гады, што б вы заспявалі». А куры накляваліся тоўчанай бульбы з мукою і завінуліся шчыпаць на двары траўку: хрысь-хрысь, хрысь-хрысь... Во і песня ўся!

Мар'ечка прымкнула хату, узяла пад паху вяроўку, у руку серп і цераз вуліцу пасыпала на пагон: ногі ў Мар'ечкі сухенькія, крываватыя, і таму яна пахістваецца ў бакі — і праўда, бы каток.

На пагоне, каля канавы ў маладым цёмным алешніку, Мар'ечка ўжала травы — усякай: і чаротніцы, і бліскучай гусінай лапкі, і вятроўніку, і казяльцу... Разаслала на палянцы вяроўку; стала накладаць ношку... Не ношка, а капа вырасла, і Мар'ечка каля яе, бы муха каля мёду, кружыць, поўзае, бегае: там выскубне жмуток травы, там выскубне — і ношка пакруглела, акуратнаю, гладзенькаю стала, каці яе, бы велікоднае яечка. Але ношку не качаюць, а носяць. Мар'ечка ўвязала ношку вяроўкаю, падсунула серп, і сама ўшчамілася пад вяроўку так, каб тая легла ніжэй падбародка. Вяроўка ўпілася Мар'ечцы ў плечы і грудзі, і — о, дзіва дзіўнае! — ношка і праўда пакацілася: чалавека пад ёй не відаць, і здаецца, ношка коціцца — віхор падняўся, сарваў яе і панёс над зямлёю, як лёгенькае пёрка; і серп зверху бліскае тонкім блакітным месячыкам.

На вуліцы Мар'ечку перастрэла на веласіпедзе паштальёнка — Люська; жыве яна ў суседняй вёсцы, але

пошту разносіць і па Малінаўцы. Люська худая, высокая — калені ў руль упіраюцца, вечна пазбіваныя, у больках. Злазіць з веласіпеда. На баку сумка як падняць.

— Алё, хто тама? Ты, Мар'ечка? — згінаецца ледзь не да зямлі, каб убачыць пад ношкаю чалавека.

Мар'ечка прыпіраецца ношкаю да частаколу, стаіць, аддыхваецца. Твар у яе ружовы, акурат пасля лазні, у маршчынах блішчыць пот, а вочы смяюцца, пераліваюцца, бы тыя чыстыя кроплі на васільках у жыце.

— Табе, Мар'ечка, пісьмо... — Люська дастае з сумкі канверт і газету. — Калюта Марыя Дзянісаўна.

— Во! Ад каго ж та? Пачытай мне, галубка, а то ўжо мае вочы, у такой грамацейкі, нічога не разбяруць.

Люська разрывае канверт, чытае. Мар'ечка слухае, і словы ёй кладуцца мёдам на сэрца. Малодшая сястра піша з Караганды, што сына падкіне месяцы на два. Няхай прыязджае Ігарок — тут сальца, малако, яйка свежае, грыбкі...

— Дзякуй табе, Люсічка, за добрую вестку! Забяжы, я кампот з чарніц варыла..: Духата во — спасу няма! — Мар'ечка нахіляецца, і ношка зноў хавае яе пад сабою, а зверху тоненькім блакітным месячыкам заззяў серп.

Руплівае было лета, але шчодрасць восені яго перамагла — ідзе час. Пастарэла зямля, дрэвы; пастарэлі хаты, платы і лавачкі пры іх, вокны — сталі цьмяныя. Пастарэла і Мар'ечка — з твару: маршчын на шыі прыбавілася, як хто ніткаю абкруціў, каля вачэй гусцей скура пасеклася; здаецца, яшчэ болей пакрывелі ногі, і вочы да зямлі бліжэй сталі. А рухавасці ў Мар'ечкі ані не паменела: не сядзе, не прысядзе, хіба што на прасле, каб не прапусціць пастуха, карову выгнаць у поле.

Неба сінім глыбокім кубкам абярнулася над зямлёю, і пад ім людзі капаюць бульбу. Хто каня напытвае, хто з трактарыстам дамаўляецца, каб капалкаю праехаў разы два; хто сыноў і дочак на помач зазывае з гарадоў. А ў Мар'ечкі няма каго зазываць — з малога Ігарка пакуль і карысць малая; адно што весяліць: «Бабушка, а як гэта казяўка называецца?» — выцягвае з бульбіны жоўтага пруткага чарвячка. «Драцянікам на-

зываюць, а жучка, які з яго вырасце, дрывасекам... шчоўк!» — «А гэта трава на елачку падобна, праўда, бабушка?» — «Хвошч ета».

Ігарок да ўсяго прыглядаецца, усё яму новае. І куртачку ўжо выпацкаў, гузік адарваўся, штонікі на каленях аж чорныя. Да вясковых дзяцей бруд неяк не прыстае, не відаць на іх, а Ігарок крок ступіў — і ўжо пляма.

— Сядзь вунь на мяшкі, пасядзі, — гаворыць Мар'ечка Ігарку, а сама лапатаю каліва за калівам падкалупвае. Метраў дзесяць адрэзала баразны, лапату на зямлю, а бульбу ў кошык, у кошык. Накапала клумку, на плечы і бяжком у хату: ссыпае бульбу ў падмосце ў яму. Нахілілася, хахол у мяшку адпусціла — бульба і пабурбацела: бу-бу-бу-бу... Ужо лёгкую, зняла клумку са спіны і вытрасла рэштку бульбы ў яму — на масніцы і на мысы ботаў мяккай жоўценькаю манкаю трусіцца пясок, бліскае на сонцы, што дастае з акна.

— Бабушка, а чаму ты адна капаеш картошку, а ў людзей вунь па колькі многа чалавек? — сустракае Мар'ечку Ігарок і сумнымі вачыма глядзіць на яе. — Цябе ніхто не любіць... і ты не любіла?

— Любіла, унучак, яшчэ як любіла! І цяперака люблю... — Мар'ечка бярэ ў рукі лапату, ставіць яе на зямлю; на чорны, свежы камяк зямлі прыліпла пранізліва-белая, як сівізна на скронях ў Мар'ечкі, халодная павучына.

У бабуліным голасе Ігарку пачулася столькі пяшчоты і ласкі, што ён не стаў далей распытваць; акурат каля нагі вылезла з зямлі рыжая мядзведка і, быццам плывец, стала грэбаць сваімі шырокімі вывернутымі лапкамі.

Мар'ечка аднесла ці не трэцюю клумку, калі пачула крыкі. Крычалі ёй і паказвалі рукамі за сядзібы — на алешнік. Яна глянула — і перш убачыла чараду варон, а потым зразумела, што нешта здарылася з Лявонам, і, кінуўшы лапату, пабегла.

За сядзібамі на дарозе нагамі ў калдобіну ляжаў Лявон. Каля яго ўжо сабраўся натоўп, найболей — дзеці. Фуфайка і кашуля на грудзях у Лявона былі расшпілены: мабыць, нехта слухаў сэрца. Твар пасінеў, а ніжняя губа стала аж чорная, і толькі знутры, як і раней, чырвоная, бы там прыліпла скурка спелага памідора.

Мар'ечка ўбачыла Лявона і загаласіла на ўсю ваколіцу: «А мой жа ты брацік!.. Горачка ж ты маё!..»

Яна кінулася на яго, абняла і стала ліць слёзы як па мёртвым. Падбегла і Лёкса, пухлая белатварая кабета з маленькім, як у птушкі, носам, пасыпала на мужа праклёны: «А каб ты ўжо смалы напіўся, як ты з'еў маю жызню і не наеўся!..» — засмаркалася ў хустку, якую зняла на ходу з галавы. І толькі ў тых, хто глядзеў на Лявона як на звычайнае дзіва, былі самыя цвярозыя галовы: аднаго паслалі званіць у «Хуткую дапамогу», другога па алей, трэцяга — шукаць фельчара, Данілавіча.

Мар'ечка ўбівалася па брату; яму лілі ў рот алей — каб сташніла, — на грудзі ваду. Лявон мармытаў, але вачэй не адплюшчваў. А па дарозе ад шашы, бліскаючы мігалкаю, пыліла ўжо «хуткая дапамога». Мар'ечка не паднімалася з зямлі, і доктар, які выскачыў з кабіны з чамаданчыкам у руцэ, не ведаў, каго трэба ратаваць і да каго падступацца. Сабралася ўся вёска, не было толькі брата Петрака і ягонай жонкі: вестка не пераляцела праз высокі плот іх двара.

...Мар'ечка ішла абвялая, асунутая, маленькія рукі яе дрыжалі, а твар быў цёмны. І восеньская зямля ўся была нейкая выцвілая, голая, над ёю свістаў вецер,ківаў на мяжы выпетраныя былкі лебяды — і яны высыпалі з сябе дробненькае чорнае, бы мак, насенне, — а ў небе, на самым краі налівалася густою халоднаю сінню, шырэла хмара. Насенне на зямлі прарастае травою, а боль у душы чалавека — спагадай і дабратою.

Ігарок ужо не разглядае жучкоў ды чарвячкоў, а збірае ў кошык бульбу. Пальчыкі ў пяску, растапыраныя, а вочы сур'ёзныя; ён моршчыць лоб: думкі лезуць і лезуць у галаву.

— Бабушка, ты дзеда Лявона любіш?

І Мар'ечка зноў — як завучанае — акурат і не Ігарку адказвае, а сваё бубніць:

— Люблю... Ой люблю, унучак!..

— А дзе твае дзеці? — Ігарок з тых дзяцей, пра якіх кажуць, што яны нараджаюцца з вышэйшаю адукацыяй.

— Няма, унучак, адна я...

— А чаму адна? Ты ніколі не любіла? — зноў сумняваецца Ігарок.

— Любіла, усё жыццё любіла і люблю...

Ігарок зноў пакутліва моршчыць лоб і надоўга змаўкае.

А густая, набрынялая халоднай сінню хмара ўжо закрыла сонца і прынесла з сабою снег: заскакалі па зямлі белыя крупкі, шчытна сабраліся ў ямачках, бы хтосьці напхаў туды ваты.

— А бо-о-о, снег пайшоў!.. — Мар'ечка пляснула сухенькімі далонямі. І ўсе людзі жвавей заварушыліся на сядзібах: то хадзілі, а то сталі бегаць. І нават Ігарок пыхцеў, як паравоз. — Скарэй, скарэй, унучак! Ета ж трэба, столькі наварочалі! — Яна ўглядалася на калгаснае поле. Яно недалёка, за алешнікам: чуваць, як тарахціць на ім капалка; бы тыя каляровыя шары, рассыпаліся людзі — «шэхвы»: прыслалі ў помач маладых дзяўчат з Магілёва з «Лаўсанбуда». — Пабеглі, Ігарок!.. — Мар'ечка першы раз назвала ўнука па імені. Яна ўзяла яго за руку і пацягнула за сабою. — Ета ж столькі наварочалі... А калі-та? Заўчора... ага, заўчора гаварылі ў целявізары, што замаразкі будуць.

На краі поля яна пайшла па шырокай — ад капалкі — градцы: хапала дзвюма рукамі бульбу. Дзяўчаты пачалі падсмейвацца, хіхікаць: «Адкуль гэту бабку прынесла?» Глядзелі ў неба, на зямлю — на варон: можа, яны?

— Што, модніцы, зубы сушыце? Зараз снег так адсушыць... Збірайце, грэйцеся! Ета вам не любоў круціць, сакатухі... на маёй лавачцы, па вечарах... — Мар'ечка смяецца.

— Во нават бабцы любоў наўме! — ускінула руку ў шарсцяной пальчатцы белабрысая высокая дзяўчына ў балоневай куртцы і сініх штанах-джынсах; засмяялася.

— А як жа? Я любіла, усё жыццё любіла і люблю, — зноў пачуў Ігарок і натапыраў вушы.

«Ха-ха-ха! Ха-ха-ха!» — панеслася над полем дзявочае сакатанне, заглушыла варонячае карканне. Ігарку стала крыўдна за бабулю, і ён шпульнуў у белабрысую сакатуху бульбінаю.

— Унукаў, бабка?.. — заходзілася ад смеху белабрысая, і ў яе дрыжаў на белай вязанай шапцы мяккі бубончык.

— Працу. Працу я любіла ўсё жыццё.

Ігарок недаверліва паглядзеў на бабулю: жартуе? Любіць жа можна толькі маму, тату, сястрычак, брацікаў, дзядулю...

А Мар'ечка, не разгінаючыся, хапала і хапала чырвонымі парэпанымі рукамі бульбу; накладала кошык укоптар і несла да машыны. Але высыпаць у кузаў не даставала і чакала, пакуль падбяжыць якая сакатуха і паможа ёй. Як згаварыўшыся, дзяўчаты болей не пацяшаліся з Мар'ечкі, і ёй стала сумна. Ігарок перастаў кідацца бульбаю ў дзяўчат, кідаў яе ў кошык.

Падалі з неба халодныя белыя крупкі, ударaліся ў балоневыя спіны дзяўчат, у зямлю, у бульбу, у маленькія парэпаныя чырвоныя рукі Мар'ечкі. Ігарок лавіў іх, катаў па далоні, браў на язык і ў вачах яго ззяла вялікае шчасце.

---

## ПАМЯЦЬ

*Бацьку свайму,*
*інваліду Айчыннай вайны,*
*прысвячаю*

Сярод цёмнай чэрвеньскай ночы, пад завывы навальнічнага ветру неспакойна стала ў адной з вясковых хат. Гаспадар, Пятровіч, адрываў галаву з заплюшчанымі вачыма ад падушкі, выкрыкваў жудасныя гукі і зноў падаў тварам ніц у падушку.

Яму, соннаму, мірсціўся бой: ляцяць вялізныя, як тарпеды, чорныя снарады і ўзрываюцца, ускідваючы ў неба шчыльныя кусты зямлі. Ён тыцкаецца галавою ў цёплы сіні ад смуроду пясок, аж задыхаецца, і ўсё роўна чуе гэта жудаснае выццё снарадаў... І раптам — нешта тупа і коратка стукае ў патыліцу; ён паварочваецца, каб глянуць, і бачыць чырвонае, як палотнішча сцяга, неба, чараду чорных груганоў і ярка-рудыя бярозы, выцягнутыя галінамі ўверх, — як выбухі.

Яго ідуць забіраць санітары.

«Што з табою, Ягор?» Ён здзіўлена лыпае гарачымі вачыма: «Няўжо незразумела?.. Я паранены...» — чуе, як бяруць яго пад рукі. «Што з табою?.. Прачніся ты!..»

Пятровіч прахопліваецца: у спальні чырванаваты

паўзмрок ад настольнай лямпы, каля ложка стаіць жонка, Таццяна, і тармосіць яго за плячо.

— А?! — вырвалася ў Пятровіча. — Задрамаў во...

— Ты ад етага кіна хутка саўсім звар'яцееш! Лупішся галавою аб падушку... у печ во бузануўся, ажно задрыжэла.

— Сталінград я прысніў, матка. Як секанула асколкам мяне. Учора сёмую серыю з «Вялікай Айчыннай» паказвалі, пра Сталінградскую бітву. Вось я... успомніў, — адчытваўся перад жонкаю Пятровіч, вінавата гледзячы ёй у вочы разгубленым позіркам: яго думкі ўсё яшчэ чапляліся за сон, непакоіла іх хваляванне, што ішло ад сэрца і разлівалася дрыготкаю па ўсім целе. Ён ужо ведаў, што яго турбуе, толькі, спрасоння, не мог сцяміць, для чаго яму гэта трэба.

— У цябе ета штоноч, як пачалі паказваць тое вялікае кіно. Стогнеш...

— Памяць мая, матка, і ўначы не спіць і не будзе спаць, пакуль жыць буду. Во не адчэпіцца ніяк сон! Стаіць у вачах карціна: неба чырвонае-чырвонае, груганы — як галавешкі, і абкураныя бярозы. А зямля — сіняя. Гэта — вайна... Стой-ка, матка! — Пятровіч сасхочыў з ложка, падыбаў, босы, у споднім, у веранду. Мудрагеліста выштукаваныя — квадрацікамі і трохкутнічкамі — вокны ўпускалі знадворку матава-шэрае святло далёкай зары і мігатлівых зорак. Ён пстрыкнуў выключальнікам, намацаўшы яго адразу каля вушака дзвярэй.

У верандзе стаяў самаробны шырокі стол — з расківанымі газетамі, белай і забруджанай паперай, двума паўлітровымі слоікамі, у адным з якіх чарнелася ніжэй палавіны вада, з другога тырчалі шчотачкамі ўверх рознай даўжыні пэндзлі.

Пятровіч выцяг прыскрынак і ўзяў з яго карабок фламасцераў. Тут жа пад рукою апынуўся аркуш чыстай паперы. Праз хвіліну-другую на ім можна было адрозніць чырвоны, чорны, руды і сіні колеры.

— Зноў... — На высокім парозе, з якога трэба саступаць у веранду, стаяла Таццяна і ківала галавою з накінутай на яе хусткаю. — І ноччу няма табе спакою. Папалю калі-небудзь етае твае прыладдзе. Завешаў усю хату мазнёй сваёй. — Яе вочы, лагодныя, пацягнутыя саплівасцю, міжволі слізганулі па сценах, з якіх — у рамках, а то проста наклееныя — папура глядзелі

карціны. — Хоць бы што людскае, а то ўсё нейкае страхоцце. Адна калі, дык ажно злякнуся... — Таццяна сцепанула плячыма.

— Гэта — вайна, матка... І во, бачыш! — Ён тыцнуў пальцам у аркуш паперы перад сабою. — Новы эскіз накідаў... што прысніў. Хачу, матка, пакінуць на ім сваю памяць, ваенную... яна патрэбна народу. А!.. — выдыхнуў. — Што ты разумееш, баба?

— Вярзеш ты нешта! Маіць, яшчэ не прачнуўся? Навошта табе вайна етая? Цяпер мірна во, дык і малюй мір, як людзі.

— Мір, матка, намалююць нашы дзеці і ўнукі, а мне трэба вайну. Я памру і маю вайну ніхто не намалюе... Ідзі, матка, спаць, ідзі! Не перашкаджай творчаму працэсу!.. — Пятровіч знарок гаварыў незразумелымі жонцы словамі — ведаў: гэта яе бянтэжыць.

— Во, маіць, распагодзіцца на змену квадры, — Таццяна, прыгінаючыся, выцікоўвала на небе месяц. Ён, белы, круглы, стаяў нерухома як мёртвы. — Абрыд ужо еты дождж.

«Нарэшце-такі!..» — падумаў Пятровіч, рады, што цяпер жонка пойдзе спаць, а ён стрэне дзень на адзіноце, з пэндзлем у руцэ. Зняў з цвіка фуфайку, ахінуў азяблыя плечы.

Першы ружаваты праменьчык, адарваўшыся ад яшчэ слабога сонца, што краем выткнулася ў веранду, мякка паслаўся на паперу. Пятровіч усміхнуўся: вочы, дасюль затоена-напружаныя, паяснелі ад чыстага і тонкага, як ільдзінка, бляску.

Каля печы затупала-запоркалася Таццяна; ляскаў посуд, бразгала дужка вядра і шкрэбала па яго дне конаўка, потым звонка лілася вада. Востра і смачна запахла паленым. На шыбінках — Пятровіч падняў галаву — іскрыліся бэзавыя кроплі. Прутка, не варушачыся, стаяў у празрыста-сіняватым марыве высокі ядраны бульбоўнік з завялымі счарнелымі кветкамі.

Ён зноў схіліўся над сталом.

— Ягор, ідзі снедаць! — пачуў ён быццам зводдалі голас жонкі. — Ды хутчэй, а то бульба астыне! Вечна халодную ясі, што не пракаўтнуць.

— Паспею, — сказаў Пятровіч, аднак на гэты раз чакаць сябе не прымусіў — прыйшоў на кухню. Моўчкі і засяроджана адмываў з пальцаў фарбу, спаласкваў твар халоднай вадою, якую браў прыгаршчамі з-пад

умывальніка, упіраючы ў далоні клапан-вісюльку.

— Во, як з богам парадзілася, што пагода будзе, — сказала Тацяна, вымаючы з печы невялікую патэльню, на якой рудымі пухлымі астраўкамі ляжалі тры аладкі. — Бачыш, сонца...

— Я яго раней, чымся ты, матка, убачыў, — усміхнуўся ў ваду Пятровіч, ды Тацяна ўлавіла падколку.

— Было і табе не сядзець у верандзе, а спаць, як усе людзі! — не залюбіла.

— Я не маю права спаць, «як усе людзі», — зноў, як і ўночы, незразумела адказаў Пятровіч. — Тое, што я прасплю, ведай, за мяне ні цар, ні твой бог не зробяць. Толькі я!

Тацяна адразу змяніла гаворку:

— Трэба канюшыну тую на сядзібе скасіць, а то ўжо што дроцце стала. Во снедай ды ідзі.

— А я, матка, хацеў бы карціну сваю дакончыць. Бо ў магілу несці сваю памяць... толку мала.

— Цэла яна будзе, карціна твая! Нікуды не ўцячэ ад цябе — разныўся, гаротнік! Цьфу-цьфу!.. — Тацяна апякла аб патэльню палец. — Во з-за цябе зазявалася!

— Ну до, до! Пайду, толькі не зачынай буркатню.

Паснедаўшы, Пятровіч надзеў на галаву саламяны, з парудзелым знутры скураным абадком капялюш і выйшаў на двор. Зажмурыўся ад сонца, што выглянула ў пралысіну між прадаўгаватых сівых воблакаў, — каля рота і вачэй твар дробна пераплёўся маршчынамі, і стала відаць, што скура на ім пажылога чалавека, якім Пятровіч ніяк не здаваўся за сталом у верандзе. Ён выцяг з паддашка пуні касільна, да якога прышчэмліваўся банькаю мыс касы — сіняватай, з іржава-чырвонымі плямамі: нядаўна касіў у Букоце, што за Сажом, выдзеленую калгасам паласу дробнага сена. Пупок быў засnаваны шэрай запыленай павуцінаю — як бруднаю марляю.

Праверыў вялікім пальцам джала касы: клёп адчуваўся і быў відаць — роўная тонкая сцежачка. «Тыя пару сотак зрэжу», — падумаў, згадваючы, куды паклаў асялок. Адшукаў у кладоўцы, уторкнутым за рэйку, да якой былі прыбіты негабляваным бокам шалёвіны.

— Ну я пайшоў! — крыкнуў з сянец жонцы, і яна пачула праз дзверы, нешта сказала, ды ён не разабраў.

Вуліца блішчала лужынамі — белымі на чорнай мокрай зямлі, што едка пахла бензінам, гумаю і прэ-

лай травою. Хаты — як у шчарбатым роце зубы — стаяць рэдка, былыя падворышчы бучна заглушыла лебяда з крамяным бледным лісцём: паўміралі старыя людзі. Во Аўтушыха нядаўна... Хату яшчэ, мусіць, не прадалі сыны?

Сядзібы надзялілі сёлета за ваколіцаю, дзе ў калгасе рос лубін, і Пятровічу трэба пхнуцца праз усю вёску. Яго пераняў насярэдзіне, каля свае хаты, Сцяпан Данілавіч, дырэктар школы, — год пяцьдзесят мужчына, са светлымі, мяккімі валасамі, скрозь якія свіцілася на цемі бліскучая ружаватая скура.

— Здароў, Пятровіч! — павітаўся ён зводдалі, а потым, падышоўшы, паціснуў руку. — Касіць сабраўся?

— Ды во трэба збіць канюшыну на сядзібе. Можа, пагода пастаіць.

— Не кажы ты! У мяне няма яшчэ ні сяніны ў пуні, — паклапаціў. — Ты ж прывёз з Букоты пудоў семдзесят?

— Ай! — махнуў рукою Пятровіч. — Як яно, гэтае сянцо, ужо мне дасталося... з нервамі. Дзякуй Івану Кузьмічу — памог.

— Да яго дабраўся?

— А што дзіўнага, мне ж павінны выдзяляць сенакос.

— Пра вас, інвалідаў, дзяржава клапоціцца! — сказаў Сцяпан Данілавіч і тут жа нечакана пацікавіўся: — Як здароўе цяпер?

— Якое ўжо здароўе, Данілавіч!.. Спіна ж у мяне... з левага боку ные, ад ранення, і ногі мярцвеюць. А што? — спытаў Пятровіч, думаючы: «Не так сабе спытаў пра здароўе».

— Можа б, згадзіўся на гэты год маляванне і чарчэнне ўзяць?

— А той, новы, з Віцебскага вучылішча?

— Ды збег ён! «Што мне, — кажа, — у глушы тут марынавацца!» І — заяву на стол.

— Мусіць, Данілавіч, я сваё ўжо аднастаўнічаў. Колькі тут засталося праліпець...

— А можа б, па-пенсіянерску гадзін якіх дванаццаць?

— Трэба падумаць, Данілавіч, трэба... Вочы ўжо не тыя, энтузіязм, як цяпер кажуць, не той. Толькі для сябе і мажу.

— Добра, Пятровіч, я перад жнівеньскай нарадаю да цябе загляну.

— Давай пагаворым... Будзе відаць тады, як ды што. — Пятровіч перакінуў касу з левага пляча на правае, больш вынослівае.

Канюшына, пасеяная на нізкім, ад выгану, канцы сядзібы была ў такіх жа кроплях, якія, успомніў, бачыў золакам на шыбінках веранды: ружова і ясна калола ў вочы. Цнатліва-чыстыя і яркія, бы вугалькі, пахістваліся ад ветру спелыя бухматыя галоўкі. Над імі млява бзыкалі — было відаць з краю — паласатыя чмялі, садзіліся і поўзалі, адтапырваючы сінія крыльцы. Паветра — як над полымем, дрыжыць, празрыста-зеленаватае.

Пятровіч наладзіў, навастрыў касу, зачаў з левага краю пакос. Канюшына блыталася і чаплялася за касу, калі Пятровіч замахваўся ёю, нязграбна падцягваючы левую нагу.

...Ён пачуў спачатку гуд машыны, а потым, абапёршыся на касу і павярнуўшы твар да выгану, убачыў жоўтую легкавушку і ззаду яе тонкі, блакітнаваты дымок; легкавушка зыбалася на рыцвінах, што пакінулі свойскія свінні, а найбольш — дзікі.

«Да мяне? Чыя ж гэта? Здаецца, старшынёва...»

Сапраўды пад'ехаў Філімончанка, старшыня. У чорным касцюме і чорным гольфе, што высока абцягваў тоўстую шыю і кранаўся маленькіх, як прыгладжаных да галавы, вушэй.

— Вітаю доблесных пенсіянераў! — Філімончанка хацеў аблакаціцца на верхнюю жэрдку агароджы, ды, глянуўшы на рукавы пінжака, адхіснуўся.

— Добры дзень! — Пятровіч, узяўшы ў руку касу, падышоў да яго.

— Сянцо, сянцо!.. — вострыя і зялёныя старшынёвы вочы, як пастаўленыя поперак кавалачкі шкла, спыніліся на Пятровічу.

— Трэба ж, — адказаў стрымана Пятровіч, гледзячы, куды ўткнуць мыс касы, каб яна стаяла, прыпятая да нагі.

— А я да цябе з просьбаю, Пятровіч... — густая зажуранасць лягла на твар Філімончанкі.

— Во! У самога старшыні да мяне просьба, — засмяяўся Пятровіч. — А я думаў, толькі ў мяне да яго можа быць.

— Мы ўсе ў гэтым свеце ўзаемазвязаны. Вось і просьба такая... лепш бы яе не было.

— Што там?..

Філімончанка пахітаў галавою, уздыхнуў:

— Вельмі добрага чалавека не стала... Шкада...

— Каго ж гэта?.. — Пятровіч пераступіў з нагі на нагу, і каса ўпала плазам у траву, блішчала там, сіняватая, аддраеная, як паска вады. Філімончанка глядзеў на яе, моршчыўся і задуменна працягваў, акурат і не чуў пытання Пятровіча.

— Трэба, Пятровіч, стужку жалобную напісаць... ад нашага калгаса. — Філімончанка з нізка апушчанай галавою схадзіў да «Жыгулёў», прынёс чорную стужку. — Вось... Прыгожа трэба напісаць. Дык як?

— Пра што размова! — узлаваўся Пятровіч. — Каго не стала?..

— Елавікоў памёр... — ціха сказаў Філімончанка.

— Іван Кузьміч?.. — Пятровіч адчуў, як па спіне папоўз холад і заварушылася на галаве скура. — Іван Кузьміч?..

— Учора... Днём.

— Дык як жа гэта? Нядаўна я быў у яго, размаўлялі... Не верыцца мне... — Вочы ў Пятровіча невыразна расплыліся, быццам усё, што з іх чыталася, правалілася на самае дно душы.

...Кабінет сакратара райкома партыі Елавікова быў на апошнім паверсе чатырохпавярховага будынка, і Пятровіч, падымаючыся па чыстых светлых прыступках, ужо каторы раз перабіраў у памяці тое, што скажа сакратару: «Пачну спакойна, хто я ды што... у чым справа... павінен... а Філімончанка сваё...» Але, як толькі машыністка з прыёмнай дазволіла яму без чаргі зайсці ў кабінет Елавікова, ён страціў вытрымку, памяркоўнасць і, павітаўшыся, з парога пачаў:

— Як гэта можна так! Мне Філімончанка абавязаны даваць сена, хаджу да яго, а ён адно і тое ж: «Я павінен... пры магчымасці, а не абязаны! Пакуль у мяне такой магчымасці няма. Будзе — дам сена». І так кожан год. Скажыце вот вы, Іван Кузьміч.

— Супакойцеся, супакойцеся, Ягор Пятровіч... — Елавікоў прыўзняўся з-за стала, паказаў рукою на крэсла побач. — Сядайце, калі ласка! Зараз разбярэмся...

Лагодны паўнаваты твар сакратара, яго мяккі позірк з-пад высока ўзнятых чорных броў, што выразна кантраставалі з сівымі, аж белымі, хвалістымі валасамі, супакоілі Пятровіча, і ён убачыў, што ў кабінеце шмат кветак — на падаконніку, на сценах, на стале — і яны ласкава адбіралі вочы, як бывала, фарбы, калі радаваўся эцюдам.

— Вось цяпер расказвайце, Ягор Пятровіч, пра жыццё-быццё.

Пятровіч, сказаўшы, што ўжо на пенсіі, паскардзіўся на старшыню, Філімончанку.

— Ёсць яшчэ бюракраты, фармалісты, — сказаў Елавікоў, цярпліва і засяроджана паслухаўшы Пятровіча. — І Філімончанка з тых... малады, не бачыў гора, ва ўсякім выпадку, такога, як наш узрост паспытаў, з кар'ерысцкімі замашкамі. Вось пад маркаю клопату аб калгасе і забывае на людзей... — Паўтарыў цвёрда: — На людзей... — Падняўся, падышоў да акна, пакратаў кончыкам пальца яркую, сабраную ў парасонікі кветку герані. — Ды абяцаю вам, Пятровіч, — сказаў, крута павярнуўшыся да Пятровіча, — што цяпер Філімончанка будзе ставіцца да вас чула. Абяцаю! Слова ветэрана даю.

Развітваючыся, Пятровіч удзячна глядзеў у вочы Елавікову і бачыў на бялках густую сетачку тонкіх чырвоных жылак.

...Філімончанка штурхнуў Пятровіча пад локаць.

— Дык бяры стужку — задумаўся... Шкада, канечне, чалавека. Ён пра людзей добра думаў. А добрыя людзі заўсёды нервовыя.

— Ад чаго ён памёр, Іван Кузьміч?

— Інфаркт. Проста ў прэзідыуме сходу...

— Ну трэба ж! Ды так адразу...

— Што зробіш. Сардэчна-сасудзістыя — хвароба веку.

«А вы, такія валакітчыкі, чэрствыя душы — вірусы гэтай хваробы! — са злосцю падумаў Пятровіч пра Філімончанку. — І мяне прымусілі перціся са сваім клопатам да занятага чалавека. Я і пачаў ад самага парога, ды крыкам. А колькі такіх...» — Пятровіч узяў з белых рук Філімончанкі стужку, беражна скруціў яе ў рулончык.

— Да вечара справішся?

— Праз дзве гадзіны напішу.

— Дык мой шафёр тады падскочыць, гадзіны праз тры. — І пасігаў, гледзячы сабе пад ногі, да легкавушкі. Мокрая крамяная трава выпроствалася, і сляды тут жа губляліся.

«Хвароба веку... — прашаптаў Пятровіч, паднімаючы касу. — І я, стары дурань, паскакаў, як той козлік, да сакратара. Памагай мне! Цяпер во можа, і мая кропля віны ў ягонай смерці. Будзе думацца...» — Ён засунуў касу пад пакос і, задуменны, спакваля пацёгся дахаты.

Тацяна, згледзеўшы праз акно, завешанае цюлем, мужа, здзівілася і выбегла настрэч — на ганак.

— Ужо скасіў? А чаму такі размяклы?

— Елавікоў памёр, — сказаў Пятровіч і амаль не пачуў голасу: у роце было суха. — Вады мне падай. У сэрца коле...

— Вой, і праўду ты бледны нейкі!.. — Яна мітнулася ў сенцы і вынесла конаўку вады. — Ета той, што нам з сенам памог?

— Той самы. Во стужку на вянок буду пісаць... Старшыня прывёз.

— А-а, дык ета ён і пытаўся ў мяне, дзе ты. На машыне легкавой заязджаў. — Тацяна сашчапіла рукі.—Ён жа, Елавікоў, маіць, яшчэ не стары?

— Можа, маладзей за мяне гады якіх на тры.

— Жыць дый жыць яшчэ мог чалавек... — уздыхнула. — А што ў яго, маіць, еты... рак, раз не спаслі?

— Інфаркт. Ён шмат людзей забірае... кажуць, часцей — добрых.

Тацяна змоўкла, і Пятровіч, аддаўшы ёй пустую конаўку, пайшоў у хату. Павесіў на ласіны рог капялюш і саступіў у веранду. Паклаў на стол стужку. Схадзіў са слоікам па свежую ваду. Надавіў з цюбіка ў шклянку «Охры жоўтай», плюхнуў вады, разбаўтаў. Прыбіў цвічком канец стужкі да стала, нацягнуў яе і прыбіў яшчэ раз. Памачыў у шклянцы пэндзаль.

«І я... Навошта мне было з тым сенам да яго... за помаччу. І чалавека лішні раз растрывожыў».

Зазныбеў камар, сеў Пятровічу на шчаку і замёр, цямнеючы.

...Ён заканчваў пісаць апошнюю літару, калі ціха скрыпнулі дзверы і пачуўся за спінаю жончын шэпт:

— Я забыла... так перапужалася тваім выглядам, сказаць табе, што прыходзіла Барысіха і пытала, ці злепіш ты ёй новую печ.

— Няма ў мяне, матка, здароўя... на печы!

— Дык я ёй нічога і не памелася. Што я, без цябе...

— Правільна, за вочы не трэба дамаўляцца. — Пятровіч адсунуўся ад стала, каб зводдалі глянуць на напісанае, схіліў галаву, чытаючы па складах:

— Ад кал-гас-ні-каў кал-га-са...

— Роўненька, літарка да літаркі, — пахваліла Таццяна.

— Можна адразаць, — сказаў Пятровіч і ўзяў нажны. — Во яшчэ колькі лішняга! На два вянкі хапіла б.

Спачатку ў Таццяны заблішчалі вочы — у іх яна хавала смех, потым не вытрымала, засмяялася:

— Напішы сабе наперад стужку, а то памрэш — і не будзе каму.

Пятровіч быў задуменны і ўсё яшчэ неадрыўна глядзеў на стужку, па якой васкова жаўцелі вільготныя літары.

— Як гэта — «не будзе каму»?

— Ніхто ж не ўмее. Усе ж во цябе просяць... заўсёды.

— Я не перажываю. У мяне дзеці ёсць, роднага бацьку не пакрыўдзяць.

— І дзеці во, бачыш, забылі саўсім, — спахмурнела Таццяна. — Ні пісьма, нічога няма...

— У іх, маладых, матка, свае клопаты. Горад — гэта табе не наша Малінаўка. Трэба круціцца, як вавёрцы ў коле... — «Жаль Івана Кузьміча... Яшчэ на аднаго ветэрана менш стала. А хутка... Вось і не маладой. Трэба малявацы!» — Пятровіч скручваў у рулончык астатак стужкі. — А гэта, — кіўнуў на стол, — няхай паляжыць, засохне фарба. Як прыедзе старшынёў шафёр, дык ты аддасі яму, а я пайду дакашу. Там мала ўжо засталося. — Позірк у Пятровіча адлучаны, цьмяны, як бы звернуты ў душу. І ўсё на твары мёртвае: шэрая скура і на ёй — белыя шчацінкі, глыбокія маршчыны сталі ў сабе пакутлівы роздум.

— А здужаеш?

— Што мне прывыкаць... («Дарма я скардзіцца хадзіў. Цяпер во...») — Зняў з ласінага рога капялюш.

Ён вярнуўся ўжо з вуліцы.

— Матка, — сказаў, — у колькі гэта раніцай на Слаўгарад першы аўтобус?

Тацяна здзіўлена паглядзела на мужа.

— У восем... Ну еты ж, што школьнікаў забірае.

Пятровіч кіўнуў галавою, моўчкі прасунуўся міма жонкі — яна зачапілася вачыма за яго спіну, нейкую вострую і чуйную, і як бы падпіхнула ўперад.

На дварэ, каля пуні, было ціха, толькі з весніц, адчыненых на гарод, туга вырываўся сыры вецер і, натыкаючыся на шчыльную высокую браму, круціў па зямлі дробнае смецце.

Пятровіч спыніўся, адчуўшы, як закружылася галава...

Па небе густа плылі рваныя шматы хмар, і ў іх бяздумным руху было нешта рашучае і напорыстае, быццам шлях іхні ляжаў у самую вечнасць.

---

**З цыкла кароткіх апавяданняў**
***«Цёплы пух адуванчыкаў»***

*

## ЦЁПЛЫ ПУХ АДУВАНЧЫКАЎ

Пра тое, што нарадзіўся сын, Марозаў даведаецца пасля. А перш — быў сум, страшэнны сум, які абваліўся на яго з таго дня, калі адвёз цяжарную на дзевятым месяцы жонку да яе маці; нараджэнне дзіцяці чакаюць з трывогаю не толькі жанчыны.

Здаецца, рытм яго жыцця не парушыўся: уранні ішоў на працу, на завод, там брыгадзірскі клопат крышку паслабляў тугу; вяртаўся дамоў увечары стомлены, перакусваў; чытаў газеты — калі была табліца футбольнага розыгрышу, падоўгу аналізаваў яе, потым выразаў і лажыў сабе ў блакнот.

Тэлефона ў кватэры не было, і Марозаў хадзіў зва-

ніць жонцы на пошту; іншы раз званіў і бацькам у вёску — пытаўся, як здароўе, што новага... Вёска, дзе нарадзіўся і вырас, жыла ў яго душы ўжо далёкім, але яскравым, шчымліва радасным святлом.

Стаяў цёплы, вільготны май. Бела-ружовымі кандэлябрамі кветак абвешаліся каштаны; а лісце яблынь у садах схавала ад вока сівую калмаценькую завязь пладоў. Ужо вылупіліся шпачаняты і падавалі з цёмнай глухаты шпакоўняў кволыя патрабавальныя галасы.

Выхадныя — былі пакутаю. Куды пайсці, што рабіць, Марозаў не ведаў, сяброў такіх, каб цікава, культурна правесці час, не было; любая сустрэча заканчвалася чаркаю, пасля якой адзінота станавілася яшчэ больш невыноснаю.

І аднаго дня, у суботу, Марозаў надумаў пазагараць: балазе недалёка ад дома, па другі бок вуліцы, была пустка — роўная, чыстая; на ёй збіраліся пасадзіць парк, ужо ляжаў круглы, як шар, ружовы валун, на якім была высечана назва і дата заснавання парку.

Пустка была жоўтая ад цвету адуванчыкаў; там-сям ужо бялеліся целы тых, што прыйшлі загараць.

Марозаў разаслаў пакрывала на траве, раздзеўся і лёг; разгарнуў газету: нацыянальны алімпійскі камітэт СССР прыняў рашэнне не пасылаць савецкіх спартсменаў на Алімпіяду ў Лос-Анджэлес. «Якія ж яны амерыканскія заправілы, зламыснікі і пустыя галовы, калі нават на спорт пераносяць палітыку!» — Марозаў павярнуўся на спіну; глядзеў у неба — яно было высокае, чыстае і, трошкі затуманенае ружоваю імглістасцю, мяккае.

Пачуў шолах. Метраў за дзесяць — не бачыў, калі прыйшла, — стаяла жанчына, тварам да сонца, і чытала кнігу — вецер гартаў старонкі; чорны, як туш, купальнік кантраставаў з яе белым целам і чамусьці нагадаў Марозаву засвечаныя на фотаплёнцы мясціны. Думкі ад Алімпіяды зноў перанесліся да жонкі: «Як яна там? Буду ісці дамоў, пазваню...»

Можа, з паўгадзіны Марозаў ляжаў нерухома; калі заплюшчваў вочы, на жоўтым фоне скакаў зялёны сілуэт.

У нейкае імгненне яму здалося, што нехта дакрануўся да яго пяшчотнымі пальцамі і паказытаў. Ён прыпадняў галаву: нікога. Што за дзіва?

Зноў заплюшчыў вочы, і зноў нехта прабег па целе цёплымі пяшчотнымі пальчыкамі. У вачах (ад сонца) было мроіна, і трава здавалася выцвілаю, бледнаю, як старая, брудная папера. Жанчына трохі воддаль стаяла па-ранейшаму з кнігаю ў руках. Што за дзіўнае адчуванне — далікатныя, кволыя пальчыкі казычуць спіну, шыю, рукі?.. Вочы асвоіліся, і трава зноў стала зялёнаю. І нечакана — Марозаў убачыў у тым баку, куды ляжаў галавою, дзядзьку — ён... касіў. Скінуў з сябе кашулю, быў у майцы, спорна махаў касою — над зямлёй слаўся, плыў пух адуванчыкаў...

Пушынкі краналіся цела і казыталі, і нейкае наіўнае замілаванне найшло на Марозава; ён лавіў іх рукою, здзімаў з далоні, пускаў далей па ветры. Нешта роднае, цёплае адгукнулася ў яго душы, расчуліла...

Дзядзька, мусіць, быў вясковы: худы, жылісты, шыя і рукі да локцяў загарэлыя, аж чорныя, як смаляны корч. Як ён апынуўся, гэты дзядзька, тут? Можа, прыехаў да сына ці дачкі і косіць трусам ці нутрыям траву? А можа, увогуле з бліжэйшае, прыгараднае вёскі. Дачуўся, што тут можна ўкасіць, і прыйшоў. Вунь, здаецца, ці не мяшок, бы камень, бялеецца з травы... Ці, можа, гэта кашуля?

Ядрана, сінявата бліскала каса, і над зямлёю ляцелі і ляцелі белыя пушынкі-парашуцікі... Ціхенька стукаліся ў газету, акурат крапаў лёгенькі, дробны дождж. Не халодны, а мяккі, цёплы дождж. Марозаў светлымі вачыма глядзеў на дзядзьку з касою, на жанчыну ў чорным купальніку, на зялёную сонечную пустку ў жоўтым цвеце адуванчыкаў...

Адуванчыкі — прыгледзеўся: яны былі блізка, каля самых вачэй — раслі як бы ў тры ярусы: ніжні — жоўтыя мяккія талерачкі кветак, сярэдні — хваліста выразаныя прадаўгаватыя лісты і самы верхні — круглыя празрыстыя галоўкі пуху на лілова-белых таўставатых чаранках; гэты пух, здрыгануты касою, разлятаўся, і вецер нёс яго ўдалячынь — цёплы, светлы, паветрана-лёгкі. І такою ж лёгкаю светласцю напаўнялася ў Марозава душа, і ён адчуў раптам сябе самым шчаслівым чалавекам на свеце: «Дзякуй табе, дзядзька, і табе, цёплы пух адуванчыкаў!..»

З нейкім прыцятым хваляваннем, радаснай стрыманасцю ішоў ён на пошту і думаў, як перажыць яму тое імгненне, калі пачуе (скажа цешча), што жонка

нарадзіла сына. Не сумняваўся: першы ў яго будзе сын. З сынам ён будзе хадзіць на рыбу, на футбол... Сын будзе гуляць з гаечкамі і болцікамі — прывучацца да тэхнікі змалку. Інакш Марозаў не ўяўляў, як не мог ужо ўявіць сённяшні дзень без наіўнага, можа, дзіцячага адкрыцця, што пух адуванчыкаў — цёплы.

## РЭНЬКА

Баяўся аднаго: каб не думалася, што я зрабіў гэта па нейкім меркантыльным разліку.

Яе маці жыве ў адным завулку з маёй цешчаю; завулак неглыбокі, метраў на сто, але даволі прасторны, хоць і абціскаюць яго з бакоў шчытныя зараснікі сліў і вішань. Яна, маці, запала ў памяць і вока з часу майго вяселля — тым, што сказала, быццам я, з барадою, падобны на маладога М. (вядомага на ўвесь свет філосафа). І хаця я свайго падабенства з М. не знаходзіў, чуць такое ад чужога і шчырага (не толькі ад хмелю) чалавека было прыемна. Што зробіш — у кожнага такі грэх: свядома ці падсвядома лічыць сябе за вялікага.

Дык вось, у гэтае жанчыны ёсць дачка, Рэнька, пра якую, яшчэ не бачачы, многа чуў, і пра яе мужа таксама — аднаго дня, калі я гасцяваў у цешчы, Рэньчына маці прынесла кітайскі ліхтарык, каб я наладзіў яго; ліхтарык быў спраўны, проста «селі» батарэйкі, і тады я падумаў, што жанчына, мабыць, захацела са мною пагаварыць і знайшла прычыну сустрэцца. І ўся яе гаворка звялася да зяця — не магла нахваліцца і сто разоў паўтарыла, што ён «бальшэй майсцер» і, калі б прыехаў, «пачыніў бы хванарык адным пальцам».

Не трэба назолаю лезці ні ў беды, ні ў шчасце людзей, бо і тое і другое адноснае і ў кожным выпадку «избирательное» — заканамернасці не выведзеш. Скептыцызм — не такая ўжо кепская якасць, але я асабіста свята веру ў дабрату і ва ўсё астатняе, што ў чалавеку ёсць харошае. А ёсць у ім шмат чаго, неймаверна болей, чымся мы можам меркаваць па сабе.

Не лез я з роспытамі і тады, калі жонка, ярая працаўніца гасцей, надзіва мне, якое, можа, калі-небудзь праясніцца, дамаглася, каб Рэнька, едучы з дзецьмі

да маці, перш пабыла ў нас. Жонка сустрэла яе на вакзале і на таксі прывезла на кватэру.

У Рэнькі было трое дзяцей — ужо вялікі (першакласнік) сын і двойня — паўтарагадовыя хлопчык і дзяўчынка.

Я адчыніў дзверы і, павітаўшыся, узяў у Рэнькі з рук дзіця — лёгенькае, як трэсачка; тварык быў бледны, нейкі ацесліва-мучны, а вочкі, замглёныя блакітнаватасцю, слязіліся — мабыць, з марозу.

Чалавек усё жыццё здзіўляецца; Рэнька здзівіла мяне тым, што не была, як чакалася, флегматычна-зажураная; рэзвая, шустрая і — як у нашай вёсцы кажуць — у целе, даволі тугая і ружовая з твару, яснавокая, яна прынесла з сабой жыццярадасны дух. І так непасрэдны ў адносінах з людзьмі любой пасады і рангу, я разумеў, што з Рэнькаю трэба паводзіць сябе як прасцей, па-свойску, і ў мяне гэта без натугі атрымлівалася.

Рэнька — удава: яе муж, украінец, казалі, нібыта зусім не піў, страшэнна кахаў жонку, паўгода назад загінуў — ехаў на матацыкле па малако (тым болей трагічна) і ўкляпаўся ў прыдарожную сасну. Людзі з яго работы, з «Сельгастэхнікі», сабралі «складчыну» і купілі Рэньцы туфлі; не забываюць...

Жонка таксама ператрэсла залежы адзення — калготкі, штонікі, кофтачкі, — з якога вырасла наша дачка, і аддала Рэньцы; а таксама — новы, няношаны світарок. Мне чамусьці было сорамна за гэты сціплы падарунак; мяне пастаянна точыць-муштруе думка, што я, хоць і не такі ўжо багатыр, жыву лепш, дастатней, чымся нехта, а такога не павінна быць: у свеце яшчэ галадае шмат людзей — паказвалі па тэлебачанні сальвадорскіх дзяцей-дыстрофікаў — напраўду, скура ды косці. Проста цяжка, жудасна, немагчыма ўявіць сабе маці, у якой дзеці просяць есці, а яна не мае што ім даць.

Калі я не паміраю з голаду сам, я гатовы дзяліцца апошнім — і гэта ў чалавеку звычайная якасць, — але я, мусіць, буду жорсткім эгаістам, калі мая дачка будзе хáваць сасмяглым ротам, — я тады не змагу думаць пра іншых, свет у мяне звузіцца ў кропку — да галоднае дачкі. Няўжо звузіцца?

Я ніколі не закалыхваю сябе думаннем, што не раб-

лю нікому зла, дык і добры. Лухта! Добрым можна быць адно робячы добрае людзям.

Рэнька за бяседаю, акропленаю сухім віном, расказала жонцы, што да яе набіваецца ў жаніхі, «у чоловікы», халасты хлопец: прыносіць кветкі, гуляе з дзецьмі — старэйшы разумее, а маленькія паказваюць пальчыкам: «па-па». Хоць плач. «Шчо він знайшыў у мінэ?..» — Рэнька гаварыла на ўкраінскі манер.

Жанчыны рэдка бываюць сціплыя, калі ацэньваюць сябе. Рэнька, даруй за мужчынскую адкрытасць: ты глянь на сваю нагу, сакатуха; стань перад люстрам — мабыць, заваленая клопатамі, ты пахавала ўжо сябе як жанчыну. А ты ж дыхаеш жаноцкасцю як тыя кветкі, што прыносіць табе жаніх, водарам. Нягледзячы ні на што.

Рэнька спавядалася, а старэйшы хлопчык, Багданка, раўніва, з глухою зацятасцю сачыў за ёю. Пра што ў гэты момант думалася яго дзіцячай і ўжо такой дарослай галаве? Маленькія, «маковы зернынкі», глядзелі няцямліва, з нейкаю ціхаю, недзіцячаю сур'ёзнасцю.

Дзеці, дзіты...

Я ведаў, што так і будзе: мы з жонкаю насілу ўгаварылі Рэньку ўзяць ад мяне сто рублёў, і то яна паставіла ўмову: як разбагацее — абавязкова верне.

Баяўся аднаго: каб не думалася, што зрабіў гэта па нейкім меркантыльным разліку.

## ГРОНКА РАБІНЫ

Не ведаю, адкуль у маіх землякоў гэта традыцыя ахайнасці і чысціні, але ў нашай вёсцы кожны двор мае сваю лазню. У вайну Малінаўка гарэла два разы: як немцы наступалі і як адступалі (апошні раз агонь яе вынішчыў датла). Будавалі людзі хаты, будавалі і лазні. Можа, дзве-тры гаротныя ўдавы, што мелі па плойме дзяцей, не змаглі тады зразу ўзбіцца на лазню — дык яны не маюць іх і да цяперашняй пары.

Мы жылі перш у дзеда — у бацькі майго бацькі. А як пабудавалі сваю хату (я ўжо скончыў школу), стала тут жа пытанне і аб лазні.

Была зіма. Снежная. Таўстыя шапкі-каўпакі ляжалі на слупах, абернутых на частаколлі старых, непатрэбных гарлачах, на шпакоўнях і на ўсім тым, з чаго не мог ссыпацца снег.

Мы з бацькам пайшлі валіць лес на лазню. Я нёс тапор, ён — пілу. Свяціла сонца, ужо каторы дзень, і снег хрумсцеў пад нагамі, крышыўся, і сляды былі блакітныя, як падсіненае шкло.

Мы ішлі ў Дачу — так самі назвалі клін густога спелага сасновага лесу, дзе заўсягды нарыхтоўвалі дровы — як і помню: з году ў год.

Светлымі застылымі фантанчыкамі стаялі між меднаствольных сосен бярозкі. Пры зямлі аплылі снегам, як парафінам усё роўна, маленькія елачкі, кусты лазняку і крушыны. Летам у Дачы шмат багуну, але цяпер яго не відаць з-пад снегу. Ледзь прыметныя пагорачкі лаўжоў.

Мы ламалі сваімі крокамі цнатлівую, белую цішыню.

— Глядзі, — бацька спыніўся: рабіна ў шчодрай бязвольнасці звесіла свае галіны з ярка-пунсовымі гронкамі ягад. Твар у бацькі худы, смуглы, і мне здаецца, што на ім адбіваецца святло ад ягад рабіны. Над кожнаю гронкаю вісела стрэшка — празрыстая ледзяная скарынка: падтаў снег. Цікава: ягады напэўна ж халодныя, а снег растаў, як ад жару.

— Давай пакаштуем, — сказаў бацька. — Мёрзлая рабіна вельмі смачная... — Ён падступіўся да рабіны, крануўся пальцамі гронкі — і галіна зазвінела: звінелі, крышачыся, ледзяныя стрэшкі над ягадамі, падалі на снег і блішчалі там, як кавалачкі слюды. Бацька адарваў тры ягадзіны, буйныя, яркія, з рудымі хвосцікамі; укінуў адну ў рот, астатнія аддаў мне. Я пакачаў іх на далоні, быццам гэта былі не мёрзлыя, цвёрдыя ягады, а гарачыя вугольчыкі. Вялікая сіла — унушэнне: мне і праўда здавалася, што ягадзіны пякуць далонь; яны качаліся па далоні, як шарыкі, стукаліся і разбягаліся...

Бацька стаяў і пасміхаўся з мае забавы. Недзе паблізку ф'юкаў снягір — вялікі аматар зімовых ягад.

— Тата, а чаму ягады рабіны цёплыя?

— Выдумаў...

— Ну як жа! Бачыш, снег над імі растае, — ска-

заў я і гэтым нечакана паставіў бацьку ў тупік, хоць ён, настаўнік фізікі, шмат чаго ведае.

— Колер чырвоны, разумееш... — сказаў пасля паўзы бацька павольна — гэтым часам прыкурваў папяросу. — Ён дае цяпло... бярэ ў сонца і аддае. Снег, натуральна, растае... І застаецца толькі празрыстая ледзяная скарыначка...

— І яна растане?

— Канечне, растане, бо халодная і яна. Сплыве вадою на ягады... і на зямлю.

Ягады і праўда былі чыстыя, пяшчотна рдзела, аж блішчала, скурка; я доўга з нейкаю глухою ўтрапёнасцю глядзеў на іх, і ці то ад задумення, ці ад фантазіі, што абудзілася бацькавымі словамі, ягады ў маіх вачах пачалі расплывацца... во яны ўжо выраслі да памераў далоні, а потым, бы магутныя крылы, шырока раздаліся ў бакі — і снег увесь вакол убачыўся мне чырвоным і цёплым.

— Ну што, пайшлі далей? — сказаў бацька, здаецца, у яго ўжо дагарэла папяроса.

## НА МІНСКІМ МОРЫ

Учацвярых, сям'ёю, яны выехалі за горад, на прыроду — на Мінскае мора. Дзень, на жаль, быў хмуры. Шэрая (светлая адно там, дзе стаяла сонца) каламуць плыла па небе, а ў душы людзей, якіх сабралася сюды не адна сотня, заплывала засмучанасць.

Мора было густое, цёмнае, і толькі параходы на ім рэзалі вочы асляпляльнаю, чыстаю, бы снег, белізною, акурат толькі на іх свяціла сонца. Цвілі сады, і квецень іх была такой жа першароднай белізны.

Дзьмуў, браўся парывамі вецер, сыпаў у твар пяском. Берагі былі пустыя, калі не лічыць рыбакоў, якія зацята махалі вудзільнамі, стоячы босымі ў вадзе.

Шатуневіч разам з сумкаю нёс у руках складзенае бамбукавае вудзільна; хацеў зразу павярнуць да мора, але жонка не згадзілася:

— Лепей вунь туды, у саснячок, там цішней... — Яна клапацілася пра дзяцей — сына і дачку.

У саснячку, дзе была зелянейшаю трава, яны атабарыліся. Разаслалі на зямлі байкавую коўдру, наверх — ватны дзіцячы сеннічок. Жонка дастала з сумкі бутэльку вінаградна-яблычнага соку і дала дзецям; стала растрыбушваць залаціста-падрумяненую ў гастраномаўскім грыль-апараце курыцу. Дала сыну мяккае, пяшчотнае крыльца, якое ён любіў таму, што «ў ім многа костачак».

Шатуневіч схадзіў з бляшанкаю, якую прадбачліва падняў на дарозе, у нізовінку і накапаў пад трухлявымі лаўжамі чарвякоў. Сын ужо чакаў яго, нецярплівасцю гарэлі яго цёмныя, бы вішні, вочы.

Пайшлі туды, дзе было сама больш рыбакоў, хаця гэта і не рыбацкі прынцып: сапраўдны рыбак заўсягды шукае зацішак, адзіноту; але, мабыць, тут у іншых месцах рыба не клюе, падумаў Шатуневіч, апынуўшыся на Мінскім моры ўпершыню.

Бераг быў пакаты, жвірысты; каля яго плавала апельсінава-жоўтая пена, напаўзала на пясок, а наступная хваля забірала яе з сабою назад у ваду.

Сярод рыбакоў было шмат падлеткаў; яны няўмела ўвіхаліся з вудзільнамі, чаплялі адзін аднаго кручкамі; лішне падавалі галасы. Шатуневіч ледзь уціснуўся між імі.

Можна было падумаць, што ён чараўнік ці накапаў нейкіх адмысловых чарвякоў — не паспяваў закідваць вудачку, як у яго клявала: выцягваў то акунька, то ёршыка. З двух бакоў на яго здзіўлена, а то і з зайздрасцю касіліся суседзі: во, апошні прыйшоў і ўсю рыбу перацягае. У рыбнай лоўлі Шатуневіч не быў навічок: вырас на рэчцы — і гэтым усё сказана.

Ён хацеў адысці далей, каб не цвяліць рыбакоў, як пачуў жаночы голас. Каля самага берага стаяла жанчына; яна трымала за руку маленькую дзяўчынку з шырокай драпінаю на носе і гаварыла да шчуплага, зусім худога хлапчука, які аніяк не мог закінуць вудачку: вецер дзьмуў з мора і адносіў лёгкі, з пёрка, паплавок за спіну. Шатуневіч як павярнуўся, так і застыў: уразіла жанчына. Яна была маладая, гадоў на трыццаць, з чыстым круглявым тварам, у меру паўнаватымі вуснамі; цёмная караткаватая спадніца адцяняла белізну яе зграбных, моцных у лытках ног.

— Далей! Далей кідай... — раіла жанчына хлапчуку. Нарэшце той закінуў вудачку, але паплавок шлёпнуў-

ся на ваду каля саменькага берага. — Рыбак з цябе!.. — засмяялася лагодна жанчына. У яе былі дзіўна белыя роўныя зубы, і толькі адна шчарбінка ў верхнім радзе (на месцы вочнага зуба) псавала іх.

Шатуневіч убачыў, што лёска ў хлапчука кароткая і на вузлах. «Ведама, з маці прыйшоў, — падумаў ён, і тут жа закалола ў мазгі думка: — А дзе бацька? На рыбу звычайна ходзяць з бацькам. Няўжо няма? Але тады наўрад і жанчына пайшла б з дваіма дзецьмі...»

Шатуневіч глянуў на сваю вудачку: на вудзільна быў наматаны вялікі запасны канец лёскі. Ён падышоў да хлапчука.

— Дай-ка, — узяў у яго з рук вудачку. Адшчыкнуў зубамі канец сваёй лёскі і надвязаў хлапчукову. Жанчына прысела, выціраючы тварык дачцэ, і Шатуневіч міжволі ўбачыў яе круглыя белыя, прыгожыя калені. А тады не пасаромеўся зазірнуць зблізку і ў твар. О, шчасце! У жанчыны на белай скуры каля носа былі рассыпаны рэдзенькія пяшчотныя вяснушкі, якія так падабаюцца яму заўсёды ў жанчынах і незразумела, глыбока хвалююць. Жанчына адкрыта, з удзячнасцю глядзела на яго і міла жмурыла левае вока, мабыць, каб схаваць лёгенькую чырвань на шчоках, што выступіла той жа міг, калі ён задужа смела затрымаў позірк на яе каленях.

— Цяпер кідай, — сказаў ён хлапчуку. Той махнуў вудзільнам. — О, гэта голас!..

Вочы ў хлапчука ззялі бязмежным шчасцем, ён нахіліўся ўперад, як не кранаўся носам паплаўка. Жанчына адышла з дзяўчынкаю далей — на траву, і Шатуневіч паспеў убачыць яе са спіны: белыя валасы, перавязаныя ружоваю стужачкаю каля патыліцы, даставалі да спадніцы і закрывалі тонкі стан.

«Адкуль гэты цуд, гэта сонца жаночай дасканаласці? Каму яно свеціць?» — Такія жанчыны Шатуневічу прыходзілі толькі ў снах; ён ужо не лавіў рыбу, аддаў вудачку сыну, і той з прастадушнаю дзіцячаю важнасцю трымаў яе ў руках.

Хлапчуку не шанцавала — рыба ў яго не клявала. Шатуневіч зняў са свайго кручка акунька і працягнуў яму.

— Занясі сястрычцы — няхай пагуляе.

Хлапчук спрытна, як кот, выхапіў у Шатуневіча рыбку.

— Мамачка!.. — І, кінуўшы на ваду вудачку, пабег да маці. Там яны ўсе трое ўсміхаліся. Шатуневіч пачуў: «Лаві, лаві, Косцік, а то прыйдзе бацька...» — Канец фразы адарваў вецер і панёс лугам.

«Значыць, бацька ёсць!..»

Цяпер Шатуневіч з нецярплівасцю чакаў, калі прыйдзе той шчасліўчык, якому дзень і ноч свеціць «сонца жаночай дасканаласці». Лавіў рыбу ён, бадай, несвядома, у нейкім раўніва-неадчэпным чадзе раздражнення.

Здалося: яму кальнулі шылам пад рэбры — за спіною, у тым месцы, дзе стаяла жанчына, загаварыў мужчына. Баяўся агледзецца, слухаў, лавіў вушамі хрыплаваты, бы прастуджаны, нейкі сутаргава-перацяты мужчынскі голас.

Хлапчук нарэшце спаймаў рыбку.

— Тата! Мамачка! Рыбка!..

Падышлі жанчына з дзяўчынкаю на руках і мужчына... Не, не мужчына, а хлапчук, падобны на мужчыну: невысокі, касцісты, з загарэлым, цёмным тварам, з сіняком пад вокам; русыя сухія, як усё роўна запыленыя валасы свіцяцца на макаўцы, тырчаць каля вушэй. На атрэпаныя ўнізе штаніны наліп мокры пясок. Мужчына ўзяў у хлапчука вудачку, махнуў ёю, і Шатуневіч убачыў, што рука ў таго спісана татуіроўкаю аж да самага локця.

І жаль, і грэблівасць, і гнеў, і абурэнне — усё разам абрынулася на Шатуневіча, сціснула яму скроні, як абручом.

Ён баяўся глянуць на жанчыну, бо думаў з тупою эгаістычнаю саманадзейнасцю, што ёй будзе сорамна перад ім.

— Тата, клюе!.. — штурхаў яго пад локаць сын.

## ЦЕРАЗ ДАРОГУ

Я ехаў з вакзала і вёз з сабою цяжкую сумку; выйшаўшы з аўтобуса, нёс яе напераменку — то ў правай, то ў левай руцэ. Ногі коўзаліся ў брудным, раскуламешаным снезе. Вільготна адсвечвалі тралейбусы, і тонкаю залацістаю павучынаю віселі над імі правады. Вя-

чэрняе паветра ад ліхтароў і падсветкі аснежанай зямлі было масляна-жаўтлявае, цьмянае, як у курнай лазні.

Дарогу, якую мне пераходзіць, «вартуюць» нямштатныя аўтаінспектары з чырвонымі павязкамі на рукавах, а зводдалі за імі наглядае міліцыянер у чорным да пят кажуху і са стракатаю палачкаю ў правай руцэ. Пешаходы смірна чакаюць, калі загарыцца ў святлафоры зялёнае вока; я звяртаю ўвагу — на праезнай палавіне ў жоўтай кашы згорнутага снегу стаіць маленькая, худая дзяўчына на мыліцах — у вязанай шапцы, балоневай куртачцы і джынсах, калышыны якіх мёртва апушчаны; на правай мыліцы вісіць торбачка. Мусіць, ведаючы, што не паспее перайсці дарогу за мінуту, пакуль гарыць зялёнае святло, саступіла з тратуара як мага далей...

Пыхнула аранжавае, затым — зялёнае вока, ад ядранасці якога вакол святлафора німбам заззяла паветра. Я чамусьці не рвануўся, як зазвычай рабіў, уперад, застаўся на месцы — не зводзіў вачэй з дзяўчыны на мыліцах. Яна рухава затузалася ўсім целам, нязграбна выцягваючы са снегу і заносячы ў бакі мёртвыя ногі — спачатку надзіва хутка. Але рухавасці ёй хапіла метры на два. Я памалу ішоў следам і бачыў, як слабела дзяўчына.

Людзі, заклапочаныя, сур'ёзныя, абганялі яе; на сярэдзіне дарогі стыкнуліся два знаёмыя, і той, што быў адзін, павярнуў назад — за тым, што нёс на руках ружовашчокую дзяўчынку, — мабыць, захацелі пагаварыць...

Торбачка тым часам матлялася, стукала (нешта ў ёй ляжала) то па мыліцы, то па мёртвай назе. Было відаць, што дзяўчына не адолее разам з усімі, як на бяду, шырокую тут, дарогу. Машыны ўжо заскрыгаталі рычагамі — і нейкая невядомая сіла пачала адхіляць мяне да іх, да машын, акурат яны маглі рвануць наперад, не зважаючы, што на шляху чалавек, калека. Я наўмысна тармазіў ход машын, і мне ўжо сігналілі; я баяўся павярнуць галаву, каб не бачыць за шклом злыя, нецярплівыя вочы.

Дзяўчына ішла ўжо зусім павольна (выбілася з духоў) — апошнія метры былі для яе самыя цяжкія. І я, здаецца, ці не спыніўся, проста на шашы перад машынамі — тут жа адчуў, як рэдкая снежная куламеса

плюхнула мне на калашыны і тугою чарнатою віхнулася за спінаю «Волга». Я ледзь утрываў, каб не вылаяцца, — не ведаю чаму, але ў душы маёй здаўна жыве грэблівасць да людзей, што ездзяць на прыватных «Волгах».

Я ступіў да дзяўчыны, яна была бледная, халодная з твару, за шкельцамі акуляраў нейкаю пустою цемнатою нерухома стаялі вочы.

— Вам памагчы?

— Я сама, — у галасе была зацятая ўпартасць, якая сведчыла, аднак, што дзяўчына злуецца не на мяне і тым больш не на людзей, а на сябе — за сваю такую нямогласць і за тое, што яе шкадуюць. Яна кіравала на прыпынак, да якога было метраў сорак і ёй, зморанай, разумеў я, трэба яшчэ высільвацца ды высільвацца, і мяне зноў пацягнула за язык:

— Давайце я памагу.

— Не трэба. Я сама, — і цяпер ужо ў галасе не толькі злосць, але нейкая сполашная цвёрдасць — у нежаданні здацца чужому чалавеку зусім бяспомачнай, нявартай.

Збіраючы сілы, дзяўчына на мыліцах намагалася рабіць як шырэйшыя крокі, але яны былі не шырэй за курыныя. Спіна, галава, рукі ў дзяўчыны хадзілі хадуном, і толькі ногі ў мёртва абвіслых джынсах былі самыя маларухомыя... аднак ішлі.

Я доўга, пакуль не звярнуў за вугал дома, азіраўся. Дзяўчына рухалася...

## «БУДУ ЖДАЦЬ!..»

Цётка мая, Хрысціна, памерла маладой і нечакана, яе забрала даволі разгульная ў наш век хвароба — тромбафлебіт. На пахаванні мне не выпала быць, але потым маці расказвала, што цётка ляжала ў труне «як жывая, красівая, яна ж не схудзела...» Чамусьці — я прымеціў—пра нябожчыкаў, надта маладых, стараюцца заўсягды сказаць, што ён у труне прыгожы — мусіць, з наданнем трагічнасці тут мяжуе шкадаванне, што чалавек пайшоў рана, а мог бы яшчэ жыць ды жыць.

Дзядзька Адам, мужык цётчын, вельмі ўжо плакаў, рыдаючы немужчынскімі слязамі. І так худы, ён—калі я ўбачыў яго прыехаўшы ў адпачынак — здаўся мне жывым шкілетам: шырокія пашчэнкі, абцягнутыя цёмнаю скураю, тырчалі ў бакі, як адагнутыя шчэлепы ў смажанай рыбы.

Дзядзька — рабацяга: трактарыст, ён, як у народзе кажуць, і жнец, і касец, і на дудзе ігрэц. Адштукаваў, як вяночак, хату, абставіў яе павецямі, скляпамі, хлевушкамі — і ўсё гэта пад шыферам, заценена густымі ліпамі. Дзядзька, як і многія вясковыя мужчыны, не процi чаркі, можа і добра ўзяць, але я ніколі не бачыў, каб ён папускаўся ў зацяжное забулдыжнае пахмелле ці з-за гарэлкі нядбаў работу, сям'ю, дзяцей... Дарэчы, дзеці (іх чацвёра) павырасталі ўжо і, паканчаўшы інстытуты, рассяліся па гарадах. І натуральна, што дзядзька Адам, як толькі пахаваў жонку, трапіў тут жа на прыцэл гарачаму ўдовінаму воку. У адной нашай Малінаўцы выявілася адразу некалькі прэтэндэнтак (скажам так) на яго, дзядзьку, а знаць — і на яго багаты двор. Мая маці са старэйшаю сястрою Сцепанідаю, якая жыла ў райцэнтры і часта наязджала, абмяркоўвалі ўжо «кандзідатуры».

І тут да Куліны, якая бáбіла дзядзькавых дзяцей (а па-сучаснаму, прымала ў цёткі Хрысціны роды), прыехала дачка, ажно са Жданава. Якраз была касавіца — ліпень. Дзядзька Адам састрыг касілкаю сваю дзялку сена і нашу — тэхніка, нічога не скажаш! — хутка і роўна. Сушыць і грэбці сена Куліна падаслала сваю дачку, звалі яе Люся. Ну, няхай сабе паможа, хаця мы (я, маці з бацькам і дзядзька) лёгка справіліся б самі. У Куліны, мусіць, быў разлік, а які — пра гэта крыху пазней.

Люся жанчына відная, сярод вясковых кабет яна вылучалася ўсім: і павольнаю хадою, і сучаснаю, цеснаю на клубах сукенкаю, і завязанаю ўкруг галавы блакітнаю касынкаю, і тварам з мяккімі, спакойнымі абрысамі, і лёгкімі, пушыстымі завіткамі на белай гладкай таўставатай шыі; я ўжо не кажу пра гаворку, вусны, вочы — глянеш: адразу відаць — невясковае.

І таму я не вельмі здзівіўся, калі ўбачыў, што дзядзька прыехаў на луг у новым касцюме, пры гальштуку і пад капелюшом. «Жаніх!» Ведаў бы ты, дзядзька, што не пасуе табе, вясковаму, жылістаму, з пракопчанаю

скураю чалавеку, а толькі смяшыць і гэты новы касцюм з гальштукам, і тым больш капялюш. Але ж табе, мусіць, так хацелася спадабацца Кулінінай гарадской дачцэ.

Люся разы тры ці чатыры ўжо выходзіла замуж, але ўсё няўдала, і цяпер жыла адна з сынам ад першага мужа. Я, сямейны чалавек, думаў: чаму ўсё-такі не ўжываецца Люся з мужчынамі? З выгляду ж такая мяккая, рахманая. Мусіць, нейкая, як у Малінаўцы кажуць, хуртавіна (загана) у характары ёсць. Гэта так і засталося для мяне загадкаю, пэўна ведаю: да пары да часу.

Дзядзька, што называецца акрыяў, пашустрэў, нават спрабаваў жартаваць з Люсяю — шчыра, але па-вясковаму прымітыўна і грубавата; Люся старалася прыняць яго жарты, пасміхалася, хоць было відаць, яны ёй не кладуцца на душу.

Селі пад капу абедаць; на разасланай хустцы заблішчала сярод закусі бутэлька. Мы з бацькам «прычасціліся», дзядзька, хоць і глытаў слінкі, не мог — за рулём; у маці хворая печань, а Люся, на здзіўленне ўсіх, ад чаркі адмовілася, як яе ні прысільвалі, і дзядзька чамусьці яшчэ больш павесялеў.

Люся сядзела на зямлі, выпрастаўшы свае поўныя загарэлыя ногі з белымі драпінкамі на скуры, і я не мог не зачапіцца воляй-няволяй за іх позіркам; мусіць, гэтым грашаць усе мужчыны, той жа дзядзька.

Надвечар дзядзька сцягваў на трактары копы, Люся памагала яму падчэпліваць іх — здалёк было відаць, як блішчаць у яе белыя зубы. Падобна, што Люся ахвотна ішла на паразуменне з дзядзькам, хаця, мне здавалася, па псіхалогіі — вясковы і гарадская— гэтыя людзі не маглі быць сумяшчальныя. Аднак... Мусіць, тут, думаў я, на дачку натўкала маці, Куліна.

Куліна мела ўжо за семдзесят, і адной з дваром упраўляцца ёй не лёгка: дровы, скаціна, бульба, сена... Сына, які жыве ў Магілёве, ведала, яна ўжо не перацягне да сябе, да таго ж ён — п'яніца, лічы, не паказвае вачэй. А вось калі б Люся сышлася з Адамам — усё стала б на сваё месца...

Маці з цёткаю Сцепанідаю, якія ведалі Люсю па дзявоччыне, гаварылі, што яна не гультайка і чорнае работы не цураецца, так што тут якога-небудзь падво-

ху чакаць нельга. Вось толькі ці «сагласіцца яна, гарадская, чыстая», пераехаць у вёску — «у еты гной».

Усім нам давялося адно паціснуць плячыма: Люся згадзілася жыць з дзядзькам Адамам, але пасля таго, як прыпуціць сына: дачакаецца з арміі, ажэніць, бо нейкі ён у яе надта шухавейны, несур'ёзны. Дзядзька Адам ужо разы два схадзіў з бутэлькаю да Куліны, каб замацаваць згоду.

— Ну што ты будзеш рабіць? — спыталі мы ў дзядзькі, калі ён вясёлы, чыста паголены, аж гарыць, прыйшоў ад Куліны да нас.

— Буду ждаць!.. — сказаў ён цвёрда, і ў гэтым кароценькім маладым і хутчэй жаночым вымаве было столькі дзёрзкай летуценнай страсці, што аж не верылася, быццам так хутка можа атрэсціся ад гора чалавек, калі наперадзе ў яго нечакана загараецца няхай і няпэўнае, але такое ўцешнае для самалюбства, заманлівае святло.

## ПАСТУШОК

Карова не хацела выходзіць з хлява, круцілася, станавілася задам у кут, угінала галаву. Вася злаўчыўся і сцёбнуў яе хлудам па крыжы — яна здрыганулася і нехаця выйшла з хлява.

У акно глядзела маці, трымаючы на руках маленькую Кацьку, якая смяялася і махала ручкаю.

Вася выгнаў карову з двара на вуліцу. Карова ўжо ведала, што трэба ісці па сцежцы да Сажа. У ружовым тумане далёка за тым берагам стаяла сонца. Па вуліцы нізка над зямлёю праляцела, трывожна цвіркаючы, сітаўка, быццам за ёю гнаўся коршак ці спудзіў зброд- лівы кот. Раней сітавак шмат вялося ў саламянай страсе старога калгаснага гумна, але немцы, наступаючы, яго спалілі, і сітаўкі рассяляліся; дзе іх цяпер гнёзды — Вася не ведаў.

Сітаўка паляцела ў канец вёскі, а карова звярнула на сцежку, абапал якой ляжалі чорныя, як вужы, рабрыстыя галавешкі — засталіся ад частаколу. Вёска стаяла на пагорку, і зямля як бы штурхала Васю і карову ў ногі.

Адразу за сядзібамі пачынаўся лужок, на ім відаць былі ямкі ад·мін — глыбокія і круглыя, быццам гіганцкія сітаўчыны гнёзды. Над Сажом плыла пара, акурат над вуліцаю дым, калі нямецкія самалёты бамбілі вёску. На вадзе, каля саменькага берага, ляжалі шырокія жоўта-зялёныя, як расплясканыя пілоткі, лісты гарлачыкаў.

Вася пагнаў карову ў Сад — каля яго Сож мелкі і карову можна перагнаць на той бок: там болей травы, не так здратавана зямля. Садам называюць месца, дзе раней быў памешчыцкі маёнтак, а цяпер стаяць дзве крывыя напаўзасохлыя яблыні-карчамяжкі ды куст здзічэлай грушы, да якога і паткнуцца боязна, так натапырыў чорныя, бы ў вожыка, іголкі.

Карова цмакнула вады, паглядзела тужлівымі вачыма на вёску, на Васю: нешта яна і праўда сёння як нежывая, а маці сказала б — «як мялля». Вася кінуў у ваду хлуд, і ён паплыў уніз па цячэнні, туды, дзе ўставала сонца. Зняў чаравікі і, звязаўшы шнуркі, павесіў на шыю; закасаў калашыны. Вада была цёпленькая, бы нагрэтая, а пясок на дне халодны: не ісці б па ёй, а плыць — легчы на спіну і лёгенька падварушваць пальцамі, глядзець у сіняе неба. Вася ўжо забыўся, калі яно было сіняе, апошнім часам то чорнае, то цьмянаружаватае, як там вунь, дзе цяпер стаіць сонца. Калі яно ўжо выбавіцца з гэтае вязкае смугі?

Босы, Вася ідзе і накульгвае: на правай назе ў яго няма вялікага пальца — адсек. Калоў дровы і адсек. Размахнуўся сякераю — жах! — ад цурбака адкалоўся аскепак, і сякера лучыла якраз на нагу...

Карова перайшла Сож, пастаяла на беразе, чакаючы, пакуль выйдзе з вады Вася. Махнула хвастом і пачала скубці траву: прыцісне мызу, языком лізь, лізь — захіляе траву сабе ў рот, сціскае сківіцамі і адрывае. На беразе трава рэдкая, наедак невялікі, і карова пайшла ў лагчыну; Вася глядзеў на яе вытырклыя вострыя маслакі на спіне, шкадаваў карову: і ёй, беднай, нялёгка, ні пойла не пасуліць маці, ні бульбачкі ці буракоў не дасць — самім няма чаго есці.

У лагчыне трава была вышэйшая і гусцейшая, і карова завінулася хадзіць. Вася пайшоў да кустоў вербалозу, там цікавей, можа, гняздо сітаўкі знойдзе ці страказу якую зловіць — усё-ткі забава. Сонца паднялося, і на траве заблішчала халодная раса. У прагале сярод

вербалозу стаяў тоўсты альховы пень, у ім было дупло, здалёк яно чарнела цьмяным круглым, як у цыклопа, вокам. Раптам вока стала чырвонае — Вася сумеўся, а потым убачыў, як з дупла выскачыў імклівы светла-рудаваты звярок з белаю палоскаю на горле і шмыганую у высокую густую асаку.

Што ён там рабіў, у дупле? Няўжо аблюбаваў сабе на хатку? Пень блізенька, можа, метраў пяць да яго, а не падыдзеш, бо акурат з гэтага боку перад ім такая прорва, што дна не відаць, вада аж сіняя, ступі — і толькі бурбалкі пусціш. Да пня можна дабрацца з другога боку, абышоўшы кусты, там цвёрды сухі пагорак. Вася думаў: ісці ці не ісці. З кіламетр трэба даваць круг, а раптам карова куды забрыдзе. Ён глянуў на карову. Яна спакойна скубла траву, і гэта надало яму рашучасці: так хацелася ўведаць, што рабіў у дупле звярок.

Ён павесіў на калок свой пінжак, каб карова нюхам адчувала, што пастух тут, і, падскокваючы, пабег паўз кусты. Як усё-ткі прыемна, калі даеш нагам волю, — здаецца, радасць гоніць цябе на край свету. Вася ўжо забыўся, калі адчуваў сябе радасным і бестурботным, усё пад страхам ды пад страхам, прыбіты, аглушаны.

Ён сцішыў бег, прыслухаўся: ці не людскія галасы? А можа, здалося, можа, у парыве імклівага лёту пачуўся бацькаў голас, адтуль, з далёкага фронту, ці голас сябрука Пецькі, што падаўся ў бежанцы... Здаецца, у кустах бубнелі мужчыны, глуха, як пад зямлёю. Вася перайшоў на мяккі, ціхі, бы ў ката, крок. Што за людзі? Можа, хто з тутэйшых косіць у кустах асаку? Ці пруцце на кошык рэжа... Некалі да вайны Вася разам з бацькам хадзілі сюды плесці кошыкі, пруцце тут доўгае, гнуткае, што лыка, хоць завязвай на вузел.

Вася спрытна, як той светла-рудаваты звярок, пашыўся ў кусты, прыгінаючыся нізенька да зямлі. Пад нагамі патрэсквалі сучкі, і ён сцінаўся ўсім целам. Уперадзе ён згледзеў вострую кучачку белага сырога пяску, а далей яшчэ і яшчэ... Сэрца моцна застукала ў грудзях: не косяць тут і не плятуць кошыкі, а капаюць, мусіць, акопы. Ён успомніў, што чуў, як увечары за Сажом гурчалі машыны. Толькі чые, нашы ці нямецкія? Ён падкраўся да бліжэйшай кучачкі і, выглянуўшы з-за яе, убачыў у нізовінцы салдат у зеленавата-рудым плямістым адзенні. Гэта былі немцы, яны сядзелі на

шэраў падсцілцы кружком і гулялі ў карты; каля іх стаялі буданчыкам карабіны са штыкамі, а крышку далей — удзяўбнутыя ў зямлю рыдлёўкі з кароткімі чаранкамі.

Вася адчуў шчакою сыры халодны пясок, які чамусьці смярдзеў жабамі. Сэрца ўжо не стукала, а здавалася, спынілася зусім. Ён нячутна, як вуж, слізгануў назад і, не разгінаючыся, пабег ад гэтых вострых белых кучачак пяску.

Вася не бачыў, за што ён зачапіўся, але адчуў, што ўжо не бяжыць, а ляціць над зямлёю; паспеў адно выпрастаць рукі — і зарыўся носам у густую шорсткую асаку, якая паласнула па твары, як брытвачкаю. І той жа міг блізка ў кустах ён пачуў злосны лямант. Нехта ўжо ламаўся, бег да яго. Не паспеў Вася падхапіцца, як над ім навіс раз'юшаны немцаў твар — аскалены рот, загнутае пад пілоткаю вуха, маленькія шэрыя вочы глыбока сядзяць пад чырвонымі, як мяцёлкі змяінага драсёну, брывамі. Немец хапіў Васю за каўнер, і каўнер той астаўся ў ягонай руцэ. Немец кінуў яго ўбок, тузануў Васю за руку.

— Хальт! Фо! Фо! — паказваў на вушы і на сіненькі дрот, які ляжаў на зямлі.

На Ваневым твары чырвонаю расою выступіла кроў. Немец трос яго за руку, штурхаў у плечы: дапытваўся, хто такі. Вася зразумеў, што хоча ад яго немец.

— Я... — паказаў пальцам у той бок, дзе пасвілася карова. — Там...

Немец пацягнуў Васю зноў да тых белых кучак пяску, за адной з якіх ён толькі што ляжаў. Чэпкімі цвёрдымі пальцамі немец ашчаперыў Васю за шыю, як пеўня, пацягнуў за сабою. Немцы, што гулялі ў нізовінцы ў карты, павярнулі да іх галовы; адзін, без каскі, устаў, расставіўшы шырока ногі, чакаў іх.

Ад моцнага штуршка ў патыліцу Вася паляцеў на брызент, у самую сярэдзіну круга, што замыкалі немцы-карцёжнікі. Нехта нагою спіхнуў яго з брызенту.

— Хто ты ест? — спытаў немец, што стаяў.

— Я... там, — зноў паказаў Вася туды, дзе за кустамі пасвілася карова.

— Там ест люды?

— Не-е, — Вася закруціў галавою. — Карова...

Немец нешта сказаў па-нямецку, кіўнуў галавою ў той бок, куды паказваў Вася.

Два немцы з куртатымі чорнымі аўтаматамі на грудзях падхапіліся і папёрлі Васю перад сабою.

— Шнэль! Шнэль!

Карова скубла траву на тым жа месцы, дзе Вася і пакідаў. На пінжаку, што вісеў на калку, сядзела сітаўка і, патрэсваючы хвастом, цвіркала. Убачыўшы людзей, яна ўспырхнула і, прыпадаючы нізка да зямлі, нөяк рыўкамі паляцела прэч. Карова шумна пацягнула ў сябе паветра, аблізнула языком бліскучую, ружовую, у чорных канаплінах мызу.

— Тфой? — Немец наставіў аўтамат на карову.

Вася кіўнуў галавою, насупіўшыся ад горычы, якая апякла душу, калі зразумеў, што немцы забяруць карову.

Немец аўтаматам і кіўком галавы паказаў Васю на кусты: гані туды.

Карова, нейкая ўся скасабочаная, настаўбурчаная, нюхала і нюхала паветра, якое несла ёй брыдкі пах чужынцаў. Вася стаяў бы ўкапаны, і немец упёр яму між лапатак цвёрдае дула аўтамата, крутнуў, сцёршы на пазванку скуру — зашчымела ад потнай кашулі.

Вася падышоў да каровы і ляпнуў далоняю па яе рабрыстым баку. Карова здрыганулася, матлянула галавою, і кончыкі яе вострых рагоў бліснулі, як цвікі.

— Пайшла! — Вася ляпнуў карове па шыі. Карове загадваў гаспадар, і яна паслухалася. Немцы ішлі з бакоў, трымаючы напагатове аўтаматы. Перад самымі кустамі карова аглянулася: ці туды гоняць? І ў яе вачах, фіялетавых, глыбокіх, бы вада ў прорве, Вася прачытаў трывогу і насцярожанасць. Рагамі карова счэсвала лісце на кустах, высокая асака блыталася ў нагах, вырывалася і засядала ў развілцы капытоў.

Немцы ў нізовінцы ўжо не гулялі ў карты, іх там пабольшала, яны мітусіліся, падавалі каманды; пад нацягнутым над зямлёю брызентам дымілася вогнішча.

Карова сагнула галаву, павяла рагамі. Немец тыцнуў ёй у вымя аўтаматам, ударыў нагою пад бруха. Карова рванулася, збегла ў нізовіну.

Вася сцяў кулакі, ледзь стрымаў сябе, каб не кінуцца на немца.

Немцы загергеталі, бы гусі, абступілі карову, упіралі ёй у сцёгны пальцы, крывіліся: «плёхо». Карова стаяла, скасавурыўшыся, выкаціўшы бялкі ў тоўстых чырвоных жылках. Яна чула сваю смерць.

Раптам немцы расступіліся перад рыжым пузаном; рукавы яго чорнай бруднай кашулі былі закасаны, у правай руцэ ён трымаў доўгі нож з глыбокім равочкам пасярод ляза. Пузан асцярожна пацягнуўся да каровы рукою, але яна чмыхнула, падалася назад, і тады ён, надзіва спружыніста, як рысь, скочыў да яе, хапіў за рог і ўдарыў нажом зверху ў галаву. Карова мыкнула і ўпала, як падкошаная, на траву; заднія ногі выпраміліся, як частаколіны, а вочы былі адкрытыя, цямнелі з кожнаю хвілінаю, быццам адлюстроўвалі ў сабе навальнічную хмару, якая набліжалася і гусцела. Немцы зарагаталі, агідна выскаляючы зубы. Вася глядзеў на іх, і вочы яго наліваліся слязамі і нянавісцю. Рыжы таўстун замахнуўся зноў нажом і ўсадзіў яго ў шыю ляжачай, ужо нерухомай каровы... Васю здалося, што нож прайшоў і яму скрозь сэрца — разануў па грудзях боль. Вася кінуўся на плечы таўстуну, але яго падхапілі дужыя рукі тых, што абступілі карову, і адкінулі ўбок.

— Вэк! Бістро! — На яго глядзелі чорнымі вочкамі некалькі аўтаматаў.

«Гады!..» — нема пракрычала ўся Васева істота, ад пятак да кончыкаў цёмна-русявых мяккіх валасоў. Ён устаў і, сціскаючы ад бяссілля кулакі, пайшоў накульгваючы праз кусты да Сажа. Адчай выдзіраў з грудзей сэрца: не ўратаваў, аддаў немцам карову. Што скажа маці? Чым цяпер карміць маленькую Кацьку? Ён, адзіны мужчына ў сям'і, падвёў і маці, і Кацьку... Бацька прыйдзе з вайны, пасмяецца: «Эх ты, Вася, я думаў, ты смелы!..» Нясцерпна пяклі-шчымелі парэзы на твары, Вася адчуваў, як шэрхне, сцягваецца скура — засыхала кроў.

Скрозь кусты прыбярэжнага вербалозу бліснуў Сож, але Вася не абрадаваўся: гора скавала яго ўсяго, апляло сваімі чорнымі, як п'яўкі, халоднымі прутамі.

Вася выйшаў да Сажа — далёка адхіліўся ад вёскі, тут глыбока, не пярэйдзеш, трэба забіраць управа, але глянуў на процілеглы бераг і ажно прысеў. З высокага крутога пагорка, белага ад рамонкаў і падсіненага смугою, спускаліся да вады вайскоўцы. Іх было шмат — у касках, у пілотках, а то і зусім з голымі галовамі. Некаторыя ўжо стаялі ў рацэ, бралі прыгаршчамі ваду, плёхалі сабе на твар, на грудзі пад гімнасцёрку. Хто гэта? Няўжо зноў немцы? Дамовіліся і ідуць на сустрэчу з гэтымі абжорамі, якія толькі што забралі карову.

Вася ўвесь наструніўся, і вушы яго чуйна ўлавілі слабы за далёкасцю голас: «Станаві-і-сь!..» Нашы! Нашы, рускія! Ён навастрыў не толькі вушы, але і вочы — і распазнаў на касках чырвоныя зоркі. Чырвонаармейцы!

Несусветная радасць абвалілася на Васю, ён, бы юла, крутнуўся на пятцы. Ура!!! Нашы! Яму хацелася кінуцца да іх, павіснуць у каго на шыі, расказаць пра сваю бяду, пахваліцца, што і яго бацька ваюе... Але ж не бухнешся ў вір, трэба бегчы туды, дзе мелка... І ён, не спускаючы вачэй з таго берага, зрабіў ужо некалькі крокаў, але ўбачыў, што чырвонаармейцы цягнуць у ваду невялічкія плыты — блішчыць жоўтымі галоўкамі масла свежазрэзанае дрэва. Куды яны? Сюды? Тут жа немцы! У Васі падкасіліся ногі, як бы зарыліся глыбока ў пясок, не беглі і не ішлі. Тыя ж гады зусім блізка ў кустах! І чырвонаармейцы акурат напорацца на іх. Дабегчы да Сада і там перайсці Сож ён не паспее. Пакуль яшчэ па тым беразе дабяжыць...

Вася рвануў з сябе кашулю — два апошнія гузікі, якія не вырваў немец, пстрыкнулі ў траву, бы тыя конікі.

— Гэ-э-эй!.. — закрычаў Вася, ступаючы ў ваду і махаючы над галавой кашуляю. — Не трэба сюды! Тут немцы! Гэй-й-й!..

Ягоны звонкі голас панёсся над вадою не ціхалётнаю сітаўкаю, а імкліваю ластаўкаю-берагавушкаю і там, на далёкім беразе, упіўся ў вушы чырвонаармейцаў. Яны перасталі мітусіцца.

— Гэ-гэ-э-эй! — Кашуля, як прапелер, матлялася над галавою ў Васі. — Не ідзіце сюды! Тут немцы!!!

Чырвонаармейцы замерлі, як бы не верачы ці пільней прыслухоўваючыся.

— Не-е-емцы! Тут немцы!..

Вася ўбачыў, як чырвонаармейцы, пакідаўшы плыты, дружнаю хваляю адкаціліся за пагорак і заляглі — блішчэлі ў рамонках каскі, і чырвоныя зоркі на іх таксама здаваліся Васю кветкамі. Абрадаваны, ён азірнуўся і кінуўся далей у ваду, але з кустоў у гэтае імгненне гарачым струменем секанула аўтаматная чарга — і зоркі на процілеглым беразе рвануліся з рамонкаў у неба і рассыпаліся ва ўсе бакі чырвонымі, як кроў, сітаўкамі...

Некалькі фашыстаў выскачылі з кустоў і ў ашале-

лай азлобленасці паднялі на штыках мокрае, ужо бяздыханае Васева цела.

* * *

Я неаднаразова чуў ад старэйшых людзей, у тым ліку і ад сваёй маці, гэты расказ пра маленькага пастушка, які выратаваў нашых салдат. Але ніхто не ведаў, што гэта за хлопчык, адкуль ён? Можа, з бежанцаў? А можа, з якой недалёкай вёскі?

Ягоная самаахвярнасць узрушыла мяне, яшчэ ў дзяцінстве цяжарам незразумелай віны лягла на душу, і я адчуў нейкую палёгку вось толькі цяпер, калі напісаў гэтае невялікае апавяданне.

## ДОМ

Панельны дом быў стары, шэры, а вакол усё яркае і ўрачыстае: астатнія дамы, ліпы і клёны ў маладой зеляніне лісця, кветкі на клумбах, бліскучыя разнаколерныя легкавікі, што выстраіліся каля гаражоў, як на парадзе; з раніцы да вечара міма дома снавалі людзі, яны таксама былі прыгожа апранутыя, адкрытыя, шчаслівыя з твару, і на фоне змрочных сцен ярка кідаліся ў вочы; недалёка ад дома быў дзіцячы сад — адтуль ляцеў звонкагалосы бестурботны перакліч, і рэха яго абрывалася, патанала ў халоднай цемнаце расчыненых пад'ездаў і закратаваных акенцах падвалаў.

Але — некаторага дня каля дома з'явіліся чаны з белай і жоўтай фарбаю, шырокія, цяжкія скрыні-бетонамяшалкі; куча пяску, рыдлёўкі... Каля сцяны выпнулі свае спіны высокія, падобныя на вярблюдаў, сталюгі-мосцікі — стоячы на іх, жанчыны ў шэрых спяцоўках і белых абвязаных укруг галавы хустках асвяжалі фарбаю рамы. Дом быў шасціпавярховы, і каб даставаць да вышэйшых паверхаў, з даху спусцілі на канштэйнах акуты жалезам насціл.

Дом вачавідкі ажываў, маладзеў — смяяўся.

І я, гледзячы з акна на дом, адчуваў, як святлее ў вачах і на душы, у кабінеце і, нарэшце, на вуліцы. Я быў удзячны будаўнікам, асабліва жанчынам-малярам,

пранікся да іх даверам нейкае шчымлівае, дзіцячае замілаванасці.

А ўвечары, ідучы дахаты і абмінаючы дом, раптам убачыў, што тыя гарбатыя сталюгі-вярблюды завалены проста на клумбы, у кветкі. Цяжкія, запэцканыя фарбаю дошкі бязлітасна падмялі пад сябе, уплішчылі ў мяккую зямлю пявінныя галоўкі настурцый, мімоз, браткаў...

І дом адразу перастаў смяяцца — лівень душэўнага абурэння змыў фарбу з рам і сцен, і яны зноў сталі тыя ранейшыя, абшарпаныя і змрочныя.

## ЗМЕСТ

### Аповесці


Разам па жыцці . . . . . . . . . . 4
Грыбавар . . . . . . . . . . . . . 88
Грэцкі арэх . . . . . . . . . . . . 185


### Апавяданні


Перад вяселлем . . . . . . . . . . . 212
Скарб . . . . . . . . . . . . . . 220
Люсінка . . . . . . . . . . . . . 229
Адліжная нядзеля . . . . . . . . . 240
Адзін толькі дзень . . . 251
Усё жыццё любіла... . 261
Памяць . . . . . . . . . . . . . . 269


#### З цыкла кароткіх апавяданняў «Цёплы пух адуванчыкаў»


Цёплы пух адуванчыкаў . . . . . . 279
Рэнька . . . . . . . . . . . . . . 282
Гронка рабіны . . . . . . . . . . . 284
На Мінскім моры . . . . . . . . . 286
Цераз дарогу . . . . . . . . . . . 289
«Буду ждаць!..» . . . . . . . . . . 291
Пастушок . . . . . . . . . . . 294
Дом . . . . . . . . . . 301

**Рубанаў У.**

Р 82 Цёплы пух адуванчыкаў: Аповесці і апавяданні.— Мн.: Маст. літ., 1987.— 303 с.: іл.

Чалавек вярнуўся з вайны без рук, на яго долю выпала шмат пакут і цяжкасцей. Але Пятро Максімавіч (аповесць «Разам па жыцці») сумеў захаваць у сабе дабрату і высокую чалавечнасць. Яго жыццё — узор для маладога журналіста Мікалая Бібічыка.

У цэнтры аповесці «Грыбавар» цікавы народны тып Грышка Пруцікаў. Яго маральная патрабавальнасць да сябе асабліва выяўляецца ў адносінах з сынам, які трапляе на лаву падсудных.

Апавяданні адкрываюць чытачу складаны свет кахання, тонкіх пачуццяў, асуджаюць душэўную чэрстваснь, эгаізм.

Р $\frac{1702120200-125}{М 302(03)-87}$ 27—87 ББК 84Бел7

Владислав Яковлевич
РУБАНОВ

**ТЕПЛЫЙ ПУХ ОДУВАНЧИКОВ**

*Повести и рассказы*

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Е. А. Пяршай
Мастак С. А. Юк
Мастацкія рэдактары В. П. Жыжэнка, М. Я. Шкурпіт
Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал
Карэктар А. Т. Глушчанка

ІБ № 2678

Здадзена ў набор 09.12.86. Падп. да друку 16.07.87. АТ 07659. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 15,96. Ум. фарб.-адб. 15,96. Ул.-выд. арк. 16,91. Тыраж 11 000 экз. Зак. 2600. Цана 1 р. 50 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня «Победа», 222310, Маладзечна, вул. В. Таўлая, 11.